# РУПЛІЎЦЫ

## на ніве фестывальнага фальклорнага руху

# «Берагіня»

## (1998–2018)

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Галоўнае ўпраўленне па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі
Гомельскага аблвыканкама
Акцябрскі выканаўчы раённы камітэт
Дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу
«Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур»
Грамадскае аб’яднанне «Беларускі фонд культуры»

# РУПЛІЎЦЫ

## на ніве фестывальнага фальклорнага руху

# «Берагіня»

## (1998–2018)

Зборнік артыкулаў

Мінск
«ІВЦ Мінфіна»
2018

УДК 398:79.091.4(476.2)(082)
ББК 85.3(4Беи)
Р86

Аўтар ідэі і кіраўнік праекта М. А. Козенка

Укладальнік М.А. Козенка

*Выказваем шчырую падзяку ўсім, хто спрычыніўся да напісання артыкулаў, падрыхтоўкі і выдання гэтай кнігі. Асаблівыя словы ўдзячнасці – Т.Б. Варфаламеевай, С.А. Беразоўскай, Т.Е. Маскалёвай, С.М. Рыбаравай, Ю.В. Шабан, Л.А. Казаковай*

Р86 **Руплíўцы** на ніве фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня» (1998–2018) : зборнік артыкулаў / аўтар ідэі, кіраўнік праекта, укл. М.А. Козенка. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2018. – 236 с.

ISBN 978-985-7205-33-2.

Зборнік складаюць артыкулы пра асоб, якія зрабілі значны ўклад у арганізацыю, правядзенне, падтрымку фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў рэспубліцы і рэгіёнах, садзейнічалі яго развіццю, папулярызацыі і распаўсюджванню, практычна вырашаюць пытанні этнічнага выхавання дзяцей і моладзі нашай краіны сродкамі розных відаў і жанраў традыцыйнага мастацтва беларусаў.

Адрасуецца шырокаму колу настаўнікаў, выкладчыкаў, навучэнцаў і студэнтаў гуманітарных дысцыплін СНУ і ВНУ, магістрантаў і аспірантаў, кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых калектываў; усім, каго цікавяць пытанні гісторыі, культуры, адукацыі, этнічнага выхавання дзяцей і моладзі Беларусі.

**УДК 398:79.091.4(476.2)(082)**
**ББК 85.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-7205-33-2**

© Укладанне. Козенка М. А., 2018
© Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, 2018
© Афармленне. РУП «ІВЦ Мінфіна», 2018

# *ГІСТАРЫЧНЫ ЛЁС «БЕРАГІНІ»*

«Берагіні» – 20! Ці багата гэта часу? У адным выпадку – юнацкі ўзрост, у другім – гісторыя, умудроная вопытам, узбагачоная шматлікімі інавацыйнымі доўгатэрміновымі этнапраектамі; дакладна вывераная дынамічна разгорнутая сістэма этнічнага выхавання падрастаючага пакалення беларусаў, скіраваная на фарміраванне ў іх нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да нематэрыяльных і матэрыяльных праяўленняў традыцыйнай спадчыны Бацькаўшчыны. Адной з мэт фестывалю «Берагіня» мае быць падтрымка этнічнай культуры ў разнастайнасці яе каранёвых мастацкіх форм. Грунтуецца на асноўных прынцыпах: выяўленне, аднаўленне, вывучэнне, даследаванне, трансляцыя, распаўсюджванне і папулярызацыя лакальных і рэгіянальных традыцыйных культур.

«Берагіня», распачатая напрыканцы 1990-х гг. на Рудабельшчыне, у невялічкім палескім краі Гомельскай вобласці, за гады свайго існавання ўпэўнена набыла рысы нацыянальнага фестывалю традыцыйнай культуры і перарасла ў фестывальны фальклорны рух.

Падыходы да «Берагіні» рабіліся яшчэ ў 70-я гг. мінулага стагоддзя, пачынаючы з кропачнага вывучэння танцавальнага і музычнага фальклору беларусаў, абрадавай спадчыны і выкарыстання элементаў народнага мастацтва на аматарскай сцэне. Некаторыя ідэі былі апрабаваны ў арганізаваных формах мастацкай самадзейнасці ў калектывах-удзельніках раённых і абласных аглядаў народнай творчасці (1970–80-я гг.). Больш шырока – у рамках рэспубліканскіх фестываляў беларускага народнага танца (заключныя туры – г. Гродна, Мінск, 1990), «Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), «Пярэзвы» (г. Бабруйск, 1992) і асабліва ў фестывалях «Беларуская полька» (г. Чачэрск, Гомельскай вобл., 1993–2000), у праграмы якіх паступова, крок за крокам, уключаліся розныя мастацкія формы, здольныя аб’ядноўваць шырокае кола носьбітаў і пераемнікаў (школьнікаў, навучэнскую і працоўную моладзь) мясцовых мастацкіх культур і што прынцыпова важна – *вусным шляхам.* Дзейсны штуршок звяртання да народнай спадчыны Бацькаўшчыны далі Першы міжнародны фестываль фальклору на Беларусі (1994), абласны фестываль аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя (1996), праведзены па выніках даследавання традыцыйнай культуры Магілёўшчыны ў рамках Рэспубліканскай праграмы «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (аўтар ідэі і кіраўнік Т.Б. Варфаламеева).

Так, з цягам часу набыў дакладны абрыс рэспубліканскі эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці» (2001–2003), які рэалізоўваўся ў рэчышчы Дзяржаўнай праграмы па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь (пастанова Саўміна Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2000). У зацверджаным Міністэрствам культуры праекце «Танцавальны фальклор і дзеці» былі акрэслены напрамкі дзейнасці ў вызначаных дзевяці (Акцябрскі, Асіповіцкі, Барысаўскі, Ваўкавыскі, Вушацкі, Гарадоцкі, Драгічынскі, Лельчыцкі, Любанскі) эксперыментальных раёнах краіны: вывучэнне фальклорнай спадчыны свайго краю ў розных яе праяўленнях; навучанне

дзяцей, падлеткаў, моладзі мясцовым народным танцам, карагодам, гульням; выраб этнічных строяў для ўдзельнікаў праекта; стварэнне танцавальных фальклорных калектываў; правядзенне вучобы кадраў; напісанне матэрыялаў даследчага характару. І як вынік сістэмнай і комплекснай працы – правядзенне конкурсаў выканаўцаў беларускіх народных парных танцаў, аглядаў маладзёжных і аўтэнтычных фальклорных гуртоў, навукова-практычных канферэнцый, чытанняў, «круглых сталоў», дыскусій па праблемах нематэрыяльнай і матэрыяльнай культурнай спадчыны Бацькаўшчыны; выданне абагульняючых матэрыялаў: даведнікаў, тэматычных зборнікаў, брашур, буклетаў і інш.

У ходзе рэалізацыі праекта першаступенная ўвага была нададзена фальклорна-этнаграфічнаму абследаванню рэгіёнаў. Так, толькі ў адным Драгічынскім раёне выяўлены: велікодны карагод «Стрілка», танец «Тэрніца» («як убіраюць лён»), вясельныя і прымеркаваныя да вяселля танцы – «Каза», «Танец бацькі і маці з хлебам», «Грэчка», «На табурэтцы», «Прыспеў»; пазаабрадавыя гуртавыя танцы – «Мост», «Галёпка», «Гарбуз», «Околышко»; сольныя – «Мыкыта», «Лявоніха», «Казачок», «Грэчанікі»; *парныя* «Генспансер», «Барадайка», «За гаем», «Валец хуткі» і інш.

У Вушацкім раёне: карагоды – «Рында», «Мак», «Ідзіця, мальцы, у карагод», «Заянька»; танцы сольныя – «Крыжачок», «Таўкачыкі», «Шчамель»; парныя – «Мільён», «Сіне мора», «Субота», «Галоп» і інш.

У Гарадоцкім раёне: карагоды –зімовага перыяду «Заінька па-за садам», веснавога перыяду «А дзе тая калыжынка?», парныя танцы «Распалоска», «Тапор», сольныя – «Дударык», «А ў баріна на дваре» і інш.

На Барысаўшчыне сярод карагодаў, традыцыйных і асіміляваных танцаў засталіся ў генетычнай памяці некаторых носьбітаў мастацкіх традыцый вясельны танец «Качан», пазаабрадавыя «Садочак», «Палянка», полька «Ася-сюся» і рэдкі для рэгіёна мужчынскі танец «Індык» (Мётчанская акруга).

На Акцябршчыне сярод 64 зафіксаваных народных харэаграфічных узораў яскрава вылучаюцца «Хадося», «Дзева ў сенях стаяла», вальсы «На 40 кален» і «Качан».

У Лельчыцкім раёне запісаны 22 народных гульні («Заёнец», «Поцем», «З ку́та», «Аб’езд маладога бычка», «Шапніца» і інш.), 257 твораў народных празаічных жанраў.

Зафіксаваны ў вялікай колькасці ў розных варыянтах, як у пластыцы, так і ў назвах, полькі: «Слізуха», «Вінтом» (Гарадоцкі р-н); «Рах-цях-цях», «Гопся-сюся», «Шабасоўка», «Трасуха», «Пчолка», «Жыдоўская полька», «Полька ўхватава», «З падгоцам», «Шалёная полька», «Полька-сцо!», «Скакуха», «Матылёк», «Босая полька» (Драгічынскі р-н); 15 полек з рознымі назвамі ў Вушацкім раёне, сярод іх – «Тармасуха», «Скакуха», «Таптуха», «Герц» і інш.; 28 полек запісана ў Любанскім раёне – «Дробненькая», «Трасуха», «З падгопам», «З прытупам», «Праз нагу», «Чачотка», «З выхадам», «Па загонах», «Ухватная», «Казёл», «Салавей», «Пчолка», «Войра», «Манька» і інш.

Запісаны і кадрылі – на 5 кален у Лельчыцкім раёне; на 5, 7, 12 кален – у Вушацкім раёне; на 4, 6 кален і на 12 штрофаў – у Любанскім раёне. У гэтым жа раёне

зафіксаваны 22 варыянты сольных танцаў, сярод іх – «Жабка», «Верабей», «Таўкачыкі», «Шамель», «Ухар», «Варан». На сёння фальклорна-этнаграфічны архіў Любанскага раённага цэнтра культуры налічвае больш 3000 адзінак захавання. У іх ліку – звыш 800 народных песень, 105 традыцыйных мясцовых танцаў. Супрацоўнікамі цэнтра (лідар С. Выскварка) рэканструяваны традыцыйныя «Гасцявыя кірмашы», абрад «Спальванне русалкі», свята «Пятрок». Штогод на Любаншчыне праходзяць аднаўленыя народныя святы: «Масленка», «Гуканне вясны», «Юрай», «Тройца».

У цэлым у Рэспубліканскім эксперыментальным праекце «Танцавальны фальклор і дзеці» (2001–2003) было задзейнічана амаль 4000 чалавек – пераемнікаў (2700) і носьбітаў мясцовых мастацкіх традыцый (фальклорныя калектывы, ансамблі, гурты, салісты – спевакі, танцоры, музыкі, апавядальнікі народнай прозы, народныя майстры і іх вучні па салома-, карунка-, лозапляценню, вышыўцы, ткацтву, вязанню і пляценню паясоў, разьбе па дрэве і іншых умельстваў). У рэалізацыі праекта ў эксперыментальных раёнах прынялі ўдзел 158 устаноў культуры, 97 устаноў адукацыі, створана больш за 60 дзіцячых фальклорных калектываў; у конкурсе выканаўцаў народных побытавых танцаў удзельнічалі 1195 танцавальныя пары. Падрыхтавана на раённыя фальклорныя чытанні і рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю 187 дакладаў і паведамленняў. Завяршэннем рэалізацыі праектаў сталі раённыя фестывалі фальклорнага мастацтва і конкурсы: «Драгічынскі карагод» (г. Драгічын, Брэсцкая вобл.), «Танцы пад гармонік» (г. Любань, Мінская вобл.), «Палескі трохкутнік» (г.п. Акцябрскі, Гомельская вобл.).

Фестывальнае зерне, кінутае ў глебу 20 год таму, сёння забуяла каласістым полем паўсюдна ў краіне. Грунтуючыся на прынцыпах «Берагіні» рэгіёны ўкаранілі ў свой сацыякультурны побыт адаптаваныя праекты, праграмы, практыкі.

На Віцебшчыне – абласныя: агляд-конкурс гісторыка-культурнай спадчыны, фальклору і рэдкіх традыцыйных рамёстваў «Букет Паазер'я»; агляд-конкурс вясельных абрадаў «Вялікая вясельніца»; свята абрадавага фальклору «Купалле Паазер'я»; агляд-конкурс фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Ад прашчураў – да зор» (з 2004 г.); турнір традыцыйных побытавых танцаў у рамках Міжнароднага свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы» (з 2014 г.); турнір беларускіх народных танцаў (з 2017 г.) у рамках Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

На Гомельшчыне – абласныя: конкурс пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» (з 1999 г.); – рэгіянальныя: фестываль гарманістаў «Грай, гармонік» (Ельскі р-н, з 2000 г.); фестываль песеннага мастацтва «Гэты дзіўны спеў з глыбінь народных» на прыз народнага артыста Рэспублікі Беларусь М.П. Дрынеўскага (г.п. Лельчыцы, з 2004 г.); Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» (аг. Ляскавічы, Петрыкаўскі р-н, з 2010 г.); «Каляднае сузор'е фальклору» (г. Светлагорск, з 2016 г.); раённыя: конкурс-фестываль народнай творчасці «Ад прадзедаў спакон вякоў» (Гомельскі р-н, з 2006 г.); свята фальклору «Траецкі карагод на Веткаўшчыне» (г. Ветка, з 2008 г.); свята ткацтва «Кросенцы» (Веткаўскі р-н, з 2013 г.).

На Брэстчыне – абласныя: конкурс пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (1999–2003), з 2004–2013 гг. – фальклорна-этнаграфічнага мастацтва «Радавод» (праекты Л.Р. Бярней і В.Р. Волкавай).

На Гродзеншчыне – абласныя: «Панямонна жыватворныя крыніцы» (з 2007 г.); «Скарбы Гродзеншчыны» (з 2013 г.); «Вяртанне да вытокаў» (з 2013 г.); «Танцуем па-ранейшаму» (з 2017 г.).

На Міншчыне – абласныя: «Фальклорная талака», «Мінская кадрыля» (з 2013 г.), «Гліняны звон», «Траецкі фэст», Саламяныя дзівосы»; рэгіянальныя – «Сугалоссе» (Салігорскі р-н); раённыя: фэст аўтэнтычнай песні «Бабулі» (Любанскі р-н, штогод), «Танцы пад гармонік» (г. Любань, з 2002 г.), свята казачнікаў «Казкі бабулі Аўдулі» (Любанскі р-н, з 2005 г.).

У сталічным мегаполісе – «Ветразь» (конкурс побытавага парнага танца, штогод з 2015 г.), «Згукі мінуўшчыны» (конкурс спеўнага і музычна-інструментальнага выканальніцтва), «Конкурс выканаўцаў народнай прозы» (г. Мінск, абодва з 2018 г.).

Значны ўплыў на этнасвядомасць беларусаў набыла сёння *грамадская ініцыятыва,* сэнс якой у засваенні і пашырэнні культуры беларускага народнага танца: гэта адкрыты конкурс беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск, праект Школы традыцыйнага мастацтва, кіраўнікі – М. Козенка, А. Каліноўская, В. Міхно, з 2013 г.); танцавальная школа «Вераб'іны клуб» (г. Мінск, абласныя цэнтры, г. Полацк, Бабруйск. Праект С. Выскваркі і А. Кухарэнка, з 2014 г.); «Жаніцьба Цярэшкі» (в. Велеўшчына, Цярэшкі Лепельскага р-на. Праект Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, кіраўнікі А. і Н. Глушко, С. Клепікава, В. Дзядовік, з 2001 г.); дударская дыскатэка «Па Крыві без баяна» (г. Мінск, праект В. Калацэя, Т. Пладуновай, Э. Шчадрыной, з 2001 г.); «Танцы ў кавярні «Жар-птушка» (г. Мінск, арганізатар З. Сідаровіч, 2008–2012); «Школка беларускага народнага танца» (г. Гомель, праект М. Тульжанковай, І. Глушэц, П. Цалка, Д. Тарасава, з 2010 г.); «Пятровіца» (Любанскі р-н, праект А. Кухарэнка пры ўдзеле С. Выскваркі, з 2011 г.); «Танцы ў Верхнім горадзе» (г. Мінск, праект танцклуба «Сіта», каардынатар А. Крукоўскі, з 2012 г.); «Свае танцы» (рэгіёны Беларусі. Праект Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, кіраўнік Ц. Акудовіч, з 2015 г.); «Вечарынка: беларускія народныя танцы ў Бабруйску» (г. Бабруйск, праект Ю. Літвінавай, з 2015 г.); «МыЗаТанцы» (г. Барысаў, праект Н. Голавай, з 2016 г.); «Кола» (г. Маладзечна, кіраўнік В. Трубач, з 2016 г.); «Танцы ў Міханавічах» (аг. Міханавічы Мінскага р-на, каардынатар А. Крукоўскі, з 2016 г.); «Танцы Гарадзенскіх Дворыкаў» (г. Гродна, праект А. Бароўскага, з 2017 г.) і інш.

За 20-гадовы перыяд выйшлі звыш тысячы публікацый самых розных жанраў. Пачыналася ўсё з артыкулаў і фотарэпартажаў, прысвечаных творчасці асобных фальклорных калектываў, аўтэнтычных гуртоў, майстроў народнага дэкаратыўна-побытавага мастацтва, мерапрыемстваў заключных тураў фестывалю, якія сістэматычна з'яўляліся на старонках рэспубліканскіх («Культура», «Звязда», «Краязнаўчая газета», «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета», «Голас Радзімы», «Рэспубліка», «Знамя юности», «Чырвоная змена» і інш.), рэгіянальных

і мясцовых («Гомельская праўда», «Мінская праўда», «Гоман Барысаўшчыны», «Чырвоны Кастрычнік» і інш.) СМІ, часопісах «Мастацтва», «Роднае слова», «Мінская школа сёння», «Балет» (Расія).

Каля 150 публікацый прысвечаны творчасці Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага гурту «Берагіня» Мётчанскай установы адукацыі Барысаўскага раёна. У іх ліку навуковыя і навукова-папулярныя выданні «Мядоцкі край і яго таленты», (1997); «Мы – "Берагіня"» (2001); «Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю» (2005); «Асоба ў народнай культуры і педагогіцы» (2016); «Мядоцкая «Берагіня» ў кантэксце нацыянальнай культуры беларусаў» (2017). Трэба адзначыць, што менавіта ў Мётчанскім фальклорным гурце «Берагіня» нараджаліся і адпрацоўваліся інавацыйныя мастацкія мадэлі, якія затым пашыраліся на ўсю краіну ў праектах рэспубліканскага фестывалю з аднайменнай назвай.

Адзін з важных складнікаў фестывальнага праекта – адлюстраванне інтэлектуальнай працы яго ўдзельнікаў – школьнай і працоўнай моладзі, работнікаў адукацыі і культуры, прадстаўленых у дакладах, паведамленнях, сачыненнях, рэфератах, аповедах, вершах і г.д. Лепшыя творы зачытваюцца на навукова-практычных канферэнцыях падчас заключных мерапрыемстаў фестываляў. Як правіла, у канферэнцыях бяруць удзел вучоныя Акадэміі навук Беларусі, супрацоўнікі даследчых інстытутаў, выкладчыкі, аспіранты, магістранты, бакалаўры вышэйшых навучальных устаноў. Такая праца абагульнена ў пяці зборніках «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання» (2001, 2004, 2006, 2008, 2018).

Аналагічныя зборнікі даследчых матэрыялаў, дакладаў і паведамленняў, а таксама навукова-папулярныя працы розных жанраў апублікаваны ў Брэсцкай вобласці («Радавод» /2007/, «Берасцейскі вазок» /2009/, укладальнік абодвух В. Волкава); у Мінскай вобласці – «Беларускі танцавальны фальклор. Методыка працы з дзіцячым факльклорным калектывам» (2015), «Казка з быллю напалову. Казкі, легенды і паданні Любаншчыны» (2017), фотаальбомы «Маляваныя сны Паўла Марціновіча» (аб творчасці самадзейнага мастака з Любаншчыны (2010), «Любаншчына традыцыйная» (2017, аўтар і ўкладальнік С. Выскварка); серыі аўдыядыскаў з запісамі фальклору Любаншчыны «З праку веку» (2011).

Да кожнага з заключных тураў I – IX фестываляў выдаваліся даведнікі энцыклапедычнага характару. Гэтак жа і юбілейная «Берагіня–2018» метадычна забяспечана даведнікам «Берагіня». X Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва», а таксама выданнямі «Рупліўцы на ніве фестывальнага фальклорнага руху "Берагіня"», бібліяграфічны ўказальнік «Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня"» (укл. А.А. Чуева), «Народная проза Акцябршчыны» (укл. А.М. Боганева); «"Берагіня" паэтычная» (укл. А.Я. Старыновіч).

Шэраг буйных публікацый прысвечаны творчасці дзеячаў культуры, навукі, педагогікі – руплівцам на ніве фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня» Т.Б. Варфаламеевай («Працяг будзе», 2004); А.А. Абрамовіч («Dum spiro spero – Пакуль жыву, спадзяюся», 2007); У.А. Гілепу («Зроднены з культурай», 2008); У.М. Конану («Погляд у вечнасць», 2009); М.А. Козенку («Хто, калі не я...», 2011);

М.Р. Дудчанку («Неўтаймаваны», 2015); М.В. Снітко і фальклорнаму калектыву пад яе кіраўніцтвам «Мілавіца» («Дабром адгукнецца», 2017).

Неаднойчы было сцверджана: гісторыю робяць асобы. Так і ў нашым выпадку. За фестывальнымі падзеямі – ад фарміравання ідэі да распрацоўкі канцэпцыі і рэалізацыі шырокага спектра рознаўзроўневых этнафальклорных практык на працягу жыццядзейнасці «Берагіні» – стаяць тысячы асоб, удзячнасць якім не мае межаў. Гэта навукоўцы Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры – галоўнага каардынатара праекта, спецыялісты абласных і раённых метадычных цэнтраў культуры, дамоў народнай творчасці і дамоў рамёстваў, творчыя калектывы, іх лідары і ўдзельнікі, носьбіты мастацкіх традыцый. У кагорце рупліцаў на ніве традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў – знаныя навукоўцы, выкладчыкі навучальных устаноў, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы. Так, Павел Латушка, былы Міністр культуры, які нават будучы Паслом у Рэспубліцы Францыя і прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у ЮНЕСКА, надаваў вялікую ўвагу фестывалю «Берагіня» і ў розных формах яго падтрымліваў; Уладзімір Шчасны, старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, дзякуючы якому «Берагіня» выйшла на міжнародную арбіту і праводзіцца пад патранатам ЮНЕСКА; Тадэуш Стружэцкі, былы намеснік Міністра культуры, стаяў ля вытокаў гэтага фестывалю; разам з Уладзімірам Гілепам, старшынёй Беларускага фонду культуры і галоўным рэдактарам «Краязнаўчай газеты», яны на працягу нялёгкага шляху «Берагіні» рупіліся не толькі аб існаванні, але і творчым развіцці з'явы нацыянальнай культуры. Цяжка пераацаніць значнасць дзейнасці аднаго з арганізатараў і нязменнага дырэктара фестывалю Святланы Беразоўскай, на плячах якой апынуўся ўвесь цяжар комплексных фестывальных праблем рэспубліканскага маштабу. Але дзякуючы Акцябрскаму райвыканкаму і прафесіяналізму яго кіраўнікоў, падтрымцы Міністэрства культуры, Гомельскага аблвыканкама, Беларускага фонда культуры Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» працягвае жыць на славутай Рудабельшчыне і мае далейшыя перспектывы развіцця.

Падсумоўваючы сказанае, паўторым пытанне, зададзенае ў пачатку артыкула: «20 год Рэспубліканскаму фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня” – ці багата гэта часу?» Калі меркаваць па тым, што́ за гэты перыяд зроблена, то юнацтва «Берагіні» ўвабрала ў сябе столькі яскравых і неардынарных падзей, што іх з лішкам хапіла б не на адно паўнавартаснае жыццё. І ў гэтым сэнсе 20 год – багата. Калі ж уявіць, колькі яшчэ закладзена ў фестывалі патэнцыяльных магчымасцей, пакуль што не рэалізаваных, колькі творчых задум яшчэ чакаюць свайго ўвасаблення, дык 20 год – гэта, вядома, мала. Бясспрэчна толькі адно – фестываль аказаўся не проста патрэбным. На яго аснове вырас шырокі фальклорны рух, які аб'яднаў людзей розных узростаў, сацыяльных груп і прафесій, стаў рухам павагі і любові да традыцыйнай культуры свайго народа. І гэта лепшы доказ неўміручасці каранёвай культуры беларусаў, надзея на яе шчаслівы гістарычны лёс.

***Мікола Козенка***

# Арганізатары



***БАГДАНОВІЧ Васіль Рыгоравіч***

*(1939–2017)*

*Хормайстар, работнік культуры, метадыст, народны музы́ка.*

Нарадзіўся 25.06.1939 г. у в. Багдановічы Кармянскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў Гомельскае музычнае вучылішча імя Н.Ф. Сакалоўскага па спецыяльнасці «артыст ансамбля», «настаўнік спеваў» (1968).

У 1968–1976 гг. працаваў у Чачэрскім аддзеле культуры, у 1976–1983 гг. – метадыстам Гомельскага абласнога дома народнай творчасці, з 1983 г. – дырэктар Акцябрскага раённага дома культуры, з 1993 г. – вядучы спецыяліст па вакальна-харавому жанру Акцябрскага раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра.

У 1998–2016 гг. з'яўляўся ўдзельнікам народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская пацеха», кіраўніком хору работнікаў культуры раёна, хору ветэранаў «Спадчына» (з 2015 г. – «народны») дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу».

Васіль Рыгоравіч выступаў у канцэртных праграмах і як саліст. У яго рэпертуары было шмат песень беларускіх і рускіх кампазітараў, народных жартаў. Яго выступленні заўсёды вельмі цёпла ўспрымаліся гледачамі, як у раённым цэнтры, так і ў сельскай мясцовасці. З такой жа павагай і цеплынёй ставіўся да сваіх гледачоў і Васіль Рыгоравіч. Заўсёды гаварыў: «Калі ў зале будзе хоць адзін глядач, будзем спяваць для яго».

Працуючы метадыстам раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра, вывучаў народную спадчыну, быў асабіста знаёмы з носьбітамі мастацкіх традыцый раёна – музы́камі, спевакамі, народнымі майстрамі. Назапашаныя матэрыялы леглі ў аснову шэрага публікацый, сярод якіх артыкулы «Народны касцюм» (аб народным строі Акцябрскага р-на), «Мерыдыяны родных мясцін» (у суаўтарстве) («Берагіня». Першы фестываль фальклорнага мастацтва. Мінск, 1999); «Песні свят народнага календара Рудабельшчыны» («Берагіня». Чацвёрты Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва. Мінск, 2006); «З глыбінь жыватворных» (пра А.І. Яфрэмаву, носьбітку мастацкіх традыцый з в. Новая Дуброва Акцябрскага р-на) // Ты дуброва, ты зялёная (Раённы аргангізацыйна-метадычны цэнтр, 2005).

Васіль Рыгоравіч працаваў з народнымі музы́камі раёна, рыхтаваў гарманістаў для выступлення на рэгіянальных і абласных мерапрыемствах. Неаднаразова калектыў вяртаўся з перамогамі.

На працягу ўсіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016) Васіль Рыгоравіч уваходзіў у групу музычнага суправаджэння конкурсу танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў, задаваў танцорам рытм на бубне.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у развіццё беларускай культуры (1997).



**_БАЕВА Ядвіга Іванаўна_**

*Педагог, арганізатар адукацыі і культурнай дзейнасці ў Палатоўскім мікрарэгіёне, грамадскі дзеяч.*

Нарадзілася 15.07.1954 г. у в. Каты Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыла Віцебскі педагічны інстытут імя С.М. Кірава па спецыяльнасці «матэматыка» (1978).

З 1977 г. па цяперашні час працуе ў дзяржаўнай установе адукацыі «Палатоўская дзіцячы сад-сярэдняя школа Полацкага раёна»: спачатку старшай піянерважатай, потым намеснікам дырэктара, з 1996 г. па 2014 г. – дырэктарам, з 2015 г. па цяперашні час – настаўнікам матэматыкі.

Ініцыіравала дзеючую мадэль школы, як сродка ўзнаўлення фальклору і этнізацыі асобы, якая дае рэальныя магчымасці для выхавання чалавека з глыбокай базавай і этнамастацкай адукацыяй, з навыкамі нацыянальнай па форме и зместу стваральнай дзейнасці. З 2001 г. у школе паспяхова рэалізуецца ўнікальны праект «Музейная педагогіка», распрацаваны Ядвігай Іванаўнай. За гэты час створаны цэласны педагагічны працэс, заснаваны на інтэграцыі ідэй «Этнашколы» і развіваючых педагагічных тэхналогій. Школьнае адукацыйнае асяроддзе папоўнілі: музей каляндарна-абрадавых традыцый беларусаў, якому ў 2016 г. прысвоены статус «народны»; музей пад адкрытым небам «Народныя промыслы Беларусі», які ўключае дзейнічую школьную пасеку; экспазіцыю «Сялянскае падвор'е».

У 2003 г. створаны фальклорны калектыў «Знічка» (кіраўнік Лідзія Захарэўская), які ў 2008 г. атрымаў званне «узорны» (падцвердзіў яго ў 2011, 2014, 2017 гг.). Калектыў вядомы далёка за межамі раёна. Яго ўдзельнікі неаднаразова станавіліся лаўрэатамі абласнога агляду-конкурсу фальклорнага мастацтва «Ад прашчураў – да зор», прызёрамі рэспубліканскага конкурсу сацыяльных праектаў «Мая сям'я – мой гонар», «Мой радавод – мая сям'я» (2013, 2014), пераможцамі ў абласных спаборніцтвах турыстычных паходаў «Пазнай Радзіму – выхавай сябе» (2012), атрымалі 2-е месца ў абласным інтэрнэт-конкурсе «Любі чужое аж да захаплення, шануй сваё да самазабыцця». Дзеці з фальклорнага калектыву выдзяляюцца тым, што ім заўсёды цікава разам, яны дружныя, няздольныя на зло, жорсткасць, шмат часу аддаюць даследчай дзейнасці. Удзельнікі фальклорнага калектыву тройчы (2010, 2012, 2016) абаранялі гонар Віцебшчыны на Рэспубліканскім фестывалі

фальклорнага мастацтва «Берагіня» і станавіліся пераможцамі і прызёрамі за перайманне і захаванне традыцый мастацкай культуры свайго краю; узнагароджаны дыпломам ЮНЕСКА «За захаванне header нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў» (2012).

Па ініцыятыве Я.І. Баевай, сталі ўжо традыцыйнымі народныя святы Каляды, Стрэчанне, Саракі, Вялікдзень, Юр'я, Зялёныя Святкі, Купалле, Багач, Пакровы, Дзяды, якія штогадова праводзяцца для жыхароў школьнікаў мікрараёна ўдзельнікамі калектыву «Знічка»; арганізуюцца выстаўкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (выцінанка, вырабы з гліны, лазы, саломкі; вышыўка, пляценне паясоў, разьба па дрэве).

Я.І. Баева вялікую ўвагу надае захаванню матэрыялаў ад носьбітаў фальклорнай спадчыны, папулярызацыі традыцый народнага мастацтва (канцэртная дзейнасць, правядзенне свят, абрадаў, заняткі салома- і лозапляценнем, вышыўкай, выцінанкай, пляценнем паясоў), прыцягненню навучэнцаў да традыцый народнага мастацтва, арганізацыі экспедыцыйнай і даследчай дзейнасці. Даследчыя працы навучэнцаў адзначаны дыпломамі на розных узроўнях: «Паданні Палатоўскага краю», «Прадметы побыту беларуса», «Ручнік у побыце беларуса», «Роля асобы ў сямейным выхаванні», «Народная проза ў школьным адукацыйным працэсе» і інш. – на краязнаўчых чытаннях «Спадчына Полацкай зямлі», абласным конкурсе «Таямніцы малой радзімы», Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучання, успрымання» (2010–2017).

Вялікую дапамогу ў арганізацыі творчай дзейнасці ў сферы традыцыйнай культуры да 2008 г. аказваў прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў І.І. Сучкоў. З 2008 г. такую работу ўзначальвае вядомы этнахарэолаг, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва М.А. Козенка.

Удалай формай навукова-метадычнага суправаджэння інавацыйнай дзейнасці ў школе можна лічыць арганізацыю Я.І. Баевай пастаянна дзеючага семінара «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання». Актуальнымі для ўдзельнікаў інавацыйнага працэса з’яўляюцца тэмы «Праблемы выкарыстання фальклору як сродку адукацыі ў сучаснай школе», «Інфармацыйна-метадычнае суправаджэнне працэса арганізацыі інавацыйнага праекта “Ад вытокаў – у будучыню: стан і праблемы”», «Выкарыстанне фальклорных матэрыялаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры», «Месца і роля традыцыйнай духоўнай спадчыны на ўроках роднай мовы і літаратуры ў пачатковых класах», «Далучэнне дзяцей да мясцовай традыцыйнай культуры», практыкум па вызначэнню паспяховасці інавацыйнай работы і інш.

Я.І. Баева дзеліцца вопытам упраўленчай дзейнасці са шматлікімі калегамі не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Латвіі, Германіі.

Ядвіга Іванаўна неаднаразова выбіралася дэпутатам мясцовага, раённага Саветаў дэпутатаў. У 2010 г. уваходзіла ў склад дэлегацыі на IV Усебеларускі народны сход ад Полацкай раённай сістэмы адукацыі.

За плённую працу, дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення Я.І. Баева ўзнагароджана шматлікімі дыпломамі, граматамі раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў; юбілейным медалём «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» (2004); двойчы (2004, 2009) занесена на раённую Дошку Гонару; у «Кнігу Славы адукацыі Полацкага раёна» (2012); узнагароджана дыпломам і ордэнам «Пашана і слава» Героя Міжнароднай энцыклапедыі «Лепшыя людзі» ў намінацыі «Адукацыя» за высокае прафесійнае майстэрства і самаадданую працу на карысць Беларусі (2012).



### *БЕЛІКАЎ Аляксандр Васільевіч*

*Мастак, работнік культуры.*

Нарадзіўся 19.08.1965 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыў Бабруйскі лесатэхнічны каледж па спецыяльнасці «тэхнік-тэхнолаг, прадпрымальнік» (2010).

У сям'і Аляксандра Васільевіча майстравалі бацька і брат. Ад іх ён навучыўся разьбе па дрэву, выпільванню, такарнай справе і маляванню.

З 1982 г. працаваў мастаком, з 1999 г. – загадчыкам мастацка-афарміцельскай майстэрні Акцябрскага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі. З 2013 г. – дырэктар Акцябрскага заапарка.

З'яўляецца мастаком галоўных раённых фестываляў і свят.

Аўтар і кіраўнік шматлікіх экспазіцый Акцябрскага раённага цэнтра гісторыі і культуры «З часоў былых», «Рудабелка партызанская», «Беларуская хата традыцыямі багата», «Зала пасяджэнняў», дэкор фае і лесвіцы на другі паверх музея, дэкаравана вінтавая лесвіца на дах музея (1993–1997). У свет рамяства, створаным гэтым майстрам, уваходзіш лёгка і радасна, таму што працы яго самабытныя і цікавыя.

На першых чатырох фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2005) быў галоўным мастаком па афармленню канцэртных пляцовак заключных імпрэз і падворкаў «Рудабельскага кірмашу», на наступных прымаў удзел у мастацкім афармленні пляцовак «Рудабельскага Купалля», рэкламных банэраў і афіш. Кожная новая работа Аляксандра Васільевіча вызначаецца арыгінальнасцю і прадуманасцю стылістыкі.

Аляксандр Васільевіч займаецца пытаннямі аднаўлення, пераемнасці, папулярызацыі і распаўсюджвання традыцыйных мясцовых рамёстваў. Ён перакананы, што дэкаратыўна-прыкладная творчасць патрэбна чалавеку, калі яму добра і калі кепска. Інакш кажучы, патрэбна заўжды.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (1999–2017).



**_БЕРАЗОЎСКАЯ Святлана Анатольеўна_**

*Дзеяч культуры, рэжысёр, сцэнарыст.*

Нарадзілася 10.03.1961 г. у г. Назарава Краснаярскага краю.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры (1979), Ленінградскі дзяржаўны інстытут культуры імя Н.К. Крупскай (1985).

З 1979 г. працавала ва ўстановах культуры Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці (Ламавічскі СДК, Акцябрскі РДК); у 1988 г. узначаліла аддзел культуры Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта. З 2013 г. працуе начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта.

Асноўны кірунак яе дзейнасці – захаванне, зберажэнне і развіццё рэгіянальнай культуры, рост творчых дасягненняў раёна, развіццё мастацка-эстэтычнага густу насельніцтва.

Пад яе кіраўніцтвам распрацаваны раённыя праграмы «Жывая памяць» (1990), «Культура і дзеці» (1993), «Рамёствы Акцябршчыны» (1998), у якіх прадугледжаны паслядоўны, абгрунтаваны комплекс мер па ахове і падтрымцы народнага мастацтва.

Па яе ініцыятыве створаны першы ў Гомельскай вобласці арганізацыйна-метадычны цэнтр аддзела культуры (1990), адкрыты ўстановы культуры новага тыпу: сельскія дамы народнай творчасці (1992 ), цэнтр гісторыі і культуры (1995), раённы дом рамёстваў (1998), музычная школа рэарганізавана ў школу мастацтваў (1998), моладзёжна-аздараўленчы цэнтр (Акцябрскі, 2003), культурна-забаўляльны комплекс «Бубнаўка» (2008).

Па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам С.А. Беразоўскай, з удзелам вядучых навукоўцаў рэспублікі ў раёне была распачата работа па даследаванню традыцыйнай культуры, далучэнню розных катэгорый насельніцтва да яе зберажэння і развіцця. Падчас этнаграфічных экспедыцый вывучалася абрадавая, танцавальная, песенная, рамесная творчасць, створаны картатэкі носьбітаў народных традыцый, аўдыя-, фота- і відэаархівы народных свят, абрадаў, рамёстваў. Сабраныя матэрыялы актыўна выкарыстоўваюцца кіраўнікамі мастацкіх калектываў устаноў культуры і адукацыі, асабліва ў час падрыхтоўкі да фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Эфектыўна вырашае пытанні па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры раёна, павышэнню прафесійнага ўзроўню кадравага складу. Стварае ўмовы для кар'ернага росту таленавітых маладых спецыялістаў, эфектыўна вырашае праблемы рэалізацыі маладзёжнай палітыкі. Усе работнікі культуры раёна маюць магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю, некаторыя былыя ўдзельнікі калектываў мастацкай творчасці скончылі аспірантуру, уваходзяць у склад творчых саюзаў вобласці і рэспублікі.

Яна – ініцыятар, аўтар сцэнарыяў і рэжысёр-пастаноўшчык шматлікіх раённых традыцыйных свят, масавых мерапрыемстваў, святочных канцэртаў. У іх ліку: фестываль-свята дзіцячай творчасці «Бабулін куфэрак» (1990), краязнаўча-экалагічнае турнэ «Над ракой Арэсай» (1997–2003), раённае свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі» (2011–2016), рэгіянальны фестываль «Палескі трохкутнік» (2003–2010) і інш.

На працягу 20-ці гадоў (з 1998 г.) з'яўляецца нязменным дырэктарам Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», каардынуючы работу больш за 50 груп, якія забяспечваюць правядзенне ўсіх мерапрыемстваў. Сярод іх: групы метадычнага, фінансавага, рэкламна-інфармацыйнага, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, а таксама групы арганізацыі фестывальных мерапрыемстваў (конкурсы, турніры, выстаўкі-кірмашы народнага мастацтва, рэспубліканскае свята «Купалле», навукова-практычныя канфернцыі, «круглыя сталы», прэс-канферэнцыі і г.д.), пражывання, харчавання, медыцынскага абслугоўвання, арганізацыі работы штаба і інш. Паспяхова вырашае рэалізацыю выдавецкіх праектаў (даведнікі, праграмкі, дыпломы, матэрыялы навукова-практычных канферэнцый, даследчыя працы і г.д.).

За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё культурна-асветніцкай дзейнасці, вялікую работу па прапагандзе беларускай народнай спадчыны і нацыянальнай культуры С.А. Беразоўская ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1998, 1999), нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2006), дыпломам ЮНЕСКА (2010), падзякай Міністра культуры Рэспублікі Беларусь (2011), Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2012), Ганаровым знакам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму (2017), Ганаровым знакам Беларускага фонду культуры «Руплівцу. Стваральніку» (2018).



***БЕРАЗОЎСКАЯ Таццяна Анатольеўна***

*Работнік культуры, педагог, арганізатар пачатковай харэаграфічнай адукацыі ў Акцябрскім раёне.*

Нарадзілася 16.01.1981 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «харэаграфічнае мастацтва» (2002), Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць» (2012).

У 2002 г. працавала метадыстам па харэаграфіі ў метадычным цэнтры аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама. Выязджала з экспедыцыямі ў вёскі раёна, збірала танцавальны, песенны, інструментальны фальклор, народную прозу.

З 2003 г. – настаўнік харэаграфіі, з 2012 г. – дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі». Надае вялікую ўвагу далучэнню навучэнцаў школы мастацтваў да танцавальнага фольклору, вывучэнню імі розных форм народнай мясцовай харэаграфіі.

У 2002 г. у в. Парэчча арганізавала танцавальны калектыў, у гэтым жа годзе на Гомельскім абласным аглядзе аматарскай творчасці калектыў быў уганараваны дыпломам III ступені.

У 2008 г. стварыла фальклорны калектыў «Праменьчыкі», у 2013 г. яму нададзена найменне «ўзорны аматарскі калектыў». У 2010 г. калектыў «Праменьчыкі» пад патранатам Т.А. Беразоўскай стаў пераможцам у намінацыі «Канцэртная праграма» IV Рэспубліканскага турніру дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», а танцавальная пара ўганаравана дыпломам лаўрэата III ступені.

Падчас правядзення заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ўваходзіла ў арганізацыйную групу Дырэкцыі фестывалю. Удзельнічала ў падрыхтоўцы сцэнарыяў шэрага фестывальных мерапрыемстваў, арганізацыі конкурсаў танцавальных пар у рознаўзроставых групах, забяспечвала падрыхтоўку і ўдзел фальклорнага калектыву «Праменьчыкі» дзіцячай школы мастацтваў у праектах фестывалю «Берагіня».

Т.А. Беразоўская з’яўляецца ўкладальнікам буклета «Танцавальны фальклор Рудабельшчыны» (2002).

Узнагароджана Ганаровай граматай аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама за добрасумленную працу, творчы падыход, ініцыятыву і актыўнасць, удзел у культурным жыцці раёна (па выніках работы за 2008, 2009 гг.); дыпломамі за падрыхтоўку калектыву «Праменьчыкі» да ўдзелу ў IV Рэспубліканскім турніры

дзіцяча-маладзёжных фальклорных калектываў (2010) і пар у конкурсе беларускіх народных танцаў на VI Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня–2010»; Ганаровай граматай за захаванне фальклорных традыцый роднай зямлі і рэалізацыю праекта «Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня”» (2010); Ганаровай граматай за прафесіяналізм у арганізацыі і правядзенні заключных мерапрыемстваў VII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012); дыпломам лаўрэата раённага конкурсу творчай моладзі «Ступені» ў галіне культуры і народнай творчасці (2010); граматай Акцябрскага раённага аб’яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі – за садзейнічанне развіццю калектыўна-дагаворных адносін, сацыяльнага партнёрства, стварэнне ўмоў для творчай працы, адпачынку і ўмацавання здароўя работнікаў галіны культуры (2016); Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама – за шматгадовую працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах (2017).



**_БЯРНЕЙ Людміла Рыгораўна_**

*Харэограф, педагог, рэжысёр, сцэнарыст, метадыст.*

Нарадзілася 26. 10. 1953 г. у в. Падбрадзяны Першыя Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыла Магілёўскае культурна-асветнае вучылішча (1973), Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «рэжысёр свят і абрадаў» (1980).

Працавала кіраўніком танцавальнага калектыву, харэографам, метадыстам мастацкай творчасці ў Пружанскім РДК (з 1975 г.). Пасля заканчэння Мінскага інстытута культуры працавала на пасадзе галоўнага балетмайстра, загадчыка аддзела мастацкай творчасці, дырэктара Брэсцкага абласнога цэнтра народнай творчасці (1980–2011).

З 1973 г. сістэматычна арганізоўвала і праводзіла мерапрыемствы, накіраваныя на развіццё аматарскага харэаграфічнага мастацтва ва ўстановах культуры і адукацыі вобласці. Ёю распрацаваны праграмы абласных семінараў-практыкумаў, стажыровак, навукова-практычных канферэнцый, а таксам майстар-класаў: «Харэаграфічная культура сёння» (1999); «Рэгіянальнае танцавальнае кола Брэстчыны» (2000); «Танец – пластычны від мастацтва» (2002); «Акцёрскае майстэрства ў дзіцячым тэатральным калектыве» (2011); «Сучасная харэаграфія» (2013).

Распрацавала і ўкараніла ў практыку Міжнародны фестывальны праект «Палескі карагод» (2001), абласныя праекты «Рытмы маладосці» (1983), «Талакуха на Бярэсці» (2001), «Кветачкі Драгчыншчыны» (2011).

Дзякуючы яе мэтанакіраванай метадычнай дзейнасці вывучаны і абагульнены вопыт работы лепшых харэаграфічных калектываў вобласці: «Мір Лялек» (к-ў «Лялькі» п/к А.Л. Івановіч, г. Баранавічы), «Юнацкія гісторыі» (к-ў «Юнацтва» п/к Э. П. Чарняўскага, г. Баранавічы), «Самародак Палесся» (к-ў «Палессе» п/к І.Г. Смірнова, г. Пінск), «Шчыры шлях» (к-ў «Ліпнікі» в. Ліпнікі Драгічынскага р-на), «Ад традыцый да сучаснасці» (метадычныя рэкамендацыі ў дапамогу харэографу). Аўтар артыкула «Багаты Божы дар» у кнізе «Хто, калі не я», прысвечанай М.А. Козенку (Мінск, 2011).

Для слухачоў ДУА «Брэсцкі абласны інстытут развіцця адукацыі» і абласных курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры прачытала цыкл лекцый («Стан і развіццё харэаграфічнага мастацтва Брэстчыны»; «Танец і час»; «Народнасцэнічны танец у дзіцячым калектыве»; «Захаванне і выкарыстанне танцавальнай спадчыны»).

Пачынаючы з 1998 г. рыхтавала дзіцячыя фальклорныя і харэаграфічныя калектывы, танцавальныя пары, салістаў на Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня»; аказвала метадычную і практычную дапамогу фальклорным гуртам у падрыхтоўцы праграм на міжнародныя фестывалі, конкурсы (Украіна, Польшча). Арганізавала і плённа ажыццявіла на Брэстчыне рэспубліканскі эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці» (2001–2003), які грунтаваўся на фестывальных «берагінскіх» прынцыпах: выяўленне, аднаўленне, пераемнасці, распаўсюджванне і папулярызацыі традыцыйных відаў і жанраў народнага мастацтва малой радзімы.

У якасці рэжысёра-пастаноўшчыка, балетмайстра і сцэнарыста арганізоўвала дзіцячыя музычныя фестывалі ў г. Брэсце, Баранавічах, Лунінцы, Пінску.

З’яўляецца пастаянным членам рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі па прысваенню і пацвярджэнню звання калектываў «узорны», «народны», «заслужаны», членам журы гарадскіх конкурсаў «Пеўнік», «Ступені», «Крылы», абласных фестываляў «Арт вакацыі», «Здравствуй, мир!»

У цяперашні час (з 2011 г.) з’яўляецца кіраўніком харэаграфічнай групы народнай тэатральнай студыі «Слова» Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і выкладчыкам школы танца «Натхненне» ДУ «Інстытут трэцяга ўзросту» (г. Брэст).

Узнагароджана знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры» (1998).



***ВОЛКАВА Вера Рыгораўна***

*Рэжысёр, сцэнарыст, педагог.*

Нарадзілася 01.01.1951 г. у в. Падбрадзяны Першыя Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыла Мінскі інстытут культуры (1975).

З 1980 г. – кіраўнік народнага аматарскага літаратурна-паэтычнага аб'яднання «Спадчына» ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці».

Сваю творчую дзейнасць праводзіць згодна з ўласна распрацаванай аўтарскай праграмай, на аснове якой створана сістэма, што забяспечвае высокую якасць падрыхтоўкі, фарміраванне эстэтычнага густу і развіццё творчага патэнцыялу навучэнцаў.

На занятках надае вялікую ўвагу апрацоўцы аўтарскіх літаратурных твораў, вылучэнню талентаў навучэнцаў, далучэнню іх да скарбаў нацыянальнай і агульначалавечай культуры.

Майстэрства, багаты творчы вопыт і выдатны густ педагога забяспечвае высокі ўзровень творчых работ удзельнікаў аб'яднання. Вынік гэтага – 36 выдадзеных зборнікаў юных творцаў, падрыхтаваных у аб'яднанні «Спадчына»: «На шляху да зор», «Роздум» і інш.

Пачынаючы з 1998 г., у рамках праекта «Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня"», арганізоўвае фальклорныя экспедыцыі, да якіх далучыла шматлікіх аматараў фальклору ў рэгіёнах Брэсцкай вобласці: настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, кіраўнікоў танцавальных калектываў, а таксама клубы ЮНЕСКА вобласці: «Спадчына» (Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці), «Погляд» (г. Іванава), «Гагарынец» (г. Маларыта). Па выніках даследавання мясцовай культурнай спадчыны ў 2005 г. арганізавала і правяла Першую абласную навукова-практычную канферэнцыю па фальклору, удзельнікамі якой былі школьнікі, навучэнцы ўстаноў адукацыі і настаўнікі вобласці. Да канферэнцыі пад яе кіраўніцтвам выдадзены зборнік «Часоў былых і новых сувязь».

У 2004 г. ініцыіравала і каардынавала правядзенне Першага адкрытага абласнога фестывалю народнай творчасці, які набыў сваю ўласную назву «Радавод».

У II фестывалі «Радавод» (2006) прынялі ўдзел 11 630 навучэнцаў. Вынікі экспедыцыйных пошукаў – 35 старадаўніх баек, 12 паданняў, 6 новых побытавых танцаў; выяўлены лакальныя варыянты этнічных касцюмаў (больш за 100 адзінак), дзякуючы чаму пераважная большасць удзельнікаў была апранута ў строі сваёй мясцовасці.

III фестываль «Радавод» (2008) аб'яднаў 18 тысяч вучняў школ і навучэнцаў установ дадатковай адукацыі. У заключных імпрэзах дэманстравалі свае таленты 1742 чалавекі.

Удзельнікамі заключных мерапрыемстваў IV фестывалю (2011) былі больш за 1200 дзяцей і моладзі вобласці і замежных краін: Польшчы, Украіны, Харватыі, Расіі.

У заключным туры V фестывалю «Радавод» (2013) прынялі ўдзел больш за 1500 дзяцей і 184 фальклорных калектываў. Другі дзень фестывалю быў прысвечаны конкурсу танцавальных пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў.

У рамках кожнага фестывалю прайшлі навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя праблемам этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі на аснове фальклорнай спадчыны Брэстчыны; па выніках фестываляў і экспедыцыйных даследаванняў выйшлі зборнікі «Берасцейская сцяжынка», «Берасцейскі вазок», «Роздум».

Вера Рыгораўна Волкава ўзнагароджана граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, УА «Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладёжнай творчасці».



***ВЫРВІЧ Людміла Васільеўна***

*Педагог, работнік культуры, публіцыст.*

Нарадзілася 02.08.1962 г. у в. Новая Дуброва Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага па спецыяльнасці «беларуская мова і літаратура» (1984).

З 1984 г. па 2012 г. працавала настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 1 імя А.Р. Салаўя г.п. Акцябрскі. Была кіраўніком (1993–2012) школьнага гуртка «Спадчына», дзейнасць якога мела скіраванасць на далучэнне вучняў да традыцыйнай спадчыны краю, развіццё сцэнічнага майстэрства школьнікаў праз аргнізацыю пастановак як фальклорнага кірунку, так і па творах беларускіх класікаў. Займалася пытаннямі даследавання тэорыі і практыкі маральнага выхавання школьнікаў. Аўтар артыкула «Беларускія прыказкі і прымаўкі як важны сродак маральнага выхавання ў народнай педагогіцы» (увайшоў у зборнік навуковых прац: «Человек. Мораль. Общество» (г. Мазыр, 2001). Пераможца раённага этапу конкурсу прафесійнага майстэрства «Настаўнік года–2003».

Вучні пад кіраўніцтвам Л.В. Вырвіч з’яўляліся пераможцамі абласных і рэспубліканскіх алімпіяд па беларускай мове (1995–2010). Каля 20 чалавек выбралі прафесію настаўніка беларускай мовы і літаратуры. Адна з былых вучаніц і пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд сёння выкладае беларускую мову і літаратуру ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.

З 2012 г. – загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Акцябрскай раённай бібліятэкі. Аказвае метадычную і практычную дапамогу ў арганізацыі бібліятэчных праектаў па захаванню і распаўсюджванню народнай спадчыны.

З 2015 г. працуе метадыстам дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна». У рамках правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» праводзіць інфармацыйна-рэкламную работу ў раённых, абласных і рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі (газеты, радыё, тэлебачанне). На першым фестывалі «Берагіня» (1999) была вядучай агляду фальклорных калектываў, конкурсу танцавальных пар, іншых мерапрыемстваў; уваходзіла ў склад рабочых груп Дырэкцыі фестываляў (1999–2018).

Узнагароджана Ганаровымі граматамі Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2004), граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі (2014, 2016, 2017).



**_ВЫСКВАРКА Сяргей Георгіевіч_**

*Фалькларыст, этнограф, педагог, метадыст, сцэнарыст, рэжысёр, арганізатар сацыякультурнай дзейнасці і фальклорнага руху на Любаншчыне, даследчык традыцыйнай культуры.*

Нарадзіўся 11.07.1971 г. у в. Пласток Любанскага р-на Мінскай вобл.

Скончыў факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага ўніверсітэта культуры (2004).

Працаваў у дамах культуры Любаншчыны (з 1991 г.). З 1999 г. – спецыяліст па фальклору і этнаграфіі Любанскага раённага цэнтра культуры, мастацкі кіраўнік Любанскага ўзорнага фальклорнага ансамбля «Верабейкі» (створаны ў 1993 г.). Цяпер працуе загадчыкам аддзела арганізацыйна-метадычнай работы ДУК «Любанскі раённы цэнтр культуры». Пад кіраўніцтвам С.Г. Выскваркі працуюць створаныя ім дзіцячы фальклорны гурт «Жэўжык» (2000), дарослы фальклорны гурт «Напарачка» (2012) і народны гурт народнага гумару «Смехаўё» (2008).

Даследуе традыцыйную народную культуру Любаншчыны: запісаў звыш за 800 народных песень, 105 традыцыйных мясцовых танцаў (сярод якіх такія рэдкія творы, як «Войра карагодам», «Каваля», «Кадрыля на пяць штоф»), больш за 15 карагодаў і народных гульняў. Ім створаны фальклорна-этнаграфічны архіў пры Любанскім раённым цэнтры культуры, які налічвае звыш за 3000 адзінак захавання. Рэканструяваў традыцыйныя «Гасцявыя кірмашы», абрад «Спальванне русалкі», свята «Пятрок». Штогод на Любаншчыне, дзякуючы працы Сяргея Георгіевіча, праходзяць рэгіянальныя народныя святы: «Масленка», «Гуканне вясны», «Юрай», «Тройца», «Русальная нядзелька», «Макавей», створаныя на мясцовым фальклорным матэрыяле.

Аўтар шэрага публікацый, прысвечаных традыцыйным танцам і фальклору ў цэлым. Сярод іх: «Танцавальны фальклор у традыцыйным вяселлі Любаншчыны» (2001); «Спецыфіка танцавальнага фальклору Любаншчыны»; «Да пытання захавання і развіцця рэгіянальнай мастацкай культуры»; «Комплекснае даследаванне фальклорна-этнаграфічных традыцый Любаншчыны» (усе 2003 г.); «Са вузлоў памяці. Традыцыйнае адзенне Любаншчыны»; «Вясновыя сваткаванні на Любаншчыне»; «Асаблівасці галаўных убораў любанчан». З дакладамі выступае на навуковых форумах у Беларусі і Літве.

З’яўляецца аўтарам пяці навукова-папулярных выданняў: «Беларускі танцавальны фальклор. Методыка працы з дзіцячым факльклорным калектывам»

(2015); «Казка з быллю напалову. Казкі, легенды і паданні Любаншчыны» (2017); «Маляваныя сны Паўла Марціновіча» – фотаальбом аб творчасці самадзейнага мастака з Любаншчыны (2010); «Любаншчына традыцыйная» – фотаальбом фальклорных традыцый Любаншчыны (2017); серыі аўдыядыскаў з запісамі фальклору Любаншчыны «З праку веку» (2011)

На працягу многіх гадоў ладзіць майстар-класы па традыцыйных беларускіх танцах у розных рэгіёнах Беларусі: абласных цэнтрах, г. Салігорск, Бабруйск, Полацк, Слуцк, Старыя Дарогі. У Мінску некалькі гадоў запар пад яго кіраўніцтвам працаваў танцавальны клуб. У 2016–2017 гг. праводзіў майстар-класы ў беларускіх суполках у Расіі, Літве, Польшчы, Эстоніі. З'яўляецца куратарам летняй маладзёжнай школы традыцыйных танцаў «Пятровіца» (арг. Н. Кухарэнка). Школа працуе на працягу сямі год і яе навучэнцамі штогод становяцца каля сямідзесяці маладых людзей з Беларусі і замежжа.

З'яўляецца вядучым шматлікіх свят, у тым ліку «Фальклорная вандроўка» (з 1993 г.) – свята, прысвечанае ўгодкам земляка этнографа Паўла Шпілеўскага; «Гліняны звон» (з 1996 г.) – любанскае свята ганчароў, Рэспубліканскі кірмаш «Вясна-2000» (г. Салігорск); Рэспубліканскае свята гумару «Капыльскія пацехі» (1999, 2002) і інш.

Апякуецца працай 25 фальклорных гуртоў на Любаншчыне, 7 з іх – аўтэнтычныя і 3 (в. Ямінск, Закальное, Обчын) маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь за мясцовы спеўны стыль выканання абрадавых і пазаабрадавых твораў. Арганізаваў на роднай зямлі шырокі фальклорны рух, з'яўляецца аўтарам канцэпцыі і галоўным арганізатарам: свята гумару «У Баянічы на гулянічы» (з 2007 г.), фэста аўтэнтычнай песні «Бабулі» (з 2014 г.), свята народных традыцый «Фольк-Любань» (з 2011 г.), выстаўкі традыцыйнага адзення «Апраткі з роднае хаткі» (2011) і «Завівана Марусечка» (2016), свята традыцыйнай кухні «У Пласток на квасок» (з 2017 г.).

Узорны фальклорны калектыў «Верабейкі», стваральнікам і кіраўніком якога на працягу 25 гадоў з'яўляецца С.Г. Выскварка, годна прадстаўляў Любаншчыну на рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях (Літва, Польшча, Расія). Калектыў мае прызнанне самых розных фестываляў, але самая ганаровая падзяка – Гран-пры фестывалю «Берагіня» у г.п. Акцябрскі (2008).

Дзякуючы С.Г. Выскварку Любанскі раён у Мінскай вобласці стаў адной з самых запатрабаваных пляцовак па падрыхтоўцы да заключных мерапрыемстваў рэспубліканскай «Берагіні». У рамках праграм фестывалю нарадзіліся і сталі традыцыйнымі шэраг раённых фальклорных праектаў (свята традыцыйнай народнай харэаграфіі «Танцы пад гармонік» /з 2002 г./, свята народнай казкі «Казкі бабулі Аўдулі» /з 2005 г./) і інш., да якіх пастаянна далучаюцца і аматары традыцыйнага мастацтва памежных раёнаў. Аказвае кансультацыйную і практычную дапамогу гуртам, танцавальным парам, удзельнікам турніру салістаў з другіх раёнаў Міншчыны. Удзельнічаў з дакладамі ў навукова-практычных канферэнцыях, «круглых сталах», быў членам Рады экспертаў рэспубликанскай «Берагіні».

Пра асобу С.Г. Выскваркі неаднаразова апавядалі абласныя і рэспубліканскія СМІ. Матэрыялы пра яго творчую дзейнасць змешчаны таксама на электронных рэсурсах:

https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A1%D1%8F%D1%80%D0%B3%D0%B5%D0%B9_%D0%93%D0%B5%D0%BE%D1%80%D0%B3%D1%96%D0%B5%D0%B2%D1%96%D1%87_%D0%92%D1%8B%D1%81%D0%BA%D0%B2%D0%B0%D1%80%D0%BA%D0%B0; https://nn.by/?c=ar&i=168337&lang=ru# ;http://zviazda.by/ru/news/20170921/1505978826-ne-vybiray-zhenu-v-ogorode-ishchi-v-horovode; http://minsk-region.gov.by/ru/glavnyj-novosti/item/28491-sergey-vyskvarka-21-yanvarya-%E2%80%93-kolyadnyy-festival-na-lyubanschine?tmpl=component&print=1; http://tv.sb.by/kultura-4/article/syargey-vyskvarka-kal-my-belarusy-u-pryyarytetse-pav-nna-byts-svaya-kultura.html; http://budzma.by/news/kraina-yashche-skacha-pyesnya-nasha-fota-videa.html;https://new.naviny.by/rubrics/culture/2014/06/11/ic_articles_117_185761; https://www.sb.by/articles/syargey-vyskvarka-kal-my-belarusy-u-pryyarytetse-pav-nna-byts-svaya-kultura.html#; https://auto.tut.by/archive/14.07.2015.html; https://auto.tut.by/tag/2131-kraina-na-kolakh.html?utm_source=news-bottom-block&utm_medium=news-tags&utm_campaign=news-tags; https://archive.is/o/cMpi3/tv.sb.by/print/post/syargey-vyskvarka-kal-my-belarusy-u-pryyarytetse-pav-nna-byts-svaya-kultura.html.



**_ГЛУШЭЦ Ірына Валер'еўна_**

*Фальклярыст, музыказнаўца, метадыст, даследчык традыцыйнай культуры Гомельшчыны.*

Нарадзілася 14.09.1985 г. у г. Гомель.

Скончыла Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага па спецыяльнасці «музыказнаўства» (2005), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2010, спецыялізацыя «этнафоназнаўства»). Бакалаўр (2010), магістр мастацтвазнаўства (2014), вучыцца ў аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «мастацтвазнаўства».

Навучаючыся ва ўніверсітэце, у складзе гурту «Кросы» (кіраўнік Л.М. Рыжкова) і фальклорнага гурту студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору «Талака» (кіраўнікі В.В. Калацэй і Т.А. Пладунова) удзельнічала ў міжнародных фальклорных фестывалях у Санкт-Пецярбургу і Бранску (Расія), Клайпедзе і Вільнюсе (Літва), Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2006, 2008, 2010), розных беларускіх фестывалях, святах традыцыйнай культуры.

У 2010 г. пачала працоўную дзейнасць у Гомельскім абласным цэнтры народнай творчасці метадыстам па этнаграфіі і фальклору; у 2013–2015 гг. – загадчык аддзела народнай традыцыйнай культуры і вядучы метадыст па этнаграфіі і фальклору. У 2011–2013 гг. па сумяшчальніцтву працавала педагогам дадатковай адукацыі ў Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі Цэнтральнага раёна г. Гомеля. На аснове ўласных навуковых даследаванняў і вопыту працы склала адукацыйную праграму фальклорнага аб'яднання «ETHNO-HOMEL», з якой ў 2014 г. заняла II месца на V Рэспубліканскім конкурсе праграм аб'яднанняў па інтарэсах фальклорнага напрамку ўстаноў адукацыі.

Выступае з дакладамі і паведамленнямі па традыцыйнай народнай культуры на навуковых канферэнцыях, семінарах, семінарах-практыкумах; праводзіць майстар-класы па традыцыйных песнях і танцах Гомельшчыны, аказвае арганізацыйна-метадычную дапамогу фальклорным калектывам вобласці ў падрыхтоўцы і ўдзелу ў разнастайных фестывальна-відовішчных акцыях, у тым ліку Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Як сябра Рэспубліканскай маладзёжнай грамадскай арганізацыі «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» (з 2009 г.) і Гомельскай маладзёжнай краязнаўчай арганізацыі «Талака» (з 2010 г.) прымае актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні фальклорных экспедыцый, традыцыйных беларускіх свят і тэматычных імпрэз.

З 2013 г. удзельнічае ў фольк-праекце «Ягорава Гара» (кіраўнік Я. Паляшук) як спявачка і выканальніца на музычных інструментах (традыцыйныя цымбалы, колавая ліра, гармонік, сінтэзатар, перкусія). Гурт з 2016 г. мае ганаровае найменне «народны аматарскі калектыў», вядзе актыўную канцэртную дзейнасць, запіс кампазіцый, з’яўляецца ўдзельнікам і дыпламантам фальклорных фестываляў у Беларусі, Расіі, Украіне і Польшчы, у тым ліку ў 2014 г. – лаўрэат I ступені «За захаванне этнамузычнай спадчыны беларусаў» VIII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

За шматгадовую сумленную працу, асабісты ўклад, накіраваны на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Гомельскай вобласці, ўзнагароджана Ганаровай граматай адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Гомеля (2014).

*Тв.*: Рытмамеладычная класіфікацыя песень абраду Ваджэнне і пахаванне стралы в. Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне: зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнароднай навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 красавіка 2010 г.). – Мінск, 2010; Асаблівасці працы з маладзёжным фальклорным калектывам // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў V Міжнароднай навук. канф. (Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2011 г.). – Мінск, 2011; Кіраўнік фальклорнага калектыву як транслятар традыцыйнай культуры // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 27–29 красавіка 2012 г.). – Мінск, 2012; Песенны фальклор Прыпяцкага запаведніка (па матэрыялах экспедыцыі ў Жыткавіцкі раён) // Традиционная культура Полесья и современный мир: материалы Междунар. науч.-практ. конф. – Гомель, 2012; Да пытання прыярытэтнасці палявых даследаванняў у этнамузыкалогіі (паводле Джэфа Цітана) // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VII Міжнар. навук. канф. (Мінск, 26–28 красавіка 2013 г.) – Мінск, 2013; Этнакультурнае выхаванне ў музеі: з вопыту працы фальклорнага калектыву ГМКГА «Талака» // Музей і традыцыйная культура Беларусі: III навук.-практ. канф. (г.п. Акцябрскі 19–20 снежня 2013 г.) – г.п. Акцябрскі, 2013; Руководитель фольклорного коллектива как транслятор традиционной культуры // Традиционная народная культура в современном геокультурном пространстве: материалы IV Междунар. науч.-практ. конф. «Истоки» (Курск – Суджа, 6–7 декабря 2012 г.) – Курск, 2014; Аутентичные формы музыкального фольклора Беларуси в современных социально-экономических условиях (на примере села Неглюбка Ветковского района Гомельской области) // Традиционная культура и современный мир: материалы V Межрегиональной науч.-практ. конф. «Традиционная культура и современный мир» (Суджа, 2–3 декабря 2014 г.) – Курск, 2015; Нематэрыяльная спадчына Тураўшчыны як агульнанацыянальная каштоўнасць // Историческое наследие города Турова: Респуб. науч.-практ. конф. «Историческое наследие города Турова», 9–10 апреля 2015 г. – Гомель, 2015; Традиция народно-песенного исполнительства Туровского региона Гомельской области как часть духовного наследия Республики Беларусь // Музыкальное исполнительство и педагогика: история, теория, практика: сб. науч. статей по материалам заочной междунар. науч.-практ. конф., РЦкии КГУ, 22 апреля 2015 г. Вып. 1 – Курск, 2015; Фальклорнае аб’яднанне ETHNO-

HOMEL // Аб'яднанні па інтарэсах: выхаванне сродкамі беларускага фальклору. – Мінск, 2015; Сістэма работы ўстаноў культуры Гомельскай вобласці з каляндарнай нематэрыяльнай культурнай спадчынай і яе метадычнае забеспячэнне // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці: Нацыянальная культура ў зменлівым свеце: матэрыялы IV Міжнар. завочн. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 снежня 2015 г.). – Мінск, 2015; Неглюбскія карагодныя песні абраду Ваджэння і пахавання «Стралы» паводле прызначэння // Лакальна-рэгіянальныя парадыгмы беларускага фальклору. – Мінск, 2015; Сучасны стан веснавой абраднасці Гомельскага Палесся // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка): зб. навук. прац [удзельнікаў X Міжнар. навук. канф. (Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2016 г.)]. – Мінск, 2016; Паняцце «трансфармацыя» ў дачыненні да традыцыйнай культуры // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці: Трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве: матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 27 верасня 2016 г.). – Мінск, 2016; Пытанні ўзаемадзеяння вуснай і пісьмовай форм у беларускай народнай культуры // Роднае слова. – 2017. – № 9.



***ДЗЕМЯНЧУК Ірына Дзмітрыеўна***

*Дзеяч культуры, рэжысёр, сцэнарыст.*

Нарадзілася 16.12.1962 г. у г. Гродна Гродзенскай вобл.

Скончыла Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «культурна-асветная работа» (1985).

Працавала загадчыкам клуба Гродзенскага завода аўтамабільных агрэгатаў (1985–1987); загадчыкам аддзела культурна-масавай работы палаца культуры хімікаў Гродзенскага вытворчага аб'яднання «Азот» (г. Гродна, 1987–2002); вядучым метадыстам, галоўным рэжысёрам (2002–2007), з 2007 г. па сённяшні дзень – дырэктарам дзяржаўнай установы культуры «Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» (АМЦНТ).

Арганізатар абласных фестываляў мастацкай творчасці розных жанраў, рэжысёр і сцэнарыст шматлікіх творчых мерапрыемстваў, урачыстых канцэртаў, тэатралізаваных свят. З'яўляецца адным з арганізатараў і рэжысёраў Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур (2008, 2010, 2012, 2014, 2016, 2018), акцый «За незалежную Беларусь», «Мы – беларусы» (2011, 2012) і інш.

Надае вялікую ўвагу захаванню і развіццю традыцыйнай беларускай культуры: выяўленню, фіксацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны і падрыхтоўцы іх да надання статусу «нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць». Пачынаючы з 2009 г. гэты напрамак стаў адным з вядучых у дзейнасці Гродзенскага АМЦНТ. Сёння ў Дзяржаўным спісе нематэрыяльных культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь ужо 14 элементаў ад Гродзенскай вобласці («Творчасць майстра па вырабу музычных інструментаў Мар'яна Скрамблевіча з аг. Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці», «Традыцыя роспісу велікодных яек у г.п. Сапоцкін Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці» і інш.).

Пытанні захавання і папулярызацыі традыцыйнай культуры неаднаразова асвятляліся Ірынай Дзмітрыеўнай на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. Яна з'яўляецца актыўным удзельнікам Міжнароднага форуму «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства» (г. Магілёў, 2014, 2016, 2018), выступала на выязным пасяджэнні Рэспубліканскага савета па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (Брэсцкая вобл., 2017) па тэме «Актуалізацыя аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці».

Пад кіраўніцтвам І.Д. Дземянчук Гродзенскім АМЦНТ ажыццяўляецца падтрымка раённых цэнтраў рамёстваў, культуры і народнай творчасці, народных

майстроў па адраджэнню, развіццю і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў і мастацкіх промыслаў рэгіёнаў. Сёння традыцыйнымі і сучаснымі рамёствамі ў Гродзенскай вобласці займаюцца каля 500 майстроў, 13 з якіх маюць статус «народны майстар Рэспублікі Беларусь». 27 майстроў з'яўляюцца сябрамі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз майстроў народнай творчасці».

З мэтай папулярызацыі і прапаганды народнай творчасці ў выставачнай зале АМЦНТ штомесячна праходзяць выстаўкі твораў самабытных майстроў з розных раёнаў вобласці (тэматычныя ці персанальныя).

Работа па падтрымцы традыцыйнай культуры рэгіёна вядзецца Гродзенскім АМЦНТ з апорай на базавыя ідэі і прынцыпы фестывальнага руху «Берагіня» – выяўлене, аднаўленне, перайманне папулярызацыя, распаўсюджванне каштоўнасцей гісторыка-культурнай спадчыны, праз арганізацыю свят, кірмашоў, фестываляў, конкурсаў. Актуальная форма абагульнення вынікаў культурнай дзейнасці ў рэгіёне – навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя аналізу сучаснага стану традыцыйнай і аматарскай творчасці Гродзеншчыны.

У межах фестывальнага руху «Берагіня» на Гродзеншчыне рэалізуецца шэраг абласных праектаў: фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямоння жыватворныя крыніцы» (2007, 2011, 2015, 2017); свята-кірмаш рамеснікаў «Гродзенскія традыцыі да свята Вялікадня» з майстар-класамі ад носьбітаў элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, занесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (2015, 2016, 2017); фестываль-свята «Танцуем па-даўнейшаму» (2013, 2015, 2017). І.Д. Дземянчук аўтар ідэі і арганізатар фестывалю традыцыйнай культуры «Скарбы Гродзеншчыны» (2013, 2015, 2015).

Міжнародныя сувязі АМЦНТ яскрава праявіліся ў фестывалі «Артыстычныя сустрэчы» – найбольш маштабным і працяглым (існуе больш за 20 гадоў) праекце, які з'яўляецца вынікам творчага супрацоўніцтва гарадоў-пабрацімаў Гродна і Беластока. І.Д. Дземянчук – арганізатар правядзення фестывалю.

Яшчэ адна сфера дзейнасці Ірыны Дзмітрыеўны – ушанаванне памяці славутых дзеячаў культуры Гродзеншчыны. Так, да 100-годдзя кампазітара, заслужанага дзеяча культуры БССР, Ганаровага грамадзяніна гг. Гродна і Смаргонь Аляксандра Канстанцінавіча Шыдлоўскага (2011) ёю былі арганізаваны выданне і прэзентацыя зборніка з аўтарскімі песнямі А. Шыдлоўскага «Колькі ў небе зор»; адкрыццё барэльефа з выявай Аляксандра Канстанцінавіча на будынку АМЦНТ; правядзенне свята песні «Колькі ў небе зор» (Гродна) з удзелам вакальна-харавых калектываў Гродзенскай вобласці.

Узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2004), Ганаровай граматай Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта (2004), Ганаровай граматай упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама (2008), Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2009), граматай Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў (2009), Архіерэйскай граматай «В благословение за труды во славу Святой Православной Церкви» (2009). І.Д. Дземянчук з'яўляецца лаўрэатам прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Клубны работнік года» (2005) і «Рэжысёр года» (2009).



***ЗАБРОЦКАЯ Надзея Васільеўна***

*Культуролаг, вядучая раённых, абласных, рэспубліканскіх свят.*

Нарадзілася 9.10.1976 г. у в. Чырвоная Слабада Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «менеджар сацыякультурнай сферы» (2002).

У 1996–2006 гг. працавала ў сельскім Доме народнай творчасці в. Чырвоная Слабада спачатку мастацкім кіраўніком, а затым дырэктарам. З 2006 г. – дырэктар карціннай галерэі імя Л.М. Дробава, з 2013 г., пасля рэарганізацыі музейных устаноў, – загадчык філіяла «Карцінная галерэя імя Дробава Л.М.» дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна».

З 2008 г. актыўны ўдзельнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»: працавала ў складзе рабочай групы вядучых імпрэз. Арганізатар разнастайных выставак: фотакалекцый фотакарэспандэнтаў газеты «Звязда» Яўгена Пясецкага, газеты «Гомельская праўда» Алега Белавусава і ўласнага фотакарэспандэнта па Гомельскай вобласці Сяргея Халадзіліна пад назвамі «Спадчына» (2016), «Берагіня ў пгасторы і часе» (2012), «Берагіня ў фотааб'ектыве ўдзельнікаў і гасцей фестывалю» (2010), «Берагіня – 20 гадовы шлях» (2014), выстаўкі ганчарства і гліны Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання майстроў народнага мастацтва і традыцыйных мастацкіх рамёстваў Беларусі «Мастацтва гліны і паперы» (2012), карцін Ірыны Рагавой з г. Светлагорска «Легенды на палотнах» (2014), дэкаратыўна-побытавага мастацтва «Вянок Рудабельскіх талентаў» (2010), выстаўкі-прэзентацыі карцін ураженкі г.п. Акцябрскі Алы Варанюк «Мір вакол нас» (2016) і інш.

Узнагароджана Ганаровай граматай аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама (2011), Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2014), падзякай Акцябрскай раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» (2014), Акцябрскага раённага аб'яднання прафсаюзаў (2016), Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта (2017).



***ІВАНЕНКА Мікалай Міхайлавіч***

*Педагог, краязнавец, метадыст, сцэнарыст, рэжысёр; даследчык народнай педагогікі, арганізатар культурнай дзейнасці і адукацыйна-выхаваўчага працэсу.*

Нарадзіўся 21.02.1961 г. у в. Міхалёўка Брагінскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў курс асноў акцёрскага майстэрства пры Маскоўскім універсітэце мастацтваў (1982), Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «культасветработа» (1987). Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю настаўніка фальклорна-тэатральных дысцыплін.

---

Працаваў дырэктарам Крукаўскага СДК, затым дырэктарам Брагінскага раённага дома культуры. Прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС (мае нагрудны знак і пасведчанне ўдзельніка ліквідацыі аварыі на ЧАЭС).

З 1989 г., пасля пераезду з зоны радыяцыйнага забруджання ў г. Вілейка, па 1993 г. працаваў дырэктарам Вілейскага гарадскога дома культуры. З 1993 г. па 1996 г. – класным настаўнікам і кіраўніком драматычнай студыі Вілейскай гімназіі № 1. З 1996 г. па 2003 г. – намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, затым дырэктарам Вілейскай пачатковай школы № 6, дзе і была адкрыта рэспубліканская эксперыментальная пляцоўка па ўкараненню праграмы «Этнашкола», метадычныя асновы якой М.М. Іваненка ўдасканальваў на працягу 15 гадоў.

З верасня 2003 г. працуе намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Вілейская гімназія № 2» і курыруе вучэбныя прадметы мастацкай, музычнай, тэатральнай і харэаграфічнай накіраванасці.

Стаяў ля вытокаў фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня» на Вілейшчыне. У рэчышчы «Берагіні» арганізоўваў святы фальклорнага мастацтва, конкурсы танцавальных пар-выканаўцаў твораў беларускай народнай харэаграфіі, падтрымліваў ініцыятыву настаўнікаў у правядзенні навукова-практычных канферэнцый, а таксама ўдзелу іх і іх вучняў у абласных і рэспубліканскіх мастацкіх і педагагічных форумах. З удзелам Мікалая Міхайлавіча ў гімназіі сістэматычна ладзяцца майстар-класы па беларускаму народнаму побытаваму танцу.

Аўтар мноства публікацый па праблемах выкарыстання народнай педагогікі, этнаграфіі і фальклору ў выхаваўчай практыцы сучасных устаноў адукацыі.

За плённую творчую працу і дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення ўзнагароджаны граматамі і дыпломамі Міністэрства адукацы Рэспублікі Беларусь, упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама; за высокае служэнне справе духоўнага адраджэння Бацькаўшчыны – Ганаровай граматай Рэспубліканскай духоўна-асветніцкай праграмы «Сям’я – Еднасць – Айчына» (2012).

Неаднойчы атрымліваў падзякі Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі Філарета «За усердные труды во славу Святой Церкви». Уладальнік рэдкага медаля «За заслуги» (заснавальнікі – Міжнародны рух «Семья – Единение – Отечество», Грамадскі савет па маральнасці ў Беларусі, Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Бацькі і настаўнікі – за адраджэнне праваслаўнай адукацыі») (2012).

*Тв.:*Каляндарна-абрадавая дзейнасць беларусаў і адукацыйна-выхаваўчыя модулі этнашколы // Этнашкола ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання). – Мінск, 2004; Праблемы выкарастання фальклору як сродку адукацыі ў сучаснай школе // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 2. Матэрыялы III Рэспуб. навук.-практ. канф. (19–20 красавіка 2006 г., г.п. Акцябрскі). – Мінск, 2006; Праблемы перайманця аўтэнтычнага фальклору Вілейшчыны ў сістэме сацыяльна-педагагічнага праекта «Этнашкола» // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, перайманця: матэрыялы навук.-метад. канф. (15–16 сакавіка 2007 г.). –Мінск, 2007; Мы з Вілейкі – і тым ганарымся: з вопыту работы этнашколы на базе ДУА «Вілейская гімназія № 2» // Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў сродкамі народнай педагогікі: З вопыту работы этнашкол Мінскай вобласці: метад. дапаможнік. – Мінск, 2008; Юбілей трэба заслужыць // Хто, калі не я...: Да 60-годдзя Міколы Козенкі. – Мінск, 2011; Сучасная школа і этнавыхаванне // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 27–29 красавіка 2012 г.). – Мінск, 2012; Гендарнае выхаванне і духоўныя асновы сям'і // II Республиканские педагогические чтения «Инновационные тенденции в современном образовании» (Минск, 15–16 ноября 2013 г.) [Электронный ресурс]. – Минск, 2013; Маральныя нормы ўзаемаадносін мужчыны і жанчыны ў традыцыйнай культуры беларусаў // Духовно-нравственные основы подготовки учащихся к семейной жизни: сб. статей и материалов из опыта работы государственного учреждения образования «Вилейская гимназия № 2». – Минск, 2013; У госці запрашаем: традыцыі беларускай гасціннасці // Образование Минщины. 2014. – № 1; Слово в семье // Духовно-нравственный потенциал слова: Материалы XII Республиканских Свято-Евфросиниевских педагогических чтений. – Минск, 2014; Сэрцу – вера, а целу – мера. Да года культуры: скарбонка народнай педагогікі // Образование Минщины. 2016. – № 3; Народная педагогіка на ўсе часы // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка): зб. навук. прац удзельнікаў X Міжнар. навук.-практ. канф. – Мінск, 2016; Адраджэнне традыцыі вырабу вясельнай лялькі на Вілейшчыне // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка): зб. навук. прац удзельнікаў XI Міжнар. навук.-практ. канф. – Мінск, 2017; Народная педагогіка ў сучаснай выхаваўчай прасторы // Экономика, христианство и социальные институты: Материалы Междунар. науч.-практ. конф. (28–29 января 2017 г., г. Минск). – Минск, 2017; Сацыяльна-эканамічныя праблемы грамадства праз прызму хрысціянскіх каштоўнасцей: педагагічны ракурс // Социум и христианство: Материалы II Междунар. науч.-практ. конф. (27–28 января 2018 г., г. Минск). – Минск, 2018.



**ІВАШЫНА Вольга Сяргееўна**

*Работнік культуры, рэжысёр, сцэнарыст, вядучая раённых, абласных, рэспубліканскіх свят.*

Нарадзілася 03.12.1981 г.н. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупской па спецыяльнасці «народная творчасць» з прысваеннем кваліфікацыі «арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці, рэжысёр вольнага часу, абрадаў і свят» (2002).

Працавала рэжысёрам Акцябрскага цэнтра вольнага часу (2002–2007), рэжысёрам дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі раённы метадычны цэнтр народнай творчасці» (2009–2014). З 2014 г. па цяперашні час – дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна». На працягу многіх гадоў была ўдзельніцай народнага хору работнікаў культуры і народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская пацеха».

Распрацоўвала сцэнарыі, з'яўлялася вядучай раённых мерапрыемстваў: свята «Дажынкі–2012», V адкрытага фестывалю-конкурсу маладзёжных творчых работ «Крокі» (2013), конкурсу культарганізатараў (2016), конкурсу маладых выканаўцаў «Песні юнацтва нашых бацькоў» (2012), адкрыцця і закрыцця фестывалю дзіцячай творчасці «Вясенняя карусель» (2015), з'ездаў Дзядоў Марозаў і Снягурак (2012–2015), прафесійнага свята «Дзень работніка культуры» (2010–2015) і інш. З'яўлялась арганізатарам народных свят у буйных населеных пунктах раёна – «Масленіца» (в. Гаць, 2012), «Троіца» (в. Валосавічы, 2013). Падчас працы ў арганізацыйна-метадычным цэнтры распрацоўвала, выдавала зборнікі сцэнарна-метадычных матэрыялаў па народнай творчасці, здароваму ладу жыцця, ваенна-патрыятычнаму выхаванню, арганізацыі вольнага часу насельніцтва.

З 2012 г. уваходзіла ў рэжысёрска-пастановачную групу фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», а таксама ў групы падрыхтоўкі і арганізацыі рэспубліканскіх турніраў дзіцячых фальклорных калектываў, канцэртаў-прэзентацый замежных калектываў – гасцей фестывалю, канцэртаў-прэзентацый аўтэнтычных гуртоў, арганізацыі відовішча-шэсця. З'яўлялася вядучай заключных мерапрыемстваў фестывалю, распрацоўвала сцэнарыі заключных імпрэз. Курыравала выязныя канцэрты калектываў – гасцей фестывалю ў населеныя пункты Акцябрскага раёна. Арганізоўвала сяброўскія вечарыны.

Адзначана Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2014), падзячным лістом аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2014), дыпломам VII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» за прафесіяналізм і правядзенне заключных мерапрыемстваў (2012).



**_КАЗАКОВА Ларыса Аляксееўна_**

*Работнік культуры, сцэнарыст, рэжысёр, збіральнік народнай спадчыны.*

Нарадзілася 29.05.1965 г. у г. Навасібірску (Расія). З 1976 г. жыве ў Беларусі.

Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С. Пушкіна (1984), Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (1991).

У 1984–1996 гг. працавала загадчыкам Лаўстыцкай бібліятэкі Акцябрскага раёна, дзе захапілася ідэяй стварэння лялечнага тэатра «Батлейка». У 1995 г. арганізавала выраб матэрыяльнай часткі тэатра. Гэта батлейка працуе і зараз на базе дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна». Другая батлейка была зроблена пазней і працуе на базе клубнай установы в. Гаць. З 1996 г. – на пасадзе спецыяліста па этнаграфіі і фальклору раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры, з 2015 г. – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна».

Асноўны напрамак дзейнасці – даследаванне традыцыйнай культуры раёна, адраджэнне традыцыйных рамёстваў, свят і абрадаў, народнага традыцыйнага адзення, развіццё сеткі творчых фарміраванняў па дэкаратыўна-прыкладной творчасці і традыцыйных рамёствах, вядзенне картатэкі народных майстроў, фона-фота-відэатэкі па трыдыцыйнай спадчыне раёна.

Выязджала ў фальклорныя экспедыцыі для збору матэрыялаў аб святах, абрадах, народным адзенні, танцах, песнях, народнай прозе і інш. Сабраныя матэрыялы ляглі ў аснову артыкулаў, буклетаў, дакладаў: «Рамёствы і промыслы», «Жаночае сялянскае адзенне Рудабельскага краю: строй сялянкі в. Гарохавішчы (другая палова XIX – пачатак XX ст.)», «Праграмны падыход да арганізацыі працэса захавання і пераемнасці традыцыйнай культурнай спадчыны (з вопыту работы раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра Акцябрскага аддзела культуры)», «Ручнікі Рудабельскага краю» і інш. Матэрыялы друкаваліся ў зборніках: «Берагіня». Першы фестываль фальклорнага мастацтва» (1999), Трэці Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2004); «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці»: зб. матэрыялаў навук.-практ. канф. (2001). Распрацавала карту існуючых народных рамёстваў Акцябрскага раёна. Удзельнічала ў падрыхтоўцы да выдання юбілейнага ілюстраванага буклета «Берагіня–2008» («“Берагіні” 10 год»).

Па ініцыятыве Ларысы Аляксееўны пры клубных установах пачалі стварацца гурткі саломапляцення, выцінанкі, традыцыйнай вышыўкі, вырабу народных строяў і інш. Для работы клубных фарміраванняў распрацавала праграмы навучання па традыцыйных рамёствах: саломапляценню, ткацтву і пляценню паясоў (1997–1999), 2-х гадовую праграму па вырабу традыцыйнага адзення (2000). У суаўтарстве з А.В. Кругаль і В.І. Шчэцька распрацоўвала раённыя мэтавыя праграмы развіцця культуры раёна (1996–2000, 2001–2005).

Л.А. Казакова ў ліку іншых стаяла ля вытокаў фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня». Работала ў складзе груп: рэжысёрска-пастановачнай, арганізацыі турніраў дзіцячых фальклорных калектываў, арганізацыі майстар-класаў, узначальвала групу арганізацыі конкурсаў танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў. Рыхтавала матэрыялы да выдання дзевяці зборнікаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Неаднаразова ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама, Акцябрскага райвыканкама (2002, 2015), Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2015).



**КОЗЕНКА *Мікалай Аляксеевіч***

*Даследчык харэаграфічнай культуры беларусаў, педагог, рэжысёр, сцэнарыст, менеджар, грамадскі дзеяч, член Беларускага саюза музычных дзеячаў (з 2012 г.), член Рады Беларускага фонду культуры (з 2013 г.).*

Нарадзіўся 09.03.1951 г. у в. Целепуны, прыгарадзе Мазыра Гомельскай вобл.

Пачатковую адукацыю атрымаў у Мазырскай школе-інтэрнаце (1958–1966). Скончыў Магілёўскае культасветвучылішча (1970), Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры (1978, спецыялізацыя «выкладчык харэаграфічных дысцыплін»), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1998).

З 1970 г. працаваў выкладчыкам харэаграфічных дысцыплін у культасветвучылішчы і кіраўніком дзіцячага харэаграфічнага калектыву дома культуры Магілёўскага аўтазавода імя Кірава. У 1978–1988 гг. – выкладчык кафедры харэаграфіі Мінскага інстытута культуры; з 1979 г. – загадчыкам аддзела харэаграфічнага мастацтва, намеснікам дырэктара, вядучым навуковым супрацоўнікам Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра культуры; з 1992 г. – старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

Не парываючы сувязі з БелДІПК, у 1995–1999 гг. працаваў: выкладчыкам танца ў дзіцячай музычнай школе г. Чачэрска і загадчыкам Чачэрскага раённага цэнтра рамёстваў, этнаграфіі і фальклору Гомельскай вобласці; вядучым спецыялістам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; мастацкім кіраўніком Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. З 1999 г. – на асноўнай працы ў БелДІПК, па сумяшчальніцтву (з 1996 г.) – мастацкі кіраўнік Мётчанскага ўзорнага (з 2012 г. заслужанага) калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага гурту «Берагіня» Барысаўскага раёна. Выкладае традыцыйны беларускі танец на кафедрах этналогіі і фальклору (з 2006 г.) і народна-песеннай творчасці (з 2013 г.) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, працуе педагогам у цэнтры дадатковай адукацыі «Ветразь» г. Мінска.

Даследуе харэаграфічную спадчыну беларусаў, займаецца пытаннямі аднаўлення, пераемнасці, папулярызацыі і распаўсюджвання традыцыйнай культуры, распрацоўвае тэарэтычныя і практычныя аспекты фальклорнага фестывальнага руху на Беларусі.

Аўтар каля 200 публікацый, прысвечаных традыцыйнаму мастацтву і аматарскай харэаграфічнай творчасці. У іх ліку: манаграфіі «Лексіка беларускага народна-сцэнічнага танца. Ч. І. Паставы рук» (1993), «Мы – “Берагіня”»

(у суаўтарстве з А. Абрамовіч, 2001), «Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю» (у суаўтарстве з А. Абрамовіч, 2004); зборнікі «Танцавальная музыка Беларусі» (15 выпускаў, Мінск, 1984–1998), «Танцы Усходняга Палесся» (1987); раздзелы – «Інструментальная музыка», «Танцавальны фальклор», «Народныя гульні» ў 6-томным выданні «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (10 кн.): Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе (2001); Т. 2. Віцебскае Падзвінне (2004); Т. 3. У 2 кн. Гродзенскае Панямонне (2006); Т. 4. У 2 кн. Брэсцкае Палессе (2008, 2009); Т. 5. У 2 кн. Цэнтральная Беларусь (2010, 2011); Т. 6. У 2 кн. Гомельскае Палессе і Падняпроўе (2012, 2013). Аўтар ідэі і кіраўнік праекта «Беларускі народны танец: традыцыі і сучаснасць. Магілёўшчына» (2011) і інш.

Складальнік навукова-папулярных, даведачных і рэпертуарных зборнікаў: «Беларускія народныя танцавальныя песні» (4 вып., Мінск, 1986–1992), «Рэспубліканскі фестываль народнага танца “Беларуская полька”» (1993, 1995, 1996; 2000), «Мядоцкі край і яго таленты» (1997), «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: зб. матэрыялаў навук.-практ. канф.» (2001), «Народная спадчына Бацькаўшчыны: Вывучэнне спадчыны і выхаванне дзяцей сродкамі аўтэнтычнага народнага мастацтва: Матэрыялы фальклорных чытанняў» (2002), даведнікі I – X Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2018), навуковых зборнікаў – «Асоба ў народнай культуры і педагогіцы» (2016), «Мядоцкая “Берагіня” ў кантэксце нацыянальнай культуры беларусаў» (2017), кнігі-альбома «Мядоцкая “Берагіня” ў прасторы і часе» (2017) і інш. Аўтар ідэі, кіраўнік і ўкладальнік дзевяці кніг «Выдатныя постаці Беларусі» (2004–2017).

Аўтар і суаўтар сцэнарыяў каля 20 відэафільмаў і тэлесюжэтаў аб танцавальным фальклоры, сярод якіх – «Столінскія карагоды, гульні, скокі» (1991), «Чачэрскі куфэрак» (1991, абодва МВТА «Артфільматэхніка»), «Танцы і карагоды на вёсцы» (1995), «Паміж небам і зямлёй» (1995), «У святыя вечары на Каляды» (1996, усе – «Летапіс» к/с «Беларусьфільм»), цыкла «Чачэрскі альбом» у тэлепраграме «Радавод» (рэдактар Рэгіна Гамзовіч) і інш.

Атар ідэі, стваральнік і кіраўнік рэспубліканскага эксперыментальнага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці» (2001–2003).

Мастацкі кіраўнік: Першага Міжнароднага фестывалю фальклору на Беларусі (г. Пінск-Мінск, 1994), Другога Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1999), рэспубліканскіх фестываляў: беларускага народнага танца (г. Гродна, Мінск, абодва 1990); аўтар ідэі і кіраўнік фестывальных праектаў – «Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), «Пярэзвы» (г. Бабруйск, 1992); аўтар ідэі і канцэпцыі, галоўны рэжысёр і харэограф рэспубліканскіх фестываляў «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1993, 1994, 1996, 2001), рэгіянальнага фестывалю народнай творчасці «Мядоцкі край і яго таленты» (в. Мётча, Барысаўскі р-н, 1997), дзесяці рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 1998–2018), аўтар ідэі і мастацкі кіраўнік: рэспубліканскіх конкурсаў беларускага народнага танца «Мяцеліца» (г. Мінск, 2013, 2015, 2017), штогадовых адкрытых конкурсаў беларускага народнага танца «Ветразь» (г. Мінск, 2015–2018), адкрытых конкурсаў спеўнага

і музычна-інструментальнага выканальніцтва «Згукі мінуўшчыны» (г. Мінск, 2018), выканальнікаў беларускай народнай прозы (г. Мінск, 2018).

Арганізатар і кіраўнік рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый, семінараў, «круглых сталоў», дыскусій па праблемах беларускай народнай харэаграфіі, традыцыйнай народнай культуры беларусаў, этнавыхавання дзяцей і моладзі.

Распрацоўшчык вучэбных праграм: «Танец у народным хоры» для студэнтаў Мінскага інстытута культуры (1986), «Пачатковае харэаграфічнае навучанне» для гурткоў, студый, школ і пазашкольных устаноў (1998).

З'яўляўся адным з кіраўнікоў і харэографам-рэпетытарам Нацыянальнай мастацкай дэлегацыі на XXII Алімпійскіх гульнях у Маскве (1980).

Праца М.А. Козенкі шматразова адзначалася падзякамі, прэміямі, граматамі, Ганаровымі граматамі. Ён узнагароджаны:

знакам Міністэрства культуры СССР і ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры «За дасягненні ў самадзейнай творчасці» (пастанова Міністэрства культуры СССР № 11-к ад 18.01.1989 г.);

нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (загад МК РБ № 29-у ад 29 сакавіка 2011 г. Пасведчанне № 847. Міністр П.П. Латушка);

ганаровым знакам Беларускага фонду культуры «Руплівцу. Стваральніку» (пасведчанне № 16. Рашэнне Выканкама Рады Грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры». 4 красавіка 2017 г., № 2);

дыпломам уладальніка спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 г. (Указ ад 30 снежня 2014 № 650);

дыпломам Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь «За вялікі ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі» (2008);

ганаровымі граматамі Чачэрскага райвыканкама Гомельскай вобласці (1996), Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў (2017);

Прозвішча М.А. Козенкі змешчана ў энцыклапедыі «Беларускі фальклор» (2005), у даведачным выданні «Кто есть Кто. Деловой мир СНГ. 2001». Яму прысвечана кніга «Хто, калі не я...: Да 60-годдзя Міколы Козенкі».

*Тв.:* «Працяг будзе» (2004); Абрамовіч А.А. «Dum spiro spero – Пакуль жыву, спадзяюся« (2007); «Зроднены з культурай» (2008); «Погляд у вечнасць. Да 75 годдзя Уладзіміра Конана» (2009); «Жыццё і лёс Адама Чопчыца» (2012); «Культура – прафесія не для слабых. Да 70-годдзя Валерыя Будняцкага» (2014); «Неўтаймаваны: да 70-годдзя Мікалая Дудчанкі» (2015); «ДаброМ адгукнецца» (да 25-годдзя Мінскага фальклорнага калектыву «Мілавіца» і творчасці яго кіраўніка Марыі Снітко, 2017).

Аўтар артыкулаў у энцыклапедыях «Беларускі фальклор» (2005, 2006), «Этнаграфія Беларусі» (1989), «Культура Беларусі» (2010–2016), энцыклапедычным даведніку «Беларускія народныя танцы, карагоды, гульні» (1989), у часопісах Весці АН БССР (1991), «Мастацтва Беларусі» (1990, 1991, 1995, 1997, 1998), «Інфармацыйны веснік БелІПК», «Тэатральная Беларусь» (1995), «Живая старина» (М., 2001), у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» (1980, 1981, 1983, 1990, 1999), «Культура» (2007, 2012, 2014, 2017, 2018), «Краязнаўчая газета» і інш.



### *КРАЧКОЎСКАЯ Алена Валер'еўна*

*Педагог, метадыст, сцэнарыст, рэжысёр, дызайнер.*

Нарадзілася 11.06.1973 г. у в. Лошніца Барысаўскага р-на Мінскай вобл.

З залатым медалём скончыла Лошніцкую сярэднюю школу, вучылася ў Барысаўскім педагагічным каледжы. У 2001 г. скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка па спецыяльнасці «педагогіка і методыка пачатковага навучання». Мае пасведчанне аб заканчэнні Лошніцкай музычнай школы па класу «цымбалы».

Працуе ў Мётчанскай школе з 1991 г. Пачынала як настаўнік пачатковых класаў, пэўны час была метадыстам па дашкольным выхаванні, намеснікам дырэктара па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце. Выкладала сусветную мастацкую культуру і прадметы этнаграфічнага кірунку «Фальклорны тэатр», «Мастацтва вуснага слова».

З 2004 г. і ў цяперашні час – намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці (вучэбная работа) і настаўнік пачатковых класаў вышэйшай катэгорыі. Выкладае вучэбны прадмет «Мастацтва (сусветная і айчынная мастацкая культура)». Актыўна ўкараняе ў адукацыйную сістэму школы і дзіцячага садка прынцыпы рэспубліканскага праекта «Фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня"».

На працягу ўсяго часу працы ў школе Алена Валер'еўна праявіла сябе найперш як выдатны педагог, які мае глыбокія веды па методыцы і псіхалогіі навучання і ўмела прымяняе іх на ўроках, у пазакласнай і пазашкольнай рабоце.

Сцвердзіла сябе як таленавіты чалавек і нястомны рэфарматар, намаганні якога скіраваны на стварэнне змястоўнага і эстэтычнага адукацыйнага асяроддзя, умоў для фарміравання адукаванай, нацыянальна свядомай, грамадска актыўнай, па-мастацку адоранай асобы вучня.

Вызначальнай рысай педагога з'яўляецца разуменне важнай ролі і ўплыву на станаўленне асобы дзіцяці традыцыйных форм народнага мастацтва. Выхаванцы Алены Валер'еўны заўсёды актыўныя, яны з задавальненнем займаюцца мастацкай дзейнасцю, ахвотна танцуюць, спяваюць, малююць, чытаюць вершы, удзельнічаюць у школьных тэатральных пастаноўках.

А.В. Крачкоўская – удзельнік рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый, сярод якіх: «Традыцыйная культура і дзеці» (2004–2010), «Мядоцкія чытанні» (1997–2016). Аўтар шматлікіх дакладаў і артыкулаў у рэспубліканскіх, абласных і раённых СМІ («Вясковы псеўданім», «Народная інструментальная музыка Мядоччыны» (2002), «Разважанні аб выхаванні асобы ў сучаснай вясковай школе» (2006),

«Канцэрт на вясковай вуліцы» (2009), «Насуперак. Творча. Настойліва» (2011), «Сваім калегам гімн спяваю…» (2014), «Рабі тое, што любіш, любі тое, што робіш» (2016) і інш.

Дарадца і куратар дзейнасці Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага гурту «Берагіня», сцэнарыст і вядучы яго юбілейных і святочных імпрэз. Актыўны ўдзельнік працы па рэалізацыі праекта «Традыцыйная культура і дзеці», адзін з арганізатараў міжшкольнага конкурсу танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (в. Лошніца, 2003). Стваральнік і кіраўнік дзіцячага фальклорнага калектыву «Зярняткі» (2002–2004).

Уваходзіла ў склад журы IV Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2004), Міжнароднага конкурсу фальклорнага мастацтва «Драўлянскі джэрэла» (г. Роўна, Украіна, 2006).

Аўтар і кіраўнік абласнога педагагічнага праекта «Укараненне мадэлі адукацыйнага працэсу па выхаванню дзяцей сродкамі традыцыйнай народнай культуры і мастацтва». У дадзены час працуе над стварэннем рэспубліканскага педагагічнага праекта «Укараненне этнакультурных тэхналогій дзеля пашырэння і ўзбагачэння адукацыйнага асяроддзя ўстановы адукацыі».

Узнагароджана Ганаровымі граматамі Мінскага абласнога ўпраўлення адукацыі (2005), раённага аддзела адукацыі, спорту і турызму Барысаўскага райвыканкама (2017).



**КРУГАЛЬ Антаніна Віктараўна**

*Краязнавец, работнік культуры, рэжысёр, сцэнарыст, вядучы гарадскіх, раённых, абласных конкурсаў і свят народнай і аматарскай творчасці, выканаўца народных песень, збіральнік фальклору.*

Нарадзілася 03.04.1956 г. у в. Буда Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Віцебскае вучылішча культуры (1975) па спецыяльнасці «кіраўнік самадзейнага драматычнага калектыву».

Працавала мастацкім кіраўніком Валосавіцкага сельскага дома культуры (1975), стварыла і з'яўлялася кіраўнікам фальклорнага калектыву гэтай установы. Пад яе кіраўніцтвам сістэматызаваны фальклорны матэрыял пра звычаі, абрады, песні, танцы в. Валосавічы, гісторыю вёскі. Сабраныя матэрыялы выкарыстоўвала ў культурных мерапрыемствах: «Вячоркі» (1977–1979), «Сустрэчы з майстрамі» (1979), «Бабуліны песні» (1977, 1980) і інш. Збіраючы інфармацыю аб спадчыне свайго краю, спецыяльную ўвагу ўдзяляла мясцовым асаблівасцям узораў розных відаў народнага мастацтва.

У 1981–1990 гг. – інструктар, метадыст Акцябрскага раённага дома культуры. На гэтай пасадзе ладзіла раённыя святы: «Свята ўраджаю» (1981–1987), «Рудабельскі кірмаш» (1984, 1986, 1988), «Восеньскі кірмаш» (1989, 1990), «Восеньскія ўзоры» (1986–1989), удзельнікамі якіх былі выканаўцы народных песень, музыкі, танцаў – індывідуальныя выканаўцы, аўтэнтычныя гурты, дзіцячыя і маладзёжныя фальклорныя калектывы з установаў культуры Акцябрскага і памежных раёнаў.

З 1990 г. – загадчык, а затым дырэктар арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры. Ініцыіруе і разам з супрацоўнікамі цэнтра ажыццяўляе збор інфармацыі аб духоўных скарбах продкаў (старадаўнія і бытуючыя святы, абрады, звычаі, творы народнай прозы і музычнага мастацтва...), арганізуе перадачу іх малодшаму пакаленню, асабліва падчас падрыхтоўкі і правядзення раённых тураў і заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Збіраючы спадчыну свайго краю, А.В. Кругаль пераймала ад носьбітаў мастацкіх традыцый народны спеўны і танцавальны рэпертуар, майстэрства вышыўкі крыжыкам, вязання пруткамі і шыдэлкам.

Метадычным цэнтрам пад кіраўніцтвам А.В. Кругаль у летні перыяд на адкрытай пляцоўцы сістэматычна праводзіліся святы народнага мастацтва. Асаблівую ўвагу сярод іх надавалі святу дзіцячай творчасці «Бабулін куфэрак» (1990–1997): дзіцячым калектывам з в. Дзербін, Валосавічы, Любань, Шкава, Новая Дуброва,

Воземля, Ляскавічы, Забалацце, Красная Слабада, Парэчча, Гарохавішчы давалася магчымасць самапраявіцца ў адноўленых і перанятых імі ад старэйшых месцічаў абрадах, звычаях, святах сваіх вёсак.

Арганізоўвала працу рабочых груп на фестывальнай «Берагіні» (1999–2014), каардынавала тэхнічную і ўзнагародную часткі падрыхтоўкі і рэалізацыі конкурсных праграм і намінацый, правядзенне прэзентацый і аглядаў аўтэнтычных гуртоў і гасцявых фальклорных калектываў, выступленні ўдзельнікаў фестывалю ў гаспадарках раёна і інш.

З 2015 г. працуе метадыстам-майстрам у доме рамёстваў, узначальвае майстэрню па саломкапляценню. Яе фарміраванне прымала ўдзел у раённым фестывалі «Вянок рудабельскіх талентаў» (2016), у свяце народнай творчасці на IX Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2016); вучаніца А.В. Кругаль – удзельніца ўзорнага фальклорнага ансамбля «Праменьчыкі» Арына Лучыновіч была адзначана дыпломам у намінацыі «Саломкапляценне» праграмы «Дэкаратыўна-прыкладная творчасць». Падрыхтавала разам з навучэнцамі сувенірную прадукцыю для ўдзельнікаў і гасцей X фестывалю «Берагіня».

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (1978, 1980, 1999, 2001, 2002, 2010), Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2003, 2011), Ганаровай граматай Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў (1999).



***КУЛАК Юлія Анатольеўна***

*Фалькларыст, работнік культуры.*

Нарадзілася 04.02.1993 г. у в. Валосавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2015) па спецыяльнасці «народнае мастацтва», спецыялізацыя «этнафоназнаўства».

Падчас вучобы спявала ў фальклорных калектывах кафедры этналогіі і фальклору «Этна-суполка» (кіраўнік Т. Пладунова) і «Талака» (кіраўнік В. Калацэй); удзельнічала ў фальклорным фестывалі «Baltika–2014» (г. Вільнюс), VI адкрытым фестывалі фальклорнага мастацтва «Радавод» (г. Кобрын, 2016), VII і VIII Міжнародных фестывалях-конкурсах «Вселиственный венок» (г. Санкт-Пецярбург, 2012, 2014),

Прыняла ўдзел у IV, V, VI Рэспубліканскіх фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2006, 2008, 2010) у якасці ўдзельніка турніра дзіцячых фальклорных калектываў, конкурсу танцавальных пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў, III Рэспубліканскага турніру салістаў-выканаўцаў твораў народнай спадчыны (г. Лепель, 2010). Неаднаразовы ўдзельнік Міжнароднай навукова-практычнай канфэрэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (г. Мінск, БДУКМ, 2012, 2014).

З 2015 г. працуе метадыстам па традыцыйнай культуры арганізацыйна-метадычнага аддзела дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна» і мастацкім кіраўніком узорнага фальклорнага ансамбля «Некрашынка» Валосавіцкага сельскага дома народнай творчасці, у якім калісьці пачынала сваю творчую дзейнасць.

З’яўляецца актыўным прапагандыстам беларускага фальклорнага мастацтва. Вывучае, зберагае, папулярызуе мастацкія традыцыі Акцябрскага раёна. Дапамагае творчым калектывам раёна ў падборы рэпертуару, фарміруе канцэртныя праграмы фальклорных калектываў. Займаецца экспедыцыйнай дзейнасцю, арганізуе сустрэчы і гутаркі з носьбітамі музычнага і танцавальнага фальклору; збірае, вывучае і запісвае абрады, звычаі, «танцавальны этыкет», народныя песні і прыпеўкі, навучае гэтаму ўдзельнікаў калектыву. Распрацоўвае метадычны матэрыял, рыхтуе матэрыялы для зборнікаў па традыцыйнай культуры. З’яўляецца ўдзельнікам народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская

пацеха» і народнага вакальнага ансамбля «Івушка» ДУК «Акцябрскі цэнтр вольнага часу».

Арганізатар XIII Рэспубліканскага конкурсу дуэтаў-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў (2016), I Рэспубліканскага конкурсу салістаў-выканаўцаў беларускіх народных традыцыйных танцаў (2016); вядучая і арганізатар прэзентацыі мастацкіх праграм аўтэнтычных гуртоў IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2016).

Узнагароджана падзякай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2016); падзякай РКГА «БРСМ» (2016), падзякай ДУК «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна» (2016), Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2016).



## *КУРСЕВІЧ Карына Анатольеўна*

*Педагог, работнік культуры.*

Нарадзілася 06.12.1987 г. у в. Парэчча Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны (2010), атрымала кваліфікацыю «выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін»; у 2017 г. – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

З 2009 г. працавала настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства дзяржаўнай установы адукацыі «Парэцкі дзіцячы сад–сярэдняя школа», з'яўлялася загадчыкам школьнага гісторыка-этнаграфічнага музея, кіраўніком этнаграфічнага гуртка. Яшчэ са школьных гадоў пачала вывучаць гісторыю і фальклор сваёй малой радзімы. Разам з навучэнцамі школы, настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры выязджала з экпедыцыямі ў вёскі Парэцкага сельскага савета, дзе запісвалі народныя казкі, паданні, песні, вывучалі побытавыя танцы. Падчас заняткаў у гуртку складалі фальклорныя зборнікі, этнаграфічныя і тапанімічныя карты сельскага савета. У працэсе выхаваўчай работы ладзілі шматлікія фальклорныя святы, майстар-класы, на якія запрашаліся носьбіты традыцыйнай культуры (Лошч В.М., Русакевіч К.Ф., Раманоўская Р.М., Матусевіч Г.С. і інш.).

З 2013 г. – галоўны захавальнік фондаў дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна», з 2014 г. – дырэктар гэтай установы (музея).

Падчас экспедыцый па Акцябрскаму раёну супрацоўнікі ўстановы вывучаюць фальклорную творчасць, мастацкія традыцыі, народны побыт, гісторыю рэгіёна, ажыццяўляюць збор музейных экспанатаў, якія характарызуюць багатую народную спадчыну краю (у фондах музея змешчаны калекцыі традыцыйнага адзення, прадметаў побыту і этнаграфіі, прадметаў ужытку і г.д.).

Аднавіла дзейнасць этна-студыі «Батлейка», дзе наведвальнікі цэнтра знаёмяцца з гісторыяй узнікнення «Батлейкі», прымаюць удзел у батлеечных спектаклях і майстар-класах па вырабу лялек.

У экспазіцыйных залах музея створаны раздзел «З гісторыі развіцця фестывальнага фальклорнага руху», у якім змешчана разнастайная інфармацыя аб Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня», розныя фестывальныя фотасюжэты, друкарская прадукцыя, падарункі гасцей, творы ўдзельнікаў конкурсу дэкаратыўна-побытавага мастацтва і інш.

У перыяд падрыхтоўкі да заключных мерапрыемстваў «Берагіні» з'яўлялася арганізатарам тэматычных выставак па розных відах традыцыйнай культуры беларусаў. Сярод іх «Беларускія народныя музычныя інструменты», «Вясельныя строі Рудабельшчыны і ваколіц», «Ручнік у прасторы і часе», «Ручнік – льняныя крылы» і г.д.

Узнагароджана граматай Акцябрскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за актыўную і плённую работу, садзейнічанню прафсаюзу ў рэалізацыі праграм яго дзейнасці (2016); падзякай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта за шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае мастэрства (2017); Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта за сумленную працу, высокае прафесійнае мастэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах (2017).



***МАРТЫНЕНКА Алена Іванаўна***

*Работнік культуры.*

Нарадзілася 03.04.1982 г. у в. Старая Дуброва Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С. Пушкіна (2005), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2012).

З 2004 г. – бібліятэкар аддзела абслугоўвання, потым намеснік дырэктара Акцябрскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. З 2016 г. і па сённяшні дзень – дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Акцябрская раённая бібліятэка». Пад кіраўніцтвам Алены Іванаўны бібліятэкі раёна ў рамках Рэспубліканскага фестывальнага праекта «Берагіня» праводзяць мэтанакіраваную работу па адраджэнню, захаванню і распаўсюджванню народнай спадчыны Рудабельскага краю.

Актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама, з'яўлялася ўдзельніцай вакальна-харэаграфічнага ансамля «Рудабельская пацеха», народнага хору работнікаў культуры.

Прымала ўдзел у якасці куратара калектываў-удзельнікаў V, VI, VII Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня»: дзіцячага фальклорнага калектыву «Астраначка» Стара-Дзедзінскага сельскага клуба Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці; дзіцячага фальклорнага калектыву Гайгалаўскай асноўнай школы Рэзекненскага краю «Purinens» (Латвія); народнага фальклорнага ансамбля імя Паўла Бакланава факультэта філалогіі і журналістыкі Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта імя У.Г. Караленкі «Жива вода».

Узнагароджана падзякамі раённага выканаўчага камітэта, граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2015, 2017).



***МАРТЫНЕНКА Сяргей Васільевіч***

*Работнік культуры, арганізатар дасугавай дзейнасці, вядучы канцэртных праграм, раённых, абласных, рэспубліканскі свят.*

Нарадзіўся 18.06.1977 г. у в. Калыбань Брагінскага р-на Гомельскай вобл.

У 1997 г. скончыў Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці, кіраўнік кінафота-відэастудыі».

З гэтага ж году пачаў працаваць у раённым арганізыцыйна-метадычным цэнтры вядучым спецыялістам па арганізацыі дасугавай дзейнасці дзяцей і падлеткаў. З 2003 г. – дырэктар маладзёжна-аздараўляльнага цэнтра дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасци Акцябрскага раёна». Са спецыялістамі цэнтра праз інфармацыйна-адукацыйныя мерапрыемствы фарміруе навыкі здаровага ладу жыцця ў падлеткаў і моладзі, далучае іх да заняткаў спортам. Добра ведае і валодае магчымасцямі фота- і відэатэхнікі. Прымае ўдзел у народным вакальна-харэаграфічным ансамблі «Рудабельская пацеха» і ў мужчынскай спеўнай групе гэтага ж калектыву. З'яўляецца вядучым раённых, абласных, рэгіянальных, рэспубліканскіх свят народнай творчасці, дзяржаўных свят. Набыты творчы вопыт Сяргей Васільевіч выкарыстоўвае падчас правядзення заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2001–2018): нязменны вядучы адкрыцця і закрыцця фестывалю, іншых фестывальных мерапрыемстваў. Фотаздымкі, зробленыя ім, змешчаны ў даведніках «Берагіня», а відэаздымкі фестывальных праектаў і мастацкага побыту склалі аснову архіва па народных традыцыях, святах і абрадах; прэзентацый і выступленняў дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў, аўтэнтычных гуртоў, салістаў-спевакоў, музыкаў, танцораў, апавядальнікаў народнай прозы, майстроў розных народных умельстваў Акцябрскага раёна.

Дэпутат раённага Савета дэпутатаў 25 і 28 скліканняў.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканакама (2001, 2006, 2014, 2015, 2017), Ганаровай граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта (2009), Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2016).



## *МАСКАЛЁВА Тамара Ермалаеўна*

*Работнік культуры, арганізатар, сацыякультурны дзеяч.*

Нарадзілася 02.10.1954 г. у в. Сялец, Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум па спецыяльнасці «бібліятэкар» (1981).

У 1978–1993 гг. працавала ў Акцябрскай раённай бібліятэцы: бібліятэкарам чытальнай залы, выконваючай абавязкі загадчыка дзіцячай бібліятэкі і загадчыка аддзела камплектавання бібліятэчнай сістэмы.

З 1993 г. па 2012 г. – дырэктар Акцябрскага цэнтра вольнага часу. Арганізоўвала дзейнасць клубных фарміраванняў, калектываў аматарскай творчасці. Была ўдзельнікам народных ансамбляў «Івушка», «Рудабельская пацеха», народнага хору работнікаў культуры. З 2012 г. метадыст, а з 2014 г. – загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела дзяржаўнай установы «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна». Арганізуе работу па даследаванню, вывучэнню стану і працэсу развіцця традыцыйнай народнай творчасці; метадычным забеспячэнні і рэалізацыі абласных, раённых сацыяльна-культурных праграм; арганізацыі павышэння прафесійнага ўзроўню работнікаў культурна-дасугавай сферы на аснове розных форм вучэбных мерапрыемстваў; аказанні метадычнай і практычнай дапамогі сельскім клубным установам культуры па асноўных напрамках работы; інфармацыйна-выдавецкай дзейнасці (абагульненне і распаўсюджванне вопыту работы ўстаноў культуры ў СМІ); арганізацыі і правядзенні раённых аглядаў, конкурсаў, фестываляў па розных жанрах народнай творчасці і культурнай дзейнасці.

Аўтар распрацоўкі пакета дакументаў раённага фестывалю «Аграфэст» (прапаганда і папулярызацыя сельскіх традыцый і перспектыў сацыяльна-культурнага развіцця аграгарадкоў і вёсак раёна).

Разам з многімі работнікамі культуры Акцябрскага раёна Т.Е. Маскалёва стаяла ля вытокаў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» і на працягу 20 год, працуючы на розных пасадах, рупілася аб жыццядзейнасці і развіцці гэтага беларускага нацыянальнага мастацкага феномена.

На пасадзе дырэктара Акцябрскага цэнтра вольнага часу забяспечвала правядзенне заключных імпрэз фестывалю, арганізоўвала працу спецыялістаў установы ў мностве напрамкаў падрыхтоўкі і правядзення розных фестывальных

мерапрыемстваў (1999–2012); узначальвала групу правядзення навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання», «круглых сталоў»; групу метадычнага забеспячэння фестывалю (адказвала за падрыхтоўку дакументацыі, збор і апрацоўку матэрыялаў для зборніка «“Берагіня”. X Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва» (2018) і інш.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама за шматгадовую працу (2000); за дасягненне лепшых паказчыкаў у адпаведнасці з умовамі спаборніцтва сярод устаноў культуры раёна (2001, 2004, 2014); дыпломам пераможца раённага конкурсу «Гордость профессии» ў намінацыі «Культура» (2015); Ганаровымі граматамі Гомельскага абласнога ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі (2004, 2014); Ганаровай граматай Беларускага фонду культуры «За падрыхтоўку і паспяховае правядзенне VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня”» (2010); дыпломам I ступені Гомельскага абласнога конкурсу інфармацыйна-выдавецкай дзейнасці (2017), юбілейнай медаллю Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «110 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі» (2017).

Калектыў арганізацыйна-метадычнага аддзела «Цэнтра культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна» пад кіраўніцтвам Т.Е. Маскалёвай узнагароджаны Ганаровай граматай і вымпелам Акцябрскага райвыканкама ў раённым спаборніцтве сярод арганізацый, вытворчых і структурных падраздзяленняў і працаўнікоў Акцябрскага раёна (2015, 2017), Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама за дасягненне лепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод устаноў культуры раёна ў намінацыі «Лучшее подразделение» (2015, 2017).



***ОСІПАЎ Павел Сяргеевіч***

*Рэжысёр, сцэнарыст, арганізатар і вядучы раённых, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемстваў.*

Нарадзіўся 06.10.1974 г. у в. Стары Двор Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

У 1994 г. скончыў Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «тэатральнае мастацтва» з прысваеннем кваліфікацыі «кіраўнік самадзейнага тэатральнага калектыву».

Працоўную дзейнасць распачаў у 1996 г. у якасці рэжысёра Акцябрскага цэнтра вольнага часу, дзе працуе мастацкім кіраўніком і па сённяшні час.

Аўтар сцэнічных распрацовак, рэжысёр літаратурна-музычных кампазіцый, прысвечаных дзяржаўным і святочным датам. Аўтар сцэнарыяў і рэжысёр-пастаноўшчык тэатралізаваных прадстаўленняў для дзяцей і іншых мерапрыемстваў цэнтра вольнага часу. Вядучы раённых свят, фестываляў, конкурсаў, святочных канцэртаў. Актыўны ўдзельнік народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская пацеха», народнага хору работнікаў культуры, вакальнай мужчынскай групы, выступае з сольнымі канцэртнымі нумарамі.

Падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ўваходзіў у групу вядучых-дыктараў; з’яўляўся пастаянным вядучым конкурсу танцавальных пар. Працаваў у складзе груп: рэжысёрска-пастановачнай, падрыхтоўкі адкрыцця і закрыцця фестывалю, народнага свята «Рудабельскае Купалле».

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі аддзела культуры (2002, 2007), Ганаровай граматай Акцябрскага выканаўчага камітэта (2007).



***СУХАЯ Наталля Аляксандраўна***

*Майстра выцінанкі, народны майстар Рэспублікі Беларусь, педагог.*

Нарадзілася 10.11.1976 г. у г. Маладзечна Мінскай вобл.

Скончыла дзіцячую мастацкую школу г. Маладзечна з чырвоным дыпломам. Выцінанцы навучалася ў славутай майстрыхі Вікторыі Мікітаўны Чырвонцавай. З 1994 г. па 1996 г. вучылася на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пры гарвыканкаме (пазней пры Маладзечанскім дзяржаўным музычным каледжы імя М.К. Агінскага). Паралельна наведвала некалькі мастацкіх студый у Маладзечна і Мінску. Моцны ўплыў на стылістычныя асаблівасці выцінанкі Наталлі Сухой аказала навучанне ў мастака-графіка Ю.П. Герасіменка-Жызнеўскага. У 2001 г. атрымала дыплом Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці «мастацкае праектаванне вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці».

Валоданне традыцыйнымі тэхнікамі тэкстыльнага мастацтва таксама аказала ўплыў на творчасць выцінаншчыцы.

З 1998 г. удзельнічае ў этнаграфічных экспедыцыях у складзе рэспубліканскага грамадскага аб’яднання «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Далучэнне да фальклорнай спадчыны сфарміравала тэматычную палітру вобразаў выцінанкі Н. Сухой: сюжэты народных песень увасабляюцца ў кампазіцыі, блізкія да наіўна-рэалістычнага жанра народнага мастацтва.

З 2002 г. па сённяшні дзень працуе ў дзяржаўнай установе «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці» на пасадзе вядучага метадыста па этнаграфіі.

З 2004 г. з’яўляецца выкладчыкам па выцінанцы ў абласной «Школе майстэрства». Публікуецца ў абласным і рэспубліканскім друку па профілю работы. Сябра Беларускага саюза майстроў народнай творчасці з 1997 г. З 2003 г. па 2009 г. узначальвала секцыю выцінанкі БСМНТ. Дзяржаўны стыпендыят 2005 г. па прапанове БСМНТ.

Як творца, пастаянна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках. Актыўны арганізатар выставак выцінанкі рознага ўзроўню. Аўтар і арганізатар праекта «Папяровы сусвет» (2005), адзін з адміністратараў блога «Беларуская выцінанка».

Ілюструе мастацкія выданні ў тэхніцы выцінанкі.

Творы Н.А. Сухой знаходзяцца ў музеях і прыватных калекцыях Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Швецыі, Польшчы, Германіі.

Прымала актыўны ўдзел у рэспубліканскім фестывальным фальклорным руху «Берагіня»: ад Мінскай вобласці вызначала, рыхтавала і арганізоўвала ўдзел дзіцяча-маладзёжных фальклорных калектываў, аўтэнтычных гуртоў, рознаўзроставых танцавальных пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў у заключных мерапрыемствах фестывалю (2002–2016). Ініцыіравала ўдзел кіраўнікоў фальклорных калектываў, навучэнскай і працоўнай моладзі ў рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання», якія праводзіліся ў рамках «Берагіні» (2004, 2006, 2008, 2018).

Аўтар Мінскай абласной праграмы «Традыцыйная культура і дзеці /2006–2010/» (2006), якая грунтавалася на метадалагічных асновах рэспубліканскага эксперыментальнага праекта «Танцавальны фальклор і дзеці. 2001–2003 гг.» і прынцыпах рэспубліканскага праекта «Традыцыйная культура і дзеці. Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2001). Аўтар праектаў М.А. Козенка.

Кіраўнік групы падрыхтоўкі і правядзення рэгіянальных тураў рэспубліканскай «Берагіні» пад назвай «Мінская кадрыля» (2015, 2017).

*Тв. працы* (удзел у выстаўках, святах-конкурсах і фестывалях):

Нацыянальная выстаўка народнай творчасці «Вечназялёнае дрэва рамёстваў» (Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, 1996); штогадовая Рэспубліканская справаздачная-выстаўка БСМНТ «Калядныя ўзоры» (г. Мінск, 1997–2017); Рэспубліканская выстаўка мастацтва выцінанкі «Папяровы сусвет» (г. Мінск, 2005); фестываль сярэднявечнай культуры «Лошыцкі фэст» (г. Мінск, 2005); ІІ Нацыянальная выстаўка народнай творчасці «Жывыя крыніцы» (Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, 2006); Міжнародны сімпозіум «Проблемы сохранения и развития искусства вырезания из бумаги» (г. Дамадзедава /Расія/, 2006); персанальная выстаўка «Papierki» сумесна з Вольгай Бабурынай (г. Мінск, 2006); Рэспубліканская выстаўка-конкурс выцінанкі «Папяровы сусвет» (г. Мінск, 2008); выстаўка «Беларуская і літоўская выцінанка» (г. Варшава / Польшча/, Музей народнага мастацтва Мар’яна Пакропэка, 2008); выстаўка беларускай і польскай выцінанкі (г. Врэдэн/ Германія/, 2008–2009); Міжнародны сімпозіум «Художественный замысел и его воплощение средствами вырезания» (г. Масква /Расія/, 2008); Міжнародная выстаўка «Бумажное Рождество» (г. Масква /Расія/, Народная галерэя Расійскага дзяржаўнага дома народнай творчасці, 2013, 2014); «Зялёныя святкі» (г. Магілёў, 2013, 2014); персанальная выстаўка «Мая міфалогія» (г. Мінск, 2015); выстаўка «Вера праз мастацтва нажніц і паперы» (г. Гродна, 2014); Міжнародны сімпозіум па праблемах выразання з паперы, прысвечаны памяці знакамітых беларускіх майстроў Вікторыі Чырвонцавай і Вячаслава Дубінкі «Мастацкае выразанне: форма і колер» (г. Маладзечна, 2016); выстаўка «Вянок», прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча (г. Мінск, 2016); выстаўка-кірмаш да Дзён Швецыі ў Мінску (г. Мінск, 2017); Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (г. Віцебск, 2017); выстаўка «Выцінанкі-забаўлянкі» сумесна з Вольгай Бабурынай (г. Віцебск, 2017).



**_СУХАЯ Таццяна Мікалаеўна_**

*Работнік культуры, хармайстар, сцэнарыст, арганізатар забаўляльных і святочных мерапрыемстваў, вядучы раённых, абласных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў.*

Нарадзілася 28.08.1977 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

У 1997 г. скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «кіраўнік народнага хору».

З 1997 г. па 2017 г. – кіраўнік народнага вакальнага ансамбля «Івушка» Акцябрскага цэнтра вольнага часу – удзельніка раённых і абласных аглядаў і конкурсаў. З 2017 г. Т.М. Сухая ўзначаліла народны хор ветэранаў «Спадчына»; пад яе кіраўніцтвам калектыў атрымаў новы творчы імпульс: абнаўляецца рэпертуар, асаблівае месца займаюць песні грамадзянска-патрыятычнага кірунку; прымае актыўны ўдзел у раённых мерапрыемствах, выступае з сольнымі канцэртнымі нумарамі.

З 2008 г. да цяперашняга часу працуе дырэктарам дзяржаўнай установы «Культурна-забаўляльны комплекс “Бубнаўка”».

Падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ўваходзіла ў групу вядучых-дыктараў. Нязменная вядучая конкурсу пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў. Распрацоўвала сцэнарыі канцэртаў і прэзентацый беларускіх і замежных фальклорных калектываў; вяла работу па арганізацыі іх выступленняў ва ўстановах культуры Акцябрскага раёна і за яго межамі; уваходзіла ў склад групы размяшчэння гасцей фестывалю.

Неаднаразова ўзнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2013, 2014, 2017), Ганаровымі граматамі Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта (2018) і галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2018), Граматай Гомельскага абласнога аб’яднання «Беларускі фонд міра» (2015).



***ТАРАКАНАВА Марына Леанідаўна***

*Харэограф, артыстка ансамбля народнага танца, настаўнік, кіраўнік самадзейных танцавальных калектываў, метадыст па харэаграфічным мастацтве.*

Нарадзілася 05.04.1950 г. у в. Буда-Лельчыцкая Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Беларускае дзяржаўнае харэаграфічнае вучылішча (1971).

З 1972 г. пачала працаваць у Гомельскім абласным доме народнай творчасці метадыстам па харэаграфічным мастацтве. Працуючы на гэтай пасадзе, шмат увагі надавала павышэнню прафесійнага ўзроўню кіраўнікоў танцавальных калектываў вобласці праз розныя формы вучобы – семінары-практыкумы, курсы павышэння кваліфікацыі, творчыя лабараторыі, дзе вывучэнне тэарэтычных дысцыплін спалучалася з практычнымі заняткамі, знаёмствам з вучэбна-рэпетыцыйнай дзейнасцю лепшых калектываў Гомельшчыны і суседніх абласцей.

Арганізоўвала стажыроўкі кіраўнікоў харэаграфічных калектываў на базе рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў: «Славянскі базар» (г. Віцебск), «Сожскі карагод» (г. Гомель), «Зямля пад белымі крыламі» (Мазыр), «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1993, 1994, 1996, 1999, 2000); творчыя сустрэчы і абменныя канцэрты паміж калектывамі вобласці і рэспублікі: «Юнацтва» (г. Бабруйск), «Рэха» (г. Столін), «Фантазія» (г. Мазыр), «Калі ласка» (г. Жлобін) і інш.

Аказвала практычную і метадычную дапамогу кіраўнікам харэаграфічных калектываў да атэстацыі на прысваенне наймення «народны (узорны) аматарскі калектыў». За час працы ганаровае найменне было нададзена каля 50 харэаграфічным калектывам розных ведамстваў Гомельскай вобласці і г. Гомеля.

Абагульняла вопыт работы лепшых танцавальны калектываў вобласці: народнага ансамбля танца «Прыпяць» Тураўскага ГДК Жыткавіцкага раёна, узорных калектываў «Верасок» Акцябрскага РДК і Капаткевіцкага ГДК Петрыкаўскага раёна, «Надзея» Рагачоўскай дзіцячай мастацкай школы і інш.

Была ініцыятарам правядзення ў Гомельскай вобласці конкурсу на лепшае выкананне беларускага танца (1975), конкурсу танцавальных пар-выканацаўцаў народна-побытавых танцаў «Вытокі» (з 1999 г.) і абласнога мемарыяльнага фестывалю імя народнага артыста БССР А.А. Рыбальчанкі (з 2004 г.).

Найбольшы плён працы Марыны Леанідаўны Тараканавай у рэалізацыі сацыякультурных праектаў у галіне харэаграфічнага мастацтва Гомельскай вобласці прыпадае на перыяд рэалізацыі нацыянальнага праекта Рэспубліканскі фесты-

валь фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016), падчас якога яна вяла актыўную дзейнасць па аднаўленню танцавальнага фальклору і перадачы яго дзецям, падлеткам і моладзі, пашырэнню гэтага руху на Гомельшчыне. Пра гэта гаворыць станоўчая дынаміка ўдзелу танцавальных пар у разнастайных конкурсах народнай харэаграфіі: так, у 1999 г. у абласным конкурсе танцавальных пар-выканаўцаў народна-побытавых танцаў прынялі ўдзел 73 танцавальныя пары (вучні 2–11 класаў) з сямі раёнаў вобласці; у другім конкурсе (2002) – 84 пары з 9 раёнаў; у III (2005) – 134 пары з 17 раёнаў вобласці; у IV (2008) – 150 танцавальных пар з 20 раёнаў Гомельшчыны. Адметнасцю апошняга конкурсу з'явілася ўключэнне ў яго склад 6-й ўзроставай групы – носьбітаў танцавальнага фальклору. У цэлым, узрост удзельнікаў вагаўся ад 8 да 75 гадоў. Такое прадстаўніцтва садзейнічала пераемнасці сапраўднай народнай манеры выканання, выразнасці і высокароднасці пластычных рухаў, народнага этыкету.

На працягу наступных гадоў гэта тэндэнцыя працягвалася: на V (2011), VI (2013) і VII (2015) абласных конкурсах выканаўцаў народна-побытавых танцаў прынялі ўдзел у кожным з іх да 174 танцавальных пар з больш за 60 устаноў культуры Гомельшчыны; у фінале VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2010) чатыры танцавальныя пары з Гомельскай вобласці сталі лаўрэатамі.

М.Л. Тараканава прымала ўдзел у арганізацыі і правядзенні абласных тураў усесаюзных і рэспубліканскіх аглядаў народнага мастацтва, была членам журы, экспертных груп міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога фестываляў і конкурсаў, сярод якіх: Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Зямля пад белымі крыламі» (г. Мазыр, 2002); I, II, III, IV Рэспубліканскія фестывалі народнага танца «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1993, 1994, 1996, 1999); Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 1999, 2001, 2004, 2010).

Зараз працуе ў Новагуцкай дзіцячай школе мастацтваў настаўнікам па харэаграфіі (выкладае дысцыпліну «Гісторыка-побытавы танец»).



***ФІЛІПШАНАВА Алена Аляксандраўна***

*Работнік культуры, рэжысёр, сцэнарыст, вядучы гарадскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх культурных мерапрыемстваў.*

Нарадзілася 14.01.1967 г. у в. Ляскавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Беларускі інстытут культуры па спецыяльнасці «культурна-асветніцкая работа» (1988).

Пасля вучобы працуе ў Акцябрскім раёне на пасадзе інструктара раённага дома культуры (1988–1990), рэжысёра (1990–1992), галоўнага рэжысёра (1992–1994), загадчыка сектара па асноўнай дзейнасці (1994–1998); з 1998 г.– намеснік дырэктара, з 2013 г. – дырэктар Акцябрскага цэнтра вольнага часу.

Аўтар сцэнарыяў урачыстых вечароў, святочных канцэртаў, цырымоній, прафесійных свят, стылізаваных абрадаў і інш. Вядучая рэгіянальных, раённых, гарадскіх культурных мерапрыемстваў. Арганізуе дзейнасць устаноў культуры, работу клубных фарміраванняў, калектываў аматарскай творчасці (мае 7 калектываў са званнем «народны», «узорны»), работу з дзецьмі, дарослым насельніцтвам. Спявала ў народным ансамблі «Івушка», народным хоры работнікаў культуры.

Кіраўнік рэжысёрска-пастановачнай групы, памочнік галоўнага рэжысёра заключных мерапрыемстваў, сцэнарыст цырымоній адкрыцця і закрыцця Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»; іх вядучая (1999–2018).

Узнагароджана дыпломам I ступені рэспубліканскага конкурсу метадычных служб (1990), Ганаровымі граматамі Акцябрскага райвыканкама: «Спецыяліст года» (2001, 2003, 2014), «Дырэктар года» сярод работнікаў гарадскіх устаноў культуры (2015, 2017), як пераможца раённага спаборніцтва сярод працоўных калектываў, арганізацый «Установа года» (2016); Ганаровай граматай Гомельскага абласнога ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі за шматгадовую працу (2017).



### *ХАЛАДОК Таццяна Васільеўна*

*Харэограф, метадыст-майстар, даследчык народнай дэкаратыўна-побытавай творчасці, сцэнарыст, арганізатар выставачнай дзейнасці.*

Нарадзілася 09.10.1971 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «кіраўнік самадзейнага харэаграфічнага калектыву» (1989), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры (2003).

За час працы ў галіне культуры прайшла шлях ад мастацкага кіраўніка сельскага дома культуры да дырэктара раённага дома рамёстваў (з 1999 г.).

Шмат увагі надае праблемам адраджэння, захавання і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў Акцябрскага раёна.

Даследчык, майстар па вышыўцы, саломапляценню, аўтар публікацый: «Танцавальны фальклор Акцябршчыны», «Традыцыйная мастацкая культура Акцябрскага раёна», «Рэгіянальныя асаблівасці адзення Рудабельшчыны: формы і метады трансляцыі традыцыйнага мастацтва навучэнцам творчых майстэрань раённага Дома рамёстваў», «Традыцыйныя паясы Акцябршчыны», «Месца і роля ДУК "Акцябрскі раённы дом рамёстваў"» у аднаўленні, засваенні і папулярызацыі традыцыйнага мастацтва». З'яўляецца аўтарам сцэнарных распрацовак свят, конкурсаў, праектаў, канцэпцый выставак па дэкаратыўна-прыкладной творчасці – «Узорны паясок», «Вянок рудабельскіх талентаў», «Сузор'е сямейнага жыцця», «Край майстроў і творцаў», «Рудабельскі сувенір», «Мой край, зямля майго натхнення», «У свеце жаночай прыгажосці», «Восеньскі калаварот».

Суаўтар і выканаўца 5 калекцый адноўленых касцюмаў для ўзорных фальклорных калектываў Акцябрскага раёна, калекцыі вышываных ручнікоў. Кіраўнік аматарскага аб'яднання «Абярэг» па вырабу вясельных рэчаў і атрыбутыкі.

З'яўлялася памочнікам галоўнага рэжысёра Рэспубліканскага фествылю фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў праграме «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» (з 1999 г.), арганізатарам выставачных праектаў па розных відах традыцыйнага мастацтва Рудабельшчыны. Спецыялісты Акцябрскага раённага дома рамёстваў на чале з Т.В. Халадок падчас фестывалю забяспечвалі ўдзельнікаў і гасцей сувенірнай прадукцыяй.

Як удзельніца міжнародных мерапрыемстваў прадстаўляла народную культуру Бацькаўшчыны ў Расіі, Латвіі, Украіне, Турцыі, Польшчы, Францыі.

Т.В. Халадок – дыпламант і прызёр Рэспубліканскага фестывалю-кірмашу рамёстваў «Вясновы букет», Рэспубліканскага фестывалю фальклорнга мастацтва

«Берагіня», абласнога свята народнага мастацтва ў рамках Дня беларускага пісьменства «Адвечная прыгажосць» у намінацыі «вышыўка», абласнога свята-конкурсу аматарскай творчасці «Захапленне на любы густ» у намінацыі «вышыўка», «ткацтва» .

Узнагароджана граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за добрасумленную працу, значны ўклад у справу адраджэння і захавання нацыянальнай культуры (2015, 2018); Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама за шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах (2007); Ганаровай граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта (2015); Ганаровай граматай аддзела культуры за дасягненне найлепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод устаноў культуры і спецыялістаў за 2012 г. у намінацыі «Дырэктар года» (2013); Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай кработы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама за дасягненне найлепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод устаноў культуры і спецыялістаў за 2013, 2015, 2017 гг. у намінацыі «Установа года» (2014, 2016, 2018); Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама за дасягненне найлепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод устаноў культуры і спецыялістаў за 2016 г. у намінацыі «Спецыяліст года» (2017).

Калектыў Акцябрскага раённага дома рамёстваў пад кіраўніцтвам Таццяны Васільеўны Халадок уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за 2017 г. і дыпломам лаўрэата за значны ўклад у захаванне і папулярызацыю традыцыйных ткацкіх рамёстваў, актыўную выставачную дзейнасць.



***ХЛЫСТУНОВА Элеанора Анатольеўна***

*Дзеяч культуры, харэограф, сцэнарыст, рэжысёр.*

Нарадзілася 05.09.1948 г. у г. Гомель.

Скончыла з адзнакай Магілёўскае культасветвучылішча імя Н.К. Крупскай (1970), Мінскі інстытут культуры (1981), атрымала дыплом з адзнакай і кваліфікацыю «культасветработнік (арганізацыя і методыка культурна-асветніцкай работы)».

Першая пасада – старшы інспектар упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (1971–1980). У 1980 г. пераходзіць у Гомельскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы (з 1990 г. – абласны цэнтр народнай творчасці), дзе працуе на пасадзе намесніка дырэктара да 2011 г.

Тэарэтычныя веды і вопыт упраўленчай працы дапамаглі ёй у рамках кампетэнцыі вырашаць задачы па развіццю ў вобласці культурна-дасугавай дзейнасці, народнай творчасці і традыцыйнай культуры.

За доўгія працоўныя гады шмат зрабіла па ўдасканаленню методыкі клубнай работы. На яе рахунку дапамога стварэння раённых арганізацыйна-метадычных цэнтраў, арганізацыя іх дзейнасці.

Увяла ў практыку актыўныя формы, такія як дзелавыя гульні і конкурсы прафмайстэрства культработнікаў. Была ініцыятарам і арганізатарам конкурсу раённых аддзелаў культуры пад дэвізам «Пошук, пачын, ініцыятыва».

У мэтах стымулявання збераджэння і развіцця самабытнай традыцыйнай культуры Гомельшчыны разам са спецыялістамі цэнтра распрацоўвала ўмовы і арганізоўвала занальныя агляды-конкурсы фальклорнага мастацтва, абласныя конкурсы выканаўцаў побытавых танцаў, драўлянай скульптуры «Ажыўшая даўніна», выстаўкі дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Прымала ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні рэспубліканскіх фестываляў народнага гумару «Аўцюкі» і фальклорнага мастацтва «Берагіня». Была адным з аўтараў распрацоўкі канцэпцыі фестывалю этнакультурных традыцый «Кліч Палесся».

Курыравала стварэнне ўстаноў культуры новай тыпалогіі: дамоў і цэнтраў фальклору, рамёстваў, народных традыцый; пошуку і падрыхтоўцы ўнікальных «помнікаў» традыцыйнай культуры да надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Неаднаразова выступала ў ролі сцэнарыста і рэжысёра рамесніцкіх фэстаў Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод», рэспубліканскіх свят «Дажынкі» ў Мазыры і Рэчыцы, Дня беларускага пісьменства ў Хойніках.

Прымала актыўны ўдзел у выпрацоўцы сістэмы развіцця аматарскай творчасці. Абласным аглядам-конкурсам па вядучых відах мастацтва надаваліся імёны знакамітых землякоў: народнага артыста БССР А.А. Рыбальчанкі (харэаграфія), заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Т.К. Лапацінай (вакальна-харавыя спевы), Г.І. Жыхарава (інструментальныя аркестры і ансамблі); праводзіліся конкурсы па сучасных жанравых кірунках (дзіцячыя эстрадныя спевы) і кірунках дзейнасці аматарскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах.

За высокі прафесіяналізм і кампетэнтнасць кіраўніка, асабісты ўклад у працэс удасканальвання сістэмы арганізацыйна-метадычнай дзейнасці і народнай творчасці былы намеснік дырэктара цэнтра была ўзнагароджана ў розныя часы: Ганаровымі граматамі абласнога ўпраўлення культуры і Гомельскага аблвыканкама; дыпломамі і Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; Ганаровымі граматамі ЛКСМБ і УЛКСМ.



***ШАРАПАЎ Андрэй Вячаслававіч***

*Работнік культуры, музыкант-інструменталіст, гукааператар, гукарэжысёр.*

Нарадзіўся 20.10.1982 г. у г. Хойнікі Гомельскай вобл.

Скончыў Мазырскае музычнае вучылішча па класу «баян» (2002). Працаваў акампаніятарам (2002–2004), з 2002 г. – інжынер-гукааператар дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу».

Валодае добрымі прафесійнымі навыкамі, ведае спецыфіку культурна-асветніцкай работы, эксплуатацыйныя магчымасці гукаўзмацняльнай апаратуры. Запісвае і апрацоўвае фанаграмы (мінус) для салістаў і калектываў цэнтра вольнага часу, з'яўляецца акампаніятарам народнага хору ветэранаў «Спадчына». Праводзіць актыўную работу па падрыхтоўцы працоўных калектываў прадпрыемстваў і арганізацый да іх удзелу ў аглядах-конкурсах аматарскай творчасці, канцэртах і фестывалях. Быў удзельнікам народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская пацеха» і вакальнай мужчынскай групы ў яго складзе. Калектывы прымалі ўдзел у розных раённых, абласных, рэспубліканскіх культурных мерапрыемствах.

Набыты творчы вопыт Андрэй Вячаслававіч з поспехам прымяняе падчас правядзення заключных імпрэз Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2004–2016). Ён – нязменны гукааператар фестывальных мерапрыемстваў, сярод якіх – конкурсы пар-выканаўцаў беларускіх народных танцаў, спеўных і інструментальных ансамбляў, таксама прэзентацыі праграм фальклорных калектываў Беларусі, замежных творчых груп і інш.; агучваў народнае свята «Рудабельскае Купалле», свята народных рамёстваў, канцэртаў адкрыцця і закрыцця фестывалю і шматлікіх іншых фестывальных падзей.

Узнагароджаны Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама за актыўны ўдзел у культурным жыцці раёна (2007); па выніках работы за 2008 г. у намінацыі «Спецыяліст года» (2009); па выніках работы за 2015 г. у намінацыі «Канцэртнае абслугоўванне сельскага насельніцтва» (2016); за актыўную і добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм, вялікі ўклад у развіццё галіны (2017).



***ШЛАПАКОВА Валянціна Уладзіміраўна***

*Філолаг, педагог, журналіст.*

Нарадзілася 02.09.1977 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Мазырскі педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «настаўнік беларускай мовы і літаратуры» (2000); Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «журналіст друкаваных сродкаў масавай інфармацыі» (2012). Член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў» (2007).

У 1999–2007 гг. працавала настаўнікам беларускай і рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 3 г.п. Акцябрскі, кіраўніком тэатральнага гуртка дома дзіцячай творчасці, педагогам-арганізатарам дзяржаўнай установы адукацыі «Акцябрская раённая гімназія».

У 2007 г. узначаліла дзяржаўную ўстанову «Рэдакцыя газеты "Чырвоны Кастрычнік"», з 2012 г. па цяперашні час – кіраўнік справамі Акцябрскага райвыканкама, старшыня раённага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», дэпутат раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Прымала ўдзел у рэалізацыі творчых праектаў у рамках фестывальнага фальклорнага руху «Берагаіня»: «Традыцыйная культура і дзеці» (2001–2003), Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2006); была сцэнарыстам і вядучай фестывальных мерапрыемстваў, уваходзіла ў склад рабочых груп Дырэкцыі фестываю (1999–2012), каардынавала выкананне рашэнняў райвыканкама па пытаннях Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012–2018).

Узнагароджана Ганаровымі граматамі і падзякамі Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта за асабісты ўклад у развіццё раёна, літаратурную і творчую дзейнасць (1999–2017), Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за педагагічную дзейнасць і перамогу ў спаборніцтве студэнцкіх атрадаў (як камандзір педагагічнага студэнтскага атрада ў 2006 і 2007 гг.), Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за рэалізацыю творчых праектаў на старонках газеты, шматбаковае асвятленне палітыкі і культурнага развіцця беларускай дзяржавы (2008–2010); медалём «Непокорённые – За верность Родине» асацыяцыі непаўналетніх вязняў фашызму Расіі і Беларусі (2011).



## ШЧЭЦЬКА Вера Іванаўна

*Бібліятэкар, краязнавец, даследчык гісторыка-культурнай спадчыны Акцябрскага раёна.*

Нарадзілася 02.12.1960 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум імя А.С. Пушкіна (1980), Мінскі інстытут культуры (1990).

З 1977 г. працавала бібліятэкарам дзіцячай бібліятэкі і адначасова бібліятэкарам аддзела абслугоўвання Акцябрскай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы.

В.І. Шчэцька ў ліку іншых стаяла ля вытокаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Узначальвала рэкламна-інфармацыйную, рэдакцыйную групы, таксама групы арганізацыі творчых лабараторый, работы штаба, была намеснікам дырэктара фестывалю (1998–2014). Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі раёна, традыцыйных абрадах і звычаях, народным танцавальным этыкеце і інш., сярод якіх: «Абрады вясны і лета», «Народны танцавальны этыкет» (абодва ў зб.: «“Берагіня”. Другі фестываль фальклорнага мастацтва». Укл. М.А. Козенка. Мінск, 2001), «Культурныя зносіны Рудабельскага краю» (зб.: «“Берагіня”. Чацвёрты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва». Укл. М.А. Козенка. Мінск, 2006). «Мерыдыяны родных мясцін: гісторыка-этнаграфічны нарыс аб Акцябрскім раёне» (зб.: «“Берагіня”. Пяты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва». Укл. М.А. Козенка. Мінск, 2008); Аўтар-складальнік бібліяграфічных паказальнікаў «Славутыя імёны Акцябршчыны» і «Літаратурная Акцябршчына» (абодва – у 1997 г., краязнаўчы фонд Акцябрскай раённай бібліятэкі). Распрацавала карты бытуючых народных і прастольных свят (зб.: «“Берагіня”. Першы фестываль фальклорнага мастацтва». Укл. М.А. Козенка. Мінск, 1999). Даследаванне гісторыі праваслаўя на тэрыторыі Акцябрскага раёна знайшло адлюстраванне ў рабоце «Да духоўных вытокаў: гісторыя праваслаўя на Рудабельшчыне», якая ў 2015 г. заняла 1-е месца на абласным туры рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – цэнтр духоўнай асветы і выхавання». Прымала ўдзел у распрацоўцы і выкананні раённых мэтавых праграм «Жывая памяць Акцябршчыны» (1992), «Традыцыйная культура і дзеці» (2001), праграм развіцця культуры ў раёне.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама (1982, 2001, 2005, 2010), Ганаровымі граматамі Акцябрскага райвыканкама (2004, 2010, 2015), упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (2009), Гомельскага аблвыканкама (2014), падзякай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2015), Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2016).



### *ШЭЙКА Любоў Сяргееўна*

*Педагог, арганізатар адукацыі, работнік культуры.*

Нарадзілася 20.10.1944 г. у в. Парэчча Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Мазырскі педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «методыка пачатковага навучання» (1965); Беларускі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага, атрымаўшы спецыяльнасць «выкладчык гісторыі і грамадазнаўства» (1975).

Працавала настаўніцай у Новадуброўскай школе (1967–1971), другім сакратаром Акцябрскага РК ЛКСМБ (1971–1975), загадчыкам кабінета палітасветы Акцябрскага РКП КПБ (1976–1990), дырэктарам Акцябрскай СШ № 3 (1991–2004), дырэктарам Акцябрскай раённай гімназіі (2004–2006). З 2007 г. навуковы супрацоўнік ДУК «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна».

Падчас работы ў сярэдняй школе № 3 арганізавала этнаграфічны музей, гістарычны нацыянальны цэнтр (з фальклорным кабінетам), кабінет пісьменства і друку, літаратурную гасцёўню, зону рэкрэацыі. У 1995 г. на базе школы стварыла невялікі калектыў аматараў народнай творчасці (кіраўнік – настаўніца пачатковых класаў Т.С. Круглова), да якога затым далучыліся іншыя настаўнікі, бацькі вучняў. Садзейнічала з'яўленню двух дзіцячых фальклорных ансамбляў – «Рудабельскія зорачкі» (1998) і інструментальнага – «Брачынскія музыкі» (1998, мастацкі кіраўнік абодвух В.Г. Дульская). Разам з В.Г. Дульскай распрацавала шэраг этнаграфічных праграм для навучэнцаў школы; арганізоўвала пераемнасць старадаўніх побытавых танцаў, спеваў, гульняў, інструментальнай музыкі ад носьбітаў традыцыйнай культуры (В.Д. Верас, А.І. Яфрэмава, А.І. Дырда, М.Р. Балута і інш.). Працу па даследаванню фальклорнай спадчыны Акцябрскага раёна, распачатая ў школе, зараз працягвае Любоў Сяргееўна ў дзяржаўнай установе культуры «Цэнтр гісторыі і культуры Акцябрскага раёна», дзе яна разам са спецыялістамі ўстановы распрацоўвае музейна-педагагічныя праграмы па фальклору, краязнаўству, займаецца пытаннямі пераемнасці і захавання розных традыцыйных праяў народнай культуры Рудабельскага краю, значнае месца адводзіць выставачнай дзейнасці музея.

Падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» арганізоўвала выстаўкі: «Беларускія музычныя інструменты», «Вясельныя строі Рудабельшчыны і ваколіц», «Ручнік у прасторы і часе», «Фальклорная спадчына – няспынная творчасць» і г.д.

Неаднаразова ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі Цэнтральнага камітэта КПСС, ЦК УЛКСМ, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта і Савета дэпутатаў, Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта і Савета дэпутатаў.

# Дарадцы



**_АНЦУХ Ліляна Фёдараўна_**

*Вядомы беларускі выдавец, дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва «Чатыры чвэрці», аўтар шматлікіх праектаў, публіцыст.*

*Член Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі, член Прэзідыума Саюза музычных дзеячаў Беларусі.*

Нарадзілася 22.01.1950 г. у в. Лошніца Барысаўскага р-на Мінскай вобл.

Сярод асноўных дасягненняў Л.Ф. Анцух – стварэнне і рэалізацыя (у выпусках грунтоўных выданняў) атрымаўшых грамадскае гучанне знакавых праектаў, такіх як: аўтарская серыя кніг-альбомаў «Нашы духоўныя каштоўнасці»: «Праваслаўныя святы Беларусі» (1995), «Праваслаўнае дойлідства Беларусі» (1995), «Прападобная Еўфрасіння Полацкая» (1997), «Крыж – краса царквы» (1998), «Праваслаўныя манастыры Беларусі» (2003), «Праваслаўныя святыя зямлі беларускай» (2014); серыя кніг-альбомаў «Культурная спадчына Беларусі»: «Аляксандр Кішчанка. Летапісец XX стагоддзя» (2015), «Тураўская рапсодыя» (2016); праект «АРТ-Беларусь»: «Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі» (2014), «Час і творчасць Льва Бакста» (2016); аўтарскі праект да 250-годдзя М.К. Агінскага: А. Залускі «Час і музыка Міхала Клеафаса Агінскага», І. Залускі «Ген Агінскага», «Мемуары Міхала Клеафаса Агінскага» (2015); аўтарская серыя «Дзеці вайны» (да 70-годдзя Вялікай Айчыннай вайны), з 2011 г. па 2016 г. у ёй выдадзена больш за 20 кніг; аўтарская серыя «Асоба і час», прысвечаная знакамітым грамадскім дзеячам, літаратарам – выдадзена 10 кніг. Многія з гэтых кніг змяшчаюць тэксты і пераклады Л.Ф. Анцух.

Ініцыіруючы праекты, Л.Ф. Анцух выкарыстоўвае творчы патэнцыял ужо вядомых у краіне людзей і смела адкрывае грамадству новыя імёны, падтрымліваючы маладыя таленты. Яе прафесійная праца над кнігай у якасці рэдактара дапамагла вялікай колькасці таленавітых людзей знайсці свой шлях у вялікую літаратуру.

У свой час выдавецтва «Чатыры чвэрці» падтрымала ініцыятыву дырэкцыі Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» аб метадычным і рэкламна-інфармацыйным суправаджэнні гэтага форуму. І на працягу больш за дзесяц гадоў забяспечвала фестывальныя мерапрыемствы друкаванай прадукцыяй: дыпломамі, праграмамі, запрашэннямі, плакатамі-афішамі. Асаблівую каштоўнасць уяўлялі выданні зборнікаў – своеасаблівых энцыклапедый фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня» на Беларусі, у якіх былі змешчаны каштоўныя матэрыялы пра кожнага з удзельнікаў – салістаў, дуэтаў, дзіцяча-маладзёжных ансамбляў, аўтэнтычных гуртоў, гасцявых калектываў

Беларусі і замежжа, майстроў дэкаратыўна-пабытавага мастацтва, арганізатараў, экспертаў, груп музычнага суправаджэння, тэхнічнага забеспячэння і інш. Да кожнага выдання меўся каляровы фотаілюстрацыйны матэрыял.

Кіруючы невялікім калектывам, Л.Ф. Анцух здолела аб'яднаць значную колькасць творчых людзей краіны і на сённяшні дзень дасягнула тых вышынь адказнасці за справу, якія ўласцівы сапраўднаму патрыёту. За сваю адданую працу мае шмат узнагарод: лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (1996); нагрудны знак Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік друку Беларусі»; нагрудны знак Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2013), грамату Патрыяршага Экзарха ў благаславенне «За працу ў славу Святой Праваслаўнай Царквы» (2014); медаль Францыска Скарыны (2017); Ганаровую грамату Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў (2018) і інш.



***БАЛЫНСКАЯ Марына Самуілаўна***

*Педагог, арганізатар адукацыі ў Акцябрскім раёне.*

Нарадзілася 05.08.1978 г. у в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «педагогіка і методыка пачатковага навучання» (1999).

У 1999–2015 гг. працавала настаўнікам гісторыі і геаграфіі ў Пратасаўскай базавай школе, сацыяльным педагогам, метадыстам вучэбна-метадычнага кабінета, галоўным спецыялістам аддзела адукацыі, спорту і турызму Акцябрскага райвыканкама; у 2015–2017 гг. з'яўлялася старшынёй Акцябрскага раённага аб`яднання арганізацый прафсаюзаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. З 2017 г. – загадчык аддзела адукацыі, спорту і турызму Акцябрскага райвыканкама.

Пад кіраўніцтвам Марыны Самуілаўны ўстановы дашкольнай, агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі раёна ў рамках этнакультурнага і адукацыйна-выхаваўчага праекта «Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня”» вядуць мэтанакіраваную работу па даследаванню традыцыйнай мастацкай культуры раёна дзецьмі і моладдзю, па практычнаму засваенню ўзораў розных відаў і жанраў народнай спадчыны Рудабельскага краю і інш., выкарыстоўваючы разнастайныя формы навучання.

Прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні раённых мерапрыемстваў розных кірункаў. Арганізатар раённага прафсаюзнага конкурсу творчасці працоўных калектываў «Новыя імёны Беларусі» (2015–2016), раённага этапу фотаконкурсу народнага праекта Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Я = Беларусь» (2016), удзельнік рэспубліканскага прафсаюзнага конкурсу на лепшы турыстычны маршрут «Беларусь у новым аблічы» (2016), арганізатар мерапрыемстваў Тыдня прафсаюзнай культуры (2017).

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела адукацыі, спорту і турызму Акцябрскага райвыканкама (2001, 2005), галоўным упраўленнем адукацыі, спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама (2007), Акцябрскага райвыканкама за шматгадовыя поспехі, дасягнутыя ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення (2013), падзякай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2015).



***БУТЭВІЧ Анатоль Іванавіч***

*Беларускі дзяржаўны і грамадскі дзеяч, дыпламат, пісьменнік, перакладчык, публіцыст, крытык. Псеўданімы: Максім Валошка, Анатоль Баярскі, Міша Алімпік.*

*Член Союза беларускіх пісьменнікаў (з 1994 г.), член Беларускага саюза журналістаў (з 1972 г.). Намеснік старшыні рады Беларускага фонду культуры (з 2008 г.). Кандыдат навук у галіне інфармацыйных тэхналогій (1997).*

Нарадзіўся 15.06.1948 г. на хутары Язавец Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.

Скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971).

Працаваў рэдактарам Беларускага тэлеграфнага агенства (1971–1973); інструктарам, затым загадчыкам аддзела ЦК ЛКСМБ (1973–1975, 1979–1980); намеснікам рэдактара газеты «Чырвоная змена» (1975–1979); інструктарам аддзела, загадчыкам сектара культуры, намеснікам загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ (1980–1990); у 1986–1987 гг. – дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура»; 1990–1992 гг. – старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку; 1992–1994 гг. – Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь; 1994–1996 гг. – Міністр культуры і друку Рспублікі Беларусь; 1996–1997 гг. – Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску (Польшча); 1997–2000 гг. – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі; 2001–2009 гг. – дарадчык старшыні Банка міжнароднага гандлю і інвестыцый.

А.І. Бутэвіч у цяперашні час з’яўляецца намеснікам старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (з 2010 г.), членам Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (з 2010 г.), членам праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі (з 2012 г.), членам Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА (з 2013 г.); ганаровы грамадзянін горада Нясвіжа (2015). Валодае беларускай, рускай, украінскай, польскай і нямецкай мовамі.

Друкавацца пачаў з 1969 г. Працуе ў галіне дзіцячай і гістарычнай літаратуры, публіцыстыкі, крытыкі; перакладае з польскай, рускай, украінскай моў на беларускую, з беларускай – на рускую. Яго творы перакладаліся на польскую, румынскую, балгарскую мовы.

Прадстаўляў Беларускі фонд культуры на VIII і IX Рэспубліканскіх фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня»; актыўна ўдзельнічаў у «круглых сталах», дыскусіях, абмеркаваннях праграм выступленняў калектываў, мастацкіх дэлегацый. Па выніках фестываляў апублікаваў шэраг артыкулаў у рэспубліканскіх СМІ. Дзейсна падтрымлівае фальклорны рух «Берагіня».

Шматгранная праца Анатоля Іванавіча Бутэвіча адзначана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1978), Ганаровай граматай Савета Міністраў Беларусі (1998). Ён узнагароджаны: медалём «За асваенне цалінных зямель» (1969), Ордэнам Свяціцеля Кірылы Тураўскага Беларускай праваслаўнай царквы (2008); нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2010), ганаровым знакам Беларускага фонду культуры «Руплівцу. Стваральніку» (2017). З'яўляецца лаўрэатам прэміі Саюза журналістаў «Залатое пяро – 2001».

*Тв.:* Прыгоды лісціка-карунчыка. Казкі. – Мінск, 1997; Прыгоды памаўзлівай Рыскі. Казкі. – Мінск, 1999; Расстайны пах асоту. Аповесць, апавяданні. – Мінск, 2000; Як акіян з кропелькай барукаўся. Казкі. – Мінск, 2003; Мірскі замак. – Мінск, 2003; Прыгоды віруса Шкодзі. – Мінск, 2009; *Серыя «Сем цудаў Беларусі»*: У гасцях у вечнасці. – Мінск, 2001; Званы Нямігі. – Мінск, 2002; За наміткай гісторыі. – Мінск, 2003; Адвечны покліч Радзімы. – Мінск, 2004; Славутыя родам сваім. – Мінск, 2006; Перуновага племені дзеці. – Мінск, 2008; На далонях вечнасці (сумесна з У. Ягоўдзікам). – Мінск, 2009; Пад небам беларускага слова. Пра пісьменнікаў, літаратуру і не толькі. – Мінск, 2007; Раскіданае гняздо крывіцкай славы. – Мінск, 2008; Каралева не здраджвала каралю або Каралеўскае шлюбаванне ў Навагародку. Раман. – Мінск, 2009; Таямніцы Мірскага замка. Падарожжа па сівых мурах з Адамам Міцкевічам. – Мінск, 2011; Таямніцы Нясвіжскага замка. Падарожжа ўглыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем. – Мінск, 2013; Таямніцы Крэўскага замка. Падарожжа па нашай гісторыі з Вітаўтам Вялікім. – Мінск, 2015; Тайны Мирского замка. Путешествие по древней фортеции с Адамом Мицкевичем. – Минск, 2014; Я адной табе належу. – Мінск, 2013; Паміж Княствам і каронай. – Мінск, 2013; Пацалунак на фоне гор. – Мінск, 2014; Чараўніца Восень і Сняжынка падарожніца. – Мінск, 2015; Як Данік у Радзівілаўскае метро трапіў. – Мінск, 2016; Маладыя гады – маладыя жаданні: п'еса // Маладосць. 2007; Апошняе ігрышча: аповесць // Полымя. 2007; Зайчыкаў лес (на румынскай мове). – Цімішаара, Румынія, 1999.

*Пераклады на рускую мову:* Липский Владимир. Крутые версты. Повесть. – Москва, 1981, Кемерово, 1982, 1989; Липский Владимир. Выстрелы над старым окопом. Повесть. – Минск, 2007; Капустин Александр. Соленая роса. Повесть. – Казань, 1984; Гигевич Василь. Марсианское путешествие. – Минск, 1992; Смеяться, право, не грешно. Белорусский народный юмор. – Мінск, 1997.

*Пераклады на беларускую мову*: Хемінгуэй Эрнэст. Бывай, зброя. – Мінск, 1996; Олдрыдж Джэймс. Паляўнічы. – Мінск, 1996; Шолам Алейхем. Тэўе-малочнік. – Мінск, 1992; Лем Станіслаў. Прыгоды Піркса. – Мінск, 1992; Лем Станіслаў. Салярыс. – Мінск, 1994; Лем Станіслаў. Непераможны. – Мінск, 2011; Радзівіл Багуслаў.

Аўтабіяграфія. – Мінск, 2009; Ажэшка Эліза. Над Нёманам. – Мінск, 2003; Курыльчык Рышард. Славянскі світанак. – Мінск, 2007; Курыльчык Рышард. Нязломны з Назарэта. – Мінск, 2009; Ажэшка Эліза. Gloria victis. Дзеяслоў. 2008. –№ 4; Ажэшка Эліза. Яны. Дзеяслоў. 2017. – № 5.

*Пераклады на беларускую мову п'ес, якія ішлі ў тэатрах Беларусі:* Сапгір С., Пракоф'еў С. Кот у ботах. 1981; Хмелік А. А ўсё-такі яна круціцца? 1981; Аляксандраў А. Шышок. 1982; Гудзяліс Антанас. Куды сышлі волаты? 1982: Фрэшат Караль. Жан і Беатрыса. 2004; Вампілаў А. Мінулым летам у Чулімску. 2006; Гальдоні Карл. Слуга двух спадароў. 2007; Шурпін Анатоль. Хто кахае мадам? 2008; Лорка Ф. Дом Бернарды Альбы. 2013; Пётр Гладзілін. Афінскія вечары. 2014.



### *ВЕРАС Варвара Данілаўна*

*(1925–2014)*

*Народная спявачка, музыка, танцорка, апавядальнік народнай прозы, майстар па ткацтву і вышыўцы.*

Нарадзілася 17.12.1925 у в. Граб’ё Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Граб’ёўскую пачатковую школу Акцябрскага раёна (1936). Працавала ў медпункце в. Ламавічы (1952–1956), у Граб’ёўскай пачатковай школе тэхнічным работнікам (1959–1991), з 1975 г. – на заслужаным адпачынку.

Любоў да народнай культуры ў традыцыйных яе праяўленнях атрымала ў спадчыну ад бацькоў.

Варвара Данілаўна стаяла ля вытокаў нараджэння ўзорнага фальклорнага калектыву «Рудабельскія зорачкі» Акцябрскай СШ № 3, дарадцам і апякуном якога была з дня яго стварэння (1995) і з якім супрацоўнічала каля 20 гадоў. Аказвала дзейсную творчую дапамогу кіраўнікам калектыву В.Г. Дульскай і Д.Г. Бяжкову ў навучанні дзяцей народным песням і танцам, сярод якіх «Ой з-пад дуба, з-пад бярозы», «Базар з прыпеўкамі», «Полька», «Нарэчанька», «Месяц», «Субота». Перадала дзецям шмат казак, прымавак і жартаў, звестак пра народную абрадавую культуру Рудабельшчыны.

Праводзіла вялікую выхаваўчую работу ў калектыве, асабліва з дзяўчынкамі, увагу якіх звяртала на захаванне пачуцця гонару і павагі да сябе, прыгажосці адносін паміж хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

В.Д. Верас разам з «Рудабельскімі зорачкамі» ўдзельнічала ў заключных мерапрыемствах Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2004–2014) і ў Рэспубліканскім свяце «Кліч Палесся» (аг. Ляскавічы, 2009) з удзелам Прэзідэнта краіны.

Неаднаразова праводзіла краязнаўчыя ўрокі ў школе, дзе вучыліся яе дачка Мая, унукі Вадзім і Саша. Свае мастацкія навыкі і любоў да песні перадала дачцы, якая працягвае справу маці і таксама выступае разам з калектывам «Рудабельскія зорачкі» на розных мастацкіх мерапрыемствах.

Узнагароджана Ганаровай граматай Акцябрскага райвыканкама за актыўны ўдзел у культурным жыцці раёна, дасягненні і асабісты ўнёсак у захаванне і развіццё народных традыцый беларускай нацыянальнай культуры (2009), ганаровымі граматамі Акцябрскага раённага Савета дэпутатаў у сувязі з 85-годдзем з дня нараджэння (2010) і за актыўны ўдзел у рабоце органаў тэрытарыяльнага грамадскага самаўпраўлення, грамадскага жыцця раёна (2013), дыпломам аргкамітэта VII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» за захаванне традыцый мастацкай культуры свайго краю (2012).

Узнагароджана медалём «Ветэран працы» (1979), медалём Мацярынства (1972).



***ГАМЗОВІЧ Рэгіна Станіславаўна***

*Філолаг, журналіст, кінадакументаліст, фалькларыст, грамадскі дзеяч.*

Нарадзілася 29.01.1948 г. у г. Мінску.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1970).

Пасля 20 гадоў працавала ў Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук Беларусі ў аддзеле гісторыі беларускай мовы, дзе ўдзельнічала ў стварэнні «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы». У 1990–1991 гг. – стыліст у «Народнай газеце», курыравала і пісала матэрыялы, прысвечаныя беларускай мове і фальклору.

Р.С. Гамзовіч прапагандуе традыцыйную культуру беларусаў. У якасці карэспандэнта Беларускага радыё (1981–2003) падрыхтавала аўтарскія праграмы «Спадчына», «Родная мова», «Наша мінуўшчына», «Даўніна», «Супольнасць». Стварыла цыкл «Радавод» – больш за 100 дакументальных фільмаў пра абрадавы фальклор і яго вусныя формы (аўтар сцэнарыяў), народны каляндар (з А. Лозкам), харэаграфію (з М. Козенкам), інструментальны фальклор (з І. Назінай), народны касцюм (з М. Віннікавай); спеўная народная традыцыя і лепшыя выканаўцы адлюстраваны ў цыкле перадач з удзелам З. Мажэйка. Так склаўся ўнікальны і адзіны ў Беларусі фонд традыцыйнай культуры «Радавод», які захоўваецца ў фондах Беларускага тэлебачання.

Працавала спецыяльным карэспандэнтам газеты «Голас Радзімы» (2003–2006), аглядальнікам часопіса «Алеся» (2007–2014).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Беларускага відэацэнтра»: «Пастаўскія перазвоны», «Галасы зямлі маёй» (з І. Назінай; абодва 1994), «Масленіца» (1995), «У кожнай хаце жыве дамавік» (1996), «Легенды Тураўскай зямлі» (1997), «Дачка Прыпяці», «Кола часу» (у суаўтарстве з рэжысёрам І. Бышнёвым і прадзюсарам Ю. Ігрушам; абодва 2012) і інш. Фільм «Дачка Прыпяці» атрымаў шэраг узнагарод: на кінафоруме «Золотой витязь» (г. Хабараўск, Расія, 2013) за лепшую аператарскую работу былі адзначаны аператары Ігар Бышнёў і Павел Зубрыцкі; на XVII Міжнародным тэлевізійным экалагічным фестывалі «Спасти и сохранить» рэжысёр Ігар Бышнёў за лепшую рэжысёрскую работу атрымаў бронзавую статуэтку з выявай гагары; на Мінскім міжнародным фестывалі «Лістапад» (2013) была адзначана музыка Наталлі Цецярэўскай; на Міжнародным каталіцкім фестывалі хрысціянскіх фільмаў і тэлевізійных праграм «Магніфікат» (2014) фільм атрымаў

Гран-пры; на II Міжнародным фестывалі «Star Independent» (Украïна–Іспанія, 2015–2016) – прыз у намінацыі «Дакументальны фільм».

Вядзе вялікую грамадскую работу: у розныя гады ўваходзіла ў склад камісій мовы і фальклору Беларускага фонду культуры, камісіі Міністэрства Культуры Рэспублікі Беларусь па прысуджэнню спецыяльных прэмій за выдатныя дасягненні і асабісты ўклад у захаванне і развіццё народных культурных традыцый. З 2005 г. працуе як грамадскі эксперт у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў.

Узнагароджана дыпломам лаўрэата VI Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая ліцера» ў намінацыі «Лепшыя матэрыялы культурнай і гісторыка-краязнаўчай тэматыкі» (2010), памятным знакам «У гонар заснавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (2017).



**_ГІЛЕП Уладзімір Аляксандравіч_**

*Вядомы дзеяч беларускай культуры, музейны работнік, краязнавец, арганізатар культурнага будаўніцтва, захавальнік гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.*

Нарадзіўся 11.03.1938 г. у в. Острава Капыльскага р-на Мінскай вобл.

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Слуцкай СШ № 1. Да прызыву на вайсковую службу (1957–1960) працаваў рабочым на Мінскім заводзе запасных частак. У 1960 г. паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыў у 1965 г. і быў накіраваны ў Дзяржаўны музей Беларускай ССР (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь).

У музеі працаваў навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром, намеснікам дырэктара па навуковай частцы. У 1969 г. пераведзены на пасаду намесніка дырэктара па навуцы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. З 1974 г. па 1982 г. У.А. Гілеп працаваў інструктарам, загадчыкам сектара мастацтваў аддзела культуры ЦК КПБ. А з 1982 г. па 1996 г. – Першы намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы яго намаганням у Беларусі быў адкрыты не адзін музей, у т.л. такія, як Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Беларускі скансэн, шэраг раённых музеяў. Шмат карысных спраў здзейснена ім за той час, калі быў старшынёй Камітэта па культуры краін Саюза Незалежных Дзяржаў (1993–1996). Сярод іх – праграма рэканструкцыі і рамонту Брэсцкай крэпасці за сродкі краін СНД і інш.

У 1996 г. У.А. Гілеп пайшоў у адстаўку і быў абраны старшынёй рады грамадскага аб’яднання «Беларускі фонд культуры». За час працы ў фондзе У. А. Гілеп прапанаваў шмат арыгінальных праграм, якія адобраны і падтрыманы творчай інтэлігенцыяй краіны. Многія праграмы і праекты фонду праводзяцца сумесна з дзяржаўнымі структурамі. Напрыклад, праграмы «Вяртанне і захаванне нацыянальных культурных каштоўнасцей», «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Ужо шмат гадоў ажыццяўляюцца праграмы падтрымкі народнага мастацтва ў Беларусі: «Берагіня» – Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва, «Адраджэнне духоўнай культуры старажытных і малых гарадоў і паселішчаў Беларусі».

З 2003 г. У.А. Гілеп з’яўляецца галоўным рэдактарам штотыднёвай, адзінай у Беларусі «Краязнаўчай газеты». За гэты час яна стала арганізатарам краязнаўчага руху ў краіне, друкаванай трыбунай мясцовых краязнаўцаў.

Асаблівую значнасць у творчай і арганізацыйнай дзейнасці Уладзіміра Аляксандравіча займае праграма «“Берагіня” – фестываль фальклорнага мастацтва ў г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці». Скіраванасць на яго матывацыю і правядзенне Беларускага фонду культуры і «Краязнаўчай газеты», падтрымка, якую аказвае фестывалю дзяржава, дазволілі яму стаць у шэраг лепшых дзяржаўных нацыянальных фестываляў для моладзі, выхоўваць на нацыянальных традыцыях патрыётаў сваёй краіны.

Дзякуючы ў тым ліку намаганням У.А. Гілепа ў Беларусі рэгулярна праводзіцца рэспубліканскі конкурс мастакоў тэатраў імя заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь І.М. Ушакова. Вялікую карысць у справе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне рэстаўрацыі сядзібна-паркавай архітэктуры прыносіць шматгадовая дзейнасць міжнароднай школы «Нясвіжская акадэмія», адным са стваральнікаў і арганізатараў якой стаў і У.А. Гілеп.

Асобная старонка дзейнасці фонду культуры і асабіста У.А. Гілепа – выданне кніг беларускай і замежнай класікі. Гэта творы Адама Міцкевіча, Аляксандра Пушкіна, Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча, Максіма Багдановіча ў перакладзе на еўрапейскія мовы. Практычна ўсе гэтыя выданні былі адзначаны высокімі ўзнагародамі на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Акрамя кіравання грамадскім аб’яднаннем «Беларускі фонд культуры» У.А. Гілеп выконвае шмат іншых грамадскіх абавязкаў. Ён з’яўляецца членам Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, старшынёй ГА «Беларускі камітэт Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС)», якое створана з ягонай ініцыятывы і займаецца праблемамі аховы помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку рэгенерацыяй горадабудаўнічай сітуацыі і захаваннем Гальшанскага замка. Ён – шматгадовы член праўлення Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, член Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, праўлення Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў. У цяперашні час з’яўляецца старшынёю Назіральнага савета закрытага акцыянернага таварыства «САКАВІЦА» Беларускага фонду культуры.

Living Рознабаковая і шматгранная дзейнасць Уладзіміра Аляксандравіча Гілепа шырока раскрываецца ў асобнай кнізе «Зроднены з культурай» (Мінск, 2008), адзначана медалём Францыска Скарыны (2013).



### *ДАРАШЭВІЧ Энгельс Канстанцінавіч*

*Філосаф, культуролаг, сацыёлаг, педагог. Доктар філасофскіх навук (1984), прафесар (1992).*

Нарадзіўся 26.10.1931 г. у г. Мінску.

Скончыў 42-ю школу г. Мінска (1948), у якой вучыліся будучыя вядомыя людзі, у тым ліку, першы лаўрэат Нобелеўская прэміі на Беларусі, Жорэс Алфёраў. У 16 гадоў паступіў на аддзяленне філасофіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыў у 1953 г.

Навучаючыся ва ўніверсітэце і, асабліва, у аспірантуры Інстытута філасофіі Акадэміі Навук Беларусі, Энгельс Канстанцінавіч усё больш цікавіцца гісторыяй філасофіі роднага краю. Праяўляе інтарэс да беларускага фальклору, які ўзнік пад уздзеяннем сяброў, асабліва, Зінаіды Мажэйка, на абароне дысертацыі («Песенная культура белорусского Полесья: село Тонеж») якой у Маскве (1971) ён прыняў удзел. У далейшым ён таксама быў блізкі да фальклорных даследаванняў, як самой Зінаіды Мажэйка, так і Тамары Варфаламеевай, якія давалі яму на адозву свае творы.

З 1958 г. працаваў у Інстытуце філасофіі і права, з 1990 г. – загадчыкам аддзела сацыялогіі культуры ў Інстытуце сацыялогіі НАН Беларусі, займаючыся ў асноўным міжнацыянальнымі адносінамі ў Беларусі.

З 1980-х гг. працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, спачатку на кафедры мастацтвазнаўства, потым культуралогіі, а з 2007 г. працуе на пасадзе прафесара кафедры этналогіі і фальклору. Выкладае дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць і інфармацыйная культура спецыяліста», «Тэорыя фальклору», «Культурная антрапалогія».

Э.К. Дарашэвіч вывучаў тэорыю і практыку развіцця розных рэгіёнаў Беларусі, пільна даследаваў розныя рукапісы, якія мелі дачыненне да Беларусі. Знайшоў больш тысячы старонак невядомых твораў Аніёла Доўгірда, найвыдатнага філосафа эпохі Асветніцтва на Беларусі. Значныя знаходкі былі ў яго таксама ў сферы рукапісных ананімных твораў парафальклорнага тыпу. Пра гэта былі ў асноўным сямейныя запісы розных людзей, якія адлюстроўвалі іх погляды і інтарэсы. Іх светаўяўленне і гуманізм. Даследуе гісторыю культуры, філасофіі і эстэтыкі Беларусі, тэорыю фальклору, займаецца культурнай антрапалогіяй.

Аўтар навуковых манаграфій: «Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения» (1967); «Философия эпохи Просвещения в Белоруссии» (1971); «Философская и социальная мысль Беларуси эпохи Просвещения» (2010); вучэбнага дапаможніка «Тэорыя фальклору» (2016). Удзельнік калектыўных навуковых

манаграфій: «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» (1972, у суаўтарстве з філосафам і эстэтыкам У. కонанам); «Философия эпохи Просвещения в Белоруссии (1971); «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г.» (1985, у суаўтарстве); «Антология педагогической мысли Белорусской ССР» (1986); «У тэзаўрусе Беларусі» (2011); «Гісторыя філасофскай і грамадскапалітычнай думкі Беларусі» (2017) і інш. Аўтар шэрага праектаў сацыялагічных даследаванняў культуры і міжнацыянальных адносін Беларусі.

Прафесар Э.К. Дарашэвіч, прымае актыўны ўдзел у розных фальклорных мерапрыемствах, ездзіць з калектывамі ў глыбінку, слухаючы розныя калектывы аўтэнтычнага фальклору. З 2006 г. ён з’яўляецца госцем Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», палюбіў гэты фестываль, пісаў пра яго шмат добрага. Лічыць, што «Берагіня» – гэта сапраўды народны светапогляд, кузня новага пакалення, якая стварае сапраўды высокамаральную і нацыянальнасвядомую маладую змену, што «Берагіня» – зара новай эпохі развіцця Рэспублікі Беларусь.

Э.К. Дарашэвіч – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984).





***ЁВЕНКА Наталля Аркадзьеўна***

*Фотакарэспандэнт, журналіст.*

Нарадзілася 20.03.1975 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны па спецыяльнасці «беларуская мова і літаратура» (2008).

З 1997 г. – аператар электроннага набору і вёрсткі, з 2008 г. – загадчык аддзела сацыяльных праблем дзяржаўнай установы «Рэдакцыя газеты “Чырвоны Кастрычнік”». Фотаработы Наталлі Ёвенка адлюстроўваюць розныя сферы жыцця і дзейнасці Акцябрскага раёна, у тым ліку і культурную спадчыну. Доўгі час супрацоўнічае з «Сельскай газетай», «Лясной газетай», «Гомельскай праўдай». З адказнасцю падыходзіць да любой справы. Пры неабходнасці займаецца вёрсткай газеты, падрыхтоўвае фотовыстаўкі.

Працавала амаль на ўсіх Рэспубліканскіх фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня». Дзякуючы яе здымкам, якія захоўваюцца ў архіве рэдакцыі, можна прасачыць гісторыю развіцця фестывалю, яго дынаміку. У 2010 г. прымала ўдзел у прэс-канферэнцыі, якая праводзілася ў Мінску і была прымеркавана да падрыхтоўкі чарговага фэсту.

У час правядзення фестывалю «Берагіня», Наталля Ёвенка хутка і якасна асвятляе масштабнае мерапрыемства, адлюстроўваючы як афіцыйную частку фестывалю, так і конкурсныя выступленні ўдзельнікаў, іх знаёмствы, першыя сустрэчы і слёзы апошніх раставанняў, міжнацыянальнае сяброўства і, абавязкова, традыцыі краін-удзельніц.

Узнагароджана ганаровай Граматай абласнога камітэта прафсаюзаў работнікаў культуры (2011); прызнана «Лепшай па прафесіі» ў штогадовым раённым спаборніцтве (2012); дыпломам ІІІ ступені ў штогадовым абласным конкурсе сярод журналістаў у намінацыі «Лепшы фотакарэспандэнт» (2013); дыпломам лаўрэата І ступені Рэспубліканскага фотаконкурсу «Я = Беларусь» (за фотаработу «Ты са мной, моё поле», 2016); дыпломам ІІІ ступені па выніках працы ў штогадовым абласным спаборніцтве сярод рэдакцый і часопісаў Гомельскай вобласці ў намінацыі «Лепшы фотажурналіст» (2017); дыпломам ІІ ступені Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за перамогу ў рэспубліканскім творчым конкурсе на лепшае асвятленне ў СМІ тэматыкі ўборачнай кампаніі «Жніво–2017».



***КАЛІНОЎСКАЯ Алена Тадэвушаўна***

*Педагог, выканаўца народных песень і танцаў, арганізатар і вядучы свят, канцэртаў, конкурсаў і майстар-класаў па традыцыйнаму беларускаму танцу.*

Нарадзілася 11.11.1973 г. у в. Геранёны Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл.

Скончыла Геранёнскую сярэднюю школу (1990) і прыродазнаўчы факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка (1995).

У студэнцкія гады стала актыўнай удзельніцай археалагічных будатрадаў, этнаграфічных летнікаў, фальклорных фестываляў.

На працягу дзесяці год выкладала геаграфію і экалогію ў школах і гімназіях Мінска. Працавала некаторы час у сферы турызму, з 2015 г. – у сферы культуры ў галіне аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны спачатку ў Інстытуце культуры Беларусі, пасля яго рэарганізацыі – у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў УА «БДУКМ». Не залежна ад сферы прафесійнай дзейнасці, увесь час займаецца практычным вывучэннем фальклорнай спадчыны. З 2012 г. грунтоўна вывучае беларускі традыцыйны танец пад кіраўніцтвам М.А. Козенкі ў прыватнай Школе традыцыйнага мастацтва, адначасова выкладае яго ў групе для пачаткоўцаў, праводзіць майстар-класы ў Беларусі і за яе межамі (Літва, Польша, Латвія і інш.). Спявала ў першым складзе фальклорнага гурту «GUDA», а ў 2013 г. стварыла танцавальную суполку гурту, якая ўдзельнічае ў міжнародных фальклорных фестывалях і ладзіць танцавальныя імпрэзы ў Беларусі. З’яўляецца старшынёй аргкамітэта конкурсу беларускіх народных танцаў «Мяцеліца», які ладзіўся ў Мінску ў 2013, 2015 і 2017 гг. з мэтай працягу традыцый фестываля фальклорнага мастацтва «Берагіня» ў сталіцы.

На заключных мерапрыемствах Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 2012, 2014, 2016, 2018) з’яўляецца вядучайдыктарам конкурсу танцавальных пар і конкурсу харэаграфічнай імправізацыі сярод салістаў, працавала валанцёрам у складзе рабочых груп; экспертам адкрытага конкурсу выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Ветразь» (г. Мінск, 2016, 2018), які з’яўляецца рэгіянальным дачэрнім праектам рэспубліканскай «Берагіні».

Працуе над стварэннем, падтрымкай і папулярызацыяй Нацыянальнага інвентару нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.



**_КАТКАВЕЦ Васіль Сцяпанавіч_**

*Дзеяч культуры, рэжысёр, сцэнарыст, педагог.*

Нарадзіўся 02.10.1957 г. у в. Тышкавічы Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыў Мінскі інстытут культуры (1982) па спецыяльнасці «рэжысёр самадзейнага тэатральнага калектыву», філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1981) па спецыяльнасці «выкладчык беларускай мовы і літаратуры».

Працаваў мастацкім кіраўніком Сароцкага дома культуры (1982–1992), намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце Сароцкай сярэдняй школы (1992–1995), начальнікам аддзела культуры Любанскага райвыканкама (1995–2014), з 2014 г. – начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама.

Аўтар паэтычнага зборніка «Васільковы палетак» (2012).

Распрацаваў канцэпцыю развіцця культуры Любаншчыны на аснове традыцыйнай народнай культуры «Адновім і памножым былых традыцый прыгажосць». На працягу 1995–2001 гг. правёў даследаванне стану традыцыйнай культуры (з дапамогай апытальнікаў, распрацаваных навуковымі супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры) сумесна з Акадэміяй навук, Саюзам фалькларыстаў Рэспублікі Беларусь.

Ажыццёўлены рэспубліканскі праект «Традыцыйная культура і дзеці», распрацавана канцэпцыя развіцця традыцыйных свят Любаншчыны на аснове народнага каляндара, а таксама розных відаў і жанраў традыцыйнай культуры: народнай казкі «Казкі бабулі Аўдулі», народнага гумару «На гулянічы ў Баянічы», народнай песні «Тут песні б'юць жывой крыніцай», танца «Танцы пад гармонік», інструментальнай музыкі «Грай, гармонік», лекавых траў «Гардовіца» і інш.

Адзін з арганізатараў фестывалю народнага мастацтва «Палескі трохкутнік» з удзелам Глускага раёна Магілёўскай вобласці, Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Адзін з заснавальнікаў і арганізатараў фольк-мадэрн фэсту «Таўкачыкі» сумесна с Ю. Выдронкам. Народна-песеннаму стылю рэгіёна, прадстаўленаму спеўнымі гуртамі «Паваля́кі» (в. Обчын), «Глыбокія крыніцы» (в. Закальное) і «Жураву́шка» (в. Ямінск), нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Раз у пяць гадоў на юбілейных датах з нагоды нараджэння на Любаншчыне вядомага фалькларыста і этнографа П.М. Шпілеўскага праходзіць «Фальклорная вандроўка» (з 1993 г.), заснавана прэмія раённага выканаўчага камітэта

імя П.М. Шпілеўскага для збіральнікаў і захавальнікаў фальклорнай спадчыны рэгіёна, В.С. Каткавец адзін з уладальнікаў гэтай прэміі.

Удзельнічаў у запісу 19 фальклорных калектываў у тэлепраектах «Запрашаем на вячоркі», «Наперад у мінулае», «Хата на хату», «Вяскоўцы» і інш.

В.С. Каткавец натхняльнік і адзін з арганізатараў рэгіянальнага фестывалю народнай творчасці «Каляднае сузор'е» і рэгіянальнага фестывалю сямейнай творчасці «Вясковы гармідар». З 2012 г. на Любаншчыне адкрыта дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Любанская дзіцячая школа народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» па 7 кірунках народных промыслаў і рамёстваў.

Стваральнік і арганізатар дзіцячага ўзорнага тэатральнага калектыву «Летуценнікі» Сароцкага дома культуры, лаўрэат многіх міжнародных, рэспубліканскіх і абласных тэатральных фестываляў, лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Натхняльнік і арганізатар адкрытага абласнога фестывалю дзіцячай тэатральнай творчасці «Чароўны куфэрак». На базе тэатра (1997–2017) прайшло адзінаццаць фестываляў.

Узнагароджаны граматамі Любанскага райвыканкама, Мінскага аблвыканкама, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2012), Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2016), знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры» (2017), медалём імя Васіля Віткі часопіса «Вясёлка».



***КОНАН Уладзімір Міхайлавіч***

*(1934–2011)*

*Беларускі філосаф, культуролаг, гісторык, літаратуразнавец, педагог. Доктар філасофскіх навук (1982), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі (1982).*

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1959).

Настаўнічаў на Вілейшчыне, выкладаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У 1962–1990 гг. працаваў у Інстытуце філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі. З 1991 г. загадчык аддзела гісторыі і тэорыі культуры Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф. Скарыны, з 2005 г. – вядучы навуковы супрацоўнік навукова-асветнага цэнтра пры Беларускім педагагічным універсітэце імя М. Танка, з 2006 г. – вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Даследаваў тэарэтыка-метадалагічныя праблемы філасофіі і культуралогіі, гісторыю эстэтычнай думкі Беларусі, праблемы традыцыйнай народнай культуры беларусаў, рэлігіязнаўства і мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства і фалькларыстыкі.

Аўтар 25 манаграфій і брашур, звыш 1000 даследчых артыкулаў у навуковых і мастацкіх зборніках, часопісах і энцыклапедыях.

Стваральнік новага кірунку беларускай навукі на сумежжы эстэтыкі, гісторыі беларускай філасофскай думкі, літаратуразнаўства і мастацтвазнаўства. У гэтым кірунку гісторыка-тэарэтычнага сінтэзу падрыхтаваны манаграфіі «Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоуных каштоўнасцей у святле фальклору» (1989) і «Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча» (1991). У першай У. Конан аналізуе эстэтыку фальклору, яго сувязь з міфалогіяй і традыцыйнымі абрадамі, духоўную каштоўнасць народнай творчасці, гратэскавыя формы камічнага ў народнай культуры, біблейскія і хрысціянскія сюжэты, вобразы і матывы ў беларускай культуры. Чарадзейныя казкі і народныя песні разглядае як высокаразвітае мастацтва, што адлюстроўвае духоўны свет народа, яго ўяўленні пра дабро і зло, жыццё і смерць, сумленне і адказнасць чалавека перад грамадствам і сабой. Раскрывае карнавальную прыроду казкі, абгрунтоўвае неабходнасць уважлівых адносін да народнай вусна-паэтычнай творчасці.

У другой манаграфіі вызначыў месца класіка беларускай літаратуры, Максіма Багдановіча, яго творчасці ў духоўнай культуры народа. Паказаў фальклорныя

вытокі, грунт лірыкі паэта. Аргументавана даказаў значэнне народных песень, міфаў, казак, легенд у станаўленні паэтычнага свету М. Багдановіча, няпросты шлях яго творчасці ад этнаграфічнай прастаты да мастацкай вышыні.

13 гадоў выконваў абавязкі эксперта Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь і члена двух саветаў па абароне дысертацый – пры Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і пры Інстытуце філасофіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З пачатку 2000-х гг. дзейсна падтрымліваў новую хвалю мастацка-практычнай фалькларыстыкі, сімвалам і ўзорам якой лічыў фальклорны гурт Мётчанскай установы адукацыі Барысаўскага раёна «Берагіня», а потым і фестываль з аднайменнай назвай. Рэгулярна прымаў удзел у навукова-практычных канферэнцыях, якія ладзіліся на базе Мётчанскай школы падчас юбілейных дат гурту (2002, 2007, 2012), канферэнцыях, «круглых сталах», дыскусіях, праводзімых у рамках Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (з 2001 г.). Актуальныя праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, ментальнай устойлівасці нацыі закрануты ім у шэрагу публікацый: Берагіня беражэ Беларусь // Традыцыйная культура і дзеці. Вып. 1. – Мінск, 2004; Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі // Роднае слова. – 2004. – № 4; Зберагчы «Берагіню»: Праблемы адраджэння народнай харэаграфіі (на прыкладзе Мётчанскай школы) // Роднае слова. 2006.

*Асн. тв.*: Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917–1934 гг.). – Мінск, 1968; Демократическая эстетика Белоруссии (1905–1917 гг.). – Минск, 1971; Очерк истории эстетической мысли Белорусии (в соавторстые с Э. Дорошевичем). – М., 1972; Адам Бабарэка: крытыка-біяграфічны нарыс. – Мінск, 1976; От Ренессанса к классицизму: Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI – XVIII вв. – Минск, 1978; Боская і людская мудрасць [Францішак Скарына: Жыццё, творчасць, светапогляд]. – Мінск, 1980; Фальклор у сістэме сучаснай мастацкай культуры // Вобраз. – Мінск, 1981; Фальклор у сістэме сучаснай мастацкай свядомасці // Узроўні фальклорных уплываў. – Мінск, 1982; Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX века. – Минск, 1985; Философия и фольклор: Сравнительный исторический анализ // Философская и общественно-политическая мысль Белоруссии и Литвы: Дооктябрьский период: Закономерности развития, проблемы исследования. – Минск, 1987; Заметки о карнавальной природе сказки // Детская литератрура. 1987. – № 5; Фольклор и современность // Нёман. 1988. – № 3; Беларуская эстэтыка і мастацкая культура: Гісторыя, традыцыя і сучаснасць. – Мінск, 1988; Святло для людзей: Родная мова і культура ў эпоху перабудовы. – Мінск, 1989; Малюнкі і спевы М. Багдановіча // Мастацтва Беларусі. 1991. – № 11; Архетыпы беларускага менталітэту: Спроба рэканструкцыі паводле нацыянальнай міфалогіі і казачнага эпасу // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 2. – Мінск, 1993; Гратэскавая форма камічнага ў славянскім фальклоры // Satura w literaturach wschodnieslawiańskich / Bialystok, 1993. Міфалогія, фальклор і літаратура ў кантэксце нацыянальнай культурнай традыцыі // Адукацыя і выхаванне. 1994. – № 4; Архетыпы нашай культуры: Міфы і міфалагемы // Там жа. 1996. – № 1, 3–11; Сусветнае дрэва // Крыніца. 1995. – № 5; Славянская міфалогія ў кантэксце беларускай

культуры // Мастацтва. 1997. – № 4, 6-8, 11-12; Беларуская мастацкая культура ў эпоху Сярэднявечча: Этнічная культура // Там жа. 1999. – № 11; Архетыпы беларускай культуры паводле даследаванняў М.В. Доўнар-Запольскага // Палессе. 1997. – № 3; Райские мотивы в поэзии Адама Мицкевича // Всемирная литература. 1998. – № 12; Міфічныя вобразы і матывы ў творчасці Максіма Багдановіча // Роднае слова. 1999. – № 4; Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі // Там жа. 2004. – № 4; Біблейскія і хрысціянскія матывы ў беларускай этнічнай культуры // Наша вера. 2000. – № 1; Эсхаталагічныя матывы ў паэзіі Якуба Коласа // Там жа. 2003. – № 3; Хараство народных ідэалаў // Полымя. 2000. – № 9; Эсхаталагічныя матывы ў паэзіі Янкі Купалы // Мова – Літаратура – Культура: Матэрыялы III Міжнар. навук. канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. – Мінск, 2002. Т. 1; Беларуская мастацкая культура ў кантэксце хрысціянскай цывілізацыі: Гісторыка-тыпалагічнае даследаванне. – Мінск, 2002; Аўтэнтычная народная культура ва ўмовах глабалізацыі // Беларусь XXI ст.: Нацыянальна-культурнае развіццё. – Мінск, 2004; Праблемы беларускай культуры ў творчасці М.В. Доўнар-Запольскага // Чацвёртыя Доўнараўскія чытанні. Ч. 1. – Гомель, 2004; Талент настаўніка – ад Бога і для народа // DUM SPIRO SPERO – Пакуль жыву, спадзяюся / Антаніна Абрамовіч. – Мінск, 2007; Фальклор як мастацкая сістэма: Праблемы эстэтыкі і актуалізацыі ў сістэме адукацыі // У. Конан. Выбранае. – Мінск, 2009;

*Літ.*: Ліс А. Навука – прызванне: Навуковыя далягляды Уладзіміра Конана // Роднае слова. 2004. – № 4; Погляд у вечнасць. Зб. артыкулаў да 75-годдзя Ул. Конана. – Мінск, 2009.



***КУЛЯЙ Аляксей Фёдаравіч***

*(1946–2017)*

*Носьбіт традыцыйнай культуры, гарманіст, бубніст, народны майстар.*

Нарадзіўся 25.08.1946 г. у в. Ігрушка Крупскага р-на Мінскай вобл.

У 1960 г. скончыў Грушкаўскую васьмігадовую школу, у 1965 г. – Мінскае СПТУ-25. З 1965 г. па 1968 г. – служба ў пагранічных войсках у Крыму. У 1969 г., скончыўшы школу міліцыі, працаваў да 1973 г. у Мінску ў органах міліцыі пры ЦК кампартыі Беларусі. У 1973 г. пераязджае на радзіму жонкі Людмілы Мікалаеўны Альшэўскай у г.п. Акцябрскі. Тут уладкоўваецца на працу ў ПМК-37 трактарыстам і працуе ў арганізацыі да 1990 г. У 1979 г. заканчвае Акцябрскую вячэрнюю школу. З 1990 г. па 1995 г. працуе ў ДРБУ-118 стропальшчыкам, з 1995 г. па 1997 г. – у райсельгастэхніцы, а з 1997 г. па 1999 г. – экскаватаршчыкам у арганізацыі «Гарадскі-раённы паліўны збыт».

Цудоўна іграў на гармоніку; па-майстэрску валодаў бубнам, прыёмы ігры на якім пераняў ад бацькі, Фёдара Іванавіча – віртуознага бубніста; ведаў шмат прыпевак і розных песень. Як гарманіст вызначаўся шырокім, разнастайным рэпертуарам: пад яго акампаненмент танцавалі «Польку», «Падыспань», «Барыню», «Лявоніху», «Цыганачку», «Кадрылю» і іншыя танцы, спявалі частушкі, прыпеўкі, страданні, лірычныя і жартоўныя песні.

У яго была свая думка наконт музычнага майстэрства. Музы́ка лічыў, што сапраўдны гарманіст павінен не капіраваць пачутую мелодыю, а ўмець імправізаваць: «Чалавек павінен іграць па-свойму, пець па-свойму. Вось, напрыклад “Кракавяк”. Яго можа іграць любы. А я іграю па-свойму, бо пад сваю музыку мне прыемней танцаваць. Кожны раз іграеш, а потым нешта і мяняеш…». Маючы тонкі музычны слых, вобразна і метка гаварыў аб характары гучання розных гармонікаў: «Ёсць гармонік звонкі, добры, але няма ў ім жаласці. Ёсць музычныя, эластычныя. Мой гармонік меладычны. Далёка не гучыць, а гучыць тут, каля сэрца заўсёды». Пасля такіх разважанняў заўсёды іграў з захапленнем, да самазабыцця, зліваючыся са сваім інструментам у адно цэлае.

Аляксей Фёдаравіч пастаянна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці арганізацый, дзе працаваў. Быў частым госцем у дзіцячым фальклорным ансамблі «Рудабельскія зорачкі», удзельнікі якога з задавальненнем слухалі яго расказы аб

музычных інструментах, асвойвалі пад яго кіраўніцтвам тэхніку ігры на шумавых і ўдарных інструментах. Быў майстрам вырабляць немудрагелістыя драўляныя рэчы спецыяльна для дзяцей: лыжкі, качалкі, трашчоткі, якія юныя музыкі выкарыстоўвалі ў сваім выкананні. Навучаў «зорачак» ігры на гармоніку, разам з імі выступаў на школьных мерапрыемствах, раённых святах.

Любоў да народнай музыкі перадалася сыну Алегу, выкладчыку фізічнай культуры ў адной з сельскіх школ раёна, унукам Руслану і Максіму. Руслан з лёгкасцю сам падбірае любую мелодыю на гармоніку і баяне, а Максім асвоіў усе тонкасці ігры на бубне. Так стварыўся сямейны ансамбль Куляяў, які неаднаразова быў удзельнікам Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016), захапляючы слухачоў віртуознай ігрой.

Жыццё Аляксея Фёдаравіча абарвалася 1 лістапада 2017 г. Памяць пра яго будзе жыць, пакуль будзе гучаць яго гармонік, дапоўнены бадзёрым гукам бубна, у выкананні шматлікіх пераемнікаў. Перададзеная ад Майстра юным выканаўцам з «Рудабельскіх зорачак» музычная спадчына будзе радаваць і ўзбагачаць прыгажосцю маладых прыхільнікаў жывой народнай музычнай і песеннай творчасці.



***МІХЕДАВА Людміла Сяргееўна***

*Філолаг, паэт-аматар, псіхолаг.*

Нарадзілася 27.05.1964 г. у п. Хваенск Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1987).

У 1989–1991 гг. працавала трэцім сакратаром райкама камсамола, у 1993–1997 гг. – мастацкім кіраўніком ва ўстанове культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу»; з 1998 г. – дырэктар дома дзіцячай творчасці аддзела адукацыі Акцябрскага райвыканкама; з 2006 г. – псіхолаг аддзялення дзяржаўнай установы «Акцябрскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

Расла ў сям'і, багатай песеннымі і танцавальнымі традыцыямі. З дзяцінства знала шмат песень – беларускіх, рускіх, польскх. Бабуля Ганна, з боку маці, была цікавай апавядальніцай, слухаючы якую, Людміла ўбірала ў сябе сюжэты твораў беларускай народнай прозы. А вось пачуццё рытму і вершаванай рыфмы – ад бацькі, які з дзіўнай лёгкасцю находзіць разнастайныя рыфмы, падбірае іх «злёту». «Майстар баек» – так з гумарам называюць яго сябры.

Л.С. Міхедава актыўны ўдзельнік рознага ўзроўню культурных мерапрыемстваў (з 1989 г.) у складзе розных мастацкіх калектываў і як салістка. У іх ліку: Міжнародны фестываль харэаграфіі «Сожскі карагод» (г. Гомель), рэгіянальны фестываль народнай творчасці «Палескі трохкутнік» (г.п. Акцябрскі, г. Любань, Глуск; 2003–2010), абласное свята паэзіі (г. Жлобін, 2016, 2018), конкурс «Новыя імёны» (г. Гомель, 1-е месца, 2017), абласны агляд-конкурс сямейнай творчасці (2010), абласны конкурс паэтычнай творчасці (г. Жлобін, 2015). У 2017 г. заняла 1-е месца ў літаратурным конкурсе «Акцябрскі ў маім сэрцы», аб'яўленым раённай газетай «Чырвоны Кастрычнік», узнагароджана дыпломам I ступені.

На Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016) выступала разам з бацькамі і сольна. Праводзіла майстар-класы па народных танцах, ткацтву паясоў і інш.

У 2004 г. раённай бібліятэкай быў арганізаваны творчы вечар «Душа моя плачет стихами», дзе гучалі вершы Людмілы Сяргееўны. Частка з іх пакладзена на

музыку: «Акцябрскія родныя ў квецені нівы» (2013), «Мой любы край» (2008), «Дзіўнае каханне» (2011) і інш.

Л.С. Міхедава – аўтар гімна Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2016), які быў напісаны да IX фестывалю і выконваўся на цырымоніі яго адкрыцця.

Узнагароджана спецыяльнай прэміяй райвыканкама за дасягненні і асабісты ўклад у развіццё культуры раёна, актыўную канцэртную дзейнасць (2014).



***ПАРШУТА Іван Якаўлевіч***

*(1999–2007)*

*Дзяржаўны дзеяч, старшыня Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта.*

*Нарадзіўся 07.07.1954 г. у г.п. Тураў Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.*

Працоўны шлях пачынаў слесарам-наладчыкам калгаса «Новае жыццё» Жыткавіцкага раёна. Потым была служба ў арміі, вучоба ў Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце, праца аграномам, намеснікам старшыні Жыткавіцкага райвыканкама, кіраўніцтва на працягу 13 год калгасам імя XXII з’езда КПСС у родным раёне. За дасягнутыя поспехі быў удастоены ганаровай узнагароды – медаля «За працоўныя заслугі». У маі 1999 г. быў назначаны старшынёй Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта.

Асноўныя рысы характару Івана Якаўлевіча – высокая працаздольнасць, мэтанакіраванасць, настойлівасць у дасягненні пастаўленых мэт. Значны скачок наперад у добраўпарадкаванні раёна, развіцці яго інфраструктуры звязаны з імем Івана Якаўлевіча.

Менавіта па яго ініцыятыве ў пасёлку з’явіўся заапарк, быў пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы комплекс, вуліцы расквеціліся прыгожымі клумбамі, азначыліся дэкаратыўнымі агароджамі, сучасны выгляд пачалі набываць сельскія населеныя пункты, якія набылі статус аграгарадкоў.

Практычна не было той сферы жыццядзейнасці, праблемы якой не хвалявалі б Івана Якаўлевіча. У перыяд яго кіравання быў адкрыты тэррытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і развіцця, дзіцячы сацыяльны прыют, школа № 3 пераўтворана ў гімназію, значна палепшана матэрыяльна-тэхнічная база раённай бальніцы, устаноў адукацыі і культуры. Быў дадзены старт новым праектам, якія паспяхова ажыццёўлены і сталі традыцыйнымі. Гэта выпускныя балі на цэнтральнай плошчы, шанаванне лаўрэатаў маладзёжнай прэміі «Ступені» Акцябрскага райвыканкама, агляды калектываў аматарскай творчасці, святкаванне Дня горада, і, вядома ж, фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», які ўпершыню адбыўся ў 1999 г.

Іван Якаўлевіч быў упэўнены, што важная роля ў працэсе адраджэння нацыі належыць традыцыйнай народнай культуры ва ўсіх яе праявах, што неабходна

зрабіць усё магчымае для таго, каб яна развівалася і перадавалася дзецям, якія панясуць яе праз трэцяе тысячагоддзе і перададуць сваім нашчадкам.

У прывітальных словах да ўдзельнікаў і гасцей фестывалю, а яны гучалі на чатырох «Берагінях», ён жадаў усім святочнага настрою, шчасця і дабрабыту, асалоды ад сапраўднага мастацтва, плёну і творчага натхнення. А самому фестывалю доўгага творчага шляху! І яго словы збыліся: справа, пачатая Іванам Якаўлевічам Паршутам, жыве. Сёння да нас крочыць X «Берагіня».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі» (1997), Ордэнам Пашаны (2004).



**ПЯСЕЦКІ Яўген Віктаравіч**

*Журналіст, фотамастак, паэт. Член Беларускага саюза пісьменнікаў (2016).*

Нарадзіўся 07.01.1949 г. у г. Смалявічы Мінскай вобл.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1978), курс «Еўрапейская журналістыка» Міжнароднага інстытута ў Дортмундзе (2001–2002).

Я.В. Пясецкі працаваў у рэдакцыі Смалявіцкай раённай газеты (1966–1970); з 1971 г. па сённяшні час – у рэдакцыі рэспубліканскай газеты «Звязда», дзе ў розныя часы займаў пасады фотакарэспандэнта, спецыяльнага карэспандэнта, рэдактара аддзела. Цяпер – вядучы фотакарэспандэнт.

У якасці спецыяльнага фотакарэспандэнта газеты «Праўда» (галоўнай газеты былога Савецкага Саюза) пабываў на новабудоўлях Далёкага Усходу і за Палярным кругам, на пагранзаставах Камчаткі і на рыбацкіх сейнерах Каспійскага мора, у газаразведчыкаў пустыні Кара-Кум.

Па заданнях газеты «Звязда» рыхтаваў фотарэпартажы з падзей, на якіх прысутнічалі знакавыя гістарычныя асобы: Фідэль Кастра, Біл Клінтан, Пётр Машэраў, Леанід Брэжнеў, кіраўнікі рэспублік СНД, іерархі праваслаўнай і каталіцкай царквы. Быў запрошаны ў Іерусалім на сустрэчу з Патрыярхам Іерусалімскім (2009).

Аўтар паэтычнага зборніка «Кола дзён» (2007), удзельнічаў у шматлікіх калектыўных зборніках паэзіі. Заснаваў аўтарскі жанр, асноўная прыкмета якога – арганічнае спалучэнне паэзіі і мастацкага фота. Гэты пошук адзначаны вышэйшымі ўзнагародамі рэспубліканскіх творчых конкурсаў «Залатое пяро» (2007) і «Залатая літара» (2010).

На працягу дваццаці гадоў пастаянна асвятляў падзеі заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» і яго дачэрніх праектаў – III Рэспубліканскага турніру салістаў – выканаўцаў твораў народнай спадчыны (г. Лепель, 2010), конкурсу беларускіх народных побытавых танцаў «Ветразь» (г. Мінск, 2015–2018), спеўнага і музычнага выканальніцтва «Згукі мінуўшчыны» (г. Мінск, 2018). Такое стаўленне да фестывальнага руху «Берагіня» газета «Звязда« захавала на працягу ўсіх мінулых гадоў. Галоўным «летапісцам» яго быў і застаецца старэйшы фотажурналіст айчыннай прэсы Яўген Пясецкі. Захоплены тэмай народнай творчасці, кампетэнтны знаўца яе форм у розных рэгіёнах Беларусі, ён умела заўважаў у агульнай фестывальнай плыні

найбольш вартыя прыклады, рэдкія асаблівасці, вылучаў сярод мноства дзеючых асоб самых яскравых, таленавітых. Аб’ектамі яго фотакарэспандэнцый станавіліся не толькі маляўнічыя фінальныя мерапрыемствы «Берагіні». Героі яго фотаздымкаў – гэта ўдзельнікі прамежкавых этапаў танцавальных конкурсаў, простыя сяляне і вядомыя вучоныя, кіраўнікі фальклорных гуртоў і члены журы, танцоры-вучні і танцоры-прафесіяналы – усе, хто так ці інакш быў спрычынены да падзей аднаўлення і пераемнасці мастацкіх традыцый беларусаў. Распавядае ён пра вывучэнне фальклорнай спадчыны ў школьных гуртках, пра краязнаўчую і музейную працу. Многіх удзельнікаў фестывалю яму ўдаецца паказаць у адзінстве з тым калектывам, дзе герой фотарэпартажу навучаецца побытаваму танцу, спевам, авалодвае народнымі рамёствамі. На фотаздымках і ў тэксце прысутнічаюць прыкметы вёскі або горада, дзе пражывае ўзгаданы герой. Усё гэта разам дапамагае ствараць аб’ёмны, поўнавартасны вобраз фестывалю.

Карысным набыткам «Берагіні» з’яўляюцца выстаўкі рэпартажнай і мастацкай фатаграфіі, якія Яўген Пясецкі рыхтаваў да многіх фінальных мерапрыемстваў фестывалю ў Акцябрскім. Вялікія каляровыя фотаздымкі такой выстаўкі экспануюцца ў раённым цэнтры культуры і адпачынку. Фота знаёмяць з мерапрыемствамі, якія згодна з праграмай фестывалю праходзілі за папярэднія гады і з апошнімі днямі галоўных конкурсаў і спаборніцтваў.

Фотажурналіст, паэт Яўген Пясецкі адзначае, што тэматыка «Берагіні» напрамую, або ўскосна прысутнічае ў многіх сферах культурнага жыцця грамадства. Захаванне спадчыны і яе ўшанаванне – адказны элемент у выхаванні грамадзяніна. Таму ўсё, што датычыцца «Берагіні», варта ўвагі журналістаў і літаратараў. У сваім зборніку вершаў «Кола дзён» Яўген Пясецкі змяшчае фотаздымак спевакоў, зроблены ў г.п. Акцябрскім падчас фестывалю, і гаворыць у вершы:

Якая ж песня без таго,
Каб ўслед за ёй буслы кружлялі,
І ветрык каб даносіў з далі
Пах свежых сціртаў і стагоў.
Якая ж песня ў палях
Без звонкіх галасоў дзявочых,
Каб гучна днём і ціха ўночы
Ёй рэхам адгукаўся шлях.
Якая ж песня без хлябоў,
І хлеб без песні, як без солі!
Заўжды спакон, з глыбінь вякоў
Хлеб з песняй побач у раздоллі.

Яўген Пясецкі ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2009).



**_РАГІН Яўген Мікалаевіч_**

*Журналіст, фотамайстар, настаўнік.*

Нарадзіўся 28.10.1960 г. у г. Ветка Гомельскай вобл.

Скончыў Гомельскі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум (1981) і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (1988).

У журналістыцы – з 1981 г. Працаваў у Веткаўскай раённай газеце (1981–1991); рэдактарам аддзела школьнага жыцця ў «Настаўніцкай газеце» (з 1992 г. – перыядычна), тыднёвіку «Літаратура і мастацтва» (1998–2002), часопісах «Роднае слова» (2004–2005), «Мастацтва» (2005–2008); з 2008 і да цяперашняга часу – рэдактар аддзела рэгіянальнай культуры газеты «Культура».

Сфера яго прафесійных інтарэсаў – культурнае жыццё «беларускай глыбінкі» ва ўсіх яе праявах: бібліятэчная і музейная справа, дзейнасць метадычных цэнтраў культуры, дамоў рамёстваў, школ мастацтваў, людзей мясцовай культуры і інш. Уздымае актуальныя праблемы захавання, адраджэння і перадачы мясцовай традыцыйнай культуры дзецям і моладзі, лёсу носьбітаў гэтай культуры, сучаснага стану і развіцця аматарскай творчасці, узаемаадносін і ўзаемаўплываў вясковай і гарадской культур.

Разнастайнасць тыпаў грамадскай практыкі чалавека і творчых магчымасцей яе адлюстравання абумовілі і разнастайнасць жанраў, у якіх працуе Я.М. Рагін. Галоўным чынам гэта жанры інфармацыі і аналітыкі – заметка, рэпартаж, інтэрв’ю, карэспандэнцыя, артыкул, агляд і інш. Друкуемыя матэрыялы вызначаюцца высокай ступенню аб’ектыўнасці і дакладнасці. Сродкамі падбору злабадзённых і значных фактаў, іх ацэнак і каментарыяў садзейнічае фарміраванню асноўных жыццёвых пазіцый людзей, іх перакананняў, каштоўнасных арыентацый. Па меракаванню Я.М. Рагіна «Берагіня» – мадэль будучай Беларусі, дзе не сорамна быць беларусам, а бабульчыны танцы ды песні застаюцца набыткам ўнукаў і праўнукаў.

У цэлым, матэрыялы Я.М. Рагіна раскрываюць багаты і разнастайны свет таго пласта сучаснай культуры краіны, у аснове якой ляжыць шматвяковая традыцыя беларусаў з яе накіраванасцю на дабрабыт, стабільнасць, бяспеку і ўстойлівае развіццё.



***РАГУЛЯ Аляксей Уладзіміравіч***

*Культуролаг, літаратуразнавец, літаратурны крытык, педагог. Кандыдат філалагічных навук (1975), прафесар (1994). Сябра грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» (з 1990 г.). Член-карэспандэнт грамадскай Міжнароднай акадэміі навук па секцыі «культуралогіі» (1996).*

Нарадзіўся 25.03.1935 г. у в. Сенна (раней Сенная) Навагрудскага р-на Гродненскай вобл.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1957).

---

У 1957–1963 гг. працаваў настаўнікам у сярэдніх школах в. Хаўхоліца і Зачысце Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. З 1963 г. па 1970 г. – выхавальнік Мінскай школы-інтэрната № 7 (цяпер школа алімпійскага рэзерву); у 1970–1991 гг. – асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута; у 1991 – 2002 гг. – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, з 2009 г. – прафесар гэтай жа кафедры; з 2011 г. – прафесар кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Даследуе праблемы філасофіі культуры, у тым ліку традыцыйнай, творчасць беларускіх пісьменнікаў (В. Быкава, Г. Далідовіча, І. Мележа, К. Чорнага і інш.). Галоўным аб’ектам навуковай увагі даследчыка з’яўляецца выяўленне ролі вербальнай культуры ў гісторыі самаканстытуявання беларускага этнасу.

Аўтар манаграфіі «Імгненні…» (1990), вучэбна-метадычнага дапаможніка «Этнасеміётыка» (у рэдпадрыхтоўцы, план выдання 2018 г.), адзін з аўтараў калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.» (2014), а таксама зборнікаў артыкулаў «Пафас станаўлення» (1991), «Зерне харасства» (2013) (артыкулы друкаваліся ў навуковых зборніках і перыядычных выданнях Расіі, Украіны, і Польшчы). Падрыхтаваў падручнікі для вышэйшай і сярэдняй школы: «Методыка выкладання беларускай літаратуры» (1986, аўтар і кіраўнік навуковага калектыву), «Беларуская літаратура для 8-га класа» (1990), «Беларуская літаратура для 9 класа» (2006, абодва ў суаўтарстве). Ініцыіраваў выданне збору твораў К. Чорнага ў 6-і тамах (разам з дачкой пісьменніка Рагнедай Раманоўскай). У складзе групы энтузіастаў у Пецярбургу ўдзельнічаў у выданні пяцітомнай спадчыны беларускага філосафа і культуролага М.І. Крукоўскага, працу якога «Бляск і трагедыя ідэалу» пераклаў на рускую мову, напісаў уступны артыкул «Логіка мадэліравання эпохі» да чацвёртага тома збору.

Даследчыцкая ўвага прафесара А.У. Рагулі вядзецца навокал пытання знаходжання і рэалізацыі патэнцыялу духоўнай энергіі, неабходнай для пераадолення

залежнасці ад прагматысцкіх, нігілісцкіх канцэпцый пазафіласофскай трактоўкі культурнай дынамікі. Вялікія перспектывы тут вучоны бачыць у развіцці педагагічнага руху «Традыцыйная культура і дзеці» і распаўсюджванні практычнага вопыту фальклорнага гурту «Берагіня» з в. Мётча Барысаўскага раёна. Як падкрэслівае ён сам, знаўцы значэння народнай харэаграфіі ў рабоце з дзецьмі арыентуюцца на іх здольнасць да ўспрымання глыбіннага сэнсу, а потым і псіхагенетычнага патэнцыялу, закладзенага ў пластыцы народнага танца. У «Берагіні» шлях да разумення і трансляцыі духоўнай энергіі танца не ўскладняецца штучнымі прыёмамі ці драбленнем вобразнай структуры. У «Берагіні» вучаць «схопліваць» адразу сутнасць у цэласнай карціне харэаграфічнага дзейства. У дзяцей малодшага ўзросту фарміруецца пачуццё далучанасці да глыбінных жыццятворных таямніц і мабілізуючых сіл Сусвету, што фарміруе ў іх пачуццё ўласнай чалавечай годнасці. Так праз харэаграфію і музыку, лічыць вучоны, фарміруецца нацыянальны стыль мыслядзеяння. Падлеткі старэйшага ўзросту ў педагагічным вопыце «Берагіні» спасцігаюць шлях чалавечай душы да вытанчанага суперажывання чысціні і глыбіні міжасобасных адносін. «Берагіня» фарміруе цнатлівае стаўленне да партнёра і ашчаджальныя адносіны да эмацыянальнага вопыту, уменне валодаць сабой у складанай сітуацыі і быць адказным за свае паводзіны і ўчынкі. «Берагіня» арыентуе падлеткаў, школьную моладзь і педагагічную думку на ўсебаковую падрыхтоўку чалавека і валоданне тэхналогіяй пазнання і трансляцыі культурных сэнсаў усімі формамі мастацкага дзеяння: музыкі, каларыстыкі, пластыкі і вербальнай культуры маўленчых зносін.

А.У. Рагуля ўзнагароджаны знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік асветы» (1985).



### *САРНАЎСКАЯ Марыя Іванаўна*

*Народны майстар, кандытар, метадыст-майстар.*

Нарадзілася 18.05.1963 г. у г. Ельску Гомельскай вобл.

Скончыла сярэднюю школу ў г. Ельску (1980), курсы кандытараў (1981).

Працавала ў сферы спажывецкай кааперацыі (1980–2001), з 2001 г. – метадыст-майстар, кіраўнік творчай майстэрні па ткацтву і пляценню паясоў «Узорны паясок», з 2014 г. – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі раённы дом рамёстваў».

З маленства цікавілася вышыўкай і ткацтвам. Назіраючы за работай старэйшых сясцёр Людмілы, Таццяны, Любы і бабулі Ксеніі Іванаўны (1902 г.н.), вучылася ад іх азам майстэрства.

Першыя крокі ў дэкаратыўна-прыкладной творчасці зрабіла ў школьныя гады (1970–1980), калі займалася ў гуртках пры доме піянераў у г. Ельску. Працягнула навучанне ў Акцябрскім раённым доме рамёстваў у творчай майстэрні па ткацтву, якую наведвала разам са сваёй дачкой. З іх удзелам створаны першыя традыцыйныя касцюмы для фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» Акцябрскай раённай гімназіі.

Сумесна з калегамі дома рамёстваў прымала ўдзел у экспедыцыях, дзе збірала этнаматэрыял па старадаўняму ткацкаму рамяству. У шчыльным супрацоўніцтве з народнымі ткачыхамі пераймала іх вопыт, вывучала тэхнікі вырабу той або іншай рэчы. Набытыя веды зараз перадае сваім навучэнцам – удзельнікам гуртка «Узорны паясок», сярод якіх і яе ўнучка Кацярына.

За гады працы ў доме рамёстваў яе рукамі створана вялікая колькасць рамізных і браных ручнікоў, сурвэтак, узорных паяскоў, выкананых у розных тэхніках. Акрамя ткацтва Марыя Іванаўна дасканала авалодала сакрэтамі традыцыйнай вышыўкі, саломапляцення. Ёй распрацаваны і выданы метадычна-вучэбныя дапаможнікі па традыцыйнай тэхніцы ткацтва і пляцення паясоў «Узорны паясок», буклет па матэрыялах фальклорных экспедыцый «Бабуліных кроснаў узор дзівосны», аформлены фотаальбом і папкі-дапаможнікі «Лакальныя асаблівасці тканых “перабіранак”», «Віды плецёных і тканых паясоў», «Ручнікі Рудабельскага краю», створаны калекцыі паясоў для ўзорных фальклорных ансамблей «Рудабельскія зорачкі», «Цярэшкавы шчодрыкі», «Некрашынка», «Праменьчыкі», вялікая колькасць паясоў і ручнікоў находзіцца ў часных калекцыях і фондах дома

ремёстваў. За перыяд дзейнасці стварыла калекцыі тканых і плеценых паясоў больш 500 адзінак, ручнікоў – 100 адзінак. Навучыла традыцыям ручнога ткацтва каля 40 навучэнцаў.

Вырабы Марыі Іванаўны вядомы не толькі ў Акцябрскім раёне, але і далёка за яго межамі.

Штогод удзельнічае ў шматлікіх выстаўках раённага, абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню:

– нацыянальная выстаўка Рэспублікі Беларусь у рамках візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Туркменістан з нагоды 20-годдзя нейтралітэту Туркменістана (г. Ашхабад, 2015);

– выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і народных рамёстваў у рамках традыцыйнай сустрэчы прыгранічных абласцей Рэспублікі Беларусь, Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Украіны – Міжнародны фестываль «Дружба–2015» (г.п. Лоеў, 2015);

– выстаўка ДПТ майстроў Акцябрскага раёна ў рамках Дзён беларускай культуры (г. Елгава, Латвія, 2016);

– XVII міжрэгіянальны ўніверсальна аптова-рознічная ярмарка «Курская Коренская ярмарка–2017» (Расія, г. Курск, 2017);

– Міжнародны навуковы форум «Традыцыйны беларускі касцюм у еўрапейскай культурнай прасторы» (г. Мінск, 2017).

За сваю творчую працу неаднаразова ўзнагароджвалася граматамі, дыпломамі, каштоўнымі падарункамі: падзяка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і прыкладнае выкананне працоўных абавязкаў» (2017); Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта «За шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства і актыўны ўдзел у культурным жыцці раёна» (2013); Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта за добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і значны ўклад у развіццё беларускай культуры (2016); Ганаровая грамата аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама «За дасягненне лепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод устаноў культуры і спецыялістаў устаноў у намінацыі “Спецыяліст года”» (2012); падзяка за актыўную і добрасумленную работу аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2014); прызер (дыплом I ступені ў намінацыі «Ткацтва») абласнога свята аматарскай творчасці «Захапленні на любы густ» (г. Гомель, 2013); прызёр (дыплом I ступені ў намінацыі «Ткацтва») Рэспубліканскага фестываля-ярмаркі рамёстваў «Вясновы букет» (г. Мінск, 2014); прызёр (III месца ў намінацыі «Ткацтва») Рэспубліканскага фестываля-ярмаркі рамёстваў «Вясновы букет» (г. Мінск, 2015); дыплом «За прафесійны рост перадачы традыцый пляцення паясоў дзецям», «За адраджэнне традыцый касцюма» Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012, 2014).

З 2011 г. – член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. У снежні 2016 г. прысвоена званне народнага майстра Рэспублікі Беларусь.



### *СЕЛІВАНАЎ Сямён Данілавіч*

*Народны музы́ка-самародак, папулярызатар інструментальнага фальклору Рудабельшчыны.*

Нарадзіўся 15.04.1932 г. у в. Харомцы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Вучыўся ў Харамецкай пачатковай школе (1939–1941), пасля вайны пераехаў з сям’ёй у г.п. Акцябрскі. У Акцябрскай вячэрняй школе набыў сярэднюю адукацыю.

У 1948–1951 гг. працаваў трактарыстам у Парэцкай МТС; з 1952–1992 гг. да заслужанага адпачынку працаваў шафёрам у райсельгастэхніцы г.п. Акцябрскі.

Ігры на гармоніку навучыўся самастойна ў юнацкія гады (спачатку гэта быў губны гармонік): «Што чуў, тое і іграў, – успамінае музы́ка. – Знаходзіў любую вольную хвіліну і браўся за гармошку, каб найграць тое, што дзе пачуў. Больш усяго частушкі, страданні, бо вельмі ж іх любілі спяваць на вячорках. А дзе песні, там і танцы: вальсы, беларуская полька, “Кракавяк”, “Сербіянка”, “Барыня”... Так і пайшло...». Гармонік, на якім іграе, імянны, зроблены пад заказ на фабрыцы г. Шуі Мікалаеўскай вобласці і мае надпіс «С.Д.» (Сямён Данілавіч).

Актыўна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці прадпрыемстваў, дзе працаваў, іграў на сямейных і вясковых святах, прымаў удзел у народных абрадах.

У рэпертуары Сямёна Данілавіча вялізная колькасць мясцовых абрадавых і пазаабрадавых песень, танцавальныя найгрышы. Валодае майстэрствам віртуознай імправізацыі, што ў найбольшай ступені раскрываецца пры выкананні танцавальных мелодый і прыпевак.

Дарадца і народны настаўнік дзіцячага ансамблю народнай музыкі «Брачынскія музыкі» Акцябрскай гімназіі. У вуснай форме перадае яго ўдзельнікам навыкі ігры на гармоніку і свой рэпертуар – «Старадуброўская полька», «Падыспань», «Карпілаўскія мётлы», «Брачынская полька», «Базар», «Нарэчанька», «Субота» і інш. Разам з калектывам неаднаразова выступаў на розных мерапрыемствах раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў, рыхтаваў маладых музы́каў да ўдзелу ў Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016). Дзякуючы супрацоўніцтву з калектывам «Брачынскія музыкі», падтрымліваюцца музычныя традыцыі Рудабельскага краю.

Перадаў свае выканальніцкія ўменні сынам і ўнукам Сяргею і Раману. Раман скончыў Акцябрсую школу мастацтваў па класу «баян» (2011). Старэйшы, Сяргей, скончыў Мазырскі дзяржаўны музычны каледж (2005), Мазырскі педуніверсітэт па спецыяльнасці «фізічнае выхаванне» (2011). Зараз завочна заканчвае Гомельскі

дзяржаўны ўніверсітэт, набываючы вышэйшую юрыдычную адукацыю. Працуе ў г. Жлобіне ў органах унутраных спраў.

У наяўнасці ў Сямёна Данілавіча тры гармонікі. Два музычныя інструменты перадаў унукам. Сямейная музычная пераемнасць не спынілася. Ланцужок ад мінулага да будучага працягваецца.

Зараз Сямёну Данілавічу 86 гадоў! Але гармонік Майстар не пакідае. Іграе і для сябе («пад настрой»), і «на дні нараджэнні запрашаюць». Значыць, гучыць інструмент: і сабе, і людзям на радасць.



***СІВУРАВА (ЗІНКЕВІЧ) Любоў Пятроўна***

*Этнолаг, культуролаг, выканаўца народных песень і танцаў, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкладчык культуралагічных дысцыплін.*

Нарадзілася 09.02.1966 г. у в. Старое Сяло Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыла Мінскі інстытут культуры (1989) па спецыяльнасці «культасветработа»; аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2002), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (2002).

Працавала загадчыкам Старасельскага сельскага клуба (1984–1985, Жабінкаўскі р-н), загадчыкам аддзела аматарскіх аб'яднанняў Міжсаюзнага дома самадзейнай творчасці Рэспубліканскага палаца культуры прафсаюзаў (1989–1993); у 1993–2004 гг. – навуковы супрацоўнік лабараторыі аматарскай творчасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры; у 2004–2017 гг. – дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; з 2017 г. – стваральнік і кіраўнік фальклорнага тэатра «Шчырасьць» Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Мінска

Даследуе пытанні развіцця аматарскай мастацкай творчасці, фестывальнага руху ў Беларусі, вывучае сучасныя этнакультурныя працэсы. Аўтар больш за 100 навуковых, навукова-метадычных работ (7 – у суаўтарстве).

Л.П. Сівурава ўдзельнічала ў распрацоўцы нарматыўных дакументаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь: Палажэння аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь, Палажэння аб народным (узорным) самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь (абодва 1999 г.) і інш.

З'яўлялася членам аргкамітэтаў, выканаўчых дырэкцый, рэспубліканскага журы і ўдзельнікам шматлікіх фестываляў, сярод якіх: Першы міжнародны фестываль фальклору на Беларусі (1994), міжнародныя фестывалі сярэдневяковай культуры «Наваградскі замак» (2000, 2002), «Старадаўні Нясвіж» (2003), «Лошыцкі фэст» (2003), «Рубон» (2008), VII Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (2003), Рэспубліканскі фестываль народнага танца «Беларуская полька» (1993, 1995, 1997), Рэспубліканскі фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (1997–1998, 2002–2005), II Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур (1998), фестывалі сучаснага фальклору «Таўкачыкі» (2002), «Вольнае паветра» (2007), «Культура, на дапамогу» (2006) Рэспубліканскі фестываль беларускай паэзіі і песні «Маладзечна» (2005) і інш.

Прымала ўдзел у выданні электронных дыскаў з запісамі беларускіх народных песень: «Гуда. Архаічныя абрадавыя сьпевы» (г. Мінск, 2002), «Ігры Багоў» (г. Мінск, 2005), «Zara» (г. Санкт-Пецярбург, 2006), «Guda. Вясельле. Традыцыйныя беларускія вясельныя сьпевы» (г. Мінск, 2013), а таксама здымках тэматычных праграм на тэлеканалах ЗАО «Второй национальный телеканал», «Лад», «БТ», «Белсат»: «Інстытут культуры», «Маем рэчы», «Звычайны незвычайны дзень», «Прыват» (2004–2007) і інш.

У творчым тандэме з Кацярынай Петраневіч рэалізавала ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту фестывальны праект «Сонцаварот» (2013), які грунтаваўся на напрацоўках «Берагіні».

На пачатку Рэспубліканскага фальклорнага руху «Берагіня» актыўна ўдзельнічала ў вырашэнні арганізацыйных пытанняў па падрыхтоўцы фестывальных тураў; працавала ў складзе Рады экспертаў на фестывалі «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 2004), конкурсе беларускіх народных побытавых танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск, 2013, 2017). На працягу шмат год асвятляла розныя сферы фестывалю на старонках рэспубліканскіх СМІ, падчас лекцый і семінарскіх заняткаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, на навукова-практычных канферэнцыях.

Прынцыпы «Берагіні» ўкараняе ў працы з мінскімі маладзёжнымі фальклорнымі калектывамі, ансамблямі, удзельнікі якіх – аматары мастацкай творчасці больш старэйшага пакалення. Навучае ўдзельнікаў творчых суполак беларускім народным побытавым танцам з рэпертуару рэспубліканскага фестывальнага праекта «Конкурс танцавальных пар». Перадае назапашаны танцавальны вопыт удзельнікам фальклорных вечарын.



**_СМІРНОВА Ірына Юр'еўна_**

*Этнограф, фальклярыст.*

Нарадзілася 20.10.1966 г. у г. Орша Віцебскай вобл.

Скончыла філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1988).

У 1988–1999 гг. працавала вядучым навуковым супрацоўнікам Веткаўскага музея народнай творчасці (г. Ветка, Гомельская вобл.). У 1999–2009 гг. – старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі традыцыйнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. У 2000–2001 гг. працавала ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь вядучым спецыялістам па народай творчасці. У 2009–2012 гг. – вядучы метадыст па фальклору Мінскага абласного цэнтра народнай творчасці. З 2012 г. – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Удзельнік навуковага праекта «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» (1999–2013), Дзяржаўнай праграмы «Культура» па даследаванні сучаснага бытавання традыцыйных лакальных культур Беларусі (2006–2010, 2011–2015); сумеснага праекта Расійскага этнаграфічнага музея і Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі «Комплекснае даследаванне беларускай этнамузеалагічнай спадчыны А.К. Сержпутоўскага ў сборы Расійскага этнаграфічнага музея» (2015–2017).

Вядзе актыўную навукова-даследчую і экспедыцыйную работу, вывучае рэгіянальныя асаблівасці беларускага фальклору і традыцыйнага беларускага касцюма. Асобная тэма даследаванняў – гісторыя і культура в. Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Як супрацоўнік сектара аховы фальклорнай спадчыны актыўна працуе над папаўненнем калекцыі фальклорных запісаў, стварэннем электроннага каталога фальклорных калекцыі ІМЭФ, апрацоўкай архіўных матэрыялаў. Работае па планавай навуковай тэме «Народная творчасць у сацыякультурных умовах сучаснай Беларусі: рэгіянальная разнастайнасць і межславянскія сувязі фальклору і постфальклору».

Аўтар больш за 50 навукова-папулярных, навуковых і метадычных публікацый.

Да праекта «Берагіня» далучылася ў 2001 г., займалася арганізацыйнымі пытаннямі падрыхтоўкі фестывалю і рэдагаваннем зборніка «Традыцыйная куль-

тура і дзеці» (Традыцыйная культура і дзеці. Вып. 1: Рэсп. эксперым. праект «Танц. фальклор і дзеці» / укл. М.А. Козенка. – Мінск, 2004).

У 2010–2012 гг. займалася падрыхтоўкай калектываў Мінскай вобласці да ўдзелу ў фестывалі «Берагіня». Асабістае творчае супрацоўніцтва з дзіцячым фальклорным ансамблем «Вясейка» і кіраўніком Н.П. Макоўскай па падрыхтоўцы да фестывалю прынесла добры вынік. У 2012 г. дзіцячы фальклорны калектыў «Вясейка» (Слуцкі р-н, Вясейская дзіцячая школа мастацтваў) на VII Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» атрымаў дыплом ЮНЕСКА за захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. «Вясейка» таксама адзначана дыпломам лаўрэата II ступені як адзін з лепшых фальклорных калектываў краіны.

*Тв.:* Народны касцюм // Даследаванне лакальных культур Беларусі. Праграмы па зборы фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. – Мінск, 2008.

Народнае адзенне // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гродзенскае Панямонне. Т. 3, Кн. 2. – Мінск, 2006.

Традыцыйнае адзенне // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Цэнтральная Беларусь. Т. 5, Кн. 2. – Мінск, 2011.

Народнае адзенне // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. Т. 6, Кн. 2. – Мінск, 2013.

Неглюбка. Историко-этнографический очерк // Бутковская Н.В., Смирнова И.Ю. Мельниковы. Бондарь. Головко. Семейные хроники. – Владивосток, 2008.

Из истории Свято-Николаевской церкви села Неглюбка // Архіварыўс. Зб. навук. паведамленняў і артыкулаў. Вып. 7. – Мінск, 2009.

Асаблівасці развіцця і трансфармацыі народнага касцюма Неглюбскага строю ў XIX – XX стст. // Роднае слова. 2010. – № 11.

Художественные традиции д. Неглюбка как объект нематериального культурного наследия // Міжнар. навук.-практ. канф. «Музей і традыцыйная культура Беларусі». – Гомель, 2011.

А.К. Супінскі – фалькларыст, этнограф, археолаг // Асоба збіральніка ў захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны: да 200-годдзя з дня нараджэння О. Кольберга. – Мінск, 2015.

Женский костюм белорусских деревень Унечской волости на фотографиях А.К. Сержпутовского (собр. Российского этнографического музея) // Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры: зб. матэрыялаў. – Мінск, 2016.

Смірнова, І. Ю., Астравух, А.М. «Саветы загадалі нам быць вясёлымі і шчаслівымі…». Яўрэйскі фальклор на Беларусі // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні: зб. навук. прац. Вып. 4. – Мінск, 2017.



***СОБАЛЬ Міхаіл Іпалітавіч***

*Педагог, навуковец, дзяржаўны і грамадскі дзеяч. Кандыдат тэхнічных навук (1976).*

Нарадзіўся 06.02.1950 г. у в. Грушаўка Камянецкага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыў хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971).

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута торфу Акадэміі навук БССР (1971–1979); інструктарам, намеснікам загадчыка аддзела навуковай моладзі ЦК ЛКСМБ (1979–1983); галоўным спецыялістам, намеснікам загадчыка аддзела навукі Камітэта народнага кантролю БССР (1983–1987); у 1987–1991 гг. – прарэктар па навуковай працы Рэспубліканскага Інстытута павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі; у 1991–1995 гг. – спецыяліст, намеснік загадчыка аддзела, загадчык аддзела ў Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь; у 1995–2016 гг. – кіраўнік Міжнароднай грамадскай дабрачыннай арганізацыі «Надзея Экспрэс».

Па адукацыі і роду заняткаў Міхаіл Іпалітавіч быў далёкі ад сферы культуры, але па сваім выхаванні, жыццёвай пазіцыі, духоўнасці падрыхтаваны да супрацоўніцтва з тымі, хто дапамагае вяртаць беларусам нацыянальную памяць і фарміруе пачуццё патрыятызму ў падрастаючага пакалення. Па яго ўласным прызнанні любоў да роднай прыроды, роднай хаты і сям'і, да гісторыі і культуры краіны, была выгадавана матуляй і бацькам. Абодвум ім прыходзілася шмат працаваць (бацьку – на чыгунцы, маці – у калгасе), і дзеці (іх было пяцёра сыноў), з разуменнем ставячыся да клопатаў і патрэб бацькоў, дапамагалі ім, як маглі. На ўсё жыццё маленькі Міхаіл запомніў маму, якая малявала алеем карціны; ружы і многія іншыя кветкі, вырабленыя ёю па ўласнай тэхніцы; кросны ў доме кожную зіму і абавязак дзяцей прыгатаваць маці для ткацтва цівкі з рознакаляровымі ніткамі; «вячоркі» жанчын за калаўротамі і іх спевы; бацьку, які з асаблівым шанаваннем прыносіў у хату напярэдадні каляд сена са стойла каровы і туясок са збожжам; вясёлыя святы калядавання і свет батлейкі ў акне дома; віртуозную ігру брата-самавучкі на акардэоне; грыбны бярозавы лес за ўскраінай вёскі і інш.

Несумненны ўплыў на светаўспрыманне М.І. Собаля зрабіла сям'я яго жонкі Людмілы Леанідаўны (дзявочае прозвішча Ермаловіч), бацька і браты якой зрабілі велізарны ўнёсак у даследаванне гісторыі і культуры Беларусі. Так, бацька Людмілы Леанідаўны – Леанід Іванавіч, працуючы настаўнікам беларускай мовы

і літаратуры на сваёй радзіме ў Навасёлкаўскай СШ Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, даследаваў гісторыю родных мясцін і даўніх уласнікаў гэтых зямель – знакамітага роду Кастравіцкіх, да якога належаць вядомыя паэты Кастусь Каганец і Гіём Апалінер. Старэйшы з братоў, Ермаловіч Мікалай Іванавіч, адкрыў нам вочы на сапраўдную гісторыю Беларусі і з'яўляецца аўтарам уласнай, прызнанай айчыннымі і замежнымі даследчыкамі і ўключанай у школьныя падручнікі навуковай канцэпцыі стварэння Вялікага Княства Літоўскага. Малодшы з братоў, Валянцін Іванавіч, вядомы многім як тэатральны рэжысёр, акцёр, педагог, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь.

Таму зусім заканамерным падаецца той факт, што ў 1995 г. Міхаіл Іпалітавіч рэзка змяніў сваё жыццё – добраахвотна пакінуў высокую пасаду ў Савеце Міністраў і ўзначаліў Міжнародную грамадскую дабрачынную арганізацыю «Надзея Экспрэс». Асноўным матывам яго рашэння было цвёрдае перакананне, што для адраджэння Беларусі недастаткова намаганняў дзяржаўных органаў, надзвычай важна абудзіць грамадзянскую ініцыятыву, аб'яднаць намаганні аднадумцаў-добраахвотнікаў і накіраваць іх дзеянні на добрыя мэты ў дадатак і ў супрацоўніцтве з дзяржаўнымі арганізацыямі.

Пачаткам такой работы паслужыла знаёмства з М.А. Козенкам, апантаннасць ідэямі нацыянальнай самаідэнтычнасці, шчырасць і мэтанакіраванасць якога пагрузілі Міхаіла Іпалітавіча ў вір падзей фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», і ён стаў адным з актыўных іх арганізатараў.

У гэты ж час пачынаецца супрацоўніцтва дабрачыннай арганізацыі «Надзея Экспрэс» з Нацыянальным цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, фальклорным гуртом «Берагіня» пад кіраўніцтвам М.А. Козенкі, культурна-адукацыйнай праграмай «Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня"», рознымі праектамі, якія ажыццяўляліся ў рэчышчы фестывальнага фальклорнага руху на працягу 20-і гадоў.



***СТАРЫНОВІЧ Алена Якаўлеўна***

*Філолаг, педагог, журналіст, псіхолаг.*

Нарадзілася 14.02.1969 г. у п. Кавалі Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

У 1991 г. скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура», мае кваліфікацыю «выкладчык беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры»; у 2001 г. скончыла Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны па спецыяльнасці «практычная псіхалогія», мае кваліфікацыю «практычны псіхолаг».

Сваю працоўную дзейнасць пачала настаўнікам пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гарохавіцкая базавая школа» (1991–1996), затым працавала ў дзяржаўнай установе адукацыі «Гацкая сярэдняя школа» (1996–2001), у аддзеле адукацыі Акцябрскага райвыканкама на пасадзе псіхолага (2001–2005). Некаторы час узначальвала дзяржаўную ўстанову адукацыі «Акцябрскі раённы цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі» (2005–2008), затым дзяржаўную ўстанову адукацыі «Ламавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа» (2008–2012).

У лютым 2013 г. прызначана на пасаду галоўнага рэдактара дзяржаўнай установы «Рэдакцыя газеты "Чырвоны Кастрычнік"» (г.п. Акцябрскі). Калектывам раённай газеты, кіраўніком якой з’яўляецца Алена Якаўлеўна, надаецца вялікая ўвага пытанням захавання фальклорнай спадчыны, традыцый, гісторыі рэгіёна, папулярызацыі народнай творчасці і мастацкіх традыцый краю, праблемам выхавання падрастаючага пакалення сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва.

У час працы газета актыўна асвятляла раённыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»: агляды, конкурсы дзіцячых і дарослых фальклорных калектываў, асобных носьбітаў мастацкіх традыцый, семінары-практыкумы для работнікаў культуры, выстаўкі дэкаратыўна-побытавага мастацтва; арганізоўвала конкурсы на лепшы паэтычны твор, прысвечаны фестывалю; асвятляла яго заключныя мерапрыемствы (конкурс парвыканаўцаў беларускіх народных танцаў, турнір дзіцяча-маладзёжных фальклорных калектываў, прэзентацыі фальклорных калектываў Беларусі і замежжа, «Рудабельскае Купалле», «Рудабельскі кірмаш») і інш.

Па выніках абласнога конкурсу перыядычных выданняў рэдакцыя газеты «Чырвоны Кастрычнік» пад кіраўніцтвам Алены Старыновіч у 2014 г. заняла II месца.

З’яўляецца ўкладальнікам зборніка «“Берагіня” паэтычная», прысвечанага 20-гадоваму юбілею фестывалю (2018).

Узнагароджана Ганаровай граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта за шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства (2012); Ганаровай граматай Акцябрскага раённага Савета дэпутатаў – за актыўную і плённую работу па асвятленню ў раённай газеце дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў (2015).



**СТРУЖЭЦКІ Тадэуш Іванавіч**

*Дзеяч культуры, педагог, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1999).*

Нарадзіўся 09.01.1953 г. у в. Падлявонавічы Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыў з адзнакай Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (1975), аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры (1981).

Працаваў загадчыкам сектара Палаца культуры прафсаюзаў у Мінску (1977), выкладчыкам Мінскага інстытута культуры (1977–1981), намеснікам дырэктара Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці і культасветработы (1981–1983). У 1983–2004 гг. – намеснік начальніка цэнтральнага апарата Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, з 1989 г. – начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці.

Адзін з ініцыятараў і распрацоўшчыкаў праектаў законаў «Аб народным мастацтве, народных промыслах і рамёствах», «Аб ахове фальклору ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», Дзяржаўнай праграмы па падтрымцы народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь на 2004–2006 гг., раздзела «Культура» Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг., Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2010–2015 гг., шэрага раздзелаў іншых праграм і нарматыўных актаў у галіне культуры.

Аўтар ідэй і арганізатар (старшыня рэспубліканскіх аргкамітэтаў), стаўшых пазней традыцыйнымі, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў: народнага мастацтва «Беларусь – мая песня», тэатральнага мастацтва «Гасціны ў Галубка», «Тэатральныя скрыжаванні» (г. Баранавічы, Слуцк, Маладзечна), духавой музыкі «Беларускія фанфары» (г. Баранавічы), нацыянальных культур (г. Гродна), сямейнай творчасці (г. Слонім), народнага гумару «Аўцюкі» (Калінкавіцкі р-н), этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» і інш.

З’яўляецца аўтарам праекта і суарганізатарам з 1989 г. Рэспубліканскага, а з 1996 г. Міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік у г. Паставы.

У 1990–2004 гг. – кіраўнік-каардынатар Нацыянальнай секцыі Міжнароднага савета па арганізацыі фальклорных фестываляў і традыцыйных мастацтваў (CIOFF).

Са студзеня 2005 г. працаваў саветнікам Галоўнага ўпраўлення Еўропы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, з мая 2005 г. – саветнікам па гуманітарных пытаннях і культуры Пасольства Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы

Польшча. Ініцыяваў і арганізаваў комплекс мерапрыемстваў (Дні культуры, выстаўкі, гастролі) па прэзентацыі беларускай культуры ў Польшчы. Вынікова займаўся пытаннямі вяртання ў Беларусь гісторыка-культурнай спадчыны.

Са снежня 2009 г. па красавік 2013 г. працаваў намеснікам Міністра культуры Рэспублікі Беларусь. Курыраваў пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў для сферы культуры, музейнай, бібліятэчнай справы, устаноў культуры і народнага мастацтва, работы з нацыянальнымі меншасцямі ў Рэспубліцы Беларусь, беларусаў замежжа, каардынацыі супрацоўніцтва з творчымі саюзамі і грамадскімі аб'яднаннямі.

Ініцыіраваў стварэнне і забяспечваў працу Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа (2009–2013), падрыхтоўку і правядзенне Першага фестывалю мастацтва беларусаў свету (г. Мінск, Віцебск, 2010), рэспубліканскага праекта «Культурная сталіца Беларусі», каардынаваў распрацоўку дзяржпраграм «Слуцкія паясы», «Беларусы ў свеце» і інш.

З'яўляецца аўтарам 4-х вучэбна-метадычных дапаможнікаў («Арганізацыя аматарскіх аб'яднанняў», 1982, «Клубныя аб'яднанні», 1983, «Праграма па клубазнаўству для падрыхтоўкі культасветработнікаў у межшкольных вучэбна-вытворчых камбінатах» 1987, «Сацыялістычная абраднасць: прапаганда, укараненне», 1987; звыш 120 публікацый па праблемах культуры ў розных выданнях Беларусі і за мяжой, а таксама энцыклапедыях «Профессиональные союзы Беларуси». Том 2. (г. Мінск, 2012); «Культура Беларусі». Том 6. (г. Мінск, 2015). Аўтар праекта альбома-каталога «Вечназялёнае дрэва рамёстваў» (1997); аўтар праекта і складальнік кнігі-альбома «Беларускія народныя музычныя інструменты» (2016).

Стаяў ля вытокаў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» і на працягу 20 гадоў рупіўся аб яго жыццядзейнасці.

Зараз – старшыня Беларускага фонду культуры (з 2018 г.), дацэнт кафедры сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (2016).

Узнагароджаны Ганаровай граматай і памятным знакам Міністэрства культуры СССР (1988), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1988), спецыяльнай прэміяй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за актыўную працу па развіццю народнай культуры і самадзейнай творчасці працоўных (1999), Ганаровым знакам Міністэрства культуры «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2003), граматай Беларускага Экзархата (2003), памятнай медаллю Таварыства супрацоўніцтва Польшча – Усход (2009), дыпломам Камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА «За ўклад у развіццё супрацоўніцтва Беларусі з ЮНЕСКА у дзейнасці па захаванню культурнай спадчыны» (2012), ганаровым знакам Беларускага прафсаюза работнікаў культуры (2013), юбілейным знакам «Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі: 100 гадоў прафсаюзнага руху» (2013), Ганаровай граматай Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за вялікі асабісты ўклад у развіццё супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры і Нацыянальнай акадэміі навук у галіне захавання і адраджэння гісторыка-культурнай спадчыны (2013), ганаровым знакам Беларускага фонду культуры «Руплівцу. Стваральніку» (2017). З'яўляецца пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Чалавек Года культуры» па выніках 2016 г. у намінацыі «народная творчасць».



***СУША Галіна Аркадзьеўна***

*Журналіст, педагог, спецыяліст па пытаннях традыцыйнай культуры і народнага мастацтва.*

Нарадзілася 04.03.1949 г. у в. Любанічы Карэліцкага р-на Гродзенскай вобл.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1974).

З 1977 г. працавала дырэктарам Рэспубліканскіх курсаў павышэння кваліфікацыі работнікаў тэлебачання і радыёвяшчання, спецкарэспандэнтам, каментатарам на Беларускім радыё і тэлебачанні; з 1982 г. – рэдактар аддзела па рабоце з камісіямі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і сродкамі масавай інфармацыі Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, вядучым спецыялістам упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. З 2000 г. – старшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры.

У якасці члена журы і аргкамітэтаў прымала актыўны ўдзел у рабоце многіх міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў, аглядаў, свят, прысвечаных народнаму мастацтву («Беларусь – мая песня», «Звіняць цымбалы і гармонік», «Берагіня», «Славянскі базар у Віцебску», «Іграй гармонь, звіні прыпеўка», «Зорка ўзышла над Беларуссю» і інш.), свят прафесійнага майстэрства ганчарства, салома- і лозапляцення, кавальства, разьбярства, выцінанкі і інш. У складзе навуковых рабочых груп удзельнічала ў распрацоўцы шэрага нарматыўна-прававых дакументаў, сярод якіх: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслах і рамёствах у Рэспубліцы Беларусь», Палажэнні «Аб аўтэнтычным фальклорным гурце», «Аб народным майстры», новай рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» і інш.

Г.А. Суша – прызнаны майстар друкаванага і вуснага публіцыстычнага слова, усе гады працы ў сферы культуры, звязаныя з журналісцкай дзейнасцю на радыё, тэлебачанні, друкаваных СМІ, асвятляла шматлікія мерапрыемствы ў галіне народнага мастацтва, агульныя пытанні станаўлення традыцыйнай культуры як часткі сацыякультурнай сферы, праблемы вывучэння, аховы, захавання, пераемнасці і папулярызацыі традыцыйнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

У 1999–2004 гг. была членам Рады экспертаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», асвятляла фестывальныя падзеі ў СМІ.

Сябра Беларускага саюза журналістаў (з 1980 г.) і Беларускага саюза майстроў народнай творчасці (з 1985 г.), майстар саломапляцення і валення, член экспертнай камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па наданні звання «народны майстар», Рэспубліканскай экспертнай атэстацыйнай камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па наданню (пазбаўленню) калектывам аматарскай творчасці і аб'яднанням найменняў «заслужаны», «народны», «узорны».

Узнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і двойчы – Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.



***ШЫЛКІНА Алена Міхайлаўна***

*Харэограф, педагог, пастаноўшчык танцаў, рэжысёр, даследчык беларускай народнай харэаграфіі.*

Нарадзілася 24.03.1959 г. у г. Мінску.

Скончыла Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў (1978), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (1982).

А.М. Шылкіна – дацэнт кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, выкладае дысцыпліны: «Народна-сцэнічны танец», «Беларускі танец», «Характарны танец», «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін», а таксама «Пластычная культура» – на кафедры «Рэжысура абрадаў і свят». Сярод яе выхаванцаў ёсць заслужаныя дзеячы культуры Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі заслужаных аматарскіх калектываў, выкладчыкі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў культуры і мастацтва краіны, салісты Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца «Харошкі», Нацыянальнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра і інш.

Шмат часу ўдзяляе рабоце ў Федэрацыі дапамогі спартсменам-інвалідам (з 1998 г.). Каманда Рэспублікі Беларусь па спартыўных танцах на калясках, дзе А.М. Шылкіна з'яўляецца галоўным трэнерам-харэографам, прызнана лепшай у свеце ў 2009–2015 гг. Сярод яе выхаванцаў 8 чэмпіёнаў свету і 10 чэмпіёнаў Еўропы.

Практычную дзейнасць плённа спалучае з навуковай і метадычнай працай. Яна з'яўляецца аўтарам тыпавых вучэбных праграм і метадычных комплексаў «Народна-сцэнічны танец», «Характэрны танец», метадычных распрацовак па харэаграфічнаму мастацтву, аўтарам дапаможнікаў «Экзамен (творчество по специализацыи "Хореографическое искусство"» (2004–2016), шэрага артыкулаў у розных выданнях. Кіруе дыпломнымі работамі студэнтаў, рэцэнзуе творчыя працы выкладчыкаў і студэнтаў.

Аўтар звыш 70 рознажанравых харэаграфічных кампазіцый для ансамблевага, парнага і сольнага выканальніцтва, большасць з іх – сцэнічныя ўзоры беларускай народнай харэаграфіі («Лявоніха», «Мяцеліца», «Мікіта», «Ночка», «Лысы», «Каробачка», «Вясновы карагод», «Рудзенскі вальс», «Кракавяк», «Боб малачу», «Беларускія вячоркі», «Дзявочыя вячоркі», «Сонейка ды месяц» і інш.) – ажыццёўлены ў народным ансамблі народнай песні і музыкі «Шчодрыца» Лошыцкага палаца

культуры г. Мінска. Калектыў з'яўляецца лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, фестываляў народнай творчасці.

Пастаянны член савета экспертаў па харэаграфіі дзяржаўнай установы культуры «Мінскканцэрт» (з 2008 г.), член камісіі Міністэрства культуры па прысваенню і падцвярджэнню званняў «заслужаны», «узорны» аматарскі калектыў (з 2002 г.).

Старшыня і член журы міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў у Беларусі, Расіі, Германіі, Літве, Латвіі, Польшчы, Галандыі, Балгарыі, Італіі, Швецыі. Сярод іх: «Я танцую» (г. Мінск, з 2015 г.), «Сузор'е» (г. Мінск, з 2008 г.), «Хваля ідэй» (Швецыя, Балгарыя, Італія і інш.), «Скрыжаванні» (г. Мінск, 2016–2018 ), «Dance city» (г. Мінск, з 2008 ), «Dance power» (г. Мінск, 2013–2018), «Star show» (г. Мінск, Мазыр, 2014, 2015), «Брава дзеці» (г. Мінск, з 2014), «Караван эмоцый» (г. Мінск, 2017 ), «Чароўны чаравік» (г. Мінск, 2018), «Сожскі карагод» (г. Гомель), рэгіянальных тураў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», у іх ліку – адкрытыя конкурсы выканаўцаў беларускіх народных побытавых парных танцаў «Ветразь», конкурсы харэаграфічнай імправізацыі (г. Мінск, 2015, 2016, 2017, 2018).

За шматгадовую добрасумленную працу, выдатныя творчыя дасягненні і прафесійнае майстэрства ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (з 1999 г. – перыядычна), Паралімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь (2014), Урада г. Масквы (2010).



***ШЭЙКА Кацярына Аляксандраўна***

*Гісторык, экскурсавод, даследчык традыцыйнай спадчыны Іспаніі, арганізатар культурнай дзейнасці сталічнага студэнства, вядучы свят, фестываляў, конкурсаў сучаснай і аматарскай творчасці.*

Нарадзілася 25.05.1991 г. у г. Рыга Латвійскай Рэспублікі

Скончыла з адзнакай гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2013), аспірантуру БДУ па спецыяльнасці «Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання» (2017). Магістр гістарычных навук (2014), мае дыплом даследчыка ў галіне гістарычных навук (2017).

З 2013 г. атэставаны экскурсавод па Беларусі (Нацыянальнае агенцтва па турызму Рэспублікі Беларусь). У 2018 г. павысіла кваліфікацыю па праграме «Гістарычная і культурная спадчына Беларусі ў турыстычнай дзейнасці».

З 2015 г. працуе спецыялістам аддзела маладзёжных праграм і праектаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, арганізатар святочных імпрэз сярод замежных студэнтаў: Дзень нацыянальных культур, фестываль «Навруз», прысвечаны новаму году іранскіх і цюркскіх народаў, літаратурны вечар і інш.

Выпускніца дзіцячага ўзорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» (пад кіраўніцтвам В.Г. Дульскай) г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці. Разам з ансамблем прымала ўдзел у Рэспубліканскім фальклорным фестывалі «Берагіня» (2004, 2006, 2008). Арганізатар і кансультант святочнага канцэрта, прысвечанага 20-годдзю ўзорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі».

Удзельніца навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання» ў рамках V Рэспубліканскага фальклорнага фестывалю «Берагіня» (2–3 красавіка 2008 г., г.п. Акцябрскі), даклад на тэму: «Што для мяне народная культура маёй Акцябршчыны».

Вядучая конкурсу «Калектыўная творчасць» у рамках V Рэспубліканскага фальклорнага фестывалю «Берагіня». Вядучая конкурсу танцавальных пар у рамках VIII Рэспубліканскага фальклорнага фестывалю «Берагіня».

Арганізатар межуніверсітэцкага форуму «Роля фальклору ў развіцці беларускай нацыі на сучасным этапе» (12.12.2012). З восені 2012 г. па сённяшні час актыўна займаецца ў Школе традыцыйнага мастацтва мінскага гурту «GUDA» на курсе «Традыцыйны танец» пад кіраўніцтвам М.А. Козенкі.

У складзе танцавальнай суполкі фальклорнага гурту «GUDA» з 2013 г. удзельнічала ў міжнародных фальклорных фестывалях «Skamba, skamba, kankliai!» (г. Вільнюс, Літва, 2013), «IX The Festival of Traditional Art», (г. Познань, Польша,

2015), «Rudenāji. Katlakalna Starptautiskais folkloras festivals» (г. Рыга, Латвія, 2015), «Parbėg laivelis» (г. Клайпеда, Літва, 2016), «Велика коляда» (г. Львоў, Украïна, 2017).

З'яўляецца намеснікам старшыні, адказным сакратаром і вядучай конкурсу выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Мяцеліца–2013» (г. Мінск), «Мяцеліца–2015» (г. Мінск), «Мяцеліца–2017» (г. Мінск).

*Тв.:* Произведения фольклорного стиля фламенко как исторический источник: проблема происхождения и развития в испанской историографии // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып 11. – Мінск, 2016; Песенный фольклор (испанская копла) как источник по изучению французской осады г. Кадис 1810–1812 гг. // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова»: сб. науч. трудов. – Витебск, 2017; Произведения испанского фольклора как источник изучения истории Испании // Теория и практика профессионально ориентированного обучения иностранным языкам: материалы междунар. конф. – Минск, 2015; Происхождение канте фламенко (cante flamenco) как источника для изучения истории Испании // Теория и практика профессионально ориентированного обучения иностранным языкам: материалы IX Междунар. науч.-практ. конф. – Минск, 2012.



***ЮРЧАК Настасся Астапаўна***

*(1932–2017)*

*Народны майстар, спявачка, апавядальніца.*

Нарадзілася 14.01.1932 г. у в. Валосавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Пасля заканчэння пачатковай школы працавала даяркай, цялятніцай на малочнай ферме в. Валосавічы калгаса імя Горкага. Пасля выхаду на пенсію (1982) працавала тэхнічным работнікам у канторы калгаса да 1994 г.

Ткаць пачала з 10 гадоў. Сакрэты майстэрства пераняла ад сваёй бабулі Ефрасінні Шэлег. Ткала ў 4, 6, 8, 10, 12 нітоў посцілкі «перабіранкі», радавыя ручнікі, ручнікі ў «елачку», шашачкі і г.д.

Падчас працы за ткацкім станком Настасся Астапаўна любіла спяваць песні аб жаночай долі. Голас у яе быў прыгожы, моцны. Ведала вялікую колькасць калядных, жніўных, вясельных песень, сярод якіх «Ой, вярба-вярба», «Ой, ішлі хмарачкі, да й па парачцы», «Стаяла-буяла канапелька», «Як ехаў мой Іван» і шмат інш.

З 1993 г. па 2010 г. з'яўлялася кіраўніком майстэрні па ткацтву пры Валосавіцкім сельскім доме народнай творчасці.

Найбольш арыгінальныя ручнікі Н.А. Юрчак экспанаваліся на абласной выстаўцы «Ручнік і намітка ў прасторы і часе» (г. Гомель, 1996 г.)

Аказвала творчую дапамогу фальклорнаму калектыву «Некрашынка» Валосавіцкага сельскага дома народнай творчасці. Удзельнікі вусным шляхам пераймалі ад носьбіткі мастацкіх традыцый манеру выканання мясцовых песень. У рэпертуары калектыву засталіся: карагоды «Ой, у лесе, лесе», «Ой, у лесе, дай на верасе» (веснавыя), «Над рачулкай, над лужком» (траецкі), «Проса» (веснавы гульнявы карагод), песні «Ішлі хмарачкі» (жніўная), «калі неслі каравай», «Ой, бярыце ж каравай, бярыце», «Наш паночку маладзенькі» (вясельныя), гульня «Ліска», казка «Пра мужыка і чорта». Прымала актыўны ўдзел у складзе аўтэнтычнага калектыву і як салістка-спявачка ў мерапрыемствах І Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999), выстаўцы-конкурсе адноўленых народных касцюмаў і паясоў Рудабельшчыны, рэгіянальнай выстаўцы дэкаратыўна-побытавага мастацтва ІІ рэгіянальнага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2001), ІІІ Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2004), свяце народнага дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва Акцябрскага раёна «Майстры і вучні» на IV Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2006).

Калекцыя яе твораў (тканыя ручнікі і посцілкі, вышываныя падузорнікі і абрусы) экспанавалася на «Рудабельскім кірмашы» (2001, 2004, 2005).

Дапамагала навукоўцам з г. Мінска ў аднаўленні ўзораў танцавальнага фальклору в. Валосавічы для кнігі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гомельскае Палессе і Падняпроўе». Том 6. Кніга 2 (г. Мінск, 2013).

У якасці інфарманта, ад якога запісаны былічкі, апавяданні пра цуды і легендарныя апавяданні, Настасся Астапаўна ўзгадана ў кнізе А.М. Боганевай «Народная проза Акцябршчыны» (г. Мінск, 2018).



***ЯГУР Марыя Ігнатаўна***

*(1928–2016)*

*Носьбітка мастацкіх традыцый Рудабельскага краю, спявачка, танцорка, ткачыха.*

Нарадзілася 03.05.1928 г. у в. Валосавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Пражыла вялікае, цяжкае, але прыгожае і змястоўнае жыццё. Перажыла ваенныя гады ліхалецця, была вязнем Азарыцкага канцлагера. У пасляваенныя гады працавала ў калгасе імя Горкага в. Валосавічы падлікоўцам малака, даяркай, свінаркай. Пасля выхаду на пенсію ў 1983 г. працавала яшчэ 7 год.

Спяваць, танчыць, ткаць і вышываць навучылася ад сваёй маці Аксінні Андрэеўны Ягур (1908 г.н.). Ткала ручнікі, «закладанкі», васьмерныя посцілкі, «паласатыя дываны» з прыгожымі кветкамі і галубкамі. Вышывала крыжыкам і гладдзю макі, птушак, галінкі на паркалёвых ручніках, падузорніках, аздабляла іх края вязанымі «каронкамі». Яшчэ і зараз у родзічаў захаваліся рэчы, зробленыя рукамі Марыі Ігнатаўны.

Шмат песень ведала Марыя Ягур: пазаабрадавыя, абрадавыя (вясельныя, вялікодныя, жніўныя), «як ягады бралі». Сярод іх «Прабачайце, госцейкі», «Даліна шырокая», «Ў карагодзе мы былі», «Ой, Троіца, Троіца», «Едзе-едзе каравай з печы», «Да ў нашага свата», «А я жала, жала», «Хрыстос васкрэс, Сын Божы», «Ой, у лесе, лесе, да й на верасе», «Расцвілі чарнабрыўцы», «Пасадзіла Тэкля гарбузы» і інш. Шмат песень увайшлі ў рэпертуар народнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Рудабельская пацеха», «Некрашынка» і іншыя фальклорныя калектывы раёна.

Падчас падрыхтоўкі да Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2014) навучала дзяцей і падлеткаў в. Валосавічы карагодугульне «Заінька», танцам «Полька-шыргалка», «Полька з камандамі», «Лысы», «Мікіта», «Гапак утраіх» і інш.

Узнагароджана медалямі «За трудовое отличие», (1973), «Победитель соцсоревнования» (1979), «Ветеран труда» (1983), юбілейнымі медалямі да 60-годдзя, 65-годдзя, 70-годдзя Вялікай Перамогі.



***ЯФРЭМАВА Аляксандра Іванаўна***

*(1925–2009)*

*Народная спявачка, танцорка, апавядальніца, работнік культуры.*

Нарадзілася ў в. Новая Дуброва Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла сямігодку ў в. Новая Дуброва (1940), вучылася ў Акцябрскай сярэдняй школе (1940–1941).

У 1977–1985 гг. працавала мастацкім кіраўніком Новадуброўскага сельскага дома народнай творчасці. Стварыла фальклорны калектыў «Дубраўчанка» (1978). Аснову яго рэпертуару склалі абрадавыя і пазаабрадавыя песні, перанятыя Аляксандрай Іванаўнай ад сваёй маці Марыі Кандратаўны Калянкевіч (1895) і змешчаныя ў серыі буклетаў «З глыбінь жыватворных», выдадзеных Акцябрскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай (2008).

Фальклорны калектыў «Дубраўчанка» пастаянна прымаў удзел у абласных аглядах, фестывалях народнай творчасці, святах народнай песні і танца, неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама, Акцябрскага раённага аддзела культуры.

З 1999 г. па 2008 г. А.І. Яфрэмава – удзельнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня»: як дарадца ўзорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» навучала яго ўдзельнікаў старадаўнім танцам, гульням, песням, прыпеўкам, перадала ў спадчыну і народную прозу – казкі, легенды, паданні. «Рудабельскія зорачкі» спяваюць амаль увесь яе песенны рэпертуар («Ой, у лузе стаяць два дубочкі», «Ой, я ў бару ды абед вару», «На маленькай да на паляначцы», «Ой, зелена-зелена», «Ой, курачкі, вы не пейце рана», «Прабачце, госцікі», «Чые тыя валы, што па дуброве ходзяць», «Ты, дуброва, ты зялёная» і шмат інш.), а песня «Міколава даліна» – візітная картка калектыву.

З'яўлялася кансультантам па традыцыйнаму мастацтву Акцябрскага раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра культуры (1999–2009).

Мастацкі талент Аляксандры Іванаўны перадаўся сыну Сяргею, вядомаму ў раёне музы́ку-гарманісту.

# Эксперты



**АБРАМОВІЧ Антаніна Анатольеўна**

*Філолаг, педагог, народны музы́ка, аўтар паэтычных твораў, выканаўца народных і аўтарскіх песень.*

Нарадзілася 03.08.1958 г. у в. Бялёў Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Гомельскае педагагічнае вучылішча (1977), філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1987).

Працавала выхавацелем групы падоўжанага дня (1977–1985), намеснікам дырэктара па асноўнай дзейнасці (вучэбная і выхаваўчая работа, /1989–2002/), з 1985 г. па сённяшні час – настаўніца беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Мётчанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа Барысаўскага раёна» Мінскай вобласці.

Музычны кіраўнік і адзін з стваральнікаў (1996) узорнага (2001), заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь (2012) фальклорнага гурту «Берагіня» Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы «Школа-садок» Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

Даследуе традыцыйную культуру свайго рэгіёна; на працягу звыш 20 год займаецца практычнымі пытаннямі мастацкай адукацыі дзяцей і моладзі, паслядоўна ўкараняе ў педагагічную практыку ідэі і прынцыпы рэспубліканскага праекта «Фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня”». Яе вучні – актыўныя ўдзельнікі інтэлектуальных і творчых конкурсаў, уладальнікі дыпломаў Гран-пры Рэспубліканскага турніру салістаў–выканаўцаў твораў народнай спадчыны (г.п. Акцябрскі, 2008; г. Лепель, 2010), лаўрэаты Мінскага конкурсу апавядальнікаў народнай прозы (2017).

Аўтар больш за 60 публікацый па розных праблемах культуры і педагогікі, у тым ліку адраджэння духоўнай спадчыны Мядоцкага краю, выхавання вясковых школьнікаў сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва ва ўмовах узаемадзеяння сям’і і школы. Суаўтар навукова-папулярнага выдання «Мы – “Берагіня”. З гісторыі фальклорнага гурту “Берагіня” Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы «Школа-садок Барысаўскага раёна Мінскай вобласці» (г. Мінск, 2001), кнігі «Традыцыйнае вяселле Мядоцкага краю» (2004). Удзельнік міжнародных, абласных, рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцый, семінараў, дыскусій, «круглых сталоў».

Лаўрэат III ступені конкурсу на лепшае апавяданне газеты «Звязда» (2006). Суаўтар адукацыйнага праекта «Мядоцкая этнашкола» (2004–2008). Арганізатар

і кіраўнік Мядоцкіх чытанняў (1997–2016). Кіраўнік праекта-экскурсіі «У госці да бабулі Аўгінні» – лаўрэата I ступені абласнога конкурсу «Пазнаем Беларусь разам» (2017). Лаўрэат (у складзе фальклорнага гурту «Берагіня») II Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1999), V Міжнароднага фестывалю народнага танца «Палескі карагод» (г. Пінск, 2000), LX Міжнароднага фестывалю фальклору «Intervolk» (Францыя, 2004), VI Міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Барысаўскі прыстанак» (г. Барысаў, 2006), Міжнароднага фестывалю дзіцячай творчасці «Дзве краіны – адзін лёс» (НАДЦ «Зубраня», 2017), IV Рэспубліканскага фестывалю народнага танца «Беларуская полька», I Рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў народных побытавых танцаў (г. Чачэрск, 2000), Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 1999–2016). Удзельнік (у складзе фальклорнага гурту «Берагіня») Рэспубліканскіх свят беларускага пісьменства (г.п. Мір, 2002; г. Барысаў, 2008; г. Рагачоў, 2016), Рэспубліканскага свята «Дажынкі» (г. Маладзечна, 2012).

Уваходзіла ў склад журы конкурсаў музычна-інструментальнага і спеўнага мастацтва на VII Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012), конкурсу танцавальных пар на II Мінскім конкурсе «Мяцеліца» (2014).

Неаднаразова ўзнагароджвалася Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама, Барысаўскага райвыканкама. Уладальнік ганаровага знака «2000 год Хрысціянству».

А.А. Абрамовіч прысвечана кніга «Dum spiro spero – Пакуль жыву, спадзяюся» (2007).

*Тв.:* Культурныя традыцыі Мядоччыны // Мядоцкі край і яго таленты. – Мінск, 1977; Каляндарна-абрадавая спадчына міжрэчча Бярэзіны, Бабра і Схі // Мы – «Берагіня». З гісторыі фальклорнага гурту «Берагіня». – Мінск, 2001; Не быць пустым звяном у повязі стагоддзяў... // Народная спадчына Бацькаўшчыны. Матэрыялы фальклорных чытанняў. – Мінск, 2002; Традыцыйная культура і дзеці. Вып. 1. Рэспубліканскі эксперыментальны праект «Танцавальны фальклор і дзеці». – Мінск, 2004; Мядоцкая этншкола / Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў сродкамі народнай педагогікі (з вопыту работы этншкол Мінскай вобласці): вучэб.-метад. дапаможнік. – Мінск, 2008; Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 3. Матэрыялы IV Рэспуб. навук.-практ. канф. (2–3 красавіка 2008 г., г.п. Акцябрскі). – Мінск, 2008; Радзінна-хрэсьбінныя традыцыі ў кантэксце народнай культуры Мядоччыны (у суаўтарстве) // Палявая фалькларыстыка і этналогія: даследаванне лакальных культур Беларусі. – Мінск, 2008; Месца і роля традыцыйнай духоўнай спадчыны на ўроках роднай мовы і літаратуры // Хто, калі не я...: Да 60-годдзя Міколы Козенкі. – Мінск, 2011; Даследаванне і трансляцыя мастацкай культуры Мядоцкага краю // Хто, калі не я...: Да 60-годдзя Міколы Козенкі. – Мінск, 2011; «Берагіня» беражэ Беларусь // Хто, калі не я...: Да 60-годдзя Міколы Козенкі. – Мінск, 2011; Святло і дабрыня таленту // Асоба ў народнай культуры і педагогіцы. – Мінск, 2016; Аўгіння // Асоба ў народнай культуры і педагогіцы. – Мінск, 2016; Дзіця і яго сацыялізацыя ў традыцыйнай культурнай прасторы Мядоцкага краю // Асоба ў народнай культуры і педагогіцы. – Мінск, 2016.



## *БАДУНОВА Ірына Іосіфаўна*

*Харэограф, педагог, даследчык гісторыка-побытавай танцавальнай культуры і сучаснай спартыўна-бальнай харэаграфіі Беларусі. Кандыдат культуралогіі (2015).*

Нарадзілася 25.02.1960 г. у в. Краглі Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл.

Скончыла Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча (1978), Мінскі інстытут культуры (1982), магістратуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «культуралогія» (2008), аспірантуру па спецыяльнасці «тэорыя і гісторыя культуры» (2012).

І.І. Бадунова працавала выкладчыкам харэаграфічных дысцыплін ва ўстановах адукацыі г. Мінска (1982–1999); з 1999 г. – на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, з 2017 г. – на пасадзе дацэнта.

Аўтар навучальных праграм і вучэбна-метадычных комплексаў па харэаграфічных дысцыплінах для харэаграфічных школ, дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых устаноў адукацыі.

Актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы і выкананні навуковых, навукова-тэхнічных праграм, асобных праектаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Кіруе навукова-даследчай працай студэнтаў універсітэта.

З'яўляецца адным з вядучых спецыялістаў па гісторыка-бытавому танцу ў рэспубліцы. Рэгулярна праводзіць майстар-класы па гістарычнаму еўрапейскаму бальнаму танцу, з'яўляецца членам журы конкурсаў і фестываляў у галіне харэаграфічнага мастацтва, стварае арыгінальныя творчыя праекты, заснаваныя на сінтэзе гістарычнай бальнай харэаграфіі.

Аўтар першага ў рэспубліцы культуралагічнага даследавання «Еўрапейскі бальны танец у кантэксце беларускай культуры» (2015). Ажыццяўляе актыўную навукова-даследчую дзейнасць у галіне культуралогіі і мастацтвазнаўства. Апублікавана каля 40 навуковых прац у беларускіх і замежных выданнях, сярод якіх артыкулы, матэрыялы канферэнцый, рэцэнзіі.

Член Рады экспертаў і ўдзельнік «круглага стала» IX фестывалю «Берагіня», член Рады экспертаў дачэрняга конкурсу пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў «Ветразь» (г. Мінск, 2016, 2017).

*Тв.:* Уплыў еўрапейскіх рыцарскіх традыцый на беларускую культуру // «Веснік» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва. – № 2 . – Мінск, 2010; Гістарычны бальны танец у еўрапейскай культуры // «Весці» Інстытута сучасных ведаў. – № 1. – Мінск, 2010; Гістарычны еўрапейскі бальны танец як феномен куль-

туры і асаблівасці яго выкладання ў рамках вузаўскага курса // Актуальныя праблемы педагогікі мастацтва. – Магілёў, 2010; Рэканструкцыя гістарычнай харэаграфіі ў беларускай культуры XXI стагоддзя // «Весці» Інстытута сучасных ведаў. – № 1. – Мінск, 2011; Роля гісторыка-бытавога танца ў падрыхтоўцы спецыялістаў-харэографаў // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання. – Мінск, 2011; Ваенна-гістарычныя клубы як від маладзёжнай субкультуры // Менталітэт славян і інтэграцыйныя працэсы: гісторыя, сучаснасць, перспектывы. – Гомель, 2011; Узнікненне тэорыі еўрапейскага танца // Культура. Навука. Творчасць. – Мінск, 2011; Узнікненне тэорыі свецкага танца // Інстытут беларускай культуры і станаўленне навукі ў Беларусі. – Мінск, 2011; Асаблівасці выкладання гісторыка-бытавога танца ў рамках універсітэцкага курса // Бесперапынная тэхналагічная і эстэтычная адукацыя: тэндэнцыі, дасягненні, праблемы. – Баранавічы, 2011; Магчымасці семіятычнага даследавання старадаўняга танцавальнага тэксту // «Весці» Інстытута сучасных ведаў. – № 1. – Мінск, 2012; Гістарычны танец у кантэксце сучаснай парадыгмы // «Веснік» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. № 7. – Полацк, 2012; Танец як самабытны атрыбут рыцарскай культуры на беларускіх землях у XIV – XVI стст. // «Нова педагогічна думка» Роўненскага абласнога інстытута паслядыпломнай педагагічнай адукацыі. – № 2 (70). – Роўна, 2012; Тэмпаральна-гістарычная прырода і сутнасць танца // «Веснік» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – № 1. – Мінск, 2012; Часовая састаўляючая танца // «Культура і цывілізацыя». – № 2–3. – Масква, 2012; Рэканструкцыя гістарычнага танца як працэс культуратворчасці // Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання. – Мінск, 2012; Танец як прасторава-часовая з’ява культуры // Універсальнае і нацыянальнае ў культуры. – Мінск, 2012; Гісторыка-бытавы танец: спецыфіка выкладання для студэнтаў-завочнікаў і навукова-метадычнае забеспячэнне // Удасканаленне дзейнасці кафедр па прафесійнай падрыхтоўцы спецыялістаў на факультэце завочнага навучання. – Мінск, 2012; Актуальныя функцыі і формы перцэпцыі гістарычнага еўрапейскага танца // «Весці» Інстытута сучасных ведаў. – № 1. – Мінск, 2013; Гістарычны еўрапейскі бальны танец: культуралагічны аспект // Роля культуры ў фарміраванні асобы: новыя падыходы. – Мінск, 2013; Сцэнічная інтэрпрэтацыя форм гістарычнага танца // Традыцыйная і сучасная культура Беларусі: гісторыя, актуальны стан, перспектывы. – Мінск, 2013; Танец як стымул жыцця і руху // Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры. – Мінск, 2013; Тэксталагічны феномен у танцы // «Мастацтва і культура». – № 4. – Масква, 2014; Еўрапейскі бытавы бальны танец у сацыякультурнай дзейнасці // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва. – Мінск, 2014; Вытокі еўрапейскай бальнай культуры // Бъдещите изследвания. – Сафія, 2014; Адлюстраванне папулярных матываў еўрапейскага бальнага танца ў фартэпіяннай музыцы М.К. Агінскага // Гісторыя і культура на стыку эпох і цывілізацый: гісторыка-культурная спадчына як рэсурс і вынік развіцця грамадства. – Мінск, 2015; Выкарыстанне жанру вальса ў афармленні ўрока класічнага танца // «Весці» Інстытута сучасных ведаў. – № 4. – Мінск, 2016; Тэарэтыка-метадалагічнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыка-бытавы і бальны танец» // Бесперапынная тэхналагічная і эстэтычная адукацыя: тэндэнцыі, дасягненні, праблемы. – Баранавічы, 2017; Асаблівасці выкладання гісторыка-бытавога танца ва ўстановах адукацыі // Культура: адкрыты фармат –

2016. – Мінск. 2017; Праваслаўныя балі Беларусі // Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры. – Мінск, 2018; Роль каштоўнасна-мэтавых арыенціраў у фарміраванні прафесійных кампетэнцый ў студэнтаў-харэографаў у працэсе асваення вучэбнай дысцыпліны «Гісторыка-бытавы і сучасны бальны танец» // Практыка-арыентаваны падыход у падрыхтоўцы спецыялістаў сферы культуры. – Мінск, 2018.

## Вучэбныя выданні

Праграмы агульнаадукацыйных школ (класаў) з харэаграфічным кірункам – Мінск, 2005 г.; «Гісторыка-бытавы танец». Праграма для харэаграфічных школ і школ мастацтваў з аддзяленнем харэаграфіі. – Мінск, 2006 г.; «Гісторыка-бытавы танец». Праграма для ўстаноў, забяспечваючых атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці 2-17 02 01 «Харэаграфічнае мастацтва», 2-18 01 01-32 «Народная творчасць (танец)». – Мінск, 2006 г.; «Гісторыка-бытавы і бальны танец». Вучэбная праграма па спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» № 1-17-02-01 (спецыялізацыя «Народны танец», «Эстрадны танец»). – Мінск, 2010 г.; «Гісторыка-бытавы і сучасны бальны танец». Вучэбная праграма для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-17 02 01 «Харэаграфічнае мастацтва». – Мінск, 2017 г.; вучэбна-метадычны комплекс (электронны) па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыка-бытавы і сучасны бальны танец». – Мінск, 2017 г.; вучэбна-метадычны комплекс (электронны) па вучэбнай дысцыпліне «Харэаграфічны трэнаж» (у суаўтарстве). – Мінск, 2017 г.; вучэбная праграма павышэння кваліфікацыі «Харэаграфічнае мастацтва: актуальныя пытанні методыкі выкладання» (для настаўнікаў па харэаграфіі дзіцячых школ мастацтваў, выкладчыкаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі) (у суаўтарстве). – Мінск. 2018 г.



***БОГАНЕВА Алена Міхайлаўна***

*Філолаг, фалькларыст, этналінгвіст.*

Нарадзілася 06.04.1967 г. у г. Мінску.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1992), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1996).

Працавала старшым інспектарам агульнага аддзела Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1992–1994), вядучым спецыялістам упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1994–1997), загадчыкам лабараторыі традыцыйнага мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры» (1997–2008), начальнікам аддзела традыцыйнай культуры ІПКПК УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (2008–2009), з 2009 г. – навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Даследуе наратывы вуснай фальклорнай Бібліі і іншыя разнавіднасці няказкавай народнай прозы, тыпалогію жанраў і відаў беларускай народнай прозы ў сувязі з яе гісторыка-культурным кантэкстам і сучасным бытаваннем; традыцыйныя светапоглядныя мадэлі беларускіх фальклорных жанраў; этнаканфесійныя адносіны ў этналінгвістычным аспекце. Займаецца практычнымі аспектамі вывучэння, захавання, пераемнасці і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Рэгулярна выступае на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях з дакладамі па названай праблематыцы.

Мае каля 120 публікацый (у беларускіх, расійскіх, польскіх, французскіх, эстонскіх выданнях), сярод якіх – раздзелы, прысвечаныя народнай прозе, у калектыўных манаграфіях «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2004–2013); зборнік фальклорных тэкстаў з прадмовай, каментарыямі і паказальнікамі «Беларуская народная Біблія ў сучасных запісах» (Мінск, 2010), «Народная проза Акцябрскага раёна» (Мінск, 2018).

З’яўлялася кіраўніком праекта «Этнічная музыка беларусаў» (серыя кампакт-дыскаў, Мінск, 2006).

Прымала ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі дзяржаўных і галіновых праграм у галіне захавання і падтрымкі традыцыйнай спадчыны беларусаў, праектаў фонду фундаментальных даследаванняў, нарматыўна-прававых дакументаў, у тым ліку законаў, палажэнняў у галіне традыцыйнай культуры.

Стаяла ля вытокаў нацыянальнага фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня». Эксперт рэспубліканскіх і рэгіянальных праектаў па традыцыйнай народнай культуры.

З'яўляецца лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2014).

*Тв.:* Аб стане традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. Вып. 3. – Мінск, 1995; Адвечныя пытанні ў сучасных запісах народнай прозы // Творчасць. Вып. 1. – Мінск, 2001; Некаторыя праблемы трансляцыі фальклору на сучасным этапе // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання, і пераемнасці: матэрыялы рэспуб. навук.-практ. канф. (1–3 чэрвеня 2001 г). – Мазыр, 2001; Традыцыйная культура // Беларуская культура сёння. – Мінск, 2002; Сучаснае бытаванне народнай няказкавай прозы. Аспекты наратыва і дыскурса // Фалькларыстычныя даследаваннні: кантэкст, тыпалогія, сувязі. – Мінск, 2004; Современная жанровая специфика белорусской народной прозы // Славянская традиционная культура и современный мир. Сб. материалов науч. конф. Вып. 7. – Москва, 2005; Актыўная і пасіўная формы бытавання народнай прозы ў сучаснай беларускай вёсцы // Веснік Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, 2005. – № 1(3–4). – Мінск, 2005; Сацыякультурны и полаўзроставы статусы сучасных носьбітаў традыцыі // Традыцыйная культура і дзеці. Праблемы этнавыхавання. – Мінск, 2006; Стратификация (этно)конфессионимов белорусско-литовского пограничья sub specie этнолингвистики н. п. // «Язык и межкультурные коммуникации». – Вільнюс, 2007 (у суаўтарстве); Прынцыпы і крытэрыі жанравай класіфікацыі беларускай народнай прозы // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 3. Матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысвечанай 50-гадоваму юбілею ІМЭФ імя К. Крапівы НАНБ «Мастацтва, фальклор, этнічныя традыцыі ў вырашэнні актуальных задач сучаснай культуры» (Мінск, 7–8 чэрвеня 2007 г.). – Мінск, 2007; Региональность сюжетно-тематического фонда народных легенд белорусского «Запада» и «Востока» // Первый Всероссийский конгресс фольклористов. Сб. докладов. Том 4. – М., 2007; Этнокультурные стереотипы в межконфессиональных отношениях на Беларуси: опыт этнолингвистического комментирования (в соавторстве) Etnolingwistyka, Problemy jezyka I kultury, Vyp. 20. – Lublin, 2008; Современные народно-библейские нарративы белорусов: бытование, контекст, параллели (на материале сюжетов о сотворении мира и первых людях) // Фольклористика в контексте наук о традиционной духовной культуре. XIV Международный съезд славистов. Македония. – Охрид, 2008; Канцэпт «грэх» у традыцыйнай культуры і маральныя катэгорыі сумлення і сораму ў народнай педагогіцы беларусаў (у суаўтарстве) // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 3: Матэрыялы IV рэсп. навук.-практ. канф. (2–3 красавіка 2008 г., г.п. Акцябрскі). – Мінск, 2008; «Харошыя былі людзі, толька іх не відзеў ніхто»... Мифологические тексты о доброхожих (по материалам экспедиций 2002 – 2004 гг.) / Живая старина. – М., 2009 г. – № 4; Беларуская «народная Біблія» ў сучасных запісах. – Мінск, 2010; Бытование жанров народной прозы в современной белорусской деревне (активная и пассивная формы) / Живая старина. – М., 2010. – № 4; Мастерство классического сказительства. Лидия Михайловна Цыбульская / Живая старина. – М., 2011. – № 2; Гаручы змей – так ён зваўся /

Живая старина. – М., 2012. – № 1; Motifs étiologiques du Nouveau testament dans la Bible populaire biélorusse // Contes et légendes étiologiques dans l'espace européen. Sous la direction de Galina Kabakova. Pippa / Flies France, 2013; Belarusian folkloristics: a brief overview // SIEF (International Society for Ethnology and Folklore) news. Vol. 11, No 2, 2013 (у суаўтарстве з Т.В. Валодзінай); Біблейскія вусныя народныя пераказы: разнавіднасці, тэматыка, механізмы фальклярызацыі // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні. Зб. навук. прац. Вып. 1. – Мінск, 2014; Из «народной Библии» белорусско-русского пограничья // Живая старина. – М., 2014. – № 2; Уроки 3-го Всероссийского конгресса фольклористов. Отклики участников Конгресса. Е.М. Боганева // Традиционная культура. – М., 2014. – № 2.; Мифологические нарративы белорусско-русского пограничья: традиционные мотивы и персонажи // Живая старина. – М., 2014. – № 3; Беларускія версіі легенды пра колас: варыянтнасць, тыпавыя і рэдкія матывы, геаграфія распаўсюджання // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні: зб. навук. прац. Вып. 2. – Мінск, 2015; Ценностные представления белорусов о вере: белорусская «народная Библия» и комментарии к ней носителей традиции // Категория оценки и система ценностей в языке и культуре. – М., 2015; Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас Русалкі: знешні выгляд (у суаўтарстве) // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні. Зб. навук. прац. Вып. 3. – Мінск, 2016; Беларуская «народная Біблія»: гісторыя, уплывы, віда-жанравы склад // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пач. XX ст. Кн. 2. Духоўная культура. – Мінск, 2016; Беларускі фальклорна-этналінгвістычны атлас. Плямы на месяцы: беларускія інтэрпрэтацыі (у суаўтарстве) // Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні. Зб. навук. прац. Вып. 4. – Мінск, 2017; Выхаваўчы патэнцыял беларускай народнай прозы // VII Мядоцкія чытанні. Мядоцкая «Берагіня» ў кантэксце нацыянальнай культуры беларусаў. Даклады. Паведамленні. – Мінск, 2017; «Невидимцы»: сюжетные версии (белорусские деревни Неглюбка и Курбаки) // Живая старина. – М., 2017. – № 4.



***ВАЛОДЗІНА Таццяна Васільеўна***

*Фальклярыст, этналінгвіст. Доктар філалагічных навук (2010).*

Нарадзілася 08.09.1968 г. у в. Суша Лепельскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1990).

З 1992 г. працавала ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (з 2012 г. – дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (ЦДБКМЛ НАН Беларусі); з 2012 г. – загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў.

Сфера навуковых інтарэсаў Т.В. Валодзінай – этнасеміётыка народнай медыцыны, замовы, сімволіка і семантыка каляндарнай абраднасці, сакральнага ландшафту; малыя жанры фальклору, беларуская традыцыя ў еўрапейскім кантэксце. У распрацоўку навуковай праблематыкі яна ўносіць істотны асабісты ўклад, у першую чаргу гэта дэталёвае даследаванне раней не вывучаных талочнай абраднасці і песень беларусаў, сімволікі і семантыкі побытавых рэчаў, народнага календара, а таксама распрацоўка фалькларыстычнага вывучэння народнай медыцыны беларусаў як часткі духоўнай культуры, увага да этназнакавых функцый чалавечага цела, арэальна-лакальнае даследаванне замоў.

Таццяна Уладзіміраўна аўтар 10 манаграфій і каля 250 артыкулаў у навуковых часопісах і энцыклапедыях розных краін – Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Славеніі, Сербіі, інш. Ёй належыць шэраг наватарскіх праектаў у беларускім народазнаўстве: яна – навуковы рэдактар фундаментальнага энцыклапедычнага слоўніка «Міфалогія беларусаў» (2011), аўтар першага ў айчыннай лексікаграфіі «Слоўніка беларускіх народных параўнанняў» (2011); аўтар ідэі і канцэпцыі першага ў Беларусі спецыялізаванага перыядычнага выдання «Беларускі фальклор: Матэрыялы і даследаванні», яго ўкладальнік і навуковы рэдактар (у 2014–2017 гг. выйшлі 4 выпускі).

Навізна, абгрунтаванасць, дакладнасць і надзейнасць атрыманых вынікаў даследаванняў грунтуюцца на трывалай аснове палявых матэрыялаў, сабраных Т.В. Валодзінай у шматлікіх фальклорна-этнаграфічных экспедыцыях у розныя рэгіёны Беларусі.

Т.В. Валодзіна годна прадстаўляе беларускую навуку на шматлікіх міжнародных навуковых форумах і канферэнцыях у Беларусі, Расіі, Украіне, Літве, Эстоніі, Аўстрыі, Польшчы, Германіі, Францыі і інш., дзе выступае з дакладамі па даследуемай праблематыцы.

Т.В. Валодзіна актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы кадраў і выхаванні моладзі – з 2017 г. выкладае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, кіруе напісаннем магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Яна – чаканы госць шэрага тэлевізійных і радыёперадач, прысвечаных адметнасцям і праблемам захавання традыцыйнай духоўнай спадчыны беларусаў – «Запрашаем на вячоркі», «Радавод», «Беларускі арнамент», «Кола часу» і інш. Шмат увагі надае прапагандзе і папулярызацыі ведаў аб духоўнай культуры беларусаў сярод моладзі.

Бярэ актыўны ўдзел у практычнай дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва, папулярызуе фальклор у сродках масавай інфармацыі. Супрацоўнічае з раённымі ўстановамі культуры, дапамагае ў падрыхтоўцы як фальклорных мерапрыемстваў, так і метадычных распрацовак, праграм па збору фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў.

Удзельнічала ў рабоце «круглых сталоў» па праблемах нацыянальнай культуры і выніках фестываляў «Берагіня» – 2006–2018 гг.

*Тв.:* Талака ў духоўнай культуры беларусаў. – Мінск, 1997; Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. – Мінск, 1999; Мифоритуальный и этнолингвистический аспекты народной медицины белорусов: эпилепсия // Studia Litteraria Polono-Slavica, 6. Warszawa. 2001; «Суськія (сушанскія) словы» // Жывое наша слова: Дыялекталаг. зб. – Мінск, 2002; Этнофразеологическая антропология славян: босота // Проблемы славяноведения: сб. науч. статей и материалов. – Брянск, 2002. Вып. 4; Мифоритуальный и этнолингвистический аспекты народной медицыны белорусов: восень (на общеславянском фоне) // Там жа. – Брянск, 2003. Вып. 5; Дыхатамія «свой – чужы» ў сферы ўяўленняў наіўнай антрапалогіі // Мовазнаства. Літаратура. Культуралогія. Фалькларыстыка: XIII Міжнар. з'езд славістаў (Любляна, 2003): Дакл. бел. дэлегацыі. – Минск, 2003; Малыя жанры. Дзіцячы фальклор. – Мінск, 2004; Белорусский эротический фольклор. – М., 2006; «Няхрышчанае мясца»: женская грудь и грудное вскармливание в белорусских традиционных представлениях и языке (на общеславянском фоне) //Антропологический форум. – СПб., 2006. – № 4; Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка. – Мінск, 2007; Женские болезни в народных представлениях белорусов // Српска академија наука и уметности. Од-не језика и књижевности. Српски језик у светлу савремених лингвистичких теорија. – Београд, 2008. Кн. 3; Цела чалавека: слова, міф, рытуал. – Мінск, 2009; Цярэшка – святое дзела: Жаніцьба Цярэшкі на Лепельшчыне (паводле сучасных запісаў). – Віцебск, 2010; Заговоры от червей в ране (белорусская традиция на европейском фоне) // Заједничко у словенском фолклору. Зб. радова. – Београд, 2012; Kaimo daktaras ir jo praktika liaudiškojo religingumo požiūriu Baltarusijoje // Lietuvos etnologija. 2013 13(22); Вода в этноанатомических представлениях и фразеологии славян // «Вода» в славянской фразеологии и паремиологии. Т. 1. – Budapest, 2013; Успехи и болевые точки белорусской фольклористики последних

лет // Навстречу Третьему Всероссийскому конгрессу фольклористов. Сб. науч. ст. – М., 2013; Еще раз о «литовском колтуне», или мифосемантика болезни в межэтническом контексте // Baltai ir slavai: dvasinių kultūrųsankirtos / Балты и славяне: пересечения духовных культур. – Vilnius, 2014; «Ядраное жыта гаспадара кліча...»: каляндарны год у абрадах і звычаях (разам з Т. Кухаронак). – Мінск, 2015; Аксиологический статус болезни в традиционной культуре белорусов // Категория оценки и система ценностей в языке и культуре. – М., 2015; Люди и камни: метаморфозы и коммуникация (белорусская традиция) // Живой камень: от природы к культуре. – М., 2015; Святыя крыніцы Беларусі (разам з У. Лобачам). – Мінск, 2016; Народнае рытуальна-магічнае лекаванне // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 2. Духоўная культура. – Мінск, 2016; Беларуска-нямецкія паралелі ў сферы ўяўленняў пра залатнік/Gebärmutter: рытуалы і замоўныя матывы // Вестник ПГУ. Серия А. Гуманитарные науки (исторические науки). – 2016. – № 9.



**_ВАРФАЛАМЕЕВА Тамара Барысаўна_**

*Этнамузыколаг, педагог, грамадскі дзеяч, сябра Беларускага саюза кампазітараў. Кандыдат мастацтвазнаўства (1983).*

Нарадзілася 24.06.1944 г. у в. Малое Сцяпанава Касалапаўскага р-на Марыйскай АССР [цяпер Мары-Турэкскі р-н Рэспублікі Марый Эл]).

Скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1970).

Працавала педагогам па тэарэтычных дысцыплінах дзіцячай музычнай школы, г. Маладзечна (1965–1967), рэдактарам галоўнай рэдакцыі музычных перадач Дзяржтэлерадыё БССР (1967–1973), выкладчыкам музычна-тэарэтычных дысцыплін Мінскага педвучылішча (1973–1975), старшым кансультантам Саюза кампазітараў БССР (1975–1981), малодшым, затым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі (з 2012 г. – ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», 1981–2017), адначасова вядучым навуковым супрацоўнікам лабараторыі традыцыйнага мастацтва ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры (1993–2009).

Т.Б. Варфаламеева працуе ў галіне фундаментальнай этнамузыкалогіі і практычнай фалькларыстыкі. Асноўная праблематыка навуковых даследаванняў – гісторыя, тэорыя, эстэтыка, віды, жанры, сістэмная тыпалогія, арэальныя характарыстыкі беларускага музычнага фальклору, этнамузычная дыялекталогія, сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў. З’яўляецца аўтарам шматлікіх (каля 150) публікацый, сярод якіх работы амаль усіх жанраў: манаграфіі, раздзелы ў кнігах, навуковыя даклады, метадычныя дапаможнікі, рэцэнзіі, артыкулы ў навуковых зборніках, энцыклапедыях, перыядычным друку (Беларусь, Расія, Украіна, Эстонія, Польшча, Германія, Францыя).

У беларускім этнамузыказнаўстве з’яўляецца паслядоўніцай кірунку, які ідзе ад Пецярбургскай школы акадэміка Барыса Асаф’ева і распрацаванай ім інтанацыйнай тэорыі, скіраванай на раскрыццё глыбіннай сутнасці музыкі як мастацтва працэсуальнага мастацтва, якое выяўляе свой сэнс толькі праз жывое гучанне і жывое інтанаванне. Сярод даследчыкаў народнай музыкі інтанацыйную тэорыю падхапілі і творча развілі непасрэдныя вучні Барыса Уладзіміравіча – Яўген Гіпіус і Зінаіда Эвальд. Інтанацыйна жывое гучанне фальклору сталася блізкім і былой аспірантцы Гіпіуса Зінаідзе Мажэйка, а затым, у сваю чаргу, і яе аспірантцы Тамары Варфаламеевай.

Даследчыцу характарызуе тып мыслення, калі строгая рацыянальнасць і сістэмнасць арганічна суіснуюць з мастацкім бачаннем свету аўтэнтычнай народнай песні, што садзейнічае аб'ёмнаму і шматграннаму раскрыццю феномену народнапесеннага інтанавання. Ёй належаць фундаментальныя даследаванні па вясельнай і пахавальнай мелодыцы, яна – адзін з аўтараў фундаментальнай працы «Беларускае этнамузыказнаўства» (1997), у якой прасочаны шляхі развіцця нацыянальнай школы ў кантэксце еўрапейскай навукі, выяўлена і вызначана роля яе асноўных прадстаўнікоў у фарміраванні і развіцці навуковых кірункаў. Сярод іншых яе грунтоўных прац – манаграфіі «Паўночнабелорускае вяселле: абрад, песенна-меладычныя тыпы» (1988); «Вяселле: Мелодыі» (1990, у суаўтарстве з З. Мажэйка), два (адзін у суаўтарстве з З. Мажейка) аналітычныя зборнікі на аснове сучасных уласных запісаў, якія раскрываюць песенныя сістэмы заходняга і ўсходняга гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі («Песні Беларускага Панямоння» – 1998 г., «Песні Беларускага Падняпроўя» – 1999 г.), раздзелы ў калектыўных манаграфіях серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў».

Па лініі Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў прыняла ўдзел у выкананні 7 праектаў, па лініі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ажыццяўляла кіраўніцтва 4 заданнямі галіновай і рэспубліканскіх праграм «Культура Беларусі».

Высокая ступень абгрунтаванасці палажэнняў, выказаных даследчыцай, як у тэарэтычных, так і ў навукова-практычных, а таксама публіцыстычных работах, шмат у чым вызначаны тым, што ад самага пачатку сваёй дзейнасці яна абапіраецца на цалкам верыфікаваны матэрыял, назапашаны па выніках амаль 40-гадовай палявой працы (з ахопам абсалютнай большасці раёнаў Беларусі, а таксама экспедыцыі па тэрыторыях беларускіх перасяленцаў у Сібіры), і на свае асабістыя назіранні за жывым аўтэнтычным выканальніцтвам, псіхалогіяй носьбітаў традыцыі, міжасобасным узаемадзеяннем, размеркаваннем роляў у аўтэнтычным спеўным гурце і да т.д.

Т.Б. Варфаламеева выступіла аўтарам ідэі і кіраўніком фундаментальнага даследчага праекта «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў: даследаванне і практыка», па выніках якога на сённяшні дзень выдадзена 6 тамоў (у 10 кнігах) серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў», кожны з якіх прысвечаны культуры аднаго з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Галоўная, паспяхова выкананая задача серыі – аб'ёмны, комплексны паказ рэгіянальнага багацця і разнастайнасці традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў у яе аўтэнтычных формах, пры тым не як архіўных фактаў, а як актуальнай праявы адной з жывых плыняў сучаснай культуры на мяжы другога і трэцяга тысячагоддзяў.

Маштабнасцю і шматаспектнасцю вызначаецца дзейнасць Т.Б. Варфаламеевай у галіне практычнай фалькларыстыкі: яна з'явілася ініцыятарам і ўдзельнікам распрацоўкі шэрага нарматыўна-прававых дакументаў у сферы абароны фальклору, стваральнікам канцэпцый і актыўным арганізатарам фэстаў фальклору (у т.л. Першага Міжнароднага фестывалю фальклору на Беларусі /1994/ і рэгіянальнага фестывалю аўтэнтычнага фальклору Беларускага Падняпроўя /1996/),

шмат гадоў працавала экспертам і членам навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. У 1972 г. яна стварыла радыёклуб «Фальклор», які існаваў на беларускім радыё больш за 25 гадоў. Ёю арганізаваны этнаграфічныя канцэрты (г. Мінск, Масква, Люблін) і выпуск аўтарскіх аўдыякалекцый з запісамі аўтэнтычных беларускіх выканаўцаў (у т.л. па заказу французскага радыё ў 2006 г.).

Разам з М. Козенкам выпрацоўвала прынцыпы і формы перадачы нашчадкам каштоўнасцей традыцыйнай беларускай культуры, што мела вынікам з'яўленне інавацыйнай доўгатэрміновай і шматаспектнай праграмы «Традыцыйная культура і дзеці», асноўныя ідэі якой былі яскрава рэалізаваны ў фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня». З'яўлялася старшынёй (1999–2010) і ўдзельнікам (з 2011 г.) Рады экспертаў фестывалю, удзельнікам і мадэратарам навукова-практычных канферэнцый, «круглых сталоў», якія праводзяцца ў рамках «Берагіні». На старонках СМІ прымала актыўны ўдзел у дыскусіях па праблемах гістарычнага лёсу каранёвай культуры беларусаў і фестывальнага руху «Берагіня».

На працягу ўсёй сваёй працоўнай дзейнасці даследчыца надавала вялікую ўвагу грамадскай рабоце. У розны час яна выконвала абавязкі сакратара секцыі музыкі Каардынацыйнага савета па праблемах мастацтвазнаўства Акадэміі навук БССР, сакратара Фальклорнай камісіі Саюза кампазітараў БССР, сакратара аддзела музычнага мастацтва і этнамузыкалогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, члена мастацкага савета АН БССР, члена секцыі музыкі Беларускага фонду культуры, члена і сактаратара Праўлення Беларускага саюза кампазітараў, члена Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Яна абрана членам Камісіі па даследаваннях і навуцы Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV), з'яўляецца дарадчыкам навуковага праўлення Амерыканскага біяграфічнага інстытута (Raleigh, North Carolina).

Узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2003), дыпломамі ЮНЕСКА «За большой вклад в сохранение нематериального культурного наследия Беларуси» (2008), лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь деячам культуры і мастацтва (2015).

*Тв.* Песенна-меладычныя тыпы паўночнабеларускага вяселля // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук.– Мінск, 1982; Белорусская свадьба сегодня // Народная музыка СССР и современность. – Л., 1982; Пахавальныя галашэнні ў сучасных запісах. Тыпы напеваў і раёны іх пашырэння // Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. – Мінск, 1986; Белорусский свадебный причет: национальная традиция и финно-угорские типологические параллели // Музыка в свадебном обряде финно-угров и соседних народов. – Таллинн, 1986; О традиции похоронного причитания междуречья Дитвы и Пелясы // Балто-славянские исследования. 1985. – М., 1987. Традыцыйныя вяселлі Віцебшчыны (у сучасных запісах). – Мінск, 1988; Primary and secondary folklore forms: propaganda problems // Folk Musik Today. International Conference. – Tallinn, 1989. Традыцыйнае вяселле Гродзеншчыны. – Мінск, 1992; «Народны фальклор», або калі пасохнуць грушы на вярбе? / Літаратура і мастацтва,

18.09.1992; Першы Міжнародны фестываль фальклору на Беларусі. – Мінск, 1994; Аб песеннай традыцыі Беларускага Панямоння / Мастацтва, 1997. – № 5; Праблемы экалогіі аўтэнтычнага песеннага фальклору (па матэрыялах этнамузыказнаўчых даследаванняў рэгіёна Беларускага Паазер'я) // Приграничное и региональное сотрудничество: новые задачи и пути их решения («Нации, границы, судьбы – III»). – Витебск, 1998 г.; Т.Б. Варфоломеева, З.Я. Можейко. Песенные традиции Могилевского Поднепровья // Живая старина. – М., 2000. – № 3; Ахова і зберажэнне ўвасобленых і фіксаваных каштоўнасцей аўтэнтычнага фальклору ў Беларусі // Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы. Матэрыялы VI Еўрапейскай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі па народнай творчасці (IOV). – Мінск, 2001; Т. Варфаламеева, А. Боганева. Рэкамендацыі па ахове, захаванню, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. Вып. 4. – Мінск, 2001; Календарная и семейно-обрядовая песенная традиция белорусов в представлениях ее носителей (аксиологический аспект) // Фольклор и традиционная музыка в Восточной Европе. Серия «Между Западом и Востоком». Вып. 6. – Берлин, 2004; Современное состояние традиционной художественной культуры белорусов. По данным экспедиционных обследований 1993–2002 гг. // Славянская традиционная культура и современный мир. Сб. материалов науч. конф. Вып. 7. – М., 2005; Т. Варфаламеева, М. Козенка. Беларуская полька ў сістэме танцавальнай аўтэнтыкі беларусаў / Музычная культура Беларусі і свету: Да 100-годдзя Л.С. Мухарынскай. – Мінск, 2006; Синхронная дескрипция мелодики белорусского похоронного и свадебного обрядов в ареальном аспекте // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 3: у 2 ч. Ч. 2. – Мінск, 2007; Сямейна-абрадавы цыкл // Беларусы. Т 11. Музыка. Ч. 1. Народная музычная творчасць. – Мінск, 2008; Ахова і захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны як сфера сацыяльна-культурнай палітыкі беларускай дзяржавы на сучасным этапе: праблемы і перспектывы / // Зроднены з культурай. – Мінск, 2008; Варфаламеева, Т. Мажэйка, З. Этнамузычны ландшафт Міншчыны ў сістэме рэгіянальных песенных традыцый Беларусі // Музычная культура Беларусі на скрыжаванні эпох. Вып. 26. Серыя 1, Беларуская музычная культура. – Мінск; 2011; Варфаламеева, Т.Б., Мажэйка, З.Я. Крывіцкі арэал у абрадава-песенных традыцыях: беларускі феномен // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных дследаванняў: зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф. (Полацк, 21–23 красав. 2011 г.: у 2 ч. Ч. 2). – Наваполацк, 2011; Les lamentations nuptials biélorusses: contexte rituel, repartition géographique, poétique, musique // Les lamentations dans le monde euro-méditerranéen. Caniers slaves, publiés par I'UFR d'Études slaves de I'Université Paris-Sorbonne, 2013; Рэгіянальная серыя «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў»: асноўныя прынцыпы падрыхтоўкі выдання // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: бюлетэнь VII Міжнар. навук. канф. – Мінск 2013; Типовые свадебные напевы Витебско-Смоленских территорий: о диалектике этнокультурных процессов на белорусско-российском пограничье // Вопросы этномузыкознания. – № 1(6). – 2014. – М.; Песенный компонент белорусского родинного обряда // Вопросы этномузыкознания. – № 3(8). – 2014. – М.; Серыя «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» як фальклорны звод, арыентаваны на рэвіталізацыю лакальных сістэм мастацтва вуснай традыцыі // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. – Мінск, 2016; Сямейныя абрады і звычаі – Мінск, 2017.



**_ВОЙЦІК Віктар Антонавіч_**

*Кампазітар, педагог. Сябра Беларускага саюза кампазітараў (з 1974 г.), Беларускага саюза музычных дзеячаў (з 1998 г.). Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь (1995), прафесар Беларускай акадэміі музыкі (2014).*

Нарадзіўся 03.09.1947 г. у г. Гродна.

Скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1972), асістэнтуру-стажыроўку Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі (1975).

З 1980 г. выкладае ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Музыка кампазітара В.А. Войціка больш за 40 гадоў прываблівае слухачоў і вызывае пільную ўвагу даследчыкаў беларускай музыкі. У яго творах арганічна спалучаюцца фальклор і экспрэсіўны гукапіс XX ст., тэатральная вобразнасць і глыбокая філасофская думка, трагізм і велічнасць гістарычных падзей мінулага і тонкія лірычныя перажыванні сучасніка.

У цэнтры ўвагі кампазітара – духоўны свет чалавека, які раскрываецца праз актыўнае дзеянне і спачуванне. Грамадзянска-патрыятычную тэму творчасці распачала араторыя «Памяць Хатыні», якая атрымала І прэмію на Усесаюзным конкурсе студэнтаў-кампазітараў у Маскве (1976). Вялікім поспехам карысталіся: Канцэрт для камернага аркестра «Героям Брэсцкай крэпасці» (1975), араторыя «Дзень Радзімы» (1977), Уверцюра (1976) для аркестра беларускіх народных інструментаў, якімі адкрывалі канцэртныя сезоны калектывы Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Сцяга філармоніі. Гэтая тэма знайшла працяг і ў песнях на вершы беларускіх паэтаў: С. Панізніка – «Беларускі дом» (Гімн фестывалю нацыянальных культур народаў Беларусі, 1998 г.), М. Ясеня – балада-рэквіем для барытона і аркестра «Над вечнасцю», «Трасцянец», «Вечный огонь», «Ішла Айчынная вайна».

Фальклорная лінія ярка прасочваецца на працягу ўсяго творчага жыцця кампазітара. Інтанацыямі беларускіх народных песень працяты шматлікія інструментальныя п’есы для цымбалаў, баяна, балалайкі, домры, габоя, фартэпіяна. Такія творы, як кантата «Казацкія песні» (1974), сімфанічная сюіта «Забавы» (1976), Саната для двух цымбалаў (1979) сталі прыкметай свайго часу і з поспехам прадстаўлялі беларускае нацыянальнае мастацтва на музычных фестывалях у Маскве, Вільнюсе, Львове, Таліне, Ташкенце.

Творчыя пошукі Войціка карэнным чынам змянілі ўяўленне аб беларускіх цымбалах і паўплывалі на творчасць многіх кампазітараў і выканаўцаў. Яны ляглі ў падмурак стварэння сучаснай школы ігры на гэтым інструменце. Яго творы

«Акварэль» і «Сюіта ў старадаўнім стылі» (1969) увайшлі ў рэпертуар амаль усіх вядомых цымбалістаў. Два сшыткі эцюдаў (1981, 2006) і п’есы педагагічнага рэпертуару – школа майстэрства не аднаго пакалення цымбалістаў. Яго канцэртныя п’есы часта гучаць на фестывалях, конкурсах, падчас культурных акцый як у краінах СНД, так і ў замежжы: Польшчы, Грэцыі, Францыі, В’етнаме, Кубе. Яны запісаны на Беларускім радыё ў выкананні народнага артыста Беларусі Я. Гладкова, заслужанага артыста Беларусі А. Лявончыка, Л. Рыдлеўскай, В. Прадзед і др.

З 1991 г. па 2014 г. прафесар В.А. Войцік восем разоў прызначаўся ў члены і старшыні журы Рэспубліканскага адкрытага і Міжнароднага конкурсаў юных кампазітараў імя Ю.У. Семянякі. Працаваў у журы Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў імя І.І. Жыновіча (2003, 2009, 2012, 2015). З’яўляецца ініцыятарам правядзення Рэспубліканскага дзіцячага фестывалю-конкурсу народных спеваў «Жывая крыніца» (2016, 2017).

Член Рады і кіраўнік групы экспертаў па народнай інструментальнай музыцы, удзельнік «круглага стала», папулярызатар ідэй Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (2010). Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў (1995).



***ГАДОЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч***

*Педагог, балетмайстар, артыст балета, адзін з вядомых арганізатараў прафесійнай харэаграфічнай адукацыі на Украіне (пераважна заходнія вобласці), аўтар навукова-метадычных прац, эксперт украінскіх айчынных і замежных фестываляў народнай творчасці. Прафесар (1999), кандыдат педагагічных навук (1990), заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны (2007), выдатнік асветы Украіны (1983), ганаровы грамадзянін г. Роўна (2017).*

Нарадзіўся 18.06.1947 г. у г. Вашкаўцы Чэрнавіцкай вобл., Украіна.

Адзін з стваральнікаў (1987) і загадчык (з 1999 г. па снежань 2017 г.) кафедры харэаграфіі Ровенскага (Украіна) дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта. Выкладаў дысцыпліны «Мастацтва балетмайстра», «Народна-сцэнічны танец», «Тэорыя і методыка работы з дзіцячым харэаграфічным калектывам».

Прафесіяналізм харэографа, балетмайстра-пастаноўшчыка гартаваўся ў Магілёўскім культурна-асветным вучылішчы (1962–1966) і Ленінградскім інстытуце культуры (1966–1971).

Арсенал мастацкай дзейнасці і мастацка-эстэтычны досвед У.М. Гадоўскага фарміраваўся шляхам арганізацыі харэаграфічных калектываў «Вяснянка» (г. Магілёў, 1966–1969), 1969 – 1977 гг. – выкладчык харэаграфічных дысціплін культурна-асветнага вучылішча і мастацкі кіраўнік (1972–1977) народнага ансамбля танца «Вадаграй» Чарнавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Чарнаўцы, Украіна,); з 1977 г. па 1979 г. – мастацкі кіраўнік заслужанага ансамбля танца Украіны «Палісянка» гарадскога палаца культуры (г. Роўна); 1979–1987 гг. – мастацкі кіраўнік узорнага ансамбля песні і танца «Дружба» (г. Роўна). З 1987 г. па 2003 г. – мастацкі кіраўнік узорнага ансамбля танца «Рытмы дзяцінства» гарадскога палаца культуры «Тэкстыльшчык» (г. Роўна), а таксама праз выканальніцкую практыку ў якасці артыста балета і саліста ансамбля песні і танца Прыкарпацкай ваеннай акругі (г. Львоў, 1971–1972).

На працягу 40 гадоў працаваў балетмайстрам-пастаноўшчыкам ва Украіне і ў замежных краінах. Перыядычна праводзіў майстар-класы і чытаў лекцыі па харэаграфічным мастацтве ў Расіі, Беларусі, Польшчы, Чэхіі. У творчай скарбонцы Уладзіміра Міхайлавіча больш за 70 аўтарскіх пастановак, звыш 20 харэаграфічных твораў запісаны і апублікаваны, у тым ліку ў замежных выданнях.

У.М. Гадоўскі з'яўляўся старшынёй і чальцом рады экспертаў шматлікіх міжнародных і айчынных харэаграфічных фестываляў і конкурсаў, сярод якіх: «Перлина Черемоша» (Букавіна, 2004–2014)), «Веселкова Терпсіхора» (г. Роўна, Украіна, з 1999), «Мистецькі барві» (г. Прылукі, Чарнігаўская вобл., 1995–2015),

«Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), «Сожскі карагод» (г. Гомель, з 1997), «Зямля пад белымі крыламі» (г. Мазыр, з 1998 г.) і інш. Асаблівую цікавасць праяўляў да «эксклюзіўнага» Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», дзе з'яўляўся членам Рады экспертаў і кіраўніком групы экспертаў па народнай харэаграфіі (2001–2014).

Навуковы збор майстра складаюць амаль 80 прац: артыкулы, метадычныя рэкамендацыі, вучэбныя дапаможнікі.

Прафесійная дзейнасць У. Гадоўскага заслугоўвае павагу сярод супрацоўнікаў кафедры і студэнтаў, ён пастаянна скіроўвае працу асабліва маладых калег-педагогаў на навуковыя даследаванні розных аспектаў харэаграфіі ў звязцы з прыкладнымі мастацтвамі, арганізуе творчыя экспедыцыі і працу па фарміраванню відэатэкі кафедры. Вялікую ўвагу надае канцэртнай дзейнасці калектываў кафедры і прафарыентацыйнай рабоце, што садзейнічае без праблем ажыццяўляць набор студэнтаў на спецыяльнасць «харэаграфія».

Імя Уладзіміра Гадоўскага змешчана ў Энцыклапедыі сучаснай Украіны (2007), а мастацкі свет чытае манаграфію «Людина... Митець... Педагог... Життеві істини Володимира Годовьского» (2009).



**_ДУДЧАНКА Мікалай Рыгоравіч_**

*Вядомы беларускі балетмайстар, рэжысёр-пастаноўшчык міжнародных і рэспубліканскіх тэатралізаваных свят, сцэнарыст, педагог, аўтар арыгінальных методык па харэаграфіі, канцэртмайстар, дырыжор, папулярызатар беларускай нацыянальнай культуры. Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь (1999).*

Нарадзіўся 21.03.1944 г. у г. Чалябінску (Расія).

Скончыў Чалябінскае музычнае вучылішча па класу «баян» (1961), харэаграфічнае аддзяленне Вышэйшай прафсаюзнай школы ВЦСПС у г. Ленінградзе (1966).

М.Р. Дудчанка – арганізатар і мастацкі кіраўнік харэаграфічнага ансамбля танца «Вяснянка» ДК Магілёўскага аўтазавода імя Кірава (з 1966 г.). Стваральнік (з В.І. Гаявой) і першы мастацкі кіраўнік (1974–1977) дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», з 1997 г. яго дырэктар і галоўны балетмайстар, з 2003 г. мастацкі кіраўнік харэаграфічнай студыі пры ансамблі. З 1977 г. галоўны балетмайстар аддзела эстрады Беларускай філармоніі. З 1991 г. мастацкі кіраўнік Рэспубліканскай дырэкцыі нацыянальных мастацкіх праграм пры Міністэрстве культуры Беларусі. У 1993–1997 гг. – рэжысёр і харэограф Мінскага ансамбля музычных і харэаграфічных мініяцюр «Бліскавіца». Галоўны рэжысёр і балетмайстар-пастаноўшчык больш за 50 міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў народнай творчасці, у т.л. Першага рэспубліканскага беларускага народнага танца (г. Гродна, 1990), Другога Міжнароднага харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1999). Аўтар сцэнарыяў і пастаноўшчык юбілейных мерапрыемстваў і тэатралізаваных свят (усесаюзных, рэспубліканскіх, абласных): у гарадах Мінск (1986, 1987, 1988, 1996), Брэст, Гродна і інш.; пастаноўшчык і галоўны харэограф юбілейных рэспубліканскіх канцэртаў. Балетмайстар-пастаноўшчык оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Солтана (1989), больш за 100 арыгінальных харэаграфічных мініяцюр, кампазіцый, танцаў, у т.л. створаных на беларускім харэаграфічным фальклоры: «Крутуха» (1969), «Весялуха» (1970), «Крыжачок» (1972), «Субота» (1974), «Таўкачыкі» (1993), «Мазур-полька», «Саўка» (абодва 1994 г.), «Падэспань» і «Танец Траецкага прадмесця» (абодва 1995 г.) і інш.

Выкладаў народны танец у Магілёўскім культасветвучылішчы (1968–1970), Мінскім харэаграфічным вучылішчы (1978–1982). Кансультант па харэаграфіі Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра культуры і Міжсаюзнага дома самадзейнай творчасці (1975–1988). Яго пастаноўкі, прысвечаныя нацыянальнай тэматыцы, вылучаюцца самабытнай пластыкай, арыгінальнай кампазіцыяй.

Адзін з першых звярнуў увагу на рэгіянальную і лакальную адметнасць беларускага танца ў сцэнічных формах, узбагаціў лексіку народна-сцэнічнай харэаграфіі. Аўтар методык па харэаграфіі, у тым ліку «Методыка сцэнічнай апрацоўкі беларускага танцавальнага фальклору» (1982). Творчасці М.Р. Дудчанкі прысвечана кніга «Неўтаймаваны» (укл., аўтар праекта М.А. Козенка, 2015).

Рэжысёр-пастаноўшчык, кіраўнік (перыядычна) групы экспертаў па народнай харэаграфіі Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл., 1999–2018). Пастаянны ўдзельнік «круглых сталоў» па выніках фестывалю, у т.л. арганізаваных СМІ.



***КАЛАЦЭЙ Вячаслаў Віктаравіч***

*Культуролаг, фалькларыст, этнафоназнаўца, сацыякультурны антраполаг. Кандыдат культуралогіі (2000).*

Нарадзіўся 10.10.1971 г. у г. Камянец Брэсцкай вобл.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (1996) па спецыяльнасці «кіраўнік народнага харавога калектыву», Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2007).

У 2003–2009 гг. працаваў загадчыкам аддзела фальклору і народных рамёстваў Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, выкладаў у БДУКМ, быў першым дэканам факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўніверсітэта (2003–2009). З 2009 г. – загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Ініцыіраваў адкрыццё на кафедры спецыялізацыі «этнафоназнаўства».

В.В. Калацэй даследуе традыцыйную культуру Еўропы, структуру мыслення і паводзін яе носьбітаў, тэорыю і практыку аховы гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў, займаецца аўдыявізуальнай антрапалогіяй.

Аўтар больш за 200 публікацый па пытаннях традыцыйнай культуры (манаграфія «Параўнальная міфалогія» /2009/; раздзелы калектыўных манаграфій «Культурная спадчына: сацыялагічна-культуралагічныя даследаванні» /2001/, «Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы» /2007/, «У тэзаўрусе Беларусі» /2011/); па этнамастацкай адукацыі Беларусі і Цыркумбалтыйскага рэгіёна; сваімі публікацыямі ўвёў у навуковы абарот першы і адзіны на сёння відэазапіс аўтэнтычнага выканання на беларускай дудзе 1939 г.

Ініцыятар і арганізатар міжнародных навуковых канферэнцый «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захававання, вывучэння, успрымання» (з 2007 г.)

Аўтар сцэнарыя антрапалагічных фільмаў «Адраджэнне абрада Ваджэнне і пахаванне Стралы ў вёсках Стаўбун і Неглюбка» (2011); «Сонца – на лета, зіма – на мароз!» (2010).

Арганізатар першых Рэспубліканскіх змен этнакультурнага выхавання ў летніку «Зубраня» (2000); першых дударскіх этна-дыскатэк Беларусі (2001–2005); лідар-заснавальнік другога пасля «Ліцьвінаў» айчыннага гурту дударскай музыкі і этнаспеваў «Ветах» (1997) – дыпламанта фестываляў Еўрапейскага вяшчальнага саюза («радыйнага» аналага «Еўрабачання») «EBU contemporary folk» у Харватыі, Германіі і Швецыі (2010–2014). Пад яго кіраўніцтвам «Ветах»

прадстаўляў фальклор Беларусі ў Палацы Нацый (Жэнева) – другой па значэнню ў свеце штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (2017). Разам з калегамі Таццянай Пладуновай і Эвелінай Шчадрыной кіруе зводным студэнцкім калектывам кафедры «Талака» (2001–2018) – дыпламантам міжнародных фестываляў студэнцкай музыкі Belfort-2003 і 2007 (Францыя); фэстаў «Покровские колокола-2006» (г. Вільнюс), «Slaavi valgis-2013» (Эстонія), «Как на речке было на Фонтанке-2013» (г. Санкт-Пецярбург), «Laiksne 20 jubileu-2013» (г. Рыга), «Rudeninės-2014» (Літва); «Etnokrakow-2015» (Польшча); «Baltica-2015» (Латвія).

У 2014 г. – стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Уваходзіў у склад рэжысёрска-пастановачных груп Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», быў удзельнікам і старшынёй Рады экспертаў заключных мерапрыемстваў рэспубліканскіх (1999–2018), а таксама рэгіянальных фестываляў (Мінскія абласныя – «Фальклорная талака«, «Мінская кадрыля»; Брэсцкія – «Радавод»). Аўтар шматлікіх артыкулаў па этнакультурным выхаванні ў межах праекта «Берагіня» і па праблемах фестывальнага руху «Берагіня». Удзельнічаў у распрацоўцы праграмы «Традыцыйная культура і моладзь» для ўстаноў адукацыі і культуры Кастрычніцкага раёна г. Мінска (зацверджана адміністрацыяй раёна, 2015) і рэалізацыі яе асобных праектаў. Мадэратар на навукова-практычных канферэнцыях і «круглых сталах» фестываляў «Берагіня».

З'яўляецца членам Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (з 2017 г.); пастаянны ўдзельнік міжуніверсітэцкага дыскусійна-аналітычнага клуба «Cogito» (з 2010 г.), створанага вучэбна-навуковай лабараторыяй беларускага фальклору БДУ (з 1996 г.).

В.В. Калацэй узнагароджаны Ганаровай граматай БДУКМ (2005), Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2017).



### *КАНАВАЛЬЧЫК Ірына Віктараўна*

*Балетмайстар-пастаноўчшык, педагог, даследчык праблем айчыннага харэаграфічнага мастацтва.*

Нарадзілася 18.10.1960 г. у г. Мінску.

Скончыла Мінскае культурна-асветніцкае вучылішча (1979), Мінскі інстытут культуры, спецыялізацыя «харэаграфія» (1983), Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (аддзяленне нямецкай мовы спецыяльнага факультэта замежных моў па перападрыхтоўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў Рэспублікі Беларусь (1995), магістратуру (2013) і аспірантуру (2017) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «мастацтвазнаўства».

Працавала балетмайстрам-пастаноўшчыкам у народным ансамблі танца «Лявоніха» Палаца культуры Мінскага трактарнага завода (1983–1990). У 1990 г. на базе Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі стварыла першы недзяржаўны прафесійны калектыў – ансамбль музычных і харэаграфічных мініяцюр «Бліскавіца», дзе працавала мастацкім кіраўніком і галоўным балетмайстрам да 2002 г. З 2002 г. па 2009 г. – памочнік мастацкага кіраўніка, затым галоўны балетмайстар Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, дзе ажыццявіла шэраг харэаграфічных пастановак, сярод якіх: «Франтавая», «Вайсковая», «Казачы пляс», «Прывітальная» і інш. З лютага 2009 г. па цяперашні час працуе старшым выкладчыкам кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

І.В. Канавальчык падрыхтавала метадычныя рэкамендацыі па дысцыплінах «Мастацтва балетмайстра», «Рэжысура харэаграфіі», у суаўтарстве – тыпавыя праграмы па дысцыплінах «Методыка выкладання спецдысцыплін», «Характэрны танец», вучэбную праграму па дысцыпліне «Рэжысура харэаграфіі». Яна актыўна ўдзельнічае ў навукова-практычных канферэнцыях, у сваіх дакладах уздымае праблемы сучаснага стану і развіцця харэаграфічнага мастацтва. У практычнай дзейнасці асаблівую ўвагу надае пытанням вывучэння, захавання і папулярызацыі беларускага харэагарафічнага фальклору. Аўтар 26 публікацый, змешчаных у навуковых зборніках і рэспубліканскіх СМІ, у тым ліку ў «Краязнаўчай газеце» – органе Беларускага фонду культуры.

Яна з’яўлялася галоўным балетмайстрам шэрага рэспубліканскіх мерапрыемстваў, такіх як: Спартыўна-моладзевыя шэсці (2008, 2009, 2010, 2012, 2013, 2014, 2015), прысвечаныя Дню Незалежнасці краіны; Святы працаўнікоў сельскай гаспадаркі «Дажынкі» (2008, 2009, 2011, 2013, 2014); канцэрты майстроў мастацтваў Беларусі, прысвечаныя Дню Незалежнасці, Дню Перамогі, Цырымоніі

ўручэння Прэмій прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2009, 20012, 2013, 2014, 2015, 2016, 2017); юбілейныя святы г. Светлагорска, Салігорска, Магілёва, Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік»; Дзень беларускага пісьменства (2008, 2009, 2013, 2015, 2017); Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» (2010, 2011, 2013, 2015); Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2012–2017); Адкрыццё чэмпіянату свету па дзю-до (2009), фрыстайлу (2012), біятлону (2015); цырымонія ўрачыстага ўшанавання пераможцаў і прызёраў зімовых Алімпійскіх гульняў у г. Сочы (2013); заключны гала-канцэрт адборачнага туру Рэспубліканскага агляду-конкурсу мастацкай творчасці «Сузор'е» (2008); урачыстае адкрыццё Мінскай Гарадской ратушы (2004); урачыстае адкрыццё Плошчы Сцяга і Герба Рэспублікі Беларусь (2013), святочныя канцэрты–акцыі «Спяваем Гімн разам» (2012–2017), тэлевізійныя праекты і інш.

І.В. Канавальчык ажыццявіла мастацкае кіраўніцтва, падрыхтоўку і рэжысуру 8 канцэртных праграм са студэнтамі БДУКіМ: «Русальны Тыдзень» (2006), «Кветка ружа» (2010), «Някемлівы хлапчына» (2014); дзіцячы харэаграфічны спектакль «Мурашыныя прыгоды», з якім студэнты правялі дабрачынную акцыю і выступалі перад дзецьмі-інвалідамі і дзецьмі-сіротамі (2013), «Подых часу» (2008), «Танцуючыя ў сусвеце» (2011), «Танец у кожным з нас» (2016), «Танец як жыццё» (2016), «Жыццё ў танцавальным вымярэнні» (2016).

З'яўлялася экспертам VIII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2014), Мінскіх гарадскіх і абласных аглядаў, конкурсаў калектываў народнай творчасці, якія ладзіліся ў яго рэчышчы.

Узнагароджана знакам ЦК УЛКСМ і Міністэрства вышэйшай і сярэдняй адукацыі СССР «За выдатную вучобу», знакам ВЦСПС «За дасягненні ў самадзейным мастацтве», Ганаровымі граматамі Мінгарвыканкама, Мінскага аблсаўпрофа, падзякамі і Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь; лаўрэат міжнародных конкурсаў (Паўночная Карэя, г. Пхеньян, 1998, 2000). У 2000 г. узнагароджана медалём Францыска Скарыны «За высокія дасягненні ў галіне мастацтва».



**_КУХАРОНАК Таццяна Іванаўна_**

*Беларускі этнолаг, фалькларыст, педагог. Кандыдат гістарычных навук (1988).*

Нарадзілася 07.08.1954 г. у в. Клінок Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1981).

З 1971 г. працуе ў аддзеле народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; з 1988 г. старшым навуковым супрацоўнікам. Праблематыка яе фундаментальных даследаванняў – гістарычная эвалюцыя сямейнай і каляндарнай абраднасці беларусаў, яе тэрытарыяльна агульныя і лакальныя рысы, тэндэнцыі развіцця на сучасным этапе.

Аўтар чатырох манаграфій: «Радзінныя звычаі і абрады беларусаў» (г. Мінск, 1993); «Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў» (г. Мінск, 2001); «Радзіны і маленства ў традыцыйнай культуры беларусаў» (г. Мінск, 2017), «Ядраное жыта гаспадара кліча...: каляндарны год у абрадах і звычаях» (у суаўтарстве з Т. Валодзінай, г. Мінск, 2015). Адзін з укладальнікаў кніг: «Прымаўкі ды прыказкі – мудрай мовы прывязкі: (з адвечнай мудрасці народнай)». (г. Мінск, 2017); «Бегла ліска каля лесу блізка...»: (з народнапаэтычнай спадчыны). (г. Мінск, 2018).

Падрыхтавала шэраг раздзелаў у калектыўных працах, надрукавала 249 навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у разнастайных айчынных і замежных выданнях.

Навукова-практычная дзейнасць Т.І. Кухаронак таксама адрозніваецца інтэнсіўнасцю. Яна распрацавала праграму па курсу «Этнапедагогіка» і выкладала па ёй з 2001 г. па 2006 г. на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка.

Т.І. Кухаронак – аўтар і навуковы кансультант 12 відэафільмаў, прысвечаных каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў. Удзельнічала ў распрацоўцы серыі памятных манет для Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па тэмах: «Святы і абрады беларусаў», «Сямейныя традыцыі славян».

З’яўлялася экспертам Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016).

Таццяна Іванаўна Кухаронак – лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2008); узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За шматгадовую навуковую, педагагічную і творчую дзейнасць у галіне куль-

туры, мастацтва і ў сувязі з 50-годдзем ІМЭФ НАН Беларусі» (2007), нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2012), падзякай Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі У.Р. Гусакова «За шматгадовую плённую навуковую і творчую дзейнасць, значны асабісты ўклад у папулярызацыю традыцыйнай культуры беларусаў» (2017).

*Тв.:* Сямейныя абрады // Беларусы. Т. 5. Сям'я. – Мінск, 2001; Каляндарныя святы // Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі. – Мінск, 2002; Славянскія каляндарныя этнакультурныя традыцыі беларусаў // Беларусы. Т. 10 Славянскія этнакультурныя традыцыі. – Мінск, 2007; Грамадзянскія святы // Сучасныя этнакультурныя працэсы. – Мінск, 2009; Календарные праздники, обычаи и обряды // Этнокультурные процессы Гродненского Понеманья в прошлом и настоящем. – Минск, 2014; Праздники, обычаи и обряды народного календаря // Этнокультурные процессы Центральной Беларуси в прошлом и настоящем. – Минск, 2016.



### *МАЗЮК Ірына Васільеўна*

*Педагог, збіральнік і даследчык традыцыйнай спадчыны беларусаў.*

Нарадзілася 24.01.1965 г. у в. Хрыса Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыла Беларускую акадэмію мастацтваў (1995), вучылася ў аспірантуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (1996–1998).

Працавала выкладчыкам (з 1995 г.), старшым выкладчыкам (з 2016 г. да сённяшняга часу) кафедры мадэліравання аддзення і мастацкага ткацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; навуковым супрацоўнікам лабараторыі традыцыйнага мастацтва аддзела народнай творчасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (1998 – 2008).

Спецыялізуецца ў галіне развіцця традыцый беларускага народнага ткацтва ў сучасным мастацкім тэкстылі, даследуе старажытныя спеўныя традыцыі беларусаў.

Падрыхтавала электронныя дадаткі (запісы беларускіх народных песень і інструментальных найгрышаў у выкананні аўтэнтычных спевакоў і музыкаў) для IV, V і VI тамоў серыі «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў» (2009, 2010, 2012) і манаграфіі Т.Б. Варфаламеевай «Сямейныя абрады і звычаі» (2017) – запіс, складанне, апрацоўка і работа з гукам.

Аўтар навуковых, навукова-папулярных артыкулаў, прысвечаных праблемам пераймання народных спеўных традыцый, сярод якіх – Творчы вопыт спеўнага гурту маладзёжнага фольк-клуба // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці (1–3 чэрвеня 2001 г., г.п. Акцябрскі). Матэрыялы навукова-практ. канф. – Мазыр, 2001; Аб праблемах пераймання спеўных традыцый // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 3. Матэрыялы IV Рэспуб. навук.-практ. канф. (2–3 красавіка, 2008 г., г.п. Акцябрскі). – Мінск, 2008.

Стваральнік серыі народна-сцэнічных касцюмаў для дзіцячых калектываў Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі (1995–1996); кансультант па касцюмах фестывалю народнага мастацтва «Мядоцкі край і яго таленты» (в. Мётча, Барысаўскі р-н, 1997); арганізатар і кіраўнік фальклорнага клуба «Маладзёвы» (1996), з 1999 – кіраўнік маладзёжнага фальклорнага гурта «Кудмень» – выканаўцы беларускіх народных песень, танцаў, інструментальнай музыкі. У складзе гурту «Гуда» (г. Мінск) удзельнічала ў Міжнародным фальклорным фестывалі «Балтыка–97»;

праводзіла майстар-класы па методыцы навучання і пераймання мясцовых спеўных традыцый (Беларусь, Расія, Польшча).

Суарганізатар Рэспубліканскай маладзёжнай арганізацыі «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства» (1998).

Член Рады экспертаў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (дэкаратыўна-побытавае, спеўнае, музычна-інструментальнае мастацтва, 1999–2016). Кансультант па касцюмах Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага гурту «Берагіня» Мётчанскай адукацыйнай установы Барысаўскага раёна, іншых калектываў – удзельнікаў фестывалю. Арганізатар навучання беларускім народным побытавым танцам студэнцкай моладзі ў фольк-клубе «Маладзёвы» і фальклорным гурце «Кудмень» (1996–2018). Праводзіла майстар-класы па пляценню і ткацтву паясоў у розных тэхніках.



***ПАПОЎ Віктар Аляксеевіч***

*Артыст балета, балетмайстар, педагог, рэжысёр, менеджар.*

Нарадзіўся 18.11.1956 г. у г. Ліпецку (Расія).

Скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры, спецыялізацыя «харэаграфія», кваліфікацыя «выкладчык харэаграфічных дысцыплін» (1978).

Працаваў артыстам Дзяржаўнага кубанскага казачага хору (1981–1983), артыстам балета і балетмайстрам ансамбля песні і пляскі групы савецкіх войск у Германіі (1984–1986); у 1983 – 2009 гг. – мастацкі кіраўнік і балетмайстар Заслужанага (з 2005 г.) аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь харэаграфічнага ансамбля «Рунь» Палаца культуры ААТ «МАГАТЭКС»; з 2009 г. – Магілёўскага гарадскога цэнтра культуры і вольнага часу; з 2014 г. – дырэктар і балетмайстар дзяржаўнага тэатра танца «Казакі Расіі» (г. Ліпецк, Расія).

У аснове праграмы калектыву «Рунь» – сцэнічна апрацаваныя народныя танцы, першакрыніца якіх – рэгіянальныя аўтэнтычныя ўзоры традыцыйнай харэаграфіі беларусаў. Сярод іх – «Лявоніха» (1984), «Варатынская кадрыля» (1989), «Таўкачыкі», «Званочкі» (абодва 1990 г.), «Хаханькі з брылямі» (1988), «Люляшы», «Жабка» (абодва 1996 г.). Захоўваючы самабытнасць беларускага нацыянальнага рэпертуару, «Рунь» адначасова паспяхова ўвасабляе на сцэне ўзоры харэаграфічнай творчасці народаў свету, раскрываючы прыгажосць і мастацкую адметнасць кожнай этнічнай культуры: рускай – «Зімушка» (1987), украінскай – «Паўзунец», народаў Далёкага Усходу – сюіта «На берагах Амура», калумбійскай – «Кумбія» (1987), балівійскай – «Сараро» і «Куэка» (1992), мексіканскай – сюіта танцаў «Харабэ лярго» і інш.

Калектыў пад кіраўніцтвам В. Папова неаднаразова перамагаў у конкурсах: «На лепшую сцэнічную апрацоўку народных танцаў» (г. Гродна, 1990), «За арыгінальную распрацоўку беларускага фальклору» (г. Бабруйск, 1992), якія праводзіліся падчас рэспубліканскіх фестываляў беларускага народнага танца. Шматразова адзначаўся спецыяльнымі прызамі, у тым ліку і прызам Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі». Уладальнік Першай прэміі за лепшую балетмайстарскую работу на Першым Міжнародным фестывалі харэаграфіі «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1997). Удастоены Гран-пры XXII Міжнароднага фестывалю фальклору «Castellj di Gorigia» (Італія, 1922).

Ансамбль «Рунь» з годнасцю прадстаўляў беларускае мастацтва на міжнародных фестывалях народнай творчасці ў Германіі, Італіі, Расіі, Украіне, Іспаніі, Англіі, Польшчы, Балгарыі, Партугаліі, Ватыкане, Францыі, Грэцыі, Вялікабрытаніі і іншых краінах далёкага і блізкага замежжа.

В.А. Папоў пастаянны член Рады экспертаў Рэспубліканскага фестывалю народнага танца «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1993–2001), Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2014); прымаў удзел у рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях, «круглых сталах», дыскусіях па праблемах беларускай народна-сцэнічнай харэаграфіі; выкладаў на рэспубліканскіх і абласных семінарах кіраўнікоў харэаграфічных калектываў; з'яўляўся кансультантам Рэспубліканскага і Магілёўскага міжсаюзнага дамоў самадзейнай творчасці (1986–1998), абласнога навукова-метадычнага цэнтра культуры (1986–2014).

У цяперашні час – член працоўнай групы пастаяннай профільнай Камісіі па садзейнічанню развіццю казачай культуры Савета пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па справах казачаства. За канцэртную праграму «Вясёлка Перамогі», створаную да 70-годдзя Перамогі савецкага народа над нацысцкай Германіяй, аўтарскаму калектыву прысуджана прэмія Урада Расійскай Федэрацыі ў галіне культуры.

Узнагароджаны знакам ВЦСПС (1989), знакам Міністэрства культуры СССР і ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры (1990); памятным знакам «2000 год хрысціянству» (2000); медалём Францыска Скарыны (2010), а таксама шматлікімі Ганаровымі граматамі Магілёўскага гарадскога і абласнога выканаўчых камітэтаў, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Па выніках 2010 г. занесены ў Кнігу славы Магілёўшчыны.



***ПЕСНЯКЕВІЧ Таццяна Пятроўна***

*Музыказнавец, журналіст.*

Нарадзілася 15.08.1952 г. у г. Мінску.

Скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1977), працуе на Беларускім радыё (з 1977 г.).

Аўтар і вядучая цыкла фальклорных музычных праграм «Радыёклуб “Фальклор”» (з 1978 г.), «Гасцінец» (з 2002 г.), «Галасы стагоддзяў» (з 1993 г.). Шэраг перадач і артыкулаў прысвяціла беларускім этнамузыколагам, у т.л. З. Мажэйка («Прызванне», 1993), «Покліч лёсу» (2003); Т. Варфаламеевай («Свой шлях, сваё служэнне» ў кн. «Працяг будзе…», 2004).

Аўтар публікацый пра нацыянальны музычны фальклор і яго выканаўцаў. Удзельніца стварэння на Беларускім радыё фонду запісаў беларускага аўтэнтычнага фальклору.

Каардынатар ад беларускага нацыянальнага радыё міжнародных фальклорных музычных праектаў Еўрапейскага вяшчальнага саюза «Каляды», «Вялікдзень» (абодва праекты штогадовыя, існуюць з 1998 г.), «Ноч балад», «Калыханкі», «Песні кахання» (2002–2005), Gypsy project (2015), міжнародных фальклорных фестываляў Еўрапейскага вяшчальнага саюза, на якіх Беларусь прадстаўлялі пастаянныя ўдзельнікі канцэртных праграм фестывалю «Берагіня», фальклорныя калектывы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў: «Раме» – Кёльн, (Германія, 2009); «Ветах» – Рудальштат (Германія, 2010), Опатыя (Харватыя, 2011), Ратвік (Швецыя, 2014); «Талака» – Кракаў (Польшча, 2015).

Аўтар шэрага радыёпраграм цыкла «Галасы стагоддзяў» (з 2004 г.), прысвечаных удзельнікам і пераможцам фестывалю «Берагіня» розных гадоў. Гасцямі праграм былі М.А. Козенка, Л.М. Рыжкова, В.В. Калацэй, Т.А. Пладунова, С.Г. Выскварка, фальклорныя гурты «Берагіня» (в. Мётча, Барысаўскі р-н), «Нежачкі» (г. Расоны), «Крыніцы» (в. Янкавічы, Расонскі р-н), гурты в. Пагост (Жыткавіцкі р-н) і Ліпляны (Лельчыцкі р-н).

Эксперт Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Лаўрэат міжнародных конкурсаў музычных праграм «Прыз Брацiславы» (1985, 1987), «Прыз Брно» (1990, 1991). Лаўрэат прэміі «Залатое пяро» Беларускага саюза журналістаў за цыкл праграм «Галасы стагоддзяў» (2009); узнагароджана Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Беларусі (2003, 2005) і нагрудным

знакам Міністэрства культуры Беларусі «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2013).

Сакратар Праўлення Беларускага саюза кампазітараў (2010), член Беларускага саюза журналістаў (1986).

*Тв.:* Каб не знікла крынічанька / Літаратура і мастацтва. 1981. 14.08; «Майстар» (пра У. Пузыню / Літаратура і мастацтва. 1990. 23.02; «Аўтэнтыка… плюс мы» / Літаратура і мастацтва. 1995. 13.10; «Сур'ёзнае і жартоўнае "Крэсіва"» / Літаратура і мастацтва. 1996; «Міханавіцкая калыханка» / Літаратура і мастацтва. 1998. 16.01; «Слава нашай "Троіцы" ляціць… да Беларусі» / Літаратура і мастацтва. 1998. 21.08; «І гэтым Беларусь цікавая свету» / Літаратура і мастацтва. 1999. 22.10; «Тое, чым я жыву» / Літаратура і мастацтва. 2000. 01.09; «У фальклорным коле –"Кола"» / Літаратура і мастацтва. 2001. 17.08; «З "Бяседай" – як сярод сяброў» // Мы – беларусы. – Мінск, 2003; «"Ветах" над Еўропай» / Літаратура і мастацтва. 2009. 24.12; «Крыніца з патэнцыялам ракі» / Літаратура і мастацтва. 2011. 04.11.



**_ПІСКУН Юрый Аляксандравіч_**

*Беларускі мастак, этнограф, мастацтвазнаўца, педагог.*

Нарадзіўся 27.08.1955 г. у г. Мінску.

Скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (1980), аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР (1968). Дацэнт (2005). Сябра Беларускага саюза мастакоў (з 1986).

Працаваў навуковым супрацоўнікам Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1986–1994), намеснікам дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (2000–2003); з 1994 г. па 2017 г. – старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры касцюма і тэкстылю Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў; з 2017 г. – вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. з 2018 г. – дацэнт кафедры дызайну моды і аксэсуараў Інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Працуючы ў музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вёў вялікую экспедыцыйную работу, у т.л. і ў раёнах, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы, даследаваў традыцыйнае беларускае народнае мастацтва і беларускі іканапіс.

Аўтар манаграфіі «На перекрестках европейских дорог. Белорусские иконы» (2006, выдадзена на рускай, нямецкай, італьянскай, французскай, іспанскай мовах), раздзелаў у калектыўных манаграфіях, больш 50 артыкулаў у навуковых выданнях Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, ФРГ, беларускіх энцыклапедыях; падрыхтаваў некалькі вучэбных дапаможнікаў. Пад яго кіраўніцтвам і навуковай рэдакцыяй апублікаваны альбомы «Беларускае мастацтва ХХ стагоддзя» (2003), «Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Мастацтва XV – пачатку ХХ стагоддзя» (2004).

З'яўляўся навуковым кіраўніком міжнародных навукова-творчых праектаў «Вобраз жанчыны ў мастацтве Вялікага Княства Літоўскага» (1997–1998) і «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага» (2003).

Як самабытны мастак-жывапісец ён з 1980 г. бярэ ўдзел у мастацкіх выстаўках. Яго творы экспанаваліся на шматлікіх вернісажах (Беларусь, Літва, Эстонія, ФРГ, Італія, Іспанія, Расія, Польшча, Эфіопія), а шэраг карцін і партрэтных твораў – «Вяселле ў Беражках» (1985), «На куццю» (2002), «Раю раіўся» (1994), «Сакалінае паляванне» (1998), «Зося ў старажытным строі» (1998), «Святло нязгаснае» (2009) сталі хрэстаматыйнымі, увайшлі ў скарбонку лепшых здабыткаў беларускага

жывапісу мяжы XX – XXI стст. Персанальныя выстаўкі мастака праходзілі ў г. Мінску, Барысаве, Нясвіжы, Баранавічах, Магілёве, Эстоніі, Літве, Германіі, Італіі.

Жывапісныя палотны Ю. Піскуна захоўваюцца ў зборах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Гістарычнага музея Беларусі, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Магілёўскага мастацкага музея імя П.В. Масленікава, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, у замежных калекцыях і прыватных зборах.

Як жывапісец і знаўца старажытнабеларускай іканапіснай традыцыі мастак ажыццявіў шэраг творчых праектаў па аднаўленню спіскаў страчаных цудадзейных беларускіх абразаў Божай Маці і напісанню шэрага абразаў для іканастасаў праваслаўных храмаў і алтароў каталіцкіх касцёлаў Беларусі. Ім былі выкананы абразы-спіскі (мастацкія рэканструкцыі) цудадзейных абразаў Божай Маці Забельская (для царквы Нараджэння Божай Маці ў в. Грэск, Слуцкі р-н, 2012), Божай Маці Вальнянская (для Троіцкай царквы ў в. Вольна, Баранавіцкі р-н, 2014), Божай Маці Лагойская (для Лагойскага раённага краязнаўчага музея, 2014). Напісаны абразы для іканастаса капліцы ў Міры (2009), для алтара касцёла Божай Маці Фацімскай у Жодзіна (2006–2010), алтарны абраз «Узнясенне Хрыста» для Троіцкага касцёла ў в. Росіца Верхнядзвінскага раёна (2009), абразы для інтэр'ераў царквы з в. Логневічы (Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, 2013) і капліцы з в. Каралеўцы (Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, 2014).

Шырокае грамадскае прызнанне атрымалі манументальныя габелены Юрыя Піскуна, выканананыя па кардонах для экспазіцыі Дзяжаўнага гісторыка-археалагічнага музея ў Заслаўі, прысвечаныя падзеям беларускай даўніны – «Полацкія званы» (1990) і «Малітва» (1991, у суаўтарстве з В. Дзёмкінай).

Ю. Піскун даследуе і адраджае беларускі народны і гістарычны касцюм. У 1979 – 2011 гг. ім створаны ўзорныя калекцыі сцэнічных касцюмаў для ансамбляў «Песняры» (у суаўтарстве з В. Дзёмкінай), «Харошкі», «Купалінка», «Талака»; для Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Беларусі імя Г. Цітовіча, Акадэмічнага аркестра народных інструментаў імя І. Жыновіча, Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, шматлікіх дарослых і дзіцячых аматарскіх калектываў; выканаў копіі-рэканструкцыі беларускіх нацыянальных гістарычных касцюмаў для экспазіцый музея «Замкавы комплекс "Мір"», Нацыянальнага гістарычнага музея, Дома беларускай культуры ў Пекіне, Віцебскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея, Магілёўскага гісторыка-краязнаўчага музея імя Я. Раманава, музея «Брэсцкая крэпасць». Таксама створаны сцэнічныя касцюмы для Акадэмічнага ансамбля танца Сібіры, маскоўскага шоў-балета «Рытмы планеты», вакальнага ансабля Смаленскай філармоніі, тэатра танца «Казакі Расіі» з г. Ліпецка; зрабіў малюнкі-рэканструкцыі ўзораў народных касцюмаў Віцебшчыны для выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Віцебскае Падзвінне» (2004).

Неаднаразова з'яўляўся старшынёй ДзЭКа ў многіх мастацкіх каледжах Беларусі, экспертам у галіне беларускага народнага мастацтва ў журы фестываля «Залатая пчолка» (2009–2014).

Усе 20 гадоў Юры Піскун – нязменны член журы і кіраўнік групы экспертаў па дэкаратыўна-побытаваму мастацтву Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Кансультаваў кіраўнікоў фальклорных калектываў па стварэнню рэгіянальных народных строяў. Удзельнічаў у рабоце навукова-практычных канферэнцый, праводзімых у рамках фестываляў, «круглых сталоў» па іх выніках.

За ўклад у даследаванне і папулярызацыю беларускага сакральнага мастацтва даследчык узнагароджаны Ганаровай граматай беларускага праваслаўнага экзархата (2007), медалём Свяціцеля Кірылы Тураўскага (2008); за распрацоўку касцюмаў для ансамбля «Харошкі» – сярэбраным медалём ВДНГ СССР (1986).

*Тв.:* Маці Божая Адзігітрыя Неўвядальны цвет / Мастацтва Беларусі. – № 4. 1986; Партрэт Ігнацiя Завiшы / Мастацтва Беларусі. – № 10. 1986; Локальные особенности древнебелорусской живописи (на примере художественного наследия Слуцка и Слуцкого княжества в XVIII веке) / Весці Акадэміі навук БССР/ серыя грамадскіх навук. – № 4. – Мінск, 1987; Аб змесце і аўтарстве маладзечанскіх абразоў «Пакровы» і «Мікола» // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя даследаванні. – Мінск, 1989; Іканапіс // Скарына і яго эпоха. – Мінск, 1990; Прастора і час у старажытнабеларускім жывапісе (на прыкладзе абраза «Параскева з жыціем») / Мастацтва Беларусі. – № 4. 1991; Дарога да роднага дому / Мастацтва. – № 4. 1994; Васіль Маркіянавіч – слуцкі мастак сярэдзіны XVIII стагоддзя // Матэрыялы да 100-годдзя з дня нараджэння Міколы Шчакаціхіна. – Мінск, 1996; Значение чудотворных икон Богоматери в истории Белорусской православной и греко-католической церкви. Иконы Богоматери в пространстве белорусского храма / Medzinarodna vedecka konferrencia. 23–25 septembra 1998. – Prešov, 2000; Іканапіс XVIII стагоддзя // Іканапіс Заходняга Палесся. – Мінск, 2002; Скарбы ўкраінскага іканапісу / Наша вера. – № 2. 2002; З верай у перамогу // Беларускае мастацтва XX стагоддзя. – Мінск, 2003; Вяртанне з забыцця / Наша вера. – № 3. 2003; Выяўленчае мастацтва Беларусі XIV – XVIII стагоддзяў. – Мінск, 2004; Гісторыя касцюма Беларусі XIV – XVIII стагоддзяў. – Мінск, 2004; Праектаванне касцюма для фальклорныўх і выканальніцкіх мастацкіх калектываў Беларусі. – Мінск, 2004; Слуцкая живопись в контексте религиозной и культурной ситуации Слуцкого княжества XVI – XVIII вв. //Studia i materialy do dziejów chreścianstwa wschodniego w Rzeczypospolitej. Tom 3. 2005/ Kościoły wschodnie w Rzeczypospolitej XVI – XVIII wieku. – Lublin, 2005; У истоков духовности – Туров и Смоленск // Тысячелетие Туровской епархии. Вестник Белорусского экзархата. Альманах. Т. 4. – Минск, 2005; Die Nationaltracht des Wießrussischen Adels im Sechzehnten-Siebzehnten Jahrhundert / On men. Muskuline dress code. – Berlin, 2005; Представители художественных профессий среди ремесленного населения Слуцка в XVII – XVIII веках //Daile LDK miestuose: poreikai ir uzsakymai. – Vilnius, 2006; Рэчы з Мінскага музейнага збору Генрыха Татура ў Львоўскім нацыянальным музеі // Могілянські читання. 2006. – Кіїв. 2007; Slucko meninis gyvenimas XVII – XVIII a. ir meninis palikimas / LDK sakrakine daile: atodangos ir naujeje kontekstai. Vilniaus dailes akademijos leidykla. 2008; Памяці Міхася Раманюка // Нацыянальны касцюм у сучаснай сацыякультурнай прасторы. – Мінск, 2008; Стэфан Катлярэўскі – новае імя ў гісторыі беларускага і ўкраінскага мастацтва апошняй чвэрці 18 стагоддзя / «Апологет». – № 1–4 (16–19). 2009. – Львів; Праваслаўны Слуцк у канцы XVII – сярэдзіне XVIII стагоддзя (па матэрыялах рэвізій

і інвентароў Слуцка) // Обретение образа. Православная белорусская культура в славянском мире. – Минск, 2009; Примеры интерпретации структуры створчатых алтарей-киотов в православной и униатской живописи Белоруссии XVIII – XIX веков: жертвенники и переносные иконы // Dailės istorijos studijos, 4; 2010/ Socialinių tapatumų reprezentacijos. – Vilnius, 2010; Шляхецкі касцюм і кунтушовыя паясы // Слуцкія паясы: Мастацтва, асобы, эпоха. – Мінск, 2015; Костюмы «Песняров» как знак национальной гордости // Владимир Мулявин. «Сэрцам і думамі»: Воспоминания, интервью, исследования. – Мінск, 2015; Радзівілы: лёсы краіны і роду // Каталог твораў. – Мінск, 2017.



### *ПЛАДУНОВА Таццяна Аляксандраўна*

*Харавы дырыжор, педагог, сцэнарыст, рэжысёр.*

Нарадзілася 08.11.1972 г. у г. Мінску.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (1994) па спецыяльнасці «культурна-асветная работа і арганізацыя самадзейнай творчасці» з прысваеннем кваліфікацыі «кіраўнік харавога калектыву, выкладчык харавых дысцыплін»; аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (2003) па спецыяльнасці «педагогіка сацыякультурнай дзейнасці».

У 1994–1997 гг. – хормайстар і артыст-вакаліст вышэйшай катэгорыі фальклортэатра «Госьціца» Белдзяржтэлерадыё; у 1997 – 2000 гг. – выкладчык СШ № 145 з музычным ухілам, адначасова – метадыст, а затым загадчык аддзела фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. У цэнтры стварыла фальклорны гурт «Верас» (1997), які разам з фальклорным гуртом «Ветах» (кіраўнік В. Калацэй) прымаў удзел у шматлікіх фестывалях (Беларусь, Літва, Латвія, Эстонія, Расія, Польшча, Францыя), а з 2001 г. – у правядзенні этна-дыскатэк у сталіцы, на якіх удзельнікі названых гуртоў дэманстравалі ў інтэрактыўнай форме народныя побытавыя танцы, гульні, сезонна прымеркаваныя песні і карагоды.

З 2002 г. па 2009 г. выкладала на кафедры народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (працавала з народнахаравым калектывам «Талака»); з 2004 г. – старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўніверсітэта, дзе была адкрыта спецыялізацыя «этнафоназнаўства» (пазней і «абрадазнаўства»). Разам з В. Калацэем распрацавала інавацыйны курс «Уводзіны ў беларускую спеўную этнафонію», пакладзены ў аснову паглыбленага вывучэння студэнтамі беларускага песеннага фальклору. Ажыццявіла першы набор і выпуск (2009) спецыялістаў-этнафоназнаўцаў.

У 2004 г. стварыла фальклорны гурт «Этна-суполка», у назве якога акрэсліла сваё эстэтычнае і этнапедагагічнае «крэда» – аб'яднаць і духоўна ўзмацніць людзей праз супольную творчую працу, засваенне і пражыванне народнага музычнага мастацтва. Гурт актыўна ўдзельнічаў у фальклорных фестывалях Беларусі (2013, 2016), Расіі (2007, 2013, 2014), Літвы (2014), неаднойчы атрымліваў дыпломы высокіх ступеняў. На V Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» атрымаў дыплом І ступені.

Сфера навуковых і творчых інтарэсаў Т.А. Пладуновай – засваенне беларускай вакальнай этнафоніі ў аматарскай творчасці; распрацоўка тыпалогіі тэмбраў вакальнай этнафоніі беларусаў і методыкі навучання спевам на яе аснове;

мастацкая рэканструкцыя традыцыйных абрадаў і свят у сучасных гарадскіх умовах.

З'яўляецца аўтарам каля 30 публікацый. Рэгулярна бярэ ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, прысвечаных праблемам вывучэння і трансляцыі традыцыйнай народнай культуры, майстар-класах паводле яе пераймання, семінарах па праблемах этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі. З 2006 г. – актыўны арганізатар штогадовых міжнародных навукова-практычных канферэнцый «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання» (ладзіцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў).

Ажыццявіла рэжысуру і правядзенне Рэспубліканскага фестывалю дзіцячых калектываў «Калядны фэст» (Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, 2005); гарадскіх свят «Зялёныя святкі» (2008) і «Гуканне вясны» (2011–2013) у парку імя М. Горкага; серыю дыпломных праектаў гурту «Этна-суполка»: мастацкія рэканструкцыі абрадавых свят «Купалле на Віцебскім Падзвінні» (2009), «Кумленне» і «Жаніцьба Цярэшкі па-Глыбоцку» (2015), «Вяселле на Лельчыцкім Палессі» (2018); з 2005 г. з'яўляецца рэжысёрам і вядучай этнаграфічных канцэртаў штогадовага цыкла «Фальклор беларускай глыбінкі». У 2010 г. падрыхтавала і выпусціла электронны дыск «Этна-суполка БДУКМ».

На пяці апошніх фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2008, 2010, 2012, 2014, 2016) выступіла рэжысёрам, вядучым і ўдзельнікам Рэспубліканскага Купалля – адной з цэнтральных фестывальных падзей, што аб'ядноўвае ўсіх удзельнікаў фестывалю як сімвал неўміручасці жывой народнай традыцыі і далучэння да яе дзяцей і моладзі.

Т.А. Пладунова ўзнагароджана дыпломамі фестываляў Еўрапейскага вяшчальнага саюза (Кёльн, Германія, 2010 г.; Апатыя, Харватыя, 2012 г.).

*Тв.:* Шляхі і перспектывы пабудовы мадэлі этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі // Пазашкольнае выхаванне, 2005. – № 11; Фарміраванне этнафанічных эталонаў гучання ў студэнтаў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства» БДУ культуры і мастацтваў // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 3. Матэрыялы IV Рэсп. навук.-практ. канф. (2–3 красавіка 2008 г., г.п. Акцябрскі). – Мінск, 2008; Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 красавіка 2010 г.). – Мінск, 2010; Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А. Пладунова. – Мінск, 2013; Этнафанічны падыход у выхаванні спевакоў-выканаўцаў народных песень / Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі ў сучаснай практыцы дадатковай адукацыі: тэндэнцыі і перспектывы: зб. навук.-метад. матэрыялаў. – Мінск, 2016; Да пытання тыпалогіі тэмбраў вакальнай этнафоніі беларусаў // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка): зб. навук. прац удзельнікаў Х Міжнар. навук. канф. (Мінск, 24–26 красавіка 2016 г.). – Мінск, 2016.



### *РАШЧЫНСКІ Алесь Уладзіміравіч*

*Кампазітар, харавы дырыжор, фалькларыст, педагог, публіцыст.*

Нарадзіўся 02.04.1949 г. у г. Лагойску Мінскай вобл.

Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М.І. Глінкі (1970), Дзяржаўны музычна-педагагічны інстытут імя Гнесіных па спецыяльнасці «харавое дырыжыраванне» ў Маскве (1975), Беларускую дзяржаўную кансерваторыю па спецыяльнасці «кампазіцыя», клас прафесара Я.А. Глебава (1984) і асістэнтуру-стажыроўку пад яго ж кіраўніцтвам (1986).

У 1973 г. А. У. Рашчынскі з аднадумцамі заснаваў першае ў Беларусі аддзяленне «Народна-харавыя спевы» ў Мінскім дзяржаўным музычным вучылішчы імя М. І. Глінкі і больш за 35 год (з перапынкамі) з'яўляўся яго загадчыкам, падрыхтаваў больш за 40 прафесійных харавых дырыжораў.

У 1976–1979 гг. працаваў музычным кіраўніком і артыстам харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» Белдзяржфілармоніі; у 1989–1994 гг. з'яўляўся мастацкім кіраўніком вакальнага ансамбля «Купалінка» гэтай жа ўстановы. Прымаў удзел у стварэнні канцэртнай праграмы фальклорнага ансамбля Белтэлерадыёкампаніі «Жывіца» пад кіраўніцтвам знакамітай спявачкі Валянціны Пархоменка. У 1991 г. арганізаваў самабытны гурт-капэлу «Агмень», асновай рэпертуару якога сталі аўтэнтычныя народныя песні розных рэгіёнаў Беларусі.

У творчасці імкнуўся да народнай музычнай мовы і адыходу ад традыцыйных прафесійных прыёмаў яе ўвасаблення, надаючы асаблівую ўвагу фальклору як першакрыніцы раскрыцця нацыянальнай псіхалогіі.

Аўтар кантаты «Дзіцячыя песні» («Калыханка», «Забаўлянка», «Дражнілка«, «Грушка», словы народныя, 1982), сюіт для народных інструментаў («Крывы танец», «Вяселле», «Свята», 1986), «Калядныя ігрышчы» («Віншаванне», «Цярэшка», «Каза», 1987), фантазій «З рога ўсяго многа» (1987), для ансамбля народных інструментаў «Траіста музыка» (1975), хароў на народныя словы «Кацілася ды ясная зорачка», «Брацетка і сястрыца», «Бульба», харавой сюіты «Веснавыя карагоды» і інш.; вакальна-інструментальнай музыкі для акадэмічных калектываў (араторыя «Смутак памяці»), музыкі для лялечнага тэатра («Сказка о царе Салтане»); апрацовак народных песень для разнастайных выканальніцкіх груп, дзе галоўную ролю адыгрывае «спеўны гурт» («За рэчкаю, за ракой», «А ў ляску, ляску», «З-пад белага камушка», «Ой, там на гарэ») і інш.

Збіраў песенны і музычна-інструментальны фальклор (запісы, апрацоўкі народных песень складаюць больш за 400 адзінак). Выдаў зборнік «Народныя песні з радзімы Ніла Гілевіча» (65 твораў) (2011), разам з даследчыкам

і збіральнікам танцавальнага і музычнага фальклору Міколам Козенкам выдаў зборнікі народных танцавальных песень: «Вечар добры, дзяўчыначка» (1991), «У карагодзе мы былі», (1992), «Ідзём-пайдзём па вуліцы» (1992). Шэраг расшыфровак, пеpакладаў, апрацовак народнай танцавальнай музыкі змешчаны ў серыі «Танцавальная музыка Беларусі» ў зборніках «Ад Дзвіны да Прыпяці» (1991), «Музыка народных танцаў Гомельскага Палесся» (1997), «Музыка народных танцаў беларусаў» (2008) і інш.

Суаўтар праекта праграмы і хрэстаматыі па музычнаму выхаванню для беларускіх садкоў. Аўтар чатырох метадычных праграм для музычных вучылішчаў і каледжаў, больш за 45 выдадзеных артыкулаў. Кансультант абласных і Мінскага гарадскога цэнтраў культуры.

Эксперт Рады Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Быў адным з аўтараў (расшыфроўка народных мелодый і іх аранжыроўка) зборнікаў народнай інструментальнай музыкі серыі «Танцавальная музыка Беларусі» («Танцы Столінскага і Баранавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці», 1986; «Танцы Паазер’я», 1989; «Народныя танцы радзімы Якуба Коласа» /у дзвюх кн./, 1992; «Мелодыі Гарыні і Убарці» /у дзвюх кн./, 1993), якія выкарыстоўваліся інструментальнымі калектывамі на фальклорных фестывалях, у тым ліку на «Берагіні». Удзельнічаў у рабоце «круглых сталоў» па праблемах нацыянальнай культуры і выніках фестываляў «Берагіня».



***ЧОРНЫ Георгій Дзмітрыевіч***

*Харэограф, педагог, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь (1991).*

Нарадзіўся 27.04.1954 г. у в. Хатынічы Ганцавіцкага р-на Брэсцкай вобл.

Скончыў Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «харэаграфія» (1981).

У 1981–1985 гг. працаваў загадчыкам Цімошкаўскага і Дубіцка-Слабадскога сельскіх клубаў Мінскага раёна. У 1982 г. стварыў пры доме культуры в. Крупіца ансамбль танца «Крупіца» і стаў яго балетмайстрам. У 1985 г. ансамблю прысвоена званне «народны». Аснову рэпертуру ансамбля складаюць сцэнічна апрацаваныя беларускія танцы і харэаграфічныя кампазіцыі, створаныя на матэрыяле танцавальнага фальклору Цэнтральнага і іншых рэгіёнаў Беларусі: «Крупіцкая полька», «Слуцкая полька», «Боб малачу«, «Брычка», «Кавалі», «Ківуха», «На вечарынцы», «Пава», «Падсеван», «Церніца», «Вянок побытавых танцаў» і інш. Пры апрацоўцы аўтэнтычных першакрыніц і пошуку сцэнічных прыёмаў ансамбль і балетмайстар імкнуцца да захавання арыгінальнай аўтэнтычнай манеры выканання.

«Крупіца» падтрымлівае творчыя сувязі з Заслужаным аматарскім калектывам Рэспублікі Беларусь «Крупіцкія музы́кі» (стваральнік і кіраўнік заслужаны работнік культуры Беларусі Уладзімір Мікалаевіч Гром /1982–2008/), са студзеня 2009 г. – Наталя Леанідаўна Лісіца). Ансамблі вядуць сумесную канцэртную дзейнасць, як на сваёй радзіме, так і за яе межамі: прымалі ўдзел у «Дажынках» (г. Нясвіж, 1998; г. Слуцк, 2005; г. Кобрын, 2009; г. Маладзечна, 2011), «Славянскім базары ў Віцебску» (2002) і іншых буйных мерапрыемствах і святах. Калектыў пабываў ва многіх краінах Еўропы, прымаў удзел у Першай Сусветнай фальклорыядзе ў г. Брунсум (Нідэрланды, 1996). Ансамбль танца «Крупіца» з'яўляецца лаўрэатам 1-й ступені Мінскага абласнога конкурсу-фестывалю «Напеў зямлі маёй» (2010).

Паралельна з асноўнай працай у 1981–1984 гг. працаваў выкладчыкам на кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў па дысцыплінах «Мастацтва балетмайстара», «Класічны танец», «Народны танец». Супрацоўнічаў, як харэограф-пастаноўшчык, з Заслужанымі аматарскімі калектывамі краіны «Дударыкі» (г. Мінск, 2000), «Церніца» (г. Мінск, 1991–2017), ансамблем танца «Вяртанне» (2016). З адкрыццём у Крупіцкай школе мастацтваў харэаграфічнага аддзялення, працуе выкладчыкам харэаграфіі (з 1992 г.).

Распрацаваў дзве вучэбныя эксперыментальныя праграмы: «Беларускія карагоды і гульні», «Беларускі традыцыйны танец» (абедзьве 1995 г.).

Аўтар рэпертуарна-метадычных дапаможнікаў для харэографаў: «Туку-туку на таку» (2013), «Ходзіць пава па вуліцы» (2014), прыняў удзел у стварэнні нотнага дапаможніка для акампаніятараў «Музыка для ўрокаў беларускага танца» (сумесна з Н. Лісіцай, 2016). Перыядычна піша артыкулы ў раённую газету «Прысталічча» і рэспубліканскую газету «Культура». Спрабуе сябе ў паэтычна-песенным жанры і прозе.

Быў старшынёй журы харэаграфічных аглядаў і конкурсаў у Мінскім раёне (канец 1990-х гг.) і вобласці (г. Салігорск, 2003), членам журы Рэспубліканскага дзіцячага конкурсу (г. Мінск, 1986), тэлевізійнага конкурсу «Усе мы родам з дзяцінства» (1998); у якасці члена Рады экспертаў неаднаразова прымаў удзел у шматлікіх фестывалях і харэаграфічных конкурсах розных узроўняў. У іх ліку: IX Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва і конкурс традыцыйных танцаў «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 2016), Рэспубліканскі конкурс беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (праект маладзёжнай ініцыятывы; г. Мінск, 2016), адкрыты конкурс выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Ветразь» (г. Мінск, 2017) – абодва грунтуюцца на прынцыпах рэспубліканскай «Берагіні».

Узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства Культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2004), дыпломамі і Ганаровымі граматамі Мінскага райвыканкама, Мінскага аблвыканкама і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.



### *ШАУРА Рыгор Фёдаравіч*

*Мастацтвазнаўца, педагог, мастак, грамадскі дзеяч. Доктар мастацтвазнаўства (2009).*

Нарадзіўся 30.08.1944 г. у в. Малы Поўсвіж Лепельскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута імя М.С. Кірава (1971).

З 1977 г. працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, з 1993 г. – загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Ініцыіраваў стварэнне ва ўніверсітэце кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і адкрыццё спецыялізацыі «народныя рамёствы», па якой з 1990 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў. На сённяшні дзень кафедра падрыхтавала звыш за 700 спецыялістаў для сферы культуры.

Пад кіраўніцтвам Р.Ф. Шауры супрацоўнікамі кафедры распрацаваны і выкарыстоўваюцца ў вучэбнай практыцы адпаведныя праграмы па дваццаці спецыяльных дысцыплінах мастацкага цыкла. Упершыню ў вучэбны працэс уведзены курс «Самадзейнае выяўленчае мастацтва і народная творчасць».

Узначальвае на кафедры навукова-творчую лабараторыю «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», дзе вядзецца даследаванне беларускага традыцыйнага народнага мастацтва.

Р.Ф. Шаура – аўтар манаграфій, вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў, у ліку якіх: «Гаўрыіл Харытонавіч Вашчанка» (1978), «Міхась Засінец» (1981), «Беларускі пейзажны жывапіс» (1982), «Леанід Дударанка» (1984), «Альгерт Малішэўскі» (1988), «Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі» (1995), «Развіццё народнага выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі другой паловы XIX – пачатку XXI ст.» (2006);

«Народнае выяўленчае мастацтва: вучэб. праграма» (2013); «Народные художественные промыслы и декоративно-прикладное искусство: учеб. пособие» (2015); «Народное изобразительное искусство: учеб.-метод. пособие» (2012) і інш.

Ён таксама аўтар звыш 120 артыкулаў у навуковых часопісах, зборніках і энцыклапедычных выданнях, у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

Рыгор Фёдаравіч Шаура паспяхова спалучае педагагічную і навукова-творчую дзейнасць. Ён – член экспертнага савета па выяўленчым мастацтве Міністэрства культуры (з 2017 г.), член вучэбна-метадычнага савета па выяўленчым мастацтве Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (РІВШ) (з 2008 г.), член савета па

абароне доктарскіх і кандыдатскіх дысертацый БДУКМ (з 2010 г.), намеснік старшыні Праўлення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці (з 2008 г.).

З'яўляўся старшынёй групы экспертаў па дэкаратыўна-побытаваму мастацтву на V Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня», прымаў удзел у рабоце «круглых сталоў» па выніках шэрага фестываляў. Ініцыіраваў выраб сувенірнай прадукцыі студэнтамі кафедры для ўдзельнікаў «Берагіні», аказвае кансультатыўную і метадычную дапамогу кіраўнікам аматарскіх калектываў у рэалізацыі фестывальнага праекта «Дэкаратыўна-побытавае мастацтва».

Р.Ф. Шаура – лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2000), стыпендыят Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за выдатныя заслугі ў развіцці вышэйшай школы (2001).

*Тв.:* Самадзейнае мастацтва і яго асаблівасці на сучасным этапе // Выяўленчае мастацтва Беларусі: зб. арт. – Мінск, 1981; Спасцігаючы сутнасць прадметаў і з'яў // Мастацтва Беларусі. – Мінск, 1984. – № 2; Подготовка специалистов художественного профиля в системе непрерывного образования (на примере специализации «народные ремесла» Белорусского государственного университета культуры) // Выяўленчае мастацтва ў сістэме адукацыі: матэрыялы Рэспуб. навук. канф. (Віцебск, 2–3 лют. 1997 г.). – Віцебск, 1997; Изобразительное искусство в эстетическом воспитании младших школьников // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі: матэрыялы навук. канф. аспірантаў (Мінск, 14 мая 1997 г.). – Мінск, 1998; Перспектыва ў малюнку і жывапісе: вучэб. дапаможнік. – Мінск, 1999; Подготовка специалистов художественного профиля в системе непрерывного образования // Асновы мастацтва. – Мінск, 2000. – № 1; На шляху да прафесійнага майстэрства // Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы: матэрыялы Рэспуб. навук.-метад. канф. (Мінск, 1–2 лют. 2000 г.). – Мінск, 2000; Культурная палітыка і мастацка-адукацыйны працэс у Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя // Культура Беларусі: стан і перспектывы развіцця: зб. артык. – Мінск, 2001; Народнае мастацтва ў сістэме духоўнай культуры беларусаў // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – Мінск, 2002. – № 1; Народнае мастацтва ў кантэксце сучаснага даследавання // Народнае мастацтва: мінулае і сучаснае: матэрыялы Рэспуб. навук.-творч. канф. (Мінск, 19–20 мая 1999 г.). – Мінск, 2002; Эстетическое воспитание и художественное образование: проблема взаимосвязи (в соавторстве с В. М. Ушаковой) // Мастацкая адукацыя і культура. – Мінск, 2003. – № 1; Малюнак у навучальным працэсе: вучэб.-метад. дапаможнік. – Мінск, 2003; Штрыхі да генезісу і тыпалогіі народнага і інсітнага мастацтва // Інсітнае мастацтва Беларусі. Гісторыя. Суадносіны з народнай культурай. Сучаснасць. Тэндэнцыі развіцця: матэрыялы навук.-практ. канф. (Віцебск, 29–30 верасня 2000 г.). – Віцебск, 2003; Народныя асновы ў іканапісе і манументальна-рэлігійных формах жывапісу Беларусі мінулых часоў // Тэрмапілы: літаратурна-мастацкі і беларусазнаўчы часопіс. – Беласток (Польшча), 2004; Примитив в современной народной живописи Беларуси // Феномен наивного искусства и творчества аутсайдеров в наши дни и его проблемы: материалы Междунар. науч. конф. (Москва, 16–17 ноября 2004 г.). – М., 2004; Народные основы художественного оформления культовых храмов Беларуси на рубеже XIX – XX столетий // Наследие культуры: утраченные ценности, неиспользованные возможности: материалы Междунар. науч. конф. (Каунас, 14–15 октября 2004 г.). – Каунас, 2005; Творчасць Я. Драздовіча, У. Галубка, М. Філіповіча, Ю. Пэна, М. Шагала ў кантэксце ўзаемасувязі розных

мастацкіх культур // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24–26 мая 2004 г.). – Мінск, 2005; Эстэтычнае выхаванне дзяцей і моладзі ў сістэме дзейнасці цэнтраў народнай творчасці і дамоў рамёстваў // Мастацкая адукацыя і культура. – Мінск, 2006. – № 2; Народное искусство: историко-теоретические аспекты // Вестник Челябинской государственной академии культуры и искусств. – Челябинск, 2008. – № 2 (14); «И в пустыне расцветут сады». Наивное искусство в творчестве белорусского художника Федора Максимова // Наивное искусство и творчество аутсайдеров в XXI веке: история, практика, перспективы: материалы Междунар. науч. конф. (Москва, 16–17 ноября 2007 г.). – М., 2008; Народные основы художественного оформления белорусской батлейки XIX – начала XX в. // Актуальные проблемы мировой художественной культуры: материалы Междунар. науч. конф., посвященной памяти проф. У. Д. Розенфельда (Гродно, 8–9 апреля 2008 г.: в 2 ч.). – Гродно, 2008. Ч. 2; Наивное творчество Ивана Супрунчика в контексте современного развития народной деревянной скульптуры Беларуси // Наивное искусство и творчество аутсайдеров в XXI веке: история, практика, перспективы: материалы Междунар. науч. конф. (Москва, 16–17 ноября 2007 г.). – М., 2008; Народное искусство, его культурная обусловленность и проблема художественной коммуникации // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 5. – Мінск, 2008; Народные расписные ковры Беларуси как национальное культурное наследие // Культурное наследие в диалоге традиций: материалы форума писателей и культурологов Казахстана и Беларуси (Минск, 4 окт. 2009 г.). – Минск, 2009; Изобразительный примитив в рекламной вывеске Беларуси XIX – XX вв. // Искусство, дизайн, художественное образование: методы и эксперименты в образовательном процессе: материалы Междунар. науч. конф. (Каунас, 19–20 октября 2009 г.). – Каунас, 2009; Images of the World of Things in the Space of a Naive Painting and in Wooden Sculpture of Belarus at the turn of the XX – XXI Centuries // Личность, цвет, натура, музыка: материалы Междунар. науч. конф. (Даугавпилс, июнь 2009 г.). – Даугавпилс, 2009; Образы предметного мира в народных расписных коврах: сб. науч. статей. – Минск, 2011; Развіццё лубачнай народнай карцінкі ў XIX – пачатку XX ст. // Духоўныя асновы сучаснай культуры: праблемы захавання культурнай спадчыны: XVI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 26–28 мая 2010 г. У 2 т.). – Мінск, 2011. – Т. 2; Пути теоретического осмысления народного изобразительного искусства // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі: матэрыялы навук. канф. (3 снежня 2010 г. У 2 т.). – Мінск, 2011. Т. 1; Учебный рисунок (в соавторстве): учебно-методическое пособие. – Минск, 2012; Народное изобразительное искусство: учебно-методическое пособие. – Минск, 2012; Исследовательские приоритеты традиционного народного и наивного искусства в XX веке (взгляд в прошлое) // Феномен наивного искусства в наши дни и его проблемы: материалы Междунар. науч. конф. (Москва, 16–17.10.2013). – М., 2013; Проблема художественной коммуникации изобразительного и декоративно-прикладного искусства в современном обществе // Материалы VIII Междунар. конф. (8–12 мая 2013 г.). – Даугавпилс, 2014; Народные художественные промыслы и декоративно-прикладное искусство: учеб. пособие. – Минск, 2015.



### *ШУМІЛАВА Эмілія Іванаўна*

*Мастацтвазнаўца, крытык, педагог. Кандыдат мастацтвазнаўства (1967).*

Нарадзілася 07.01.1929 г. у г. Яраслаўль (Расія).

Скончыла Маскоўскае харэаграфічнае вучылішча (1947), тэатразнаўчае аддзяленне Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва (ГИТИС; 1954, г. Масква), аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук (г. Масква, 1967).

Салістка балета Навасібірскага тэатра оперы і балета (1947–1963); стваральнік, першы дырэктар і мастацкі кіраўнік Навасібірскага харэаграфічнага вучылішча (1957–1963), намеснік начальніка Навасібірскага абласнога ўпраўлення культуры (1963–1964), начальнік метадычнага аддзела Містэрства культуры РСФСР (1967–1971), навуковы супрацоўнік, загадчык аспірантурай Інстытута гісторыі мастацтваў Міністэрства культуры СССР (1971–1975), старшы выкладчык (1975–1981), дацэнт (з 1982) кафедры гісторыі і тэорыі культуры, загадчык кафедры рэжысуры масавых свят (1983–1992) Мінскага інстытута культуры; з 1993 г. дацэнт, прафесар (з 2000 г.) кафедры харэаграфіі Расійскай дзяржаўнай акадэміі славянскай культуры (Масква).

Даследавала праблемы балетнага тэатра, нацыянальнага ў мастацкай культуры, харэаграфічнай фальклАрыстыкі, музычна-харэаграфічнага выхавання дзяцей і моладзі. Сістэматычна выступала (з 1965 г.) на міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, семінарах (Азербайджан, Арменія, Беларусь, Венгрыя, Грузія, Латвія, Літва, Казахстан, Польшча, Расія, Украіна, Эстонія і інш.), з водгукамі і апаніраваннем дысертацый.

Аўтар звыш 200 публікацый, сярод якіх: манаграфіі – «Правда балета» (М., 1976), «Национальное своеобразие балета» (М., 1976), артыкулы ў рэспубліканскіх і замежных навуковых і навукова-папулярных выданнях, перыядычным друку; метадычныя дапаможнікі, вучэбныя праграмы для сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва Беларусі і Расіі («Тэорыя культуры», «Асновы драматургіі і сцэнічнага майстэрства», «Уводзіны ў гісторыю сусветнай мастацкай культуры» і інш.); буклеты, прысвечаныя спектаклям беларускага тэатра оперы і балета: «Стварэнне свету», «Жызель», «Шчаўкунчык», «Карміна Бурана».

З'яўляецца аўтарам сцэнарыяў дакументальных кінафільмаў («Беларусьфільм»): «Тревожусь и люблю» (1981), «Творческий портрет Юрия Траяна» (1982), «Танцует Саркисян» (1983); сцэнарыяў шэрага відэапраграм на Беларускім нацыя-

нальнм тэлебачанні, у іх ліку: «Бальны танец учора і сёння» (1983), «Магія натхнення» (1986).

Неаднаразова прадстаўляла СССР, Расію, БССР на міжнародных еўрапейскіх, рэгіёну Урала, Сібіры і Дальняга Усходу сімпозіумах прафесійнага і аматарскага мастацтва. З'яўлялася старшынёй і членам журы міжнародных беларускіх і рэспубліканскіх фестываляў народнай творчасці, сярод якіх: «Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), «Пярэзвы» (г. Бабруйск, 1992), «Беларуская полька» (г. Чачэрск Гомельскай вобл, 1993, 1994, 1996, 2000), «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1997, 1999) і інш.

Удзельнічала ў распрацоўцы канцэпцыі і рабоце экспертнага савета I і II Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.,1998–1999, 2001), прымала ўдзел у «круглых сталах» па выніках фестываляў. Па праблемах беларускай народнай харэаграфіі, фестывальнага руху ў краіне, выхавання падрастаючага пакалення беларусаў апублікавала шэраг артыкулаў у штотыднёвіках «Культура», «Літаратура і мастацтва», «Рэспубліка», у часопісе «Балет» (М., лістапад-снежань 2000).

Член CIOFF (з 1972 г.), Саюза тэатральных дзеячаў СССР (з 1953 г.), Расійскай Федэрацыіі (з 1992 г.), член Рэспубліканскай міжведамаснай камісіі па прысваенню ганаровых званняў «народны», «узорны самадзейны калектыў», навуковы кансультант Міністэрства культуры, рэспубліканскіх і абласных метадычных цэнтраў сістэмы культуры, адукацыі, прафсаюзаў Беларусі (1975–1992).

Больш 10 вучняў Э.І. Шумілавай маюць ганаровыя званні народных і заслужаных артыстаў, лаўрэатаў усесаюзных і міжнародных конкурсаў, абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Узнагароджана медаллю «Ветэран працы» (1997), знакам «Выдатнік вышэйшай школы СССР» (1988).



***ШЧАДРЫНА Эвеліна Вячаславаўна***

*Педагог, спявачка.*

Нарадзілася 22.03.1978 г. у г. Мінску.

Скончыла музычна-тэарэтычнае аддзяленне Мінскага музычнага вучылішча імя М.І. Глінкі (1997), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2002), атрымала спецыяльнасць «артыст фальклорнага ансамбля, кіраўнік фальклорнага ансамбля, выкладчык»; магістратуру (2003) і аспірантуру (2006) універсітэта па спецыяльнасці «мастацтвазнаўства».

З 2006 г. працавала выкладчыкам вакальна-харавых дысцыплін на кафедры беларускай народна-песеннай творчасці; у 2011 г. стала кіраўніком курса спецыялізацыі «этнафоназнаўства» кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ; з 2016 г. – старшы выкладчык БДУКМ. Стварыла гурт «Страла», які займаецца вывучэннем і пераймannем беларускай вакальнай і інструментальнай этнафоніі, з дапамогай фона- і відэаархіваў і выкарыстоўваючы матэрыялы, назапашаныя ў экспедыцыях.

Калектыў з’яўляецца ўдзельнікам і лаўрэатам шматлікіх канцэртаў, этнафестываляў і конкурсаў на Беларусі («Камяніца», «Таўкачыкі», «Меч Брачыслава» (2016), з 2011 г. – пастаянны ўдзельнік каляндарна-абрадавых свят Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і побыту (2011–2018) і за межамі краіны (Расія, Польшча, Літва, Латвія, Эстонія).

У 2012–2013 гг. «Страла» ўдзельнічала ў шэрагу канцэртаў фальклорна-акадэмічнага праекта «Колаварот» (музычнай містэрыі для народных галасоў і камернага аркестра), аўтарам і каардынатарам якога з’яўляецца кампазітар К. Яськоў: у зале «Верхні горад» з «Belarus modern orchestra» пад кіраўніцтвам К. Яськова, у малой зале Белдзяржфілармоніі і Віцебскай абласной філармоніі на фестывалі імя І.І. Салерцінскага з ансамблем салістаў «Класік-авангард» пад кіраўніцтвам У. Байдава, а таксама ў вялікай студыі Дома радыё з сімфанічным аркестрам Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі (дырыжор Ю. Караваеў) у праекце В. Кісценя «Канцэртная зала». Разам з ансамблем салістаў «Класік-авангард» «Страла» прымала ўдзел і ў Днях беларускай культуры ў Літве (Нацыянальная філармонія Літвы, г. Вільнюс), і шэрага філарманічных канцэртаў у Беларусі.

У 2015 г. «Страла» стала лаўрэатам І ступені вакальнага конкурсу «Як на рэчцы было на Фантанцы», з 2016 г. – стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У 2015 г. «Страла» ўдзельнічала ў Міжнародным фестывалі «Light. Move.Festival» у г. Лодзь (Польшча)

у праекце беларускага кампазітара С. Бадалава. Пастаянны ўдзельнік рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня». На VIII фестывалі калектыў атрымаў дыплом I ступені.

З 2004 г. Э. Шчадрына з'яўляецца салісткай гурту смыкавай і дударскай музыкі і этнічных спеваў «Ветах» (кіраўнік В. Калацэй) – лаўрэата міжнародных фестываляў у Францыі, Германіі, Харватыі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бельгіі, Швейцарыі, Расіі.

Э. Шчадрына ўзнагароджана дыпломамі фестываляў Еўрапейскага вяшчальнага саюза (Апатыя, Харватыя, 2012 г.; Раттвік, Швецыя, 2014). З 2017 г. з'яўляецца салісткай містэрыі К. Яськова «Кросны Макошы» для народнага голасу, струнных, раяля і ўдарных.

На фестываль «Берагіня» ўпершыню трапіла ў 2001 г., калі была студэнткай III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, і з таго часу прымала ў ім удзел у якасці гледача, госця, артыста і эксперта. Таксама ў якасці эксперта была запрошана на II – IV раённыя конкурсы выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Ветразь» (2016–2018).

# Кiраўнiкi творчых калектываў



***АГЕЙЧЫК Алена Ігнатаўна***

*Работник культуры.*

Нарадзілася 18.08.1965 г. у в. Гаць Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «народная творчасць», набыла кваліфікацыю «арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці, кіраўнік народнага хору» (1998).

З 1988 г. – на пасадзе дырэктара Гацкага сельскага клуба; з 2015 г. працуе загадчыкам сектара культурна-масавай работы дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культурна-дасугавай дзейнасці Акцябрскага раёна».

Вырасла ў акружэнні бабуль і матулі, якія заўсёды пелі, ці то на полі, ці за іншай работай. Па ўспамінах Алены ў доме бабулі Просі маладыя дзеўкі збіраліся на вячоркі, дзе пелі, вязалі, танчылі, а бабуля «іграла пад язык». Так з сяброўкамі і навучылася танчыць «Каваля», «Месяц», «Падыспань», «Польку», «Беднага», спяваць калядныя, велікодныя, талочныя, вясельныя, песні, прыпеўкі.

У 1988 г. Алена Ігнатаўна аб’яднала мясцовых вясковых спявачак у фальклорны гурт «Перазвоны», які стаў адным з вядучых мастацкіх калектываў раёна. У яго рэпертуары – мясцовыя песні, абрады, танцы, прыпеўкі, найгрышы, запісаныя ад старэйшых жыхароў вёскі. Музычнае суправаджэнне «Перазвонаў» – выдатны музы́ка Міхаіл Мікалаевіч Кандратовіч.

Гурт «Перазвоны» годна прадстаўляў раён на Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016). Гурту былі прысвечаны радыёперадача і дзве тэлеперадачы «Наперад у мінулае».

Разам з калектывам Алена Ігнатаўна імкнецца прывіць дзецям і падлеткам любоў да традыцыйнай культуры свайго краю, вядзе актыўную работу ў дзяржаўных установах адукацыі «Гацкі дзяцячы сад–базавая школа» і «Сацыяльна-педагагічны цэнтр в. Гаць», дзе навучае дзяцей спяваць і танчыць, далучаючы іх да фальклорнай спадчыны Бацькаўшчыны.

У 2018 г. Алена Ігнатаўна Агейчык абрана дэпутатам Ламавіцкага сельскага Савета дэпутатаў.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2013, 2015), Ганаровай граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта (2015).



***АДАМОВІЧ Тарэса Антонаўна***

*Работнік культуры, збіральнік фальклору.*

Нарадзілася 08.08.1959 г. у в. Танявічы Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл.

Скончыла Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «культурна-асветніцкая работа» (1983).

З 1986 г. мастацкі караўнік, з 1992 г. галоўны рэжысёр народнага тэатра народнай песні «Матуліна песня», які быў створаны ў 1986 г. на базе Жытамлянскага сельскага дома культуры Гродзенскага раёна; у 1992 г. атрымаў ганаровае найменне «народны». У розныя часы ў склад тэатра ўваходзіла да 50 чалавек: дзеці, дарослыя, сталыя людзі – жыхары в. Жытомля. На сённяшні дзень калектыў налічвае 21 удзельніка. За 30 гадоў існавання народнага тэатра народнай песні адноўлены і актыўна папулярызуюцца народныя святы Гродзеншчыны. Тарэса Антонаўна запісала і паставіла на сцэне звыш 15 фальклорных спектакляў, сярод якіх «Вялікдзень», «Купалле», «Куцця», «Святыя вечары», «Шчодрык», «Вячоркі», «Выправы ў войска». Велікодны і калядны абрады паказаны ў тэлепраграме «Запрашаем на вячоркі». У аснову сцэнарных распрацовак пакладзены непаўторны каларыт мясцовай абраднасці, песенны і гутарковы тэкст у пастаноўках зберагае мясцовы дыялект жытамлянцаў, песні не сапсаваны сучаснай апрацоўкай.

У 1992–1995 гг. збірала фальклор у Шчучынскім і Воранаўскім раёнах. З тэатрам прымала ўдзел у фальклорных фестывалях «Вялікдзень» і «Каляды» Беларускага саюза фалькларыстаў у Траецкім прадмесці г. Мінска (1994, 1997, 1999), міжнародных велікодных сустрэчах «Канапелька» (2002–2004), кірмашы фальклору (2003; усе ў Польшчы), фестывалі «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў: беларусаў, палякаў, літоўцаў» (1998–2003), Усебеларускім фестывалі нацыянальных культур (г. Гродна, 1996–2016). Удзельнічала ў фальклорных тэлепраграмах г. Гродна, Беластока, Гданьска, Варшавы. Лаўрэат Другога свята гумару ў в. Аўцюкі Калінкавіцкага раёна (1992).

У верасні 2014 г. Т.А. Адамовіч прымала ўдзел у выязным пасяджэнні Праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын», якое было прысвечана Году гасціннасці. Калектыў «Матуліна песня» паказаў удзельнікам пасяджэння побытавыя танцы «Кракавяк», «Вальсок», «Падыспань», «Лысы», адноўленыя Тарэсай Антонаўнай па ўспамінах жыхароў в. Жытомля Гродзенскага раёна. У гэтай жа вёсцы адбыліся здымкі абраду «Зажынкі» Гродзенскім абласным тэлебачаннем

і абраду «Дажынкі» Першым нацыянальным тэлеканалам (2014). Гэтыя абрады адноўлены па матэрыялах, запісаных Т.А. Адамовіч ад мясцовых носьбітаў традыцыйнай культуры.

У 2011 г. імя Тарэсы Антонаўны ўвайшло ў энцыклапедыю «Хто ёсць хто ў Рэспубліцы Беларусь. Жанчыны Беларусі», а калектыў «Матуліна песня» і яго кіраўнік занесены ў энцыклапедыю «Беларускі фальклор» (г. Мінск, 2005). Тарэса Антонаўна – пераможца Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года–2014» у намінацыі «За духоўна-маральнае адраджэнне нацыі»; адзначана як «Лепшы работнік культуры Гродзенскага раёна» (2015).



**_БУРАК Ганна Мікалаеўна_**

*Народны майстар-самародак, спявачка, танцорка, вышывальшчыца, работнік культуры.*

Нарадзілася 15.08.1947 г. у в. Рычоў Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.

Напрыканцы 1970-х гг. ініцыіравала аднаўленне фальклорнага ансамбля «Дубравіца», які існаваў у в. Рычоў яшчэ ў 1950-я гг., а зараз ажыццяўляе сваю дзейнасць пры Рычоўскім цэнтры традыцыйнай культуры дзяржаўнай установы культуры «Жыткавіцкі раённы цэнтр народнай творчасці і арганізацыі вольнага часу насельніцтва». З 1999 г. Ганна Мікалаеўна з'яўляецца яго пастаянным кіраўніком; у 2005 г. калектыў атрымаў званне «народны». Да працы з калектывам кіраўнік падыходзіць грунтоўна і шматпланава. Вялікую ўвагу надае рэпетыцыйнаму працэсу, захаванню ў выконваемых творах мясцовага каларыту, працуе над зладжанасцю ансамблевага гучання, падтрымлівае добры псіхалагічны мікраклімат. Паважліва ставіцца да зберажэння і трансляцыі мясцовай традыцыйнай спадчыны, спрыяе яе захаванню і лічыць яе сапраўдным духоўным скарбам сваёй малой радзімы. Такія ж адносіны прывівае маладым удзельнікам ансамбля «Дубравіца» і дзецям – удзельнікам дзіцячага вакальнага калектыву-спадарожніка «Дубравіцы» – «Усмешка» (створаны ў 1999 г.). Дзіцячы калектыў – уладальнік дыплома I ступені рэгіянальнага фестывалю Палескага краю «Грай, гармонік» (г. Ельск, 2012), дыпломаў I (2002) і II (2013) ступеняў раённага фестывалю дзіцячай творчасці «Палеская вясёлка» (г. Жыткавічы).

У рэпертуары ансамбля прадстаўлены ўсе асноўныя жанры мясцовай песеннай традыцыі – каляндарныя і сямейна-абрадавыя, а таксама пазаабрадавыя, якія ў г. Рычове называюць «лесавыя» (суправаджаюць нарыхтоўку сена, збор ягад і грыбоў) і «застольныя» (песні celebrating рознай тэматыкі, якія выконваюцца зараз пераважна ў застоллях).

Дзейнасці народнага фальклорнага ансамбля «Дубравіца» пад кіраўніцтвам Ганны Мікалаеўны была прысвечана асобная праграма ў межах праекта «Беларуская этнафонія» (канал «Культура» Беларускага радыё). Запіс праграмы ў 2015 г. папоўніў калекцыю «Фонапомнікі» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Калектыў адзначаны дыпломамі абласных і рэспубліканскіх фестываляў – VII і VIII Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012, 2014); IV Каляднага рэгіянальнага фестывалю «Каляднае сузор'е фальклору» (г. Светлагорск, 2017); VI рэгіянальнага фестывалю песеннага мастацтва «Гэты дзіўны спеў з глыбінь народных» на прыз мастацкага кіраўніка Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прафесара, народнага артыста Рэспублікі Беларусь М.П. Дрынеўскага (г.п. Лельчыцы, 2017). Калектыў выступаў з канцэртнымі праграмамі для ўдзельнікаў расійска-беларускай навукова-практычнай канферэнцыі на тэму «Навечно в памяти народной. Патриотизм в системе обеспечения безопасности Союзного государства России и Беларуси» (в. Пагост Жыткавіцкага р-на, 2016), выязнога пасяджэння Рэспубліканскага савета па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (г. Тураў, 2017).

Народны фальклорны ансамбль «Дубравіца» – носьбіт элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі», які ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (2016).

Ганна Мікалаеўна мае таксама асабістыя творчыя дасягненні: уладальніца ганаровай граматы I ступені рэгіянальнага фестывалю Палескага краю «Грай, гармонік» (г. Ельск, 2001), лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю «Мінскі гармонік» (г. Мінск, 2001), дыпламант III ступені агляду-конкурсу «Пяю табе мая Белая Русь» (г. Мінск, 2004), дыпламант конкурсу «Іграй гармонь» (г. Любань Мінскай вобл., 2010), дыпламант глядацкіх сімпатый II фестывалю этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» (аг. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на, 2012), удзельніца намінацыі «Пякарскае майстэрства "Беларускі каравай"» абласнога свята сямейнай творчасці «Семь-Я» (г. Рэчыца, 2017).

За поспехі ў працы Г.М. Бурак узнагароджана граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Жыткавіцкага райвыканкама (2012), ганаровай граматай установы «Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці» (2016), Ганаровай граматай Жыткавіцкага раённага Савета дэпутатаў (2016).



***БЯЖКОЎ Дзмітрый Гаўрылавіч***

*Харавы дырыжор, народны музы́ка.*

Нарадзіўся 11.11.1963 г. у в. Янова Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў Беларускі ўніверсітэт культуры (2002) па спецыяльнасці «народная творчасць, харавая музыка», спецыялізацыя – «кіраўнік народнага хору, выкладчык харавых дысцыплін».

У 1985–1990 гг. працаваў настаўнікам музыкі і спеваў у СШ № 1 г.п. Акцябрскі, з 1990 г. – загадчык аўтаклуба аддзела культуры, з 1992 г. – старшы навуковы супрацоўнік Акцябрскага метадычнага цэнтра, з 1994 г. – акампаніятар, загадчык сектара па харавой дзейнасці Акцябрскага цэнтра дасуга, з 2002 г. да сённяшняга часу – хармайстар народнага хору работнікаў культуры Акцябрскага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама, з 1998 г. – музычны кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу», створанага Дзмітрыем Гаўрылавічам разам з сястрой Вольгай Гаўрылаўнай Дульскай і настаўнікамі раённай гімназіі ў 1995 г.

За час працы з калектывам Дзмітрый Гаўрылавіч праявіў сябе як таленавіты арганізатар, адукаваны і адказны спецыяліст. Ён добра валодае музычнымі інструментамі – баянам і гармонікам, рознымі ўдарнымі і шумавымі інструментамі, майстэрствам апрацоўкі музычнага матэрыялу, добра ведае методыку работы з аматарскім дзіцячым калектывам.

У сваёй прафесійнай дзейнасці асноўны ўпор робіць на фарміраванне эстэтычнага густу ўдзельнікаў ансамбля «Рудабельскія зорачкі», на развіццё цікавасці да музычна-абрадавай культуры Рудабельскага краю. Яго заняткі насычаны не толькі практычнымі заданнямі, а і гістарычнымі даведкамі, цікавымі і карыснымі аповедамі. Сваёй галоўнай задачай Дзмітрый Гаўрылавіч лічыць адраджэнне, захаванне і папулярызацыю традыцыйнага мастацтва Бацькаўшчыны.

Пастаянна працуе над папаўненнем рэпертуару ансамбля, зрабіў для яго шмат аранжыровак мясцовых народных песень і інструментальных найгрышаў. Вялікую ўвагу надае падбору фальклорнага матэрыялу з улікам узроставых асаблівасцей удзельнікаў калектыву.

З 1994 г. працуе хармайстрам народнага хору работнікаў культуры, які з’яўляецца ўдзельнікам усіх раённых, абласных і рэспубліканскіх культурных

мерапрыемстваў. На абласным конкурсе харавога мастацтва імя заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Т.К. Лапацінай хор атрымаў дыплом III ступені (2017).

Д.Г. Бяжкоў – музычны кіраўнік акампаніруючай групы конкурсу танцавальных пар Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016). Гэтая група прымала ўдзел і ў суправаджэнні Рэспубліканскага конкурсу беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» – прадаўжальніцы ідэй «Берагіні» (г. Мінск, 2015). Музычная праграма суправаджэння конкурсу танцавальных пар і салістаў запісана на Беларускім радыё (2016).

Узнагароджаны Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама за шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах (2013), Ганаровай граматай Акцябрскага аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2018).



***БЯЛЬКО Ала Мікалаеўна***

*Педагог, спявачка, работнік культуры, народны музы́ка, збіральнік фальклору.*

Нарадзілася 02.05.1972 г. у в. Навінкі Калінкавіцкага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Лоеўскае педагагічнае вучылішча (1991) па спецыяльнасці «настаўнік пачатковых классаў», Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (2005), атрымала кваліфікацыю «выкладчык».

З 1991 г. – настаўнік пачатковых класаў ва ўстанове адукацыі «Валосавіцкі дзіцячы сад-сярэдняя школа», з 2010 г. – мастацкі кіраўнік узорнага (2005) фальклорнага ансамбля «Некрашынка» (1998 – 2010 гг. – мастацкім кіраўніком калектыву была Кульбіцкая Валянціна Цярэнцьеўна) Валосавіцкага сельскага дома народнай творчасці.

Спяваць Алу Мікалаеўну навучылі яе бабуля Алена і маці Ніна, разам з сям'ёй яны збіраліся і спявалі, у тым ліку песні каляндарных і сямейных абрадаў і народныя пазаабрадавыя, сама навучылася граць на баяне і акардэоне.

У ансамблі «Некрашынка» вучыць дзяцей самабытнаму мастацтву свайго краю. Арганізуе сустрэчы і гутаркі з носьбітамі мясцовага фальклору, збірае, запісвае і вывучае абрады, песні, танцы, «танцавальны этыкет» і перадае свае веды. Удзельнікі калектыву выконваюць народныя побытавыя танцы (парныя і гуртавыя – «Месяц», «Кракавяк», «Сербіянку», «Польку па-мясцоваму», «Лявоніху», «Падыспань», «Ва саду лі», «Суботу»); песні калядныя («Го-го-го каза»), траецкія («Ой, Троіца, Троіца, прысвятая Багародзіца»), вясельныя («Ой, нясіце ж каравай нясіце», «Дай у нашага свата»); пазаабрадавыя («Зелянее жыта», «Прабачайце госцейкі, ды на маю чэсць»), жартоўныя («Камар лазню тапіў»).

Дзіцячы ўзорны фальклорны ансамбль «Некрашынка» пад кіраўніцтвам А. М. Бялько – удзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх мерапрыемстваў. У іх ліку: рэгіянальны агляд-конкурс сельскай мастацкай самадзейнасці (г. Калінкавічы, 2013); абласны агляд-конкурс сямейнай творчасці «Жывіце ў радасці», г. Гомель (2011, дыплом лаўрэата І ступені за зберажэнне і папулярызацыю нацыянальных традыцый сямейнай творчасці; (2015, дыплом лаўрэата І ступені за зберажэнне нацыянальных сямейных традыцый, развіццё песеннай творчасці і выканальніцкага майстэрства), Рэспубліканскі конкурс беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск, 2015, 2017); абласны конкурс выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» (г. Калінкавічы, 2015, 2016, 2017 г.);

лаўрэаты турніру дзіцяча-маладзёжных фальклорных калектываў (2010, 2014, 2016) і дыпламанты конкурсу пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (2006, 2008, 2012) Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».

Узнагароджана Ганаровымі граматамі аддзела адукацыі, спорту і турызму (2009, 2017), падзякай аддзела ідэагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2016).



***ВЕЖНАВЕЦ Іван Пятровіч***

*Народны музы́ка, майстар лозапляцення, работнік культуры.*

Нарадзіўся 25.11.1945 г. у в. Майсееўка Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў Майсееўскую школу-сямігодку (1960), школу кінамеханікаў (Мінск, 1963).

Працаваў па прафесіі ў роднай вёсцы (з 1964 г.), 18 гадоў – дырэктарам Майсееўскага сельскага клуба (1990–2008). Быў і акампаніятарам. Па яго ініцыятыве ў 1985 г. створаны фальклорны гурт «Сяброўкі», які і цяпер дзейнічае пры ўстанове (кіраўнік калектыву – дачка Валянціна Іванаўна). Сам Іван Пятровіч даўно на заслужаным адпачынку (з 2008 г.). Яго, як непраўзыдзённага народнага музыку, запрашалі на вяселлі, вечарыны, хрэсьбіны: «Якую бабы песню пелі, такую і іграў. А любілі спяваць найбольш народную, сваю: ”Ой, у лесе, ў лесе”, “Бацька едзе па лучыну”, “Пойдзем, сястрыца”, “Ой, ночанька цямнюсенька”, “Ой, ды ў нашым сяле ды свадзьба будзе”... Іграў танцы, якія ведалі і любілі танцаваць на любых бяседах: “Падыспан”, “Кракавяк”, “Лысы”, “Субота”. Цяпер іграю менш, калі з’яўляецца настрой, больш для душы». У калекцыі Івана Пятровіча налічваецца 8! гармонікаў і адзін баян.

Гурт, які ўзначальваў Іван Пятровіч, прымаў удзел у Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999, 2001).

Таксама займаецца лозапляценнем, навыкі якога пераняў ад бацькі. Калі працаваў у клубе, стварыў гурток па лозапляценню «Чароўны пруцік». Навучыў гэтаму рамяству 15 хлопчыкаў, у тым ліку і свайго ўнука. Вырабы яго вучняў выстаўляліся на «Рудабельскім кірмашы» падчас фестывалю «Берагіня» (2004, 2006), удзельнікі майстэрні ўзнагароджаны дыпломам за захаванне і папулярызацыю народных традыцый свайго краю. Творы самога майстра прадстаўлялі Акцябршчыну на абласных і рэспубліканкіх святах народнага мастацтва.

Любоў да мастацкіх традыцый роднай зямлі перадалася дзецям – сыну Аляксандру, дачкам, Валянціне і Тамары, якія працуюць у Майсееўскім сельскім клубе.

Узнагароджаны трыма медалямі «Ударник труда» (1975, 1978, 1979), медалём «Ветэран працы» (2005), граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2005), граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта ў намінацыі «Дынастыі» (2017).



## *ГАЛАВАЧЭНКА Святлана Мікалаеўна*

*Аграном, работнік культуры, збіральнік фальклору.*

Нарадзілася 12.06.1965 г. у в. Старына Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.; з 1976 г. жыве ў в. Рассвет Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум (Жлобінскі р-н Гомельскай вобл.) па спецыяльнасці «аграном» (1987).

У 1985–1993 гг. – выхавальнік дзіцячага садка, з 2005 г. – брыгадзір калгаса імя Леніна (Акцябрскі р-н). З 2011 г. – мастацкі кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Цярэшкавы шчодрыкі» (стваральнік калектыву І.Ф. Дземенкавец) Расветаўскага культурна-спартыўнага цэнтра Акцябрскага раёна. У рэпертуары калектыву абрадавыя і пазаабрадавыя песні, карагоды, танцы, гульні, народная проза, найгрышы сваёй мясцовасці; дзеці займаюцца вырабам выцінанак, пляценнем паясоў, насценных пано; разам з дарослымі святкуюць «Каляды», «Купалле», «Тройцу».

Святлана Мікалаеўна арганізуе для сваіх выхаванцаў краязнаўчыя экскурсіі, фальклорныя экспедыцыі ў навакольныя вёскі, дзе назапашваюцца матэрыялы, які потым уваходзяць у рэпертуар «Цярэшкавых шчодрыкаў».

Калектыў – дыпламант ІІІ ступені (2012), лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2014); лаўрэат канцэрта-прэзентацыі «Фальклор беларускай глыбінкі» ў рамках прэзентацыі Рэспубліканского фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г. Мінск, 2012). Узнагароджаны спецыяльным прызам VII Рэгіянальнага фестывалю «Грай гармонік» (г. Ельск, 2012); танцавальная пара калектыву ў 2017 г. атрымала дыплом ІІІ ступені на Рэспубліканскім конкурсе беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск) і дыплом І ступені на VIII абласным конкурсе выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» (г. Калінкавічы, 2017).

Узнагароджана Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2014, 2015) за шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах.



***ДУЛЬСКАЯ Вольга Гаўрылаўна***

*Філолаг, педагог, народны музыка.*

Нарадзілася 10.10.1954 г. у в. Янова Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла філалагічны факультэт Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н.К. Крупскай (1987).

Працоўную дзейнасць пачала ў 1978 г. музычным кіраўніком у дзіцячым садку № 1 г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці. З 1991 г. – намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Акцябрскай сярэдняй школы № 3, выкладчык музыкі і спеваў. Зараз працуе выкладчыкам музыкі і спеваў у Акцябрскай раённай гімназіі.

Нарадзілася ў таленавітай настаўніцкай сям'і, дзе бацька Гаўрыл Лявонцьевіч Бяжкоў добра іграў на гармоніку, а маці Зінаіда Іванаўна спявала. Яны і прывілі сваім дзецям любоў да народнай песні, музыкі.

В.Г. Дульская – стваральнік і мастацкі кіраўнік (з 1998 г.) дзіцячага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі», арганізаванага ў СШ № 3 (дырэктар Любоў Сяргееўна Шэйка), з 2003 г. функцыянуе на базе дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу» (музычны кіраўнік ансамбля Д.Г. Бяжкоў). У 2000 г. калектыву нададзена найменне «ўзорны». На базе кружка інструментальнай музыкі (арганізаваны ў 1995 г.) у 1998 г. стварыла ансамбль народнай музыкі «Брачынскія музыкі», які забяспечваў музычнае суправаджэнне фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі». У рэпертуары калектываў – абрадавыя і пазаабрадавыя песні, карагоды, танцы, гульні, найгрышы, народная проза Акцябрскага раёна.

Больш за 20 год Вольга Гаўрылаўна актыўна ўкараняе ў практыку сваёй работы з калектывамі ўсё здабытае, праводзіць мэтанакіраваную дзейнасць па аднаўленню, захаванню і папулярызацыі народнай спадчыны сярод школьнікаў.

«Рудабельскія зорачкі» атрымалі прызнанне ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. Ансамбль узнагароджаны дыпломам ЮНЕСКА «За значны ўклад у захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі» (2008), стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (2009). Калектыў – пастаянны ўдзельнік, прызёр і дыпламант шматлікіх раённых, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных (Украіна, Расія, Германія) фестываляў, конкурсаў фальклорнага мастацтва, канцэртаў.

Ужо не адзін склад удзельнікаў «Рудабельскіх зорачак» і «Брачынскіх музыкаў» навучыла спяваць, танчыць, іграць на народных інструментах Вольга Гаўрылаўна. Некаторыя з іх пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў працуюць у розных установах культуры: так, Святлана Красоўская спявае ў Нацыянальным акадэмічным народным хоры Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча, Віталь Залатароў працуе спецыялістам у аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама і спявае ў калектыве «Рудабельская пацеха»; Кацярына Шэйка скончыла гістарычны факультэт і аспірантуру БДУ, уваходзіць у склад дырэкцыі па падрыхтоўцы Рэспубліканскага конкурсу беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск), вядучая Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня»; Юля Любанец пасля заканчэння магістратуры па спецыяльнасці «мастацтвазнаўства» (2013) і аспірантуры дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па спецыяльнасці «фалькларыстыка» (2017, навуковая кваліфікацыя «даследчык у галіне філалагічных навук») працуе ў Цэнтры ў аддзеле архітэктуры; Дар'я Шлапакова вучыцца на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

За шматгадовую добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах у 2014 г. Вольга Гаўрылаўна была ўзнагароджана Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама. Яна ўладальніца дыплома лаўрэата XII Рэспубліканскага конкурсу пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў VIII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» як кіраўнік танцавальнай пары – лаўрэата I ступені (2014), а таксама дыплома лаўрэата II ступені IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» як мастацкі кіраўнік узорнага фальклорнага ансамбля «Рудабельскія зорачкі» дзяржаўнай установы культуры «Акцябрскі цэнтр вольнага часу» (2016).



***ЖЫХ Чэслаў Альфонсавіч***

*Педагог, самадзейны кампазітар, канцэртмайстар, работнік культуры, папулярызатар музычнай спадчыны беларусаў.*

Нарадзіўся 06.11.1963 г. у г. Навагрудак Гродзенскай вобл.

Скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя Л.В. Луначарскага па спецыяльнасці «баян» (1991).

У 1983–1987 гг. працаваў выкладчыкам у Лідскай і Сольской музычных школах; у 1988–1989 гг. быў канцэртмайстрам ансамбля танца «Белыя росы» Гродзенскай абласной філармоніі. З 1992 г. працуе настаўнікам па класу баяна ў дзяржаўнай установе адукацыі «Смаргонская дзіцячая школа мастацтваў імя М.К. Агінскага». Яго вучні неаднаразова станавіліся лаўрэатамі конкурсаў рознага ўзроўню ў Беларусі, Літве, Польшчы, Італіі, Расіі.

Стварыў ансамбль народнай музыкі «Гулянак» (1995), у 2001 г. ансамблю прысвоена званне «ўзорны». Адраджэнне, захаванне і развіццё беларускай спадчыны – асноўная задача дзейнасці ансамбля. У рэпертуары творы этнічнага характару, мясцовага фальклору, а таксама народная музыка суседніх рэгіёнаў.

Пад яго кіраўніцтвам калектыў прымае ўдзел у розных мерапрыемствах, конкурсах і фестывалях не толькі раённага, але і абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага значэння. Сярод іх: IV і V Рэспубліканскія турніры дзіцячых фальклорных калектываў у рамках VI і VII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2010, 2012, дыпломы I ступені і дыплом за высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства і адданасць каранёвай традыцыі); XXVI Міжнародныя фальклорныя сустрэчы «Люблін – 2011» (Польшча), II абласны фестываль рэгіянальнага фальклору «Панямонне жыватворныя крыніцы» (2011, г. Гродна, дыплом II ступені), V Міжнародны фестываль «Народныя забавы» (2014, г. Познань, Польшча), IV Міжнародны фальклорны фестываль «Вена – 2015» (Аўстрыя); I Рэспубліканскі конкурс музычных інструментальных капэл традыцыйнага складу «Дудар» (у рамках IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» – дыплом за зберажэнне рэгіянальнага стылю інструментальнага выканальніцтва) і інш.

Ініцыіраваў стварэнне народнага ансамбля сучаснай музыкі «Субітоа», народнага сямейнага калектыву «Жых». Актыўны ўдзел прымае ў канцэртнай дзейнасці школы, горада ў якасці саліста-інструменталіста.

З'яўляецца аўтарам музычных твораў і аранжыроўшчыкам народнай музыкі. У 2008 г. падрыхтаваў да выдання зборнік п'ес для баяна. У 2013 г. у Польшчы ў выдавецтве ASTRA выйшлі аўтарскія творы «SCHERZO», «PRELUDIUM I FUGA», «MOMENT MUZYCZNY». Творы Чэслава Жыха «Том і Джэры», «Таксі-джаз», інтрадукцыя і фуга мі мінор (памяці А. Пьяцоллы) уключаны ў навучальныя дапаможнікі «Спецыяльны інструмент (баян, акардэон)» (Мінск, 2013); у 2015 г. выдавецтва «Каўчэг» уключыла ў «Дзіцячы альбом» экспромт на тэму М.І. Глінкі; «Канцэртны альбом юнага баяніста», выпуск 1 – «Музычны момант», «Скерца».

Ч.А. Жых – пастаянны член журы Міжнароднага конкурсу акардэоннай музыкі ў г. Вільні (2013, 2015, 2017).

Узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2011); з'яўляецца ўладальнікам прэміі А.І. Дубко «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў 2012 годзе»; неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі і дыпломамі ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, прэзідыума Смаргонскага раённага Савета дэпутатаў і раённага выканаўчага камітэта.



***ІВАХНЕНКА Алена Леанідаўна***

*Майстар народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, харэограф, работнік культуры.*

Нарадзілася 27.10.1960 г. у г. Жэзказган (Казахстан).

Скончыла музычную школу імя П.І. Чайкоўскага па класу фартэпіяна (г. Жанатас, Казахстан, 1977), факультэт «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва» Казахскага політэхнічнага інстытута імя У.І. Леніна (1983).

У 1991 г. вярнулася на радзіму сваіх бабулі і матулі – в. Пярэдзелка. Дзякуючы дапамозе загадчыцы аддзела культуры Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці І.А. Рудзько, метадыста па фальклору Лоеўскага аддзела культуры В.У. Берасневай і метадыста па харэаграфічным мастацтве Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці М.Л. Тараканавай набыла новую прафесію і стала спецыялістам у сферы культуры.

Працавала мастацкім кіраўніком Пярэдзелкаўскага цэнтра культуры і вольнага часу (1993–2018), дзе ў 2004 г. стварыла дзіцячы ансамбль народных побытавых танцаў «ФЭСТ». У 2005 г. ансамбль «ФЭСТ» упершыню прымаў удзел у абласным конкурсе танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў, у 2008 г. адна пара заняла 2-е месца на абласным конкурсе і была адабрана на «Берагіню–2010», дзе атрымала 1-е месца. У наступныя гады ансамбль з нязменным поспехам прымаў удзел ва ўсіх Рэспубліканскіх фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня»: у 2012 і 2014 гг. – у конкурсах пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў атрымалі 2-е месца, у 2016 г. – 3-е месца за ўдзел у кірмашы майстроў. У 2015 г. ансамбль «ФЭСТ» прыняў удзел у конкурсе выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск).

У 2017 г. стварыла калектыў народна-бытавога танца «ЖЫ́ВА» пры дзяржаўнай установе культуры «Гарадскі цэнтр культуры г.п. Лоеў», які таксама атрымаў вядомасць у вобласці, заняўшы 1-е і 3-е месцы на VIII абласным конкурсе танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» і 1-е месца сярод ансамблей народных побытавых танцаў на VII адкрытым раённым свяце фальклору «Траецкі карагод на Веткаўшчыне» (г. Ветка, 2017).

Засвоіўшы майстэрства пашыву і вышывання беларускага народнага касцюма, пляцення паясоў на «вёртышках», вырабу лялькі-мотанкі, А.Л. Івахненка свае веды ўкараняла ў практыку творчых калектываў, а таксама прадстаўляла свой мастацкі вопыт (вырабы ДПМ) на рознага ўзроўню выстаўках.

У 2017 г. Алену Леанідаўну запрасілі як майстра народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў сямейны клуб «Нашчадкі Лоя» (грамадскае аб'яднанне, кіраўнік Л.М. Сямашка), з 2018 г. удзельнікі клуба пад яе кіраўніцтвам сталі навучацца беларускім народным побытавым танцам.

За шматгадовую плённую працоўную дзейнасць А.Л. Івахненка адзначана Ганаровымі граматамі Гомельскага абласнога савета дэпутатаў (1999, 2001), галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта (2014), Лоеўскага раённага выканаўчага камітэта «Лепшая па прафесіі» (1995, 2000), падзякай Лоеўскага раённага выканаўчага камітэта (2015).



**_КАБАЦКАЯ Святлана Юр'еўна_**

*Педагог, збіральнік і папулярызатар фальклору.*

Нарадзілася 30.03.1984 г. у г. Полацку Віцебскай вобл.

Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава па спецыяльнасці «музычнае мастацтва» (2007).

Працуе ў дзяржаўнай установе адукацыі «Палатоўская дзіцячы сад–базавая школа Полацкага раёна»: з 2003 г. – настаўнік музыкі, з 2010 г. – кіраўнік дзіцячага фальклорнага калектыву «Знічка», створанага калектывам настаўнікаў у 2003 г.; у 2008 г. атрымаў найменне «ўзорны».

Заняткі Святланы Юр'еўны адметныя сваёй накіраванасцю на ўсебаковае гарманічнае развіццё асобы ў спалучэнні з прадстаўленнем умоў самарэалізацыі кожнаму вучню з ўлікам яго магчымасцей, інтарэсаў і жыццёвых планаў. Разам з вучнямі яна прымае ўдзел у школьных святах, раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і фестывалях.

Дзеці не толькі спяваюць і інсцэніруюць абрады, але і іграюць на музычных інструментах: дудзе, акарыне, гармоніках, скрыпцы, цымбалах, жалейках, дудачках, шумавых і г.д. А яшчэ вельмі спрытна выконваюць беларускія народныя танцы, прычым менавіта свайго рэгіёна. Займаюцца саломка- і лозапляценнем, вышыўкай, разьбой па дрэве, выцінанкай. Заняткі ў калектыве «Знічка» праходзяць у форме, максімальна набліжанай да традыцыйнай перадачы ведаў, уменняў і навыкаў вусным шляхам: традыцыйныя спевы засвойваюцца «з голасу», танец развучваецца «ў танцы», абрад пражываецца праз уключэнне ў яго кантэкст. Мелодыя, спеў, гучанне музычных інструментаў і рытмаў, скокі, танец, вопратка, атрыбуты, маскі і, нарэшце, адпаведнае прыроднае асяроддзе, пара года, рэгіянальнае месцазнаходжанне, якое фарміруе мясцовы мастацкі каларыт – усё гэта існуе ў сінкрэтычнай суцэльнасці, адзінстве мастацкай непадзельнасці са старажытнымі вераваннямі, светапоглядам, эстэтыкай, этыкай, мараллю народа. Найбольш відавочна выяўляецца гэтая непадзельнасць у традыцыйных святах і абрадах. Фальклорны калектыў з'яднаў вучняў, настаўнікаў і бацькоў у адзіны калектыў. Бацькі актыўна прымаюць удзел у зборы аўтэнтычных твораў рэгіёна і нібыта нанова адкрываюць для сябе цудоўны свет фальклору.

На працягу 2010–2017 гг. створаны тэкставыя альбомы з нотнымі расшыфроўкамі, куды ўвайшлі каляндарныя песні Полацкага раёна: цыкл вясенніх

свят (масленічныя песні, вясеннія песні-заклічкі, велікодныя, «Юр'я»; святы «Масленіца», «Саракі», «Гуканне вясны», «Вялікдзень»); цыкл летніх свят (купальскія, жніўныя песні, «Зялёныя святкі», «Траецкі кірмаш», «Купалле»); цыкл восеньскіх свят («Багач», «Пакровы», «Дзяды»); цыкл зімовых свят («Піліпаўскія вячоркі», «Каляды», «Стрэчанне»). Запісы песень зроблены ад жыхароў вёсак Полацкага раёна: Іванковіч П.С. (1925 г.н. з в. Заазер'е), Лісоўскай Н.Ф. (1934 г.н. з в. Заазер'е); Гусаравай Г.С. (1930 г.н. з в. Заазер'е), Пісюковай В.Ул. (1935 г.н. з в. Багатырскае), Храноўскай Н.Т. (1935 г.н. з в. Палата), Бычковай З.Я. (1930 г.н. з в. Палата), Бліновай А.С. (1930 г.н. з в. Стадола), Маскалёвай Н.П. (1937 г.н. з в. Гомель); карагоды, гульні, песні ад Вышынскай Т.К. (1935 г.н. з в. Шпакоўшчына); танцы, гульні, абрады ад Каланды Я.М. (1935 г.н. з в. Палата); музыка для ансамбляў гарманістаў ад Багданава Я.І. (1946 г.н.), Падгайскага В.П. (1926 г.н.), Андрон Ул.В. (1917 г.н.) і шмат іншых жывых носьбітаў фальклору.

Заняткі ў фальклорным калектыве спрыяюць падрыхтоўцы дзяцей да свядомага, зацікаўленага ўдзелу ў мясцовых святах, рытуалах, абрадах земляробчага календара і сямейна-родавага цыкла.

«Знічка» пад кіраўніцтвам С.Ю. Кабацкай – пастаянны ўдзельнік раённых, абласных, рэспубліканскіх аглядаў, конкурсаў, фестываляў народнай творчасці, дзе калектыў шматразова станавіўся лаўрэатам і дыпламантам. У іх ліку Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2006–2016), абласны агляд-конкурс фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Ад прашчураў – да зор» (2006–2018), абласное свята-конкурс народных талентаў «Іграй гармонік» (2010), абласны тур X Міжнароднага дзіцячага форуму «Зялёная планета» (2012–2015), Рэспубліканская выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці вучняў «Калядная зорка» (2015) і інш.

Святлана Юр'еўна Кабацкая ўзнагароджана Ганаровай граматай упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама (2010) і граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2014).



### *КАВАЛЁВА Надзея Канстанцінаўна*

*Работнік культуры, настаўнік, даследчык народнай спадчыны.*

*Нарадзілася* 05.09.1944 г. у в. Старына Расонскага р-на Віцебскай вобл.

У 1965 г. скончыла Полацкае педвучылішча, пасля чаго працавала настаўнікам пачатковых класаў Грачушынскай пачатковай школы Расонскага раёна (1965–1968). У 1974 г. скончыла Ленінградскі дзяржаўны інстытут культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «бібліятэкар-бібліёграф вышэйшай кваліфікацыі».

З 1991 г. звязала свой лёс з клубнай дзейнасцю, працавала спачатку мастацкім кіраўніком, а з 1998 г. – дырэктарам Янкавіцкага СДК.

З'яўляецца знаўцам самабытнай традыцыйнай спадчыны Расоншчыны, праводзіць вялікую экспедыцыйную работу, запісваючы абрады, песні, танцы, народную прозу. Праводзіць майстар-класы для замежных гасцей, семінары раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню для работнікаў культуры.

У 1978 г. на базе Янкавіцкага сельскага дома культуры заснавала фальклорны калектыў «Крыніца», які з 2004 г. носіць званне «народны аматарскі калектыў». Аснова яго рэпертуару – каляндарна-земляробчыя, сямейна-абрадавыя, пазаабрадавыя песні, побытавыя танцы. Захаванне аўтэнтычнай манеры спеўнай і танцавальнай традыцый Паазер'я вызначае творчую самабытнасць калектыву. Яго ўдзельнікі таксама валодаюць майстэрствам у разнастайных відах традыцыйнай культуры: вышыўка, ткацтва і інш. Калектыў праводзіць экспедыцыйную дзейнасць, дзякуючы якой рэпертуар абнаўляецца новымі творамі.

«Крыніца» пастаянна выступае перад гасцямі з блізкага і далёкага замежжа, папулярызуе фальклор Расоншчыны ў краінах Еўропы. Калектыў з'яўляецца лаўрэатам I Міжнароднага фэсту мастацтва галасавой імправізацыі «Фонтон-2012» (Кавалёвай Н.К. прысвоена званне – карыфей галасавых спеваў); III і VIII Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2004, 2014), IX Рэспубліканскага этнаграфічнага канцэрта «Фальклор беларускай глыбінкі» (2012); абласнога конкурсу вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца» (2012, 2015, 2017), абласных свят гісторыка-культурнай спадчыны, фальклору і рэдкіх традыцыйных рамёстваў «Букет Паазер'я» (2013) і «Масленічны разгуляй» (2015); раённага агляду мастацкай творчасці ў рамках II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (2005) і інш.

Паралельна са сваёй асноўнай працай Н.К. Кавалёва на працягу 11 гадоў з'яўляецца нязменным старшынёй Савета ветэранаў Янкавіцкага сельскага Савета.

Узнагароджана падзякай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за захаванне і папулярызацыю беларускай народнай творчасці; Ганаровымі граматамі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта за вялікі ўклад у захаванне нацыянальных традыцый (2008), за актыўны ўдзел у абласным свяце «Дажынкі–2010» і інш.; Ганаровымі граматамі Расонскага раённага Савета дэпутатаў і раённага выканаўчага камітэта за актыўны ўдзел у культурным жыцці Расонскага раёна, захаванне народных традыцый роднага краю



***КАТЛЯРОВА Святлана Міхайлаўна***

*Мастак-самародак, народная спявачка, работнік культуры.*

*Нарадзілася* 15.02.1970 г. у в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Пратасаўскую сярэднюю школу (1987).

Працавала ў Акцябрскім Райпо (1987–1988), лабарантам Пратасаўскай сярэдняй школы (1989–2009), з 2011 г. – мастацкі кіраўнік гурту «Купалінка» Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці (гурт арганізавала В.Л. Сілівончык, 1986), з 2014 г. – дырэктар гэтай установы культуры.

Гурт – удзельнік шматлікіх раённых, абласных, рэгіянальных мерапрыемстваў. «Купалінка» прымала ўдзел у Рэспубліканскім фестывалі гумару «Аўцюкі» (г. Калінкавічы, 2012), абласным свяце «Нашы карані» (г. Рагачоў, 1990), рэгіянальным фестывалі «Палескі трохкутнік» (г. Глуск, 2000), «Грай, гармонік» (г. Ельск, 2003, 2013; г. Рагачоў, 2017), абласных аглядах-конкурсах сельскай мастацкай самадзейнасці (г. Калінкавічы, 2003) і танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (г. Калінкавічы, 2005).

У 2013 г. калектыў удзельнічаў у тэлепраграме «Наперад у мінулае», у 2016 г. – у радыёпраграме «Беларуская этнафонія» канала «Культура» Белтэлерадыёкампаніі (г. Мінск).

У 2017 г. калектыў выступіў з канцэртнай праграмай на Міжнародным форуме «Турбізнес–2017» (г. Мінск, «БелЭкспа»).

Гурт «Купалінка» – пастаянны ўдзельнік Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2018).

С.М. Катлярова ўзнагароджана Ганаровай граматай «Дырэктар года» аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама (2016), Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Акцябрскага райвыканкама «Лепшы дарослы калектыў» (2016).



### *КЛІМОВІЧ Святлана Анатольеўна*

*Работнік культуры, педагог, збіральнік фальклору.*

*Нарадзілася* 13.05.1982 г. у в. Ячная Буда Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.

Скончыла з адзнакай Магілёўскае дзяржаўнае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай (2004), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «рэжысура народных свят» (2012).

Працоўную дзейнасць пачала ў 1999 г. на пасадзе мастацкага кіраўніка Новінскага сельскага дома культуры Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці, з 2015 г. – яго дырэктар.

Стваральнік і кіраўнік фальклорнага калектыву «Валошкі» (2000), у 2014 г. яму прысвоена найменне «ўзорны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь». Пад кіраўніцтвам С.А. Клімовіч калектыў мэтанакіравана займаецца вывучэннем свят і абрадаў свайго краю, мясцовых песенных і танцавальных традыцый. Шмат увагі Святлана Анатольеўна надае падбору рэпертуару, які ўзбагачаецца за кошт рознажанравых твораў, выяўленых у фальклорных экспедыцыях.

За час існавання калектыву створана некалькі тэматычных фальклорных праграм: «Гуканне вясны», «Святое Вялічка з чырвоным яічкам», траецкі абрад «Хадзіла Тройца каля ваконца», калядныя шчадроўкі. Асабліва любяць ўдзельнікі калектыву танцавальны фальклор. Сёння «Валошкі» могуць станцаваць «Лявоніху», «Падыспань», «Кракавяк», «Гапак», «Месяц», «Лысага», «Мікіту», «Каханачку», шматкаленную польку «Тадора», «Страданне», «На рэчаньку» і інш.

Гурт «Валошкі» – актыўны ўдзельнік раённых, абласных і рэспубліканскіх культурных мерапрыемстваў, уладальнік разнастайных узнагарод. У 2014 г. «Валошкі» прымалі ўдзел у фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня»; у 2017 г. танцавальныя пары калектыву «Валошкі» ўдзельнічалі ў III адкрытым конкурсе беларускіх народных танцаў «Ветразь–2017» (г. Мінск), дзе кіраўнік калектыву была ўзнагароджана падзячным лістом аргкамітэта конкурсу «За высокі прафесіяналізм, асабісты ўклад у захаванне і папулярызацыю нацыянальнай культуры Беларусі»; на Мінскім абласным фестывалі фальклорнага мастацтва «Фальклорная талака» (г. Барысаў, 2017) гурт выступіў з канцэртнай праграмай «Добры дзень, лета!» і быў узнагароджаны дыпломам «За беражлівае стаўленне да мясцовых песенных традыцый, плённую працу па захаванню і развіцю нацыянальнай культуры». У рамках фестывалю адбыўся III абласны конкурс побытавага

танца «Мінская кадрыля» (2017), дзе ўзорны фальклорны гурт «Валошкі» быў узнагароджаны дыпломам ІІ ступені «За высокі ўзровень выканання шматкаленнага танца». На XIV абласным фестывалі народнай творчасці «Напеў зямлі маёй», (г. Мар'іна Горка, 2017) «Валошкі» сталі лаўрэатамі ІІ ступені.

С.А. Клімовіч узнагароджана Ганаровай граматай Мінскага аблвыканкама (2017).



**КРУК Васіль Васільевіч**

*Народны музы́ка.*

Нарадзіўся 23.09.1953 г. у в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў 8 класаў Пратасаўсай СШ (1968), вывучыўся на трактарыста (1971), працаваў па набытай прафесіі (1974–1990), а потым узначаліў трактарную брыгаду калгаса імя У.І. Леніна (1991–2006).

З дзяцінства Васіль марыў навучыцца іграць на гармоніку. Шмат часу падлеткам праводзіў каля мясцовага гарманіста Васіля Сямёнавіча Крука, які заўсёды іграў на вяселлях і іншых вясковых святах. Майстэрства ігры на барабане пераняў ад бацькі Васіля Іванавіча, які быў знаным барабаншчыкам у акрузе, а спеўнае мастэрства – ад маці Надзеі Іосіфаўны. Сваяк Васіля Леанід Фёдаравіч Папоў, які бачыў захапленне падлетка музыкай, падараваў яму свой гармонік.

З 1986 г. з'яўляўся акампаніятарам і музычным кіраўніком гурту «Купалінка» Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці. Калектыў пад кіраўніцтвам В.В. Крука – неаднаразовы ўдзельнік і лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016); удзельнік абласнога свята «Нашы карані» (г. Рагачоў, 1990); рэгіянальных фестываляў «Палескі трохкутнік» (г. Глуск, 2000), «Грай, гармонік» (г. Ельск, 2003, 2013; г. Рагачоў, 2017); абласнога агляду-конкурсу сельскай мастацкай самадзейнасці (г. Калінкавічы, 2003); абласнога агляду-конкурсу пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў (г. Калінкавічы, 2005); Рэспубліканскага фестывалю гумару «Аўцюкі» (г. Калінкавічы, 2012). Удзельнік тэлепраграмы «Наперад у мінулае» (2013), радыёперадачы «Беларуская этнафонія» канала «Культура» Белтэлерадыёкампаніі (г. Мінск, 2016); у 2017 г. калектыў выступіў з канцэртнай праграмай на Міжнародным форуме «Турбізнес 2017» (г. Мінск, «БелЭкспа»).

Любоў да музыкі і песень Васіль Васільевіч прывіў сыну Віктару і дачцы Надзеі, якія раней выступалі разам з бацькам на канцэртах, былі ўдзельнікамі аматарскіх аб'яднанняў Пратасаўскага сельскага дома народнай творчасці, прымалі ўдзел у фестывалях фальклорнага мастацтва «Берагіня».

2018 г. у майстра-музы́кі юбілейны – у верасні ён адзначыць 65-годзе з дня нараджэння і 50-годдзе сваёй музычнай творчасці. Вялікая радасць і падарунак у юбілейны год для дзеда, што яго ўнучак Яраслаў таксама мае інтарэс да музыкі.



***КРУПСКАЯ Зінаіда Васільеўна***

*Народны мастак-самародак, спявачка і музы́ка, народны настаўнік, паэт-аматар, папулярызатар мастацкіх традыцый Вілейшчыны.*

Нарадзілася 24.01.1951 г. у в. Пагоннае Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.

З дзяцінства (адна або ў ансамблі з іншымі музы́камі) іграла на вяселлях у вёсках Вілейскага і суседніх раёнаў. Ад сваіх аднавяскоўцаў (Валянціны Бондар, 1941 г.н., Марыі Церах, 1941 г.н., Васіля Забенькі, 1935 г.н.), пераняла музычную, спеўную і танцавальную традыцыю рэгіёна. Добра іграе на музычных інструментах, валодае цудоўным голасам, памятае безліч твораў вуснай народнай творчасці.

Больш за 20 год вучыла дзяцей беларускаму народнаму танцу ў розных школах Вілейкі, у тым ліку па праграмах сацыяльна-педагагічнага праекта «Этнашкола». У паўсядзённай працы шырока выкарыстоўвала традыцыі народнай педагогікі. На ўрокі заўсёды апранала нацыянальны касцюм, каб падкрэсліць арганічную ўзаемасувязь усіх складнікаў нацыянальнай самасвядомасці, без якіх немагчыма зразумець сэнс, глыбіню і выразнасць народнай культуры. На базе вілейскай гімназіі праводзіла майстар-класы па народнаму танцу Вілейшчыны, куды прыязджала моладзь з г. Мінска, Маладзечна, Смаргоні.

Была стваральнікам і мастацкім кіраўніком фальклорных гуртоў «Вілякі» (1982) і «Чабарок» (2004). Вучні З.В. Крупскай шмат разоў прымалі ўдзел у Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня», наладжвалі свае фальклорныя фестывалі, праводзілі тэатралізаваныя прадстаўленні па сямейнай і каляндарнай абраднасці (вяселле, радзіны, свята калыханкі, свята казкі, гуканне вясны, калядныя, валачобныя і інш.).

Больш 15 год узначальвае пры гарадской бібліятэцы літаратурную гасцёўню «Натхненне», сама піша вершы, байкі, казкі, стварае музыку да вершаў сваіх сяброў. У 1990–2001 гг. друкавалася ў газетах «Шлях перамогі», «Літаратура і мастацтва», «Новы час», у часопісе «Першацвет». Яе творы змяшчаліся ў калектыўных зборніках «Пад шэпат хваляў Віліі», «Вілейскі звон», «Любы край, дарагі», «Адчыні сваё сэрца» і інш. Пабачылі свет некалькі яе кніжак казак і баек: «Краіна чароўных сноў» (2004), «Знойдзенае імя», «Казкі-дарылкі для жэўжыка Кірылкі», «Чаго не бывае на свеце» і інш. Напісаныя ёю песні перамагалі на конкурсах лепшых песень пра Вілейку.

Зараз Зінаіда Васільеўна на заслужаным адпачынку, але працягвае папулярызаваць народную культуру. Яна праводзіць майстар-класы па народнаму танцу на фальклорных святах у Вілейскай гімназіі № 2, удзельнічае ў мерапрыемствах з самабытнымі музы́камі Вілейшчыны і іншых рэгіёнаў рэспублікі.

Зінаіда Васільеўна заўсёды дэманструе прыклад творча натхнёнага, змястоўнага і радаснага жыцця.

Узнагароджана знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік асветы» (1985).



***ЛЁГКІ Іван Лукашавіч***

*Харэограф, педагог, фальклараст.*

Нарадзіўся 07.07.1959 г. у в. Жадэнь Дубровіцкага р-на Ровенскай вобл. (Украіна).

Скончыў Дубнаўскае вучылішча мастацтваў па спецыяльнасці «кіраўнік самадзейнага калектыву, артыст» (1981).

Па заканчэнні вучылішча працаваў кіраўніком танцавальнага калектыву Сарненскага СПТВ № 2, потым метадыстам па харэаграфіі ў метадычным цэнтры пры аддзеле культуры Столінскага райвыканкама Брэсцкай вобласці (1983–1993). Адначасова працаваў кіраўніком танцавальнага калектыву Вяліка-Арлоўскага СДК.

З 1993 г. – настаўнік рытмікі і танца сярэдняй школы з музычна-харавым ухілам № 2 г. Століна, дзе стварыў танцавальны калектыў «Палескія плясуны». У гэты час у Беларусі набірае моц рэспубліканскі фальклорны рух «Берагіня», які падштурхнуў спецыялістаў метадычных цэнтраў і калектываў аматарскай творчасці звярнуцца да вывучэння народнай спадчыны свайго краю. У выніку даследчай дзейнасці ў рэпертуары «Палескіх плясуноў» з’явіліся сцэнічныя варыянты старадаўніх народных танцаў, перанятых ад жыхароў розных вёсак Століншчыны: «Шэро» (в. Талмачава), «Шэн» (в. Мачуль), «Тэрніца» (в. Харомск), «Лядзецкая полька» (в. Лядзец), «Шабасоўка» (в. Вялікія Арлы), «Асаўская полька» (в. Асаўцы), «Вянгерка» (в. Альшаны), «Кацярына» (в. Радчыцк), «Капанёўскія гульні» (в. Капані) і інш. У 2001 г. ансамбль фальклорнага танца «Палескія плясуны» атрымаў найменне «ўзорны самадзейны калектыў».

Творчы пошук, высокі прафесійны ўзровень кіраўніка, дазваляе калектыву дасягаць высокіх поспехаў на конкурсах і фестывалях міжнароднага, рэспубліканскага і абласнога ўзроўняў. Сярод іх: фестываль рэгіянальнай творчасці (г. Даўгаўпілс, Латвія, 2001), фестываль харэаграфічнага мастацтва «Палескі карагод» (г. Пінск, 2003), форум моладзі «Свято талантів» (г. Кіеў, 2007), Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, Гомельская вобл. /2006, 2016/), праект «Нашы карані – наша культура» (Галандыя, 2007); фестываль фальклорнага мастацтва «Веснавы танок» (НДАЦ, «Зубраня», 2010); рэспубліканскія агляды-конкурсы дзіцячай творчасці «Прывітанне, сусвет!» (2013, 2015, 2017) і інш.

Падрыхтаваныя Іванам Лукашавічам танцавальныя пары неаднаразова станавіліся пераможцамі Брэсцкага адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва «Радавод» (2004, 2006, 2009, 2011, 2013, 2016), Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2006), Рэспубліканскага конкурсу беларускіх народных танцаў «Мяцеліца» (г. Мінск, 2015).

І.Л. Лёгкі ўзнагароджаны падзякай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за высокі прафесіяналізм, любоў да дзяцей, вернасць школе і педагагічнай працы (2010); граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за шматгадовую плённую працу ў сістэме адукацыі і высокі прафесіяналізм (2011), дыпломам упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама за зберажэнне і папулярызацыю народнай творчасці (2011); Ганаровымі граматамі Столінскага раённага выканаўчага камітэта за шматгадовую, добрасумленную працу, актыўную дзейнасць па адраджэнню і прапагандзе народнай творчасці (1996, 2002, 2012).



***ЛІТВІНАВА Валянціна Уласаўна***

*(1949–2012)*

*Харэограф, педагог, фальклярыст.*

Нарадзілася 18.11.1949 г. у в. Гарані Расонскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыла 10-месячныя курсы па спецыяльнасці «харэографія» ў г. Віцебску (кіраўнік курсаў Осіп Партной).

---

У 1971–1995 гг. працавала інструктарам Расонскага раённага дома культуры.

Была першай, хто на прафесійнай аснове стаў займацца навучаннем харэаграфічнаму мастацтву дзяцей у Расонскім раёне. На занятках дзеці, а потым і дарослыя вучыліся народнаму, класічнаму, сучаснаму і бальнаму танцам.

Па прапанове заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Івана Арцёмавіча Серыкава, якога Літвінава лічыла сваім настаўнікам, у 1993 г. яна стварыла вакальна-харэаграфічны калектыў «Свяціца», куды ўвайшлі танцавальны ансамбль РДК і вакальны ансамбль дзіцячай школы мастацтваў. Ужо праз год калектыў атрымаў найменне «народны». Пад кіраўніцтвам Валянціны Уласаўны калектыў стаў дыпламантам Міжнароднага фестывалю беларускай культуры ў Польшчы, лаўрэатам двух міжнародных фестываляў «Дзвіна-Двіна-Даўгава» ў Латвіі, рэгіянальных фестываляў «Дняпроўскія галасы», «Браслаўскія зарніцы», Усебеларускага фестывалю «Беларусь – мая песня»; выязджаў з гастрольнымі паездкамі ў Цвер, Ідрыцу, Себеж, Навахаванск, Тарапец (Расія).

З 1970 г. пачала дзейнасць фальклярыста і збіральніка твораў народнага мастацтва паўночнага рэгёну Віцебшчыны.

У 1999 г. з вучняў 3–5 класаў Расонскай сярэдняй школы разам з педагогамі-лідарамі А.Ф. Мірановіч, А.М. Вашчанка, Л.А. Задзвінскай, У.В. Літвінавым стварыла гурт «Нежачкі». Яго рэпертуар грунтуецца на багатым мясцовым фальклоры – танцавальным, песенным, інструментальным, гульнявым і пастаянна папаўняецца творамі, знойдзенымі падчас фальклорных экспедыцый па Расоншчыне.

У 2004 г. дзіцячаму фальклорнаму калектыву «Нежачкі» было прысвоена найменне «ўзорны». Калектыў з'яўляецца дыпламантам і лаўрэатам шматлікіх абласных, рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў народнай творчасці: «Беларусь – мая песня» (2005), «Берагіня» (2006), «Марцінас» (2006, Літва), «Грай гармонік і цымбалы» (2007), «Звіняць цымбалы і гармонік» (2008), «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне» (2009) і інш. Калектыў – адзін з найбольш актыўных удзельнікаў фальклорнага руху «Берагіня».

В.У. Літвінава мае ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны» ў намінацыі «Адукацыя і культура» (2010); узнагароджана шматлікімі граматамі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Расонскага Савета дэпутатаў і райвыканкама. З 2014 г. у памяць аб выдатным педагогу і фалькларысту Валянціне Уласаўне Літвінавай у Расонах праводзіцца абласны агляд-конкурс фальклорных дзіцячых і маладзёжных калектываў «Ад прашчураў да зор» (з 2004).



### *ЛОСЬ Людміла Міхайлаўна*

*Работнік культуры, рэжысёр, збіральнік фальклору.*

Нарадзілася 05.10.1970 г. у в. Ліпляны Лельчыцкага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры (1997) па спецыяльнасці «рэжысёр свят і абрадаў, арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці».

З 2010 г. працуе дырэктарам Ліплянскага сельскага дома культуры дзяржаўнай установы «Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці» і з'яўляецца кіраўніком народнага аматарскага калектыву «Вяснянка». У 2000 г. стварыла спадарожнік «Вяснянкі» – дзіцячы фальклорны калектыў «Карагод», рэпертуар якога складаюць творы, запісаныя ад мясцовых носьбітаў народных традыцый. У 2005 г. калектыў атрымаў ганаровае найменне «ўзорны».

Пад кіраўніцтвам Л.М. Лось калектывы «Вяснянка» і «Карагод» вядуць актыўную канцэртную дзейнасць, часта выступаюць разам, прымаюць удзел у раённых, рэгіянальных, рэспубліканскіх і міжнародных імпрэзах. Выхаванцы Людмілы Міхайлаўны – пастаянныя ўдзельнікі і пераможцы абласнога конкурсу народна-пабытавага танца «Вытокі» (з 1991 г., раз у два гады), а таксама конкурсу танцавальных пар і турніраў фальклорных калектываў, якія ладзіліся ў рамках V і VII Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня»: лаўрэат 2008 і 2012 гг.

Узнагароджана Ганаровымі граматамі Лельчыцкага раённага выканаўчага камітэта (2008, 2010, 2012), падзякай Лельчыцкага раённага Савета дэпутатаў (2011), граматай аддзела культуры Лельчыцкага раённага выканаўчага камітэта (2011); Ганаровай граматай абласнога Савета дэпутатаў (2016); Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі (2013, 2014, 2016, 2017); граматай галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2016).



**МАКОЎСКАЯ Ніна Пятроўна**

*Хормайстар, педагог, работнік культуры.*

Нарадзілася 17.10.1958 г. у в. Селішча Старадарожскага р-на Мінскай вобл.

Скончыла Мінскае культурна-асветнае вучылішча па спецыяльнасці «народна-харавыя спевы» (1978).

У 1990 г. пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў в. Вясея Слуцкага раёна Мінскай вобласці.

З 1990 г. па 2000 г. – мастацкі кіраўнік Вясейскага палаца культуры. У час працы на гэтай пасадзе праводзіла вялікую работу па збору мясцовага фальклору. У палац культуры запрашаліся лепшыя танцоры в. Вясея: У.А. Губчык, Н.П. Краўчэня, М.І. Коршак, У.І. Шусцер, ад якіх гурткоўцы пераняли шмат мясцовых танцаў. Многа абрадавых і пазаабрадавых песень перадалі нашчадкам С.М. Карцель, Р.П. Алешка, Н.П. Краўчэня, У.А. Губчык. Ад жыхароў в. Ізбудзішча запісаны абрады «Юр’е» і «Зажынкі»; у в. Новы Гуткоў запісана «Вяселле», «Вялікдзень»; у в. Бярозаўка – «Каляды».

З 1998 г. працуе выкладчыкам першай кваліфікацыйнай катэгорыі па класу «Народная творчасць» у дзяржаўнай установе адукацыі «Вясейская дзіцячая школа мастацтваў» Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Кіраўнік створанага ёю дзіцячага фальклорнага ансамбля «Вясейка». У складзе гурту хлопчыкі і дзяўчынкі з аг. Вясея і 7 аддаленых вёсак. Многія дзеці з многадзетных, малазабяспечаных сем’яў. Такой катэгорыі дзяцей Ніна Пятроўна ўдзяляе асаблівую ўвагу. «Вясейка» прымае ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праходзяць у вёсцы, а таксама раённых, абласных, рэспубліканскіх, міжнародных мерапрыемствах і конкурсах. Мае шмат дыпломаў і ўзнагарод. У 2005 г. і 2011 г. гурт вітаў пераможцаў на рэспубліканскіх «дажынках» у г. Слуцку і г. Маладзечна; у 2010 г. стаў дыпламантам конкурсу «Калыска талентаў» (г. Клецк); у 2012 г. атрымаў дыплом II ступені на VII Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» і дыплом ЮНЕСКА за захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. «Вясейка» прадстаўляла Беларусь на IV Міжнародным фестывалі фальклору «Ліцэдзерскае сэрца» (Сербія, 2012). На конкурсе побытавага танца «Мінская кадрыля» (Клецк, 2013) пара Дзіяна Пацала і Уладзіслаў Трафімовіч узнагароджаны дыпломам I ступені, Пісарык Ірына і Танко Арцём – II ступені. У 2014 г. «Вясейка» выступала на пляцоўках Мінска і спартыўнага комплексу «Сілічы» на

Чэмпіянаце свету па хакею; на святах-конкурсах «Фальклорная талака» (г. Барысаў, 2015, 2017), у намінацыі «Карагод» калектыў заваяваў дыпломы адпаведна I і III ступеняў, танцавальная пара Андрэй Шкурскі і Ганна Макоўская атрымала дыплом III ступені.

У 2000–2016 гг. узнагароджана Ганаровымі граматамі Слуцкага райвыканкама і аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слуцкага райвыканкама.



**ПРЫБАЛАВЕЦ Тамара Іванаўна**

*Работнік культуры, хормайстар.*

Нарадзілася 05.06.1950 г. у в. Бабунічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры па спецыяльнасці «кіраўнік самадзейнага народнага хору» (1969).

З 1970 г. з'яўляецца кіраўніком народнага хору «Таняжанка» (у 1984 г. хору прысвоена ганаровае найменне «народны», у 2006 г. калектыў рэарганізаваны ў народны фальклорны калектыў «Таняжанка» дзяржаўнай установы «Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»), з 1976 г. – дырэктар Тонежскага сельскага дома культуры – адной з вядучых устаноў культуры раёна.

Вядзе актыўную працу па збору і аднаўленню мясцовага фальклору. Сабраныя матэрыялы выкарыстоўваюцца пры фарміраванні рэпертуару калектыву, які зараз налічвае больш за 100 рознажанравых твораў. Найбольш яркім і паказальным з'яўляецца ўнікальны веснавы абрад «Чырачка», які з 2016 г. мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Калектыў актыўна ўдзельнічае ў імпрэзах абласнога, міжрэгіянальнага і міжнароднага ўзроўняў. Толькі за апошнія гады ён узяў удзел у Міжнародным фэсце «Najstarsze Pieśni Europy» (г. Люблін, Польшча, 2012), XV фестываль «Белавежскія мастацкія інтэграцыі "Перэточэ–2017"» і XIII Падляска-Палескіх жніўных сустрэчах «Oleń po boru chodit» (г. Бельск-Падляскі, Польшча, 2017), Міжнародным фэсце фальклорнага мастацтва «Майскія асамблеі» ў Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных (г. Масква, Расія, 2014), Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» (аг. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл., 2014, 2016), Рэспубліканскім свяце «Бульбаш» у гарналыжным цэнтры «Сілічы» (г. Мінск, 2014), Рэгіянальным фэсце песеннага мастацтва «Гэты дзіўны спеў – з глыбінь народных» на прыз народнага артыста Рэспублікі Беларусь М.П. Дрынеўскага (г.п. Лельчыцы, 2004–2017), IX Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйка)» (г. Мінск, 2015). Народны фальклорны калектыў «Таняжанка» – лаўрэат IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2016). Пры ўдзеле калектыву зняты дакументальны фільм «Пад белым крылом Лелькі» (Рэспубліканскі тэлепраект «Зямля Беларуская», 2012), выпускі праграмы «Наперад у мінулае» (тэлеканал «Беларусь-3»,

2014, 2017), фільм «Абрад “Чырачка”, або як у Тонежы вясну гукалі» (па заказу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, рэж. Марыя Курачова, студыя «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», 2014).

У «Таняжанкі» ёсць калектыў-спадарожнік – дзіцячы фальклорны ансамбль «Верасок» – пераемнік мясцовых традыцый.

За значны ўклад у развіццё культуры Лельчыцкага раёна, зберажэнне і папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый Беларусі Тамара Іванаўна была ўзнагароджана: Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР за дасягнутыя поспехі ў сацыялістычным спаборніцтве па дастойнай сустрэчы 60-годдзя БССР і КПБ (1978); Ганаровымі граматамі аддзела культуры Лельчыцкага райвыканкама (1980–1982, 1996), аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лельчыцкага райвыканкама (2014, 2016); абласнога Савета дэпутатаў за шматгадовую добрасумленную працу, значны ўклад у развіццё культуры раёна, зберажэнне і папулярызацыю нацыянальных традыцый (2016), нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2017).

Неаднаразова заносілася на раённую Дошку гонару Лельчыцкага раёна (1984, 2004).



***ПЯТРОЎСКАЯ Елізавета Станіславаўна***

*Работнік культуры, педагог, даследчык традыцыйнай культуры Валожынскага раёна.*

Нарадзілася 29.04.1968 г. у в. Пілюжына Валожынскага р-на Мінскай вобл.

Скончыла Мінскае мастацкае вучылішча імя А.К. Глебава (1988) па спецыяльнасці «настаўнік выяўленчага мастацтва і чарчэння».

Працуе ў Ракаўскім цэнтры народнай творчасці Мінскай вобласці. У 1999 г. стварыла фальклорны ансамбль «Гасцінец» (з 2001 г. – «народны», 2010 г. – «заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь»), у 2002 г. – дзіцячы фальклорны калектыў-спадарожнік «Вянок» (з 2006 г.– «узорны»).

Адной з галоўных задач сваёй дзейнасці лічыць збераржэнне традыцый беларускай народнай культуры і перадачу іх нашчадкам. Праводзіць экспедыцыйную работу, вывучае народныя святы і абрады, беларускі касцюм, промыслы і рамёствы, народна-песеннае мастацтва рэгіёна. На аснове назапашаных матэрыялаў стварыла канцэртныя тэматычныя праграмы «Ракаўскі кірмаш» (2006), «Купальскі вечар» (штогод, пачынаючы з 2000 г.). У 2016 г. па ўспамінах мясцовых старажылаў аднавіла старажытны рэгіянальны абрад «Вяселле».

Калектывы «Гасцінец» і «Вянок» прадстаўляюць беларускі фальклор на міжнародных фестывалях традыцыйнай культуры, удзельнічаюць у абласных і раённых святах і фестывалях, праводзяць святы вёсак, арганізоўваюць канцэртныя і абрадавыя праграмы ў маланаселеных вёсках, для турыстаў і замежных дэлегацый, якія прыязджаюць у Валожынскі раён. Калектывы актыўна супрацоўнічаюць з беларускімі тэлеканаламі і друкаванымі СМІ.

«Вянок» з'яўляецца лаўрэатам IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2016); у абласным свяце-конкурсе дзіцячай творчасці «Калыска талентаў» (Клецк, 2016) стаў уладальнікам Гран-пры.

Як лепшы работнік па выніках года Л.С. Пятроўская двойчы была занесена на Дошку гонару Валожынскага раёна (2005, 2008); за шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у папулярызацыю самадзейнай мастацкай творчасці, вывучэнне і захаванне народнай песеннай спадчыны, абрадаў і традыцый Валожынскага раёна ўзнагароджана Ганаровымі граматамі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (2005, 2011) і Валожынскага раённага выканаўчага камітэта (2006, 2008, 2009, 2010), граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2008), дыпломам «Жанчына года» Беларускага саюза жанчын (2010). У 2017 г. Л.С. Пятроўская ўганаравана медалём Францыска Скарыны.



***РУДЗЁНАК Галіна Сяргееўна***

*Работнік культуры, рэжысёр, сцэнарыст, метадыст, збіральнік фальклору, грамадскі дзеяч.*

Нарадзілася 13.04.1965 г. у в. Дзянісава Міёрскага р-на Віцебскай вобл.

Скончыла Віцебскае вучылішча мастацтваў па спецыяльнасці «культурна-асветная праца і самадзейная творчасць», атрымала кваліфікацыю «клубны работнік, рэжысёр клубных мерапрыемстваў» (1994).

У 1986–2014 гг. працавала мастацкім кіраўніком Матырынскага сельскага дома культуры; у цяперашні час займае пасаду метадыста па народнай творчасці ў аддзеле метадычнай работы дзяржаўнай установы культуры «Ушацкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці».

У 1987 г. стварыла фальклорны калектыў «Матырынская спадчына» (у 2004 г. яму прысвоена званне «народны»), у 1995 г. – дзіцячы фальклорны калектыў «Спадчына». У абодвух калектывах Галіна Сяргееўна ажыццяўляе паслядоўную дзейнасць па захаванню і развіццю традыцый нацыянальнай культуры свайго рэгіёна: плануе і арганізуе экспедыцыі і камандзіроўкі з мэтай аднаўлення, захавання, засваення і папулярызацыі твораў мясцовага фальклору, працу па зборы і апрацоўцы этнаграфічнага матэрыялу. Аказвае практычную дапамогу іншым фальклорным калектывам раёна ў фарміраванні рэпертуару, праводзіць кансультацыі і семінары з кіраўнікамі сельскіх устаноў культуры па пытаннях методыкі і практыкі працы з фальклорным матэрыялам, распрацоўвае метадычныя рэкамендацыі.

Дарослы і дзіцячы фальклорныя калектывы Матырынскага сельскага дома культуры добра вядомыя ў вобласці і рэспубліцы як актыўныя ўдзельнікі сельскіх, раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемстваў, прысвечаных традыцыйнай культуры беларусаў, дзе яны займалі прызавыя месцы і дыпломы высокіх ступеняў. Сярод іх – рэспубліканскі праект «Танцавальны фальклор і дзеці» (2000–2002, перамога ва ўзроставай катэгорыі 10–14 год); абласное свята гульнёвага фальклору «А давайце, пажэнім Цярэшку!» (2008, дыплом лаўрэата); абласное свята «Масленічны разгуляй» у межах абласнога агляду-конкурсу гісторыка-культурнай спадчыны, фальклору і рэдкіх традыцыйных ремёстваў «Букет Паазер’я» (г. Гарадок, 2015, дыпломы ў намінацыях «Выраб і прэзентацыя масленічнай лялькі» і «Гуртавыя спевы»); абласное свята ручніка «Ручнік як лёс» у межах XXIV Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (за праграму прэзентацыі рэгіянальнага ручніка «Крылы…

ільняныя ручнікі…» атрымалі дыплом за захаванне традыцый); конкурс выканаўцаў беларускіх танцаў на Міжнародным свяце традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы» (2015, танцавальная пара ва ўзроставай катэгорыі ад 16 да 30 гадоў у складзе Іллі Макрыдзіна і Алівіі Балаган стала лаўрэатам III ступені); абласны агляд-конкур вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца–2015» (г. Дуброўна, лаўрэаты II ступені ў намінацыі «Лепшы вясельны абрад»); конкурс выканацаў беларускіх народных танцаў на XXVI Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (2017, танцавальная пара ва ўзроставай катэгорыі ад 16 да 30 гадоў у складзе Іллі Шалонька і Дар'і Казак стала лаўрэатам II ступені).

Распрацавала сцэнарый фальклорных свят «Рака часу», «Славутыя майстры Ушаччыны», «Беларускі каляндар у гліняным гаршочку», абрадаў «Ваджэнне куста», «Вялікдзень», «Багач», «Пайшла Каляда калядуючы», свят народнага календара Масленіца, Купалле.

Тройчы выбіралася дэпутатам Ушацкага раённага Савета дэпутатаў. У цяперашні час з'яўляецца дэпутатам Ушацкага раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання па Двор-Плінскай выбарчай акрузе № 24.

Узнагароджана Ганаровай граматай Ушацкага раённага Савета дэпутатаў (2015); па выніках працы за 2015 г. занесена на раённую Дошку гонару Ушацкага раёна.



***РЫЖКОВА Ларыса Мікалаеўна***

*Этнапедагог, даследчык спецыфікі навучання «слыхавым» спевам.*

Нарадзілася 06.06.1952 г. у г. Віцебску.

У 1973 г. скончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут па спецыяльнасці «клубны работнік, рэжысёр тэатральнага калектыву».

Фальклорам зацікавілася, працуючы загадчыцай аўтаклуба аддзела культуры Кірышскага райвыканкама Ленінградскай вобласці (1975–1984). Арганізоўвала і праводзіла Кірышскія фестывалі фальклору, актыўна супрацоўнічала з сектарам фальклору навукова-даследчага аддзела Ленінградскага дзяржаўнага інстытута тэатра, музыкі і кінематаграфіі. Прымала ўдзел у канферэнцыях, экспедыцыях, была сярод арганізатараў фальклорных канцэртаў у Пецярбургу і Кірышах.

З 1984 г. працуе метадыстам па фальклору Мінскага абласнога дома народнай творчасці; з 1985 г. – загадчыкам сектара сацыялістычнай абраднасці ў Рэспубліканскім навукова-метадычным цэнтры культасветработы і народнай творчасці. Супрацоўнічае з Нацыянальным тэлебачаннем, вядзе тэлепраграму «Калыханка».

У 1989 г. для тэлепраграмы «Масленка» Л.М. Рыжкова набірае ў Міханавічах групу дзяцей і развучвае з імі масленічныя гульні і мясцовую песню «Ў нас сягодня Масленіца». Так пачалася гісторыя ансамбля «Калыханка».

Паступова фарміравалася арыгінальная методыка няспешнага «слыхавага» выхавання спевакоў-ансамблістаў, спевакоў-салістаў, якія арыентуюцца ў спевах на жывыя гукі і гуказлучэнні, а не на нотныя знакі. Методыка «слыхавых» спеваў Л.М. Рыжковай абапіраецца на народныя гульні, якія для навучэнцаў з’яўляюцца мадэллю старадаўняга жыцця і вызначаюць характар разнастайнага гукапасылу – у хаце, у двары, у лесе, у полі, ля ракі і г.д.

У рэпертуары «Калыханкі» праграмы з песень да ўсіх каляндарных свят Беларусі, 30 карагодных гульняў і казкі пра жывёл, чарадзейныя і сацыяльна-бытавыя казкі. Расказваючы і слухаючы іх, удзельнікі ансамбля засвойваюць лексічнае і інтанацыйнае багацце дыялектнай беларускай мовы.

Зараз ансамбль працуе на базе Міханавіцкага дома фальклору.

За тры дзесяцігоддзі існавання ансамбль «Калыханка» дэманстраваў беларускую спеўную традыцыю на шматлікіх імпрэзах і фестывалях у Беларусі (тэлефестываль «Песні маёй краіны» /2008, 2010/, Рэспубліканскія Дажынкі /2012/),

а таксама за мяжой: у Расіі (2000, 2008, 2013), Украіне (1996, 1998, 2000, 2002), Малдове (2003), Польшчы (1993, 1995, 1996, 2001).

З 2007 г. ансамбль «Калыханка» выконвае народныя духоўныя вершы і праваслаўную літургічную музыку, прымае ўдзел у фестывалях рэлігійных і паралітургічных песнаспеваў у г. Мінску, Вілейцы, Лідзе, Любані, Польшчы.

Па праблемах «слыхавага» навучання даследчыца выступае на міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, праводзіць майстар-класы для кіраўнікоў фальклорных калектываў

Л.М. Рыжкова – аўтар кнігі «Выхаванне спевака (метадычны дапаможнік для кіраўнікоў дзіцячых фальклорных калектываў)», дзе выкладзена методыка «слыхавага» навучання спевам, якая ўжо амаль 30 год выкарыстоўваецца ў Міханавічах.

У 2005–2016 гг. працавала старшым выкладчыкам кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, дзе арганізавала два студэнцкія ансамблі. Ансамбль «Кроса» – двойчы лаўрэат Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2001, 2016) і дыпламант Міжнароднага фестывалю «Zuvys isgalvojo giesmes» (г. Клайпеда, 2006). Удзельніцы ансамбля «Таццянка-Вяснянка» сталі лаўрэатамі міжнародных фальклорных фестываляў «Красная горка» (г. Бранск, 2015), «Танцы над Эльбрусам» (г. Нальчык, 2015), 4-га адкрытага Расійска-Беларускага конкурсу народнапесеннага мастацтва «Как на речке было на Фонтанке» (г. Санкт-Пецярбург, 2015).

Узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспрублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2012), граматамі ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама.



***САЙКОЎСКАЯ Таццяна Эдуардаўна***

*Хормайстар, педагог, работнік культуры.*

Нарадзілася 14.02.2980 г. у в. Валосавічы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вычылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «харавая музыка народная», прысвоена кваліфікацыя «арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці, кіраўнік хору» (2001); Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «народная творчасць», прысвоена кваліфікацыя «кіраўнік народнага хору, выкладчык» (2018).

---

Хормайстар (2001–2005), удзельнік (2013–2014) народнага вакальнага-харэаграфічнага калектыву «Рудабельская пацеха»; метадыст па аматарскай творчасці раённага арганізацыйна-метадычнага цэнтра аддзела культуры Акцябрскага равыканкама (2009–2010); з 2012 г. працуе настаўнікам спеваў у дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі», кіраўніком узорнага фальклорнага калектыву «Праменьчыкі» – пастаяннага ўдзельніка заключных імпрэз Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2012–2018).

Падчас працы ў арганізацыйна-метадычным цэнтры распрацавала метадычныя выданні па народнай музычнай творчасці, падбірала песенны матэрыял для кіраўнікоў сельскіх устаноў культуры. Некаторы час з’яўлялася вядучай раённых фестываляў і мерапрыемстаў.

У 2008 г. – кіраўнік групы па арганізацыі прэзентацыі аўтэнтычных гуртоў, у 2012 г. – вядучая конкурсу-прэзентацыі беларускіх народных строяў і заключнага канцэрта VII Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіні».

Узнагароджана Ганаровай граматай за дасягненне лепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод спецыялістаў устаноў культуры ў намінацыі «Спецыяліст года» (2012); Ганаровай граматай настаўніку дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі» за добрасумленную працу, высокае прафесійнае майстэрства, асабісты ўклад у развіццё галіны і ў сувязі з Днём работніка культуры (2012, 2016); падзякай за актыўную і добрасумленную работу па выніках 2013 г. (2014).



***САЛОМІНА Людміла Рыгораўна***

*Харэограф, педагог, метадыст.*

Нарадзілася 15.10.1950 г. у г.п. Карма Кармянскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае культурна-асветніцкае вучылішча па спецыяльнасці «харэаграфія» (1969).

Пасля навучання была накіравана на працу ў г.п. Карма ў раённы дом культуры харэографам. Цяперашняя назва – дзяржаўная ўстанова культуры «Кармянскі раённы цэнтр культуры і вольнага часу», пасада – метадыст па харэаграфіі.

У 1989 г. стварыла ансамбль песні, музыкі і танца «Спадчына» (з 1992 г. – «народны»). Калектыў прымаў удзел у многіх міжнародных фестывалях: II фестывалі народнага танца «Сожскі карагод» (г. Гомель, 1999), фестывалі народнай творчасці «Венок дружбы» (г. Бабруйск, 2004), фестывалі песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне» (г. Дуброўна, 2009, 2013), фестывалі-конкурсе славянскай культуры «Купальские вечара на Волхонке» (г. Нагінск, Маскоўская вобл., 2014). Не меншай інтэнсіўнасцю вызначаецца творчая дзейнасць ансамбля і на рэспубліканскім узроўні. «Спадчына» была ўдзельнікам рэспубліканскага фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы, 1994), акцыі да 10-годдзя Чарнобыля (г. Мінск, 1996), Рэспубліканскага фестывалю «Беларуская полька» (г. Чачэрск, 1993–1998), Рэспубліканскага свята працаўнікоў сельскай гаспадаркі «Дажынкі–2000» (г. Мазыр, 2000), свята Славянскага пісьменства і народнай творчасці «На земле Баяна» (г. Трубчэўск, Бранская вобл., 2003), свята г. Чачэрска (2014), абласнога агляду-конкурсу ансамбляў народнай музыкі, песні і танца (2012).

У скарбонцы калектыву мноства перамог і ўзнагарод, сярод якіх: дыплом I ступені Кармянскага раённага выканаўчага камітэта па выніках працы за 2014 г., дыплом II ступені II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (2004).

Людміла Рыгораўна штогод рыхтуе танцавальныя пары, якія актыўна ўдзельнічаюць у абласным конкурсе танцавальных пар-выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» і займаюць прызавыя месцы. Вяршыняй творчай дзейнасці з'яўляецца неаднаразовы ўдзел танцавальных пар Кармяншчыны ў Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва «Берагіня» – дыплом I ступені ў 2008 г., дыплом III ступені ў 2016 г.

Узнагароджана дыпломамі і Ганаровымі граматамі за шматгадовую добрасумленную працу, значны ўклад у справу адраджэння і захавання беларускай нацыянальнай культуры: грамата аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Кармянскага райвыканкама (2014, 2016), Ганаровыя граматы аддзела культуры Кармянскага райвыканкама (2006, 2010), упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (2010), падзякі Кармянскага раённага Савета дэпутатаў (2016), галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама (2018).



***САРНАЎСКІ Аляксандр Якаўлевіч***

*Харэограф, народны майстар, музыка, работнік культуры.*

Нарадзіўся 29.09.1960 г. у Кургальджынскім р-не Акмолінскай вобл. (Казахстан). Выхоўваўся ў бабулі ў г. Нароўлі Гомельскай вобл. (1960–1975), з пераездам бацькоў у Беларусь – у. г. Ельску Гомельскай вобл. (1979–1988).

У дзяцінстве наведваў заняткі ў музычнай школе і танцавальным гуртку пры Доме культуры г. Нароўля. Скончыў харэаграфічнае аддзяленне Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча па спецыяльнасці «культработнік» (1979).

Працаваў мастацкім кіраўніком, дырэктарам Вербавіцкага сельскага дома культуры, інструктарам і метадыстам РДК «Колас» аддзела культуры Нараўлянскага райвыканкама (1979–1983), загадчыкам аўтаклуба (1984), мастаком-афармiцелем Ельскага аддзела культуры Гомельскай вобласці (1985–1988).

З пераездам у г.п. Акцябрскі пачаў працаваць у Акцябрскім раённым доме культуры балетмайстрам узорнага танцавальнага калектыву «Верасок» (1988–1994), стваральнікам і першым кіраўніком якога была Базылік Марыя Селівестраўна (1972–1986). У 1992 г. з удзельнікаў «Вераска» стварыў старэйшую групу пад назвай «Весніца». Па выніках удзелу ў Рэспубліканскім фестывалі харэаграфічнага мастацтва «Пярэзвы» (г. Бабруйск, 1992) «Весніцы» было нададзена найменне «народны» (1993). З пачатку стварэння калектыву і да цяперашняга часу працуе мастацкім кіраўніком.

Народны ансамбль «Весніца» мае цікавы і змястоўны рэпертуар, у яго скарбонцы больш 40 мастацкіх твораў. Асноўнай крыніцай яго стварэння з'яўляецца мясцовы танцавальна-музычны фальклорны матэрыял. Створаныя на іх аснове сцэнічныя танцы «Сялецкі мазурок», навадубраўскі «Падыспань», карагод «Над ракой Арэсай», на матэрыяле Палескага рэгіёна жартоўная полька «На зэдліках», «Круцёлкі», «Беларускі вальс», «Лявоніха» адрозніваюцца разнастайнасцю малюнкаў. Важную ролю ў калектыве адыгрывае ансамбль музычнага суправаджэння, у склад якога ўваходзяць вопытныя музыкі.

Ансамбль выступае перад гледачамі свайго і суседніх раёнаў і абласцей Беларусі, удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных фестываляў.

Ансамбль «Весніца» – лаўрэат Гран-пры Міжнароднага адкрытага конкурсу-фестывалю маладых талентаў «Крымские волны» (г. Феадосія, 2009), Гран-пры Міжнароднага феставалю песні і танца «Жемчужіна Черемоша» (г. Віжніца, Украіна,

2007), I ступені абласнога фестывалю харэаграфічнага мастацтва імя народнага артыста БССР А.А. Рыбальчанкі (г. Гомель, 2004), III ступені (г. Мазыр, 2007), Рэспубліканскага фестывалю народнага гумару «Аўцюкі–2000». Ансамбль з'яўляецца дыпламантам Міжнароднага фестывалю «Sarimsakii» (Турцыя, 2014), Міжнароднага фестывалю народнага танца «Sarimsakii TROPHY» (Турцыя, 2012), III Міжнароднага фестывалю вакальнага, харэаграфічнага і цыркавога мастацтва «Диамант Карпат» (Украіна, 2011), Міжнароднага фестывалю народнага танца «Сожскі карагод» (1999).

У 2016 г. калектыў прымаў удзел у святочным канцэрце, прысвечаным Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, што праходзіў у Палацы Рэспублікі.

Ад бацькі пераняў майстэрства апрацоўкі і разьбы па дрэве, інкрустацыі шпонам, а таксама набыў пачатковыя веды ў бондарстве. Уласнаручна вырабіў для групы музычнага суправаджэння ансамбля «Весніца» частку музычных інструментаў (дудачкі, ляскоткі, дуду і інш.), што забяспечыла калектыву патрэбнае музычнае гучанне. А точаныя ножкі-падстаўкі пад цымбалы і скрынкі-чахлы пад музычнае абсталяванне надзейна абараняюць і захоўваюць даўгавечнасць інструментаў. Акрамя гэтага Аляксандр Якаўлевіч сабраў і аднавіў калекцыю старых гармонікаў.

У сваёй майстэрні вырабляе сувеніры-падарункі з нагоды ўдзелу «Весніцы» ў міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях народнай творчасці: сувенірныя талеркі, дошчачкі, рамачкі, лыжкі і іншыя рэчы, якія, як напамін аб Беларусі, захоўваюцца ў прыватных калекцыях многіх краін, дзе пабываў ансамбль.

Займаецца фатаграфіяй: па-мастацку фіксуе партрэты творчых людзей, моманты з жыцця калектыву «Весніца», родныя краявіды, удзельнікаў і гасцей заключных імпрэз фестывалю «Берагіня».

Падчас правядзення Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» Аляксандр Якаўлевіч з'яўляецца асістэнтам галоўнага рэжысёра і разам з удзельнікамі калектыву «Весніца» забяспечвае правядзенне «Купальскага шэсця» і відовішча-шэсця ўдзельнікаў заключных мерапрыемстваў фестывалю (2004–2018).

Народны ансамбль танца «Весніца» пад кіраўніцтвам А.Я. Сарнаўскага па выніках раённых спаборніцтваў сярод устаноў культуры і спецыялістаў неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі ў намінацыі «Лепшы дарослы калектыў» (2014, 2015, 2018), Ганаровай граматай і спецыяльнай прэміяй Акцябрскага райвыканкама за асобы ўклад і развіццё культурнай і народнай творчасці раёна (2014).

Сарнаўскі Аляксандр Якаўлевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Акцябрскага райвыканкама па выніках работы за 2015 г. у намінацыі «Лепшы па прафесіі».



***СЕМІЛЕТ Ірына Валянцінаўна***

*Харэограф, педагог, работнік культуры.*

Нарадзілася 23.12.1976 г. у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

Скончыла Магілёўскае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «харэаграфія», прысвоена кваліфікацыя «настаўнік, артыст ансамбля» (1998).

Працоўную дзейнасць пачала ў 1998 г. настаўнікам харэаграфіі ў дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Акцябрскі». З 2012 г. займаецца там народным танцам з узорным фальклорным калектывам «Праменьчыкі». Сама прымае ўдзел у конкурсе танцавальных пар і ўзнагароджана дыпломам I ступені за высокае майстэрства выканання народных побытавых танцаў (2012).

Рэгулярна аказвае дапамогу іншым фальклорным гуртам у падрыхтоўцы конкурсу танцавальных пар падчас правядзення Рэспубліканскага конкурсу пар-выканаўцаў беларускіх народных побытавых танцаў фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня». Рэкламуе дзейнасць школы і фальклорнага гурту «Праменьчыкі». Займаецца пытаннямі пераемнасці танцавальнога фальклору.

У 2006 г. падрыхтавала да конкурсу маладзёжны фальклорны гурт «Маладзік» Акцябрскага цэнтра вольнага часу; у 2014 г. – танцавальныя пары вучняў мастацкай школы да абласнога конкурсу побытавых танцаў «Вытокі» ў г. Калінкавічы (дыпломы I ступені – Лера Ляпко і Ілля Дайнека, III ступені – Лера Ляшкова і Юрый Асадчы).

Узнагароджана Ганаровай граматай аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі за дасягненне найлепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве сярод гарадскіх устаноў культуры і спецыялістаў у намінацыі «Спецыяліст года» (2013).



### *СІЛІВОНЧЫК Вера Леанідаўна*

*Майстар народнага дэкаратыўна-побытавага мастацтва, работнік культуры.*

Нарадзілася 16.02.1956 г. у с. Бальшы Талкай Похвістнеўскага р-на Самарскай вобл. (Расія); у 1963 г. сям'я пераехала на радзіму маці ў в. Пратасы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыла Пратасаўскую сярэднюю школу (1973).

Пасля заканчэння Пратасаўскай СШ (1973) на працягу 10 год (1973–1983) працавала ў калгасе імя Леніна (Акцябрскі р-н), затым у мясцовай бібліятэцы (1984), а з 1984 г. да 2014 г. – дырэктар Пратасаўскага сельскага клуба.

Працуючы ў клубе, арганізавала фальклорны ансамбль «Купалінка» (1986). З дапамогай сястры Надзеі шылі і разам з жанчынамі аздаблялі ў мясцовай традыцыі народныя касцюмы для калектыву – пастаяннага ўдзельніка і лаўрэата Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (1999–2016). Ансамбль «Купалінка» пад кіраўніцтвам В.Л. Сілівончык узнагароджаны (2013) Ганаровай граматай і спецыяльнай прэміяй Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта за дасягненне і асобы ўклад у захаванне і развіццё народнай творчасці, папулярызацыю аўтэнтычнага мастацтва.

Вера Леанідаўна зараз на заслужаным адпачынку (з 2014 г.), але, як і раней, з'яўляецца актыўным удзельнікам «Купалінкі», займаецца вышываннем. Да юбілейнай Х «Берагіні» (2018) абнаўляе для калектыву касцюмы і вырабляе сувенірную прадукцю для ўдзельнікаў і гасцей фестывалю. Сярод яе твораў дэкаратыўна-побытавага мастацтва – лялькі: сялянскія хлапчук і дзяўчынка; вясельны картэж: нявеста, жаніх, маці з бацькам, дружкі і шафяркі; ручнікі – вясельны, на абразы, каравайны, уціральнік; вышытыя крыжыкам карціны: Маці Божая, снегіры, зімовы эцюд і шмат інш.

Яе вырабы дэманструюцца на выстаўках рознага ўзроўню. В.Л. Сілівончык з'яўляецца дыпламантам раённага фестывалю «Вянок рудабельскіх талентаў» (г.п. Акцябрскі, 2008), абласнога – «Лялькі з бабулінага куфэрка» (г. Гомель, 2010), фестывалю этнафальклорнага мастацтва «Палеская слабада» (аг. Ляскавічы Петрыкаўскага р-на, 2012), рэспубліканскай выстаўкі традыцыйнага касцюма і лялек «У карагодзе традыцый і спадчыны» (г. Мінск, 2013) і інш.

Свой талент вышывання перадала пляменніцам Аксане, Ганначцы, Наталлі, унучцы Віялеце.

В.Л. Сілівончык узнагароджвалася Ганаровымі граматамі Гомельскага абласнога камітэта прафсаюзаў работнікаў культуры (2002), упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (2003), Ганаровай граматай Акцябрскага раённага Савета дэпутатаў за шматгадовую працу, высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных мерапрыемствах (2013), Ганаровымі граматамі аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама за дасягненне найлепшых паказчыкаў у раённым спаборніцтве (2006, 2008, 2011, 2014).



**СНІТКО Марыя Васільеўна**

*Педагог, даследчыца беларускага фальклору, народная спявачка, сцэнарыст, рэжысёр.*

Нарадзілася 24.08.1953 г. у в. Грыцкавічы Крупскага р-на Мінскай вобл.

Скончыла Мінскае музычнае вычылішча імя М. Глінкі (1977), аддзяленне «народна-харавыя спевы» – першы выпуск (клас педагога А.У. Рашчынскага).

---

Па размеркаванню працавала артысткай Дзяражаўнага народнага хору Беларусі (1977–1985). У 1990 г. заснавала дзіцячы фальклорны калектыў «Мілавіца» і сямейны клуб «Стрэчанне» пры доме піянераў (сёння дзяржаўная ўстанова адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска») Кастрычніцкага раёна сталіцы, кіраўніком якога працуе і зараз.

На працягу педагагічнай працы плённа займаецца навукова-метадычнай, даследчай дзейнасцю, прымае актыўны ўдзел у розннага ўзроўню семінарах, навуковых дыскусіях, канферэнцыях, «круглых сталах», сярод якіх: «Фестываль фальклорнага мастацтва “Берагіня” – дваццацігадовы шлях», V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці. Трасфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве» (2016) і інш.

На базе калектыву «Мілавіцца» распрацоўваюцца мастацка-адукацыйныя мадэлі ў межах Рэспубліканскай лабараторыі народнай творчасці «Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі ў сучаснай практыцы дадатковай адукацыі: тэндэнцыі і перспектывы». Асаблівую ўвагу пры фарміраванні рэпертуру М.В. Снітко надае творам каляндарна-абрадавага і сямейна-родавага цыклаў.

Шматгранная супольная творчая дзейнасць фальклорнага калектыву «Мілавіца» і клуба «Стрэчанне» – асноўны складнік Рэспубліканскай апорнай метадычнай пляцоўкі «Традыцыйная культура і моладзь» ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска», мэта якой – падтрымка і рэалізацыя інавацыйных адукацыйных праектаў па захаванню этнакультурнай спадчыны, распаўсюджванню традыцыйнай беларускай культуры і выхаванню нацыянальнай самасвядомасці падрастаючага пакалення.

Педагагічны вопыт Марыі Васільеўны неаднойчы асвятляўся ў мясцовых і рэспубліканскіх СМІ, адлюстраваны ў выданнях: «Стварэнне этнакультурнай адукацыйнай прасторы як умова выхавання духоўна-маральных каштоўнасцей і сацыялізацыі навучэнцаў у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі:

зб. навук.-метад. і практ. матэрыялаў / склад. Т.М. Крыўко. – Мінск: НЦХТДіМ, 2013; «Набыткі этнакультурнага выхавання ва ўмовах урбанізацыі: з вопыту работы фальклорнага калектыву “Мілавіца”»: зб. / склад. Т.М. Крыўко. – Мінск: НЦХТДіМ, 2016; «Даброж адгукнецца: да 25-годдзя творчай дзейнасці калектыву “Мілавіца” пад кіраўніцтвам Марыі Снітко» / уклад. М.А. Козенка. – Мінск: Беларускі фонд культуры, 2017.

Сістэматызаваныя напрацоўкі па шматгадовай фальклорнай дзейнасці кіраўніка мінскага калектыву «Мілавіца» змешчаны ў «Даведніку IX Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Бергаіня –2016”» / Мазыр: КПУП «Калор», 2016.

Творчасць фальклорнага калектыву «Мілавіца» пад кіраўніцтвам М.В. Снітко неаднойчы асвятлялі на сваіх старонках «Краязнаўчая газета», «Настаўніцкая газета», часопісы «Качели», «Мінская школа»; каналы СТБ і «Культура» Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі.

Удзел калектыву «Мілавіца» ў міжнародных конкурсах і фестывалях адзначаны наступнымі дасягненнямі: дыплом лаурэата III ступені «Інтэрфолк у Расіі» (г. Санкт-Пецярбург, 2010); дыплом Міжнароднага фестывалю фальклорнага мастацтва «Дунайска стреда» (Славакія, 2012); дыплом III ступені ў II Міжнародным фестывалі-конкурсе «Культурная столица» (г. Санкт-Пецербург, Расія, 2012); «Залатыя ёлкі» – у Міжнародным фестывалі дзяцей і моладзі «Кельце (Польшча, 2013, 2014, 2015).

«Мілавіца» пад кіраўніцтвам М.В. Снітко з’яўляецца базай правядзення рэспубліканскіх і рэгіянальных семінараў, а таксама практыкі студэнтаў кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ, Мінскага каледжа мастацтваў. З удзелам калектыву «Мілавіца» былі рэалізаваны дыпломныя праекты выпускнікоў універсітэта культуры і мастацтваў: абрад «Кумленне», «Провады Русалкі» (кіраўнікі Т.А. Пладунова, Э.В. Шчадрына) і інш.

М.В. Снітко – рэцэнзент шэрага метадычных распрацовак, дапаможнікаў, у іх ліку: «Выхаванне на нацыянальных традыцыях: беларускі фальклор (НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2014).

Калектыў «Мілавіца» пад кіраўніцтвам М.В. Снітко плённа супрацоўнічае з установамі адукацыі, музеямі, тэатрамі г. Мінска. Сярод іх: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, Мінскі каледж мастацтваў; Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, музей гісторыі беларускай літаратуры, музей імя М. Багдановіча, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, тэатр юнага гледача.

Узнагароджана граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2010, 2016), Ганаровымі граматамі ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна (2005), Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама (2012, 2007, 2002), Ганаровай граматай адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Мінска (2015). Марыя Васільеўна з’яўляецца ўладальнікам прэміі Мінгарвыканкама (2003, 2016).



**_СУБОТКА Ядвіга Іванаўна_**

*Арганізатар сацыякультурнай дзейнасці, харэограф, рэжысёр, сцэнарыст, выканаўца народных песень і танцаў, артыст аматарскага тэатра, грамадскі дзеяч.*

Нарадзілася 08.05.1954 г. у пас. Капаткевічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

У 1972 г. скочыла Магілёўскае культурна-асветніцкае вучылішча імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «кіраўнік танцавальнага калектыву», у 1990 г. – Мінскі інстытут культуры па спецыяльнасці «арганізацыя і методыка клубнай работы».

Працавала метадыстам Ганцавіцкага раённага дома культуры Брэсцкай вобласці (1972–1974), з 1974 г. – інструктар Капаткевіцкага гарадскога дома культуры Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці, з 1977 г. – яго дырэктар. У 1974 г. стварыла харэаграфічны калектыў «Верасок» і з таго часу працуе яго кіраўніком; у 1990 г. калектыву было нададзена ганаровае найменне «ўзорны». Таксама кіруе (на грамадскіх пачатках) народным ансамблем танца, музыкі і песні «Лявоніха» з дня яго стварэння (з 1989 г.) (музычны кіраўнік калектыву Анатолій Адамавіч Грынько), у 1997 г. калектыў атрымаў найменне «народны».

Праводзіць даследаванне танцавальнай спадчыны Петрыкаўшчыны: арганізоўвае вандроўкі ў навакольныя вёскі з мэтай вывучэння танцавальнай спадчыны, сустрэчы з носьбітамі народнай традыцыйнай культуры, у тым ліку з запрашэннем іх на рэпетыцыі творчых калектываў ГДК. Ядвіга Іванаўна аднавіла і ўвела ў рэпертуар калектываў народныя побытавыя танцы «Полька ў пяць кален», полька «Шчабятуха», «Мікіта», «Бярозка», «Падыспань», «Кракавяк», «Нарэчанька», «Каробачка», «Субота», «Ойра», «Ва саду лі», «Каханачка», «Карапэт», «Сербіянка», танец-гульню «Дзяркач» і інш. Фотаздымкі і апісанні танцаў полька «Мост», «Конкавіцкая кадрыля» (расшыфроўка і графічна-літаратурны запіс М.А. Козенкі) і 7 гульняў з рэпертуару капаткевіцкіх калектываў увайшлі ў 6-ы том выдання «Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Гомельскае Палессе і Падняпроўе» (г. Мінск, 2013).

Ансамблі «Верасок» і «Лявоніха» прымалі ўдзел у шматлікіх абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных творчых мерапрыемствах: абласным аглядзе-конкурсе, прысвечаным 60-годдзю стварэння БССР і кампартыі Беларусі (1979), Усебеларускім фестывалі народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (1988), абласных аглядах-конкурсах харэаграфічнага мастацтва калектываў з найменнем «народны», «узорны» (1990, 1995, 2000), абласных фестывалях харэаграфічнага мастацтва імя народнага артыста БССР А.А. Рыбальчанкі (2004, 2007, 2010), Міжнародным фестывалі харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (1997,

2008, 2011, 2016), Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Кліч Палесся» (2010, 2012, 2014, 2016). У 2010 г. ансамбль «Лявоніха» ўзнагароджаны дыпломам І ступені «За лепшую харэаграфію, за высокае мастацкае майстэрства і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Палесся» (танец «Полька-мост»).

Ансамбль танца «Верасок» у 2013 г. атрымаў дыплом ІІ ступені сярод дзіцячых калектываў устаноў культуры ў намінацыі «народна-сцэнічны танец», у 2016 г. узнагароджаны дыпломам «За ўвасабленне танцавальнага фальклору Гомельшчыны».

Танцавальныя пары абодвух калектываў (у розных узроставых групах) – лаўрэаты і дыпламанты абласных конкурсаў выканаўцаў народных побытавых танцаў «Вытокі» (1999, 2002, 2005, 2008, 2011, 2013, 2015, 2017) і Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» (2002, 2010, 2012, 2014, 2016).

Я.І. Суботка – дэпутат Капаткевіцкага пасялковага Савета (5 созываў, з 2003 г.) і Петрыкаўскага раённага Савета дэпутатаў 28-га созыва (з 2018 г.), па выніках раённага спаборніцтва стала лепшым «Кіраўніком года» сярод работнікаў культуры (2017).

Узнагароджана дыпломамі і граматамі ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (2012, 2013, 2016), Петрыкаўскага райвыканкама (2004, 2009, 2012, 2015, 2016, 2017), Гомельскага абласнога аддзялення грамадскага аб’яднання «Беларускі фонд міру» (2017), Ганаровай граматай абласнога аб’яднання арганізацый прафсаюзаў (2017), граматай (2006, 2016) за шматгадовую плённую працу, значны ўклад у справу адраджэння і захавання нацыянальнай культуры і нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё беларускай культуры» (2018).



***ХОМБАК Вераніка Аляксандраўна***

*Харэограф, педагог, рэжысёр.*

Нарадзілася 22 чэрвеня 1972 г. у в. Клімавічы Сенненскага р-на Віцебскай вобл.

У 2001 г. скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры па спецыяльнасці «сацыяльны педагог».

З 2013 г. узначальвае дзяржаўную ўстанову адукацыі «Лепельская дзіцячая школа мастацтваў», дзе займаюцца сёння больш за 700 дзяцей і падлеткаў.

У 1996 г. стварыла дзіцячы фальклорны калектыў «Сунічкі», якому ў 2000 г. нададзена найменне «ўзорны», а ў 2013 – ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

Адметнасць калектыву ў тым, што засваенне рэпертуару адбываецца ўласцівым аўтэнтычнай народнай культуры шляхам вуснага пераймання. У цяперашні час у рэпертуар калектыву ўваходзіць больш за 40 мясцовых традыцыйных танцаў, 40 карагодаў і гульняў, больш за 30 песень, сярод якіх узоры каляндарных і сямейна-родавых абрадаў, пазаабрадавыя песні і прыпеўкі, каля 30 найгрышаў. Складзены каталог з 82 старадаўніх традыцыйных страў. Удзельнікі калектыву з цікавасцю вывучаюць лад жыцця сваіх продкаў, мясцовыя народныя святы, абрады і звычаі. Удзельнікі «Сунічак» валодаюць не толькі харэаграфічнымі навыкамі, многія з іх добра спяваюць, іграюць на музычных інструментах, ведаюць шмат твораў народнай прозы, займаюцца рознымі відамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Апошнім часам у калектыве надаецца вялікая ўвага правядзенню каляндарных свят і абрадаў у натуральным іх бытаванні. Вялікай папулярнасцю ў малодшых выхаванцаў В.А. Хомбак карыстаюцца Каляды, Масленіца, Вялікдзень, у старэйшых – Жаніцьба Цярэшкі, Грамніцы, Дажынкі і інш.

У сваёй адміністрацыйнай і мастацкай дзейнасці В.А. Хомбак творча супрацоўнічае з бацькамі навучэнцаў школы мастацтваў і ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных аб'яднанняў: яны наведваюць заняткі гуртка, удзельнічаюць у выхаваўчых мерапрыемствах, традыцыйных вечарынах і святах. Разам са сваімі дачкамі і сынамі спяваюць беларускія народныя песні, танцуюць народныя танцы, шыюць і аздабляюць у народнай традыцыі касцюмы.

Асабістыя якасці кіраўніка садзейнічаюць плённай рэалізацыі разнастайных творчых праектаў («Новы год па-беларуску», «Масленічныя забавы», «Лепельскі

карагод», «Іграй гармонік» і інш.), сэнс якіх – далучэнне падрастаючага пакалення да каштоўнасцей традыцыйнай культуры бацькаўшчыны.

Удзельнікі калектыву неаднойчы станавіліся лаўрэатамі і дыпламантамі міжнародных фестываляў і конкурсаў. У скарбонцы творчага калектыву 59 дыпломаў.

Толькі за апошнія гады калектыў «Сунічкі» прадстаўляў народную культуру Лепельшчыны на Міжнародным дзіцячым фестывалі «Сонца, радасць, прыгажосць» (Балгарыя, 2013 г.); XXII Міжнародным фестывалі песні і музыкі «Дняпроўскія галасы» (г. Дуброўна, 2015); фестывалі «Pynu, pynu situ» (г. Даўгаўпілс, Латвія, 2016); турнірах выканаўцаў беларускіх народных танцаў у межах XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» (2017); Міжнародным святе традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы» (г. Браслаў, 2014, 2015, 2016); Рэспубліканскім конкурсе выканаўцаў беларускіх народных танцаў «Мяцеліца–2013» (г. Мінск, 2013); абласным аглядзе-конкурсе фальклорнага мастацтва дзяцей і моладзі «Ад прашчураў – да зор» (г. Расоны, 2014, 2016), арганізатарам якога з’яўляецца.

Вераніка Аляксандраўна – член журы рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў народнай творчасці, актыўны ўдзельнік абласных, рэспубліканскіх і міжнародных майстар-класаў, семінараў і канферэнцый па праблемах эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі сродкамі народнага мастацтва.

Узнагароджана дыпломам VIII Рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года-2015« у намінацыі «За ўклад у развіццё духоўнасці і культуры»; Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за заслугі ў рэалізацыі сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры, нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў за дасягненні ў сацыяльна-культурнай дзейнасці, значны ўклад у эстэтычнае выхаванне навучэнцаў і ў сувязі з 60-годдзем з дня ўтварэння ўстановы, з’яўляецца дэпутатам Лепельскага раённага Савета дэпутатаў, членам праўлення Лепельскага раённага грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз жанчын».

Грунтуючыся ў сваёй працы на прынцыпах нацыянальнага фестывальнага фальклорнага руху «Берагіня», які распачаўся больш за 20 гадоў таму ў г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці, знаная дзеячка нацыянальнай культуры Беларусі Вераніка Аляксандраўна Хомбак, яе калегі-педагогі і ўдзельнікі вядомага ў краіне заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Сунічкі» знайшлі ў народнай культуры Бацькаўшчыны чысцюткую крыніцу, якая жывіць душы, мастацкі талент асоб і падтрымлівае беларускае ў беларусах.



**ШАПЛЫКА Васіль Данілавіч**

*Музыкант, работнік культуры.*

Нарадзіўся 13.09.1949 г. у в. Харомцы Акцябрскага р-на Гомельскай вобл.

Скончыў Магілёўскае культурна-асветніцкае вучылішча імя Н.К. Крупскай па спецыяльнасці «культурна-асветніцкая работа», кваліфікацыя «клубны работнік, кіраўнік самадзейнага харавога калектыву» (1985).

Працаваў загадчыкам клуба ў в. Курын Акцябрскага раёна (1966–1968), на Мінскім трактарным заводзе (1969–1972); дырэктарам клуба ў в. Харомцы (1973–1982), загадчыкам Ляскавіцкага сельскага клуба (1982–1984), мастацкім кіраўніком Харамецкага сельскага дома культуры (1984–1994), а затым яго дырэктарам (1995–2009).

Стварыў фальклорны калектыў «Вечарына» (1984) у Харамецкім СДК. Душой калектыву была жонка Васіля Данілавіча Надзея Іванаўна, якую аднавяскоўцы называлі «харамецкім салаўём» за добры голас.

Васіль Данілавіч аднавіў старадаўнія песні: «Закацілася ды яснае сонейка за зялёны гай» (жніўная), «Туман пры даліне» (летняя), «Шчыпала і рвала із розы цвяты» (сіроцкая), «Чаравічкі», «Ночанька цямнюсенька», «Каліна з малінаю разам расцвіла»; карагоды: «Па-за лужком зялёненькім», «Зажыначны карагод»; прыпеўкі: «Пад польку», «Барыня-сударыня», «Сербіянка», «Страданне»; з народнага гумару: «Не дабраўся» і танцы: «Чамяля», «Хадося», «Дзева ў сенях стаяла», «Субота» і інш. Калектыў з поспехам выступіў на раённым свяце рамяства і гармонікі «Вясковае падвор'е» (1996), а потым свой талент прадэманстравалі на Рэспубліканскім фестывалі народнага танца «Беларуская полька» (Чачэрск, 2000). Калектыў – пастаянны ўдзельнік заключных мерапрыемстваў Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», у тым ліку фіналіст у намінацыях «Агляд аўтэнтычных гуртоў», «Рудабельскае Купалле», «Рудабельскі кірмаш» (1999, 2001, 2004, 2006, 2008). Уваходзіў у склад акампаніруючай групы конкурсу танцавальных пар (1999, 2001, 2004).

Сам Васіль Данілавіч – патомны народны музы́ка. Бацька яго, Даніла Антонавіч, быў вядомым музы́кам, іграў адразу на двух інструментах: гармоніку і балалайцы. Маці, Надзея Рыгораўна, была лепшай у вёсцы спявачкай. У сям'і расло пяцёра дзяцей і кожны іграў на якім-небудзь інструменце. Так атрымаўся сямейны ансамбль, які быў частым госцем на святах у сваёй і суседніх вёсках. Пра сябе расказвае сціпла: «Любоў да музыкі прыйшла да мяне, напэўна, яшчэ з мацярынскім

малаком… А іграць на гармоніку навучыўся ад старэйшага брата, шмат найгрышаў пераняў ад бацькі».

У сям’і Шаплыкаў двое сыноў, падрастаюць унукі. Старэйшы сын Рыгор іграе на гітары. І ён самавук. Сямейная дынастыя музы́каў працягваецца.

Узнагароджаны Ганаровай граматай упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама (2000), Ганаровымі граматамі аддзела культуры Акцябрскага райвыканкама за шматгадовую плённую працу ў галіне культуры (2004), актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна і ў сувязі з Днём работніка культуры (2006), Ганаровай граматай Акцябрскага раённага выканаўчага камітэта (2009).

## ЗМЕСТ


Гістарычны лёс «Берагіні». М.А. Козенка .................... 3

АРГАНІЗАТАРЫ

БАГДАНОВІЧ Васіль Рыгоравіч ........... 10
БАЕВА Ядвіга Іванаўна.................... 12
БЕЛІКАЎ Аляксандр Васільевіч........... 15
БЕРАЗОЎСКАЯ Святлана Анатольеўна.... 16
БЕРАЗОЎСКАЯ Таццяна Анатольеўна..... 18
БЯРНЕЙ Людміла Рыгораўна ............. 20
ВОЛКАВА Вера Рыгораўна ............... 22
ВЫРВІЧ Людміла Васільеўна ............ 24
ВЫСКВАРКА Сяргей Георгіевіч ........... 25
ГЛУШЭЦ Ірына Валер’еўна ............... 28
ДЗЕМЯНЧУК Ірына Дзмітрыеўна ........ 31
ЗАБРОЦКАЯ Надзея Васільеўна .......... 33
ІВАНЕНКА Мікалай Міхайлавіч **......... 34**
ІВАШЫНА Вольга Сяргееўна ............. 36
КАЗАКОВА Ларыса Аляксееўна........... 37
КОЗЕНКА Мікалай Аляксеевіч ............ 39
КРАЧКОЎСКАЯ Алена Валер’еўна ......... 42
КРУГАЛЬ Антаніна Віктараўна ........... 44
КУЛАК Юлія Анатольеўна ................ 46
КУРСЕВІЧ Карына Анатольеўна .......... 48
МАРТЫНЕНКА Алена Іванаўна ........... 50
МАРТЫНЕНКА Сяргей Васільевіч......... 51
МАСКАЛЁВА Тамара Ермалаеўна ......... 52
ОСІПАЎ Павел Сяргеевіч.................. 54
СУХАЯ Наталля Аляксандраўна........... 55
СУХАЯ Таццяна Мікалаеўна............... 57
ТАРАКАНАВА Марына Леанідаўна........ 58
ФІЛІПШАНАВА Алена Аляксандраўна.... 60
ХАЛАДОК Таццяна Васільеўна............ 61
ХЛЫСТУНОВА Элеанора Анатольеўна.... 63
ШАРАПАЎ Андрэй Вячаслававіч .......... 65
ШЛАПАКОВА Валянціна Уладзіміраўна... 66
ШЧЭЦЬКА Вера Іванаўна ................ 67
ШЭЙКА Любоў Сяргееўна.................. 68

ДАРАДЦЫ

АНЦУХ Ліліяна Фёдараўна................ 70
БАЛЫНСКАЯ Марына Самуілаўна ........ 72
БУТЭВІЧ Анатоль Іванавіч................ 73
ВЕРАС Варвара Данілаўна................. 76
ГАМЗОВІЧ Рэгіна Станіславаўна.......... 77
ГІЛЕП Уладзімір Аляксандравіч .......... 79
ДАРАШЭВІЧ Энгельс Канстанцінавіч..... 81
ЁВЕНКА Наталля Аркадзьеўна ........... 83
КАЛІНОЎСКАЯ Алена Тадэвушаўна....... 84
КАТКАВЕЦ Васіль Сцяпанавіч ............ 85
КОНАН Уладзімір Міхайлавіч ............ 87
КУЛЯЙ Аляксей Фёдаравіч................ 90
МІХЕДАВА Людміла Сяргееўна ........... 92
ПАРШУТА Іван Якаўлевіч ................. 94
ПЯСЕЦКІ Яўген Віктаравіч................ 96
РАГІН Яўген Мікалаевіч................... 98
РАГУЛЯ Аляксей Уладзіміравіч ........... 99
САРНАЎСКАЯ Марыя Іванаўна...........101
СЕЛІВАНАЎ Сямён Данілавіч ............103
СІВУРАВА (ЗІНКЕВІЧ) Любоў Пятроўна .105
СМІРНОВА Ірына Юр’еўна................107
СОБАЛЬ Міхаіл Іпалітавіч.................109
СТАРЫНОВІЧ Алена Якаўлеўна ..........111
СТРУЖЭЦКІ Тадэуш Іванавіч ............113
СУША Галіна Аркадзьеўна ...............115
ШЫЛКІНА Алена Міхайлаўна............117
ШЭЙКА Кацярына Аляксандраўна.......119
ЮРЧАК Настасся Астапаўна .............121
ЯГУР Марыя Ігнатаўна....................123
ЯФРЭМАВА Аляксандра Іванаўна........124

## ЭКСПЕРТЫ


АБРАМОВІЧ Антаніна Анатольеўна......126
БАДУНОВА Ірына Іосіфаўна .............128
БОГАНЕВА Алена Міхайлаўна............131
ВАЛОДЗІНА Таццяна Васільеўна.........134
ВАРФАЛАМЕЕВА Тамара Барысаўна.....137
ВОЙЦІК Віктар Антонавіч ...............141
ГАДОЎСКІ Уладзімір Міхайлавіч .........143
ДУДЧАНКА Мікалай Рыгоравіч ..........145
КАЛАЦЭЙ Вячаслаў Віктаравіч ..........147
КАНАВАЛЬЧЫК Ірына Віктараўна.......149
КУХАРОНАК Таццяна Іванаўна ..........151
МАЗЮК Ірына Васільеўна ...............153
ПАПОЎ Віктар Аляксеевіч................155
ПЕСНЯКЕВІЧ Таццяна Пятроўна.........157
ПІСКУН Юрый Аляксандравіч ...........159
ПЛАДУНОВА Таццяна Аляксандраўна ...163
РАШЧЫНСКІ Алесь Уладзіміравіч........165
ЧОРНЫ Георгій Дзмітрыевіч.............167
ШАУРА Рыгор Фёдаравіч ................169
ШУМІЛАВА Эмілія Іванаўна..............172
ШЧАДРЫНА Эвеліна Вячаславаўна......174


## КІРАЎНІКІ ТВОРЧЫХ КАЛЕКТЫВАЎ


АГЕЙЧЫК Алена Ігнатаўна ..............177
АДАМОВІЧ Тарэса Антонаўна............178
БУРАК Ганна Мікалаеўна ................180
БЯЖКОЎ Дзмітрый Гаўрылавіч...........182
БЯЛЬКО Ала Мікалаеўна..................184
ВЕЖНАВЕЦ Іван Пятровіч ...............186
ГАЛАВАЧЭНКА Святлана Мікалаеўна....187
ДУЛЬСКАЯ Вольга Гаўрылаўна ..........188
ЖЫХ Чэслаў Альфонсавіч................190
ІВАХНЕНКА Алена Леанідаўна...........192
КАБАЦКАЯ Святлана Юр’еўна............194
КАВАЛЁВА Надзея Канстанцінаўна .....196
КАТЛЯРОВА Святлана Міхайлаўна.......198
КЛІМОВІЧ Святлана Анатольеўна .......199
КРУК Васіль Васільевіч ..................201
КРУПСКАЯ Зінаіда Васільеўна ...........202
ЛЁГКІ Іван Лукашавіч ...................204
ЛІТВІНАВА Валянціна Уласаўна .........206
ЛОСЬ Людміла Міхайлаўна ..............208
МАКОЎСКАЯ Ніна Пятроўна ..............209
ПРЫБАЛАВЕЦ Тамара Іванаўна..........211
ПЯТРОЎСКАЯ Елізавета Станіславаўна..213
РУДЗЁНАК Галіна Сяргееўна.............214
РЫЖКОВА Ларыса Мікалаеўна ..........216
САЙКОЎСКАЯ Таццяна Эдуардаўна ......218
САЛОМІНА Людміла Рыгораўна .........219
САРНАЎСКІ Аляксандр Якаўлевіч........221
СЕМІЛЕТ Ірына Валянцінаўна...........223
СІЛІВОНЧЫК Вера Леанідаўна...........224
СНІТКО Марыя Васільеўна...............226
СУБОТКА Ядвіга Іванаўна................228
ХОМБАК Вераніка Аляксандраўна.......230
ШАПЛЫКА Васіль Данілавіч.............232

*Навукова-папулярнае выданне*

РУПЛІЎЦЫ
на ніве фестывальнага фальклорнага руху
«БЕРАГІНЯ»
(1998–2018)

Зборнік артыкулаў

Укладальнік
**Козенка** Мікалай Аляксеевіч

Рэдактары Т.Б. Варфаламеева, М.А. Козенка, С.М. Рыбарава
Дызайн і камп'ютарная вёрстка Ю.В. Шабан

Фота з архіваў М.А. Козенкі, Акцябрскага РЦНТ, Віцебскага АЦНТ,
Гомельскага АЦНТ, Мінскага АЦНТ

Падпісана да друку 11.06.2018. Фармат 84x108 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура Cambria.
Ум. друк. арк. 14,16. Ул.-выд. арк. 14,01. Тыраж 150 экз. Заказ 183.

РУП «Інфармацыйна-вылічальны цэнтр
Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь».
Пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/161 ад 27.01.2014, № 2/41 ад 29.01.2014.
Вул. Кальварыйская, 17, 220004, г. Мінск.